Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь
Установа адукацыі “Полацкі дзяржаўны універсітэт”

Д.У. Дук

ПОЛАЦК XVI – XVIII СТАГОДДЗЯЎ: НАРЫСЫ ТАПАГРАФІІ, ГІСТОРЫІ МАТЭРЫЯЛЬНАЙ КУЛЬТУРЫ І АРГАНІЗАЦЫІ ЖЫЦЦЁВАЙ ПРАСТОРЫ НАСЕЛЬНІЦТВА БЕЛАРУСКАГА ГОРАДА

Наваполацк 2007

УДК 904 (476) “16/18” (043.3)
ББК 63.3 (4Беи) 4
Д 79

Адобрана саветам Установы адукацыі
“Полацкі дзяржаўны універсітэт”

Рэцэнзенты:

Г.В. ШТЫХАЎ, доктар гістарычных навук, прафесар,
галоўны навуковы супрацоўнік Інстытута гісторыі НАН Беларусі;
С.В. ТАРАСАЎ кандыдат гістарычных навук, дацэнт кафедры гуманітарных навук
Інстытута парламентарызму і прадпрымальніцтва

Д 79 **Дук, Д.У.** Полацк XVI – XVIII стагоддзяў: нарысы тапаграфіі, гісторыі матэрыяльнай культуры і арганізацыі жыццёвай прасторы насельніцтва беларускага горада / Д.У. Дук. – Наваполацк: ПДУ, 2007. – 268 с.: іл.
ISBN 978-985-418-534-7

Манаграфія прысвечана гісторыі Полацка XVI – XVIII стст. На падставе археалагічных і пісьмовых крыніц прыводзіцца характарыстыка развіцця тапаграфіі Полацка, асаблівасцей развіцця матэрыяльнай культуры і арганізацыі жыццёвай прасторы насельніцтва самага старажытнага горада Беларусі ў эпоху ранняга Новага часу. Прадстаўлены новыя звесткі аб развіцці тапаграфіі Полацка. Зроблена ілюстраванае апісанне і сістэматызацыя даных пра асноўныя катэгорыі матэрыяльнай культуры. Упершыню ў гістарыяграфіі прапануецца комплекснае вызначэнне асяроддзя і ўмоў штодзённага жыцця насельніцтва Полацка XVI – XVIII стст. Прадстаўлена вялікая колькасць малюнкаў, планаў Полацка і табліц.

Разлічана на прафесійных гісторыкаў, студэнтаў гістарычных спецыяльнасцей вышэйшых навучальных устаноў, мастацтвазнаўцаў і ўсіх, хто цікавіцца гісторыяй Беларусі.

УДК 904 (476) “16/18” (043.3)
ББК 63.3 (4 Беи) 4

ISBN 978-985-418-534-7

© Дук Д.У., 2007
© Установа адукацыі
“Полацкі дзяржаўны універсітэт”, 2007

ЗМЕСТ

Спіс скарачэнняў 4
Уводзіны 5
1. Гістарыяграфія і крыніцы 9
1.1. Гістарыяграфія 9
1.2. Агляд крыніц 14
2. Нарыс тапаграфічнага развіцця Полацка XVI – XVIII стагоддзяў 26
3. Полацкая архітэктурна-дэкаратыўная кераміка 50
3.1. Вытворчасць кафлі і аздабленне полацкіх печаў 50
3.1.1. Кафля першай паловы XVI стагоддзя 50
3.1.2. Кафля канца XVI – XVII стагоддзяў 57
3.1.2.1. Геральдычная кафля 57
3.1.2.2. Сюжэтная кафля 69
3.1.2.3. Кафля з раслінным і геаметрычным арнаментам 73
3.1.3. Кафля XVIII стагоддзя 83
3.2. Канструкцыя і знешні выгляд печаў XVI – XVIII стагоддзяў 88
3.3. Архітэктурна-дэкаратыўныя элементы аздаблення інтэр'ераў і экстэр'ераў гарадскіх пабудоў 93
4. Ганчарны посуд і дробныя керамічныя групы 99
4.1. Вытворчасць, пытанні тыпалогіі і храналогіі полацкага керамічнага посуду XVI – XVIII стагоддзяў 99
4.1.1. Кухонны посуд 101
4.1.2. Сталовы посуд 124
4.1.3. Тарны і гігіенічны посуд 129
4.1.4. Дэкаратыўны посуд 131
4.1.5. Дробныя керамічныя групы 136
5. Апрацоўка металаў. Шкларобства. Вырабы са скуры, з косці, дрэва і каменю 147
5.1. Вырабы з металаў 147
5.1.1. Побытавыя рэчы 147
5.1.2. Інструменты вытворчасці 161
5.1.3 Рыштунак вершніка і каня 164
5.1.4. Зброя 166
5.1.5. Ювелірныя рэчы 171
5.2. Шкларобства 179
5.3. Гарбарныя вырабы 188
5.4. Апрацоўка дрэва і косці 192
5.5. Вырабы з каменю 196
6. Жыццёвая прастора насельніцтва Полацка XVI – XVIII стагоддзяў 199
6.1. Арганізацыя жыццёвай прасторы заможных гараджан 199
6.2. Арганізацыя жыццёвай прасторы прадстаўнікоў сярэдняга сацыяльнага стану і гарадскіх нізоў 219
Заключэнне 237
Крыніцы 244
Даследаванні 247

СПІС СКАРАЧЭННЯЎ

БГА – Беларускі гістарычны агляд.
БГЧ – Беларускі гістарычны часопіс.
ГАЗ – Гістарычна-археалагічны зборнік.
ІГ НАНБ – Інстытут гісторыі Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі.
ИЮМ – Историко-юридические материалы, извлечённые из актовых книг губерний Витебской и Могилёвской, хранящиеся в Центральном архиве в Витебске и изданные под редакцией архивариуса сего архива Сазонова.
КСИА – Краткие сообщения о докладах и полевых исследованиях Института археологии АН СССР.
МИА – Материалы и исследования по археологии СССР.
НМГКБ – Нацыянальны музей гісторыі і культуры Беларусі.
НПГКМЗ – Нацыянальны Полацкі гісторыка-культурны музей-запаведнік.
НТДП – Навукова-тэхнічнае дзяржаўнае прадпрыемства.
ПГКБ – Помнікі гісторыі і культуры Беларусі.
РА – Российская археология.
СА – Советская археология.
САИ – Свод археологических источников.
PMMAEL – Prace i materiały muzeum archeologicznego i etnograficznego w Łodzi. Seria Archeologiczna.
SMHKM – Studia i materiały z historii kultury materialnej.

Маім бацькам

УВОДЗІНЫ

Прыемна ўсведамляць, што цікаўнасць да гістарычнай спадчыны Полацка з цягам часу толькі ўзрастае, а гістарычны досвед становіцца ўсё больш запатрабаваным у сучасным грамадстве. Полацк – адметны горад у беларускай гісторыі. Яго мінулае – гэта вытокі беларускай дзяржаўнасці і культуры, у летапісу горада адлюстраваны найбольш характэрныя старонкі гісторыі Бацькаўшчыны.

Гістарыяграфія гісторыі Полацка вельмі вялікая і можа стаць прадметам асобнага навуковага даследавання. Падкрэслім толькі, што за апошнія дзесяцігоддзі пабачылі свет дзве манаграфіі выдатных беларускіх археолагаў Г.В. Штыхава і С.В. Тарасава, у якіх разглядаюцца палітычная гісторыя і матэрыяльная культура старажытнага Полацка IX – XIII стст., а таксама тапаграфічнае развіццё горада ў IX – XVII стст. (Штыхов, 1975; Тарасаў, 1998).

Увазе чытача прапануецца работа, прысвечаная вывучэнню тапаграфіі, матэрыяльнай культуры і жыццёвай прасторы насельніцтва Полацка ў эпоху ранняга Новага часу (XVI – XVIII стст.) паводле даных археалагічных і пісьмовых крыніц. Пры гэтым акцэнт у даследаванні зроблены менавіта на магчымасцях археалогіі ў справе вывучэння розных аспектаў жыцця беларускага горада.

Храналагічныя межы работы абраны не выпадкова. Ранні Новы час – гэта адметная эпоха развіцця еўрапейскага грамадства. Яна адзначаецца якаснымі зменамі ў сістэме ідэалагічных уяўленняў, значнымі навуковымі адкрыццямі і тэхнічнымі вынаходніцтвамі. Гістарычныя ўмовы, у якіх адбывалася фарміраванне новых каштоўнасных арыенціраў, у Полацку мелі сваю спецыфіку. Ранні Новы час з’яўляецца пераломным у палітычным, эканамічным, і як следства, культурным жыцці горада. Менавіта ў гэты перыяд Полацк з квітнеючага і самага вялікага пасля Вільні горада Вялікага княства Літоўскага (далей – ВКЛ), сталіцы намесніцтва і ваяводства, пераўтварыўся ў павятовы горад у складзе Расійскай Імперыі. Аднак заняпад Полацка ў XVII – XVIII стст., пра які часам згадваюць нават прафесійныя гісторыкі, датычыцца хіба што сферы палітычнай вагі Полацка ў дзяржаўнай структуры Рэчы Паспалітай. У кнізе на падставе вывучэння тапаграфіі, гісторыі матэрыяльнай культуры і ступені арганізацыі жыццёвай прасторы аўтар ставіць мэту паказаць агульную карціну развіцця горада ў пазначаны час. У гэтую эпоху ў горадзе жылі і працавалі Францыск Скарына, Сімяон Полацкі, горад атрымаў свой герб і права на сама-

кіраванне паводле “звычаю Майдэбургскага”, перажыў найбольш пакутныя і разбуральныя войны – сама меней па адной на кожнае стагоддзе, але выстаяў, і кожны раз адраджаў і развіваў сваю высокую культуру. Гэты дастаткова цьмяны перыяд гісторыі Полацка яшчэ будзе асэнсаваны належным чынам і, спадзяемся, не без дапамогі сапраўднага даследавання.

За апошнія дзесяцігоддзі ў выніку археалагічнага вывучэння Полацка сабрана вялікая колькасць артэфактаў XVI – XVIII стст., большасць з якіх належным чынам не была сістэматызавана ці ўвогуле не апрацавана. Гэтаму спрыяў традыцыйны ў айчыннай археалогіі 50 – 70-х гадоў XX ст. падыход да вывучэння ў першую чаргу “княжацкага” перыяду IX – XIII стст., таму на сённяшні дзень паўстала неабходнасць комплекснага вывучэння матэрыялаў позняга Сярэднявечча і эпохі ранняга Новага часу. Як адзначаў С.В. Тарасаў на старонках кнігі “Полацк IX – XVII стст.: гісторыя і тапаграфія”, багатая матэрыяльная культура горада XVI – XVIII стст. вартая асобнага даследавання.

У справе вывучэння гарадской матэрыяльнай культуры насельніцтва ВКЛ XVI – XVIII стст. зроблена шмат. Грунтоўныя работы І.У. Ганецкай, Ю.А. Заяца, Н.І. Здановіч, Л.У. Калядзінскага, А.К. Краўцэвіча, В.М. Ляўко, І.А. Марзалюка, А.А. Мяцельскага, Г.М. Сагановіча, С.В. Тарасава, А.А. Трусава, Г.В. Штыхава і іншых беларускіх археологаў дазволілі вызначыць галіны, генезіс і этапы развіцця асноўных рамесных і гандлёвых цэнтраў ранняга Новага часу. Вялікае значэнне ў распрацоўцы акрэсленай праблематыкі мае сінтэзная калектыўная праца “Археалогія Беларусі”. У 4 т. Т. 4. Помнікі XIV – XVIII стст. (2000), якая фактычна з’яўляецца падсумаваннем асноўных вынікаў і стану вывучэння археалагічных помнікаў акрэсленага перыяду на тэрыторыі Беларусі.

Зробленыя даследаванні пацвердзілі значнасць артэфактаў XVI – XVIII стст. як важнай гістарычнай крыніцы. Аналіз рэчавага матэрыялу, праведзены на фоне гістарычнага развіцця розных гарадоў ВКЛ, паказаў іх сацыяльна-эканамічную і культурную еднасць.

Археалагічнае (у навуковым сэнсе) вывучэнне Полацка пачалося ў 1928 годзе А.Н. Ляўданскім, аднак матэрыяльная культура ранняга Новага часу як аб’ект доследу стала брацца пад увагу не раней канца 1950-х гадоў, калі пачаліся буйнамаштабныя археалагічныя раскопкі ў горадзе. У 1957 годзе на Верхнім замку былі праведзены раскопкі М.К. Каргера; у 1958 – 1960 гадах – А.Р. Мітрафанава; 1961 – 1962 – В.Р. Тарасенкі. Гэтыя раскопкі ставілі розныя мэты, аднак традыцыйна матэрыялы па-за “старажытнарускага” перыяду лічыліся менш істотнымі, і нават другаснымі. Такі падыход меў шмат хібаў, напрыклад, ранжыраванне артэфактаў па ступені “аддалення” ад дыяпазону бытавання IX – XIII стст. на менш важныя. Гэта

прывяло да таго, што археалагічныя знаходкі па перыяду ад эпохі Рэнесанса (XVI ст.) да Новага часу (XIX ст.) працяглы час асобна не вывучаліся, асабліва гэта тычылася “нізавой” гарадской культуры. Між тым матэрыялы менавіта XVI – XVIII стст. складаюць пераважную большасць археалагічных знаходак у культурным пласце г. Полацка, але яны належным чынам не апрацоўваліся. Напрыклад, напластаванні XVI – XVIII стст. Вялікага пасада, які ўтрымлівае асноўную колькасць матэрыялаў позняга Сярэднявечча і ранняга Новага часу, пачалі археалагічна даследавацца толькі з 1987 года (раскопкі С.В. Тарасава).

З усіх катэгорый археалагіных знаходак XVI – XVIII стст. найбольш даследаваным можна лічыць полацкае кафлярства. Полацкая кафля вывучалася Л.Г. Панічавай на падставе раскопак П.А. Рапапорта (Паничева, 1980 б, 1981) і Н.І. Здановіч па матэрыялах уласных раскопак (Здановіч, Сінчук, 1993; Здановіч, 1997, 2001). У выніку была паказана адметнасць полацкай кафлі, яе тыпалагічная і жанравая разнастайнасць. Тым не менш полацкае кафлярства было даследавана не дастаткова поўна, бо не былі сістэматызаваны даныя па развіццю ўсіх вядомых на той час арнаментальных і канструкцыйных груп полацкай кафлі.

Такім чынам, класіфікацыя ўсіх груп артэфактаў XVI – XVIII стст., назапашаных у выніку археалагічнага вывучэння Полацка, на сённяшні дзень стала актуальнай задачай. Паўстала неабходнасць комплекснага вывучэння матэрыяльнай культуры насельніцтва Полацка XVI – XVIII стст., паколькі сінтэзнае даследаванне па гісторыі матэрыяльнай культуры, арганізацыі жыццёвай прасторы насельніцтва Полацка XVI – XVIII стст. у беларускай гістарыяграфіі адсутнічае. Заўважым таксама, што шмат якія пытанні ў вывучэнні асобных горадаўтвараючых тапаграфічных структур Полацка гэтага часу закраналіся мімаходзь, найперш гэта тычыцца Задзвінскіх пасадаў горада, дзе археалагічныя раскопкі не праводзіліся. Натуральна, гэта з’яўляецца прыярытэтнай задачай найноўшай палявой археалогіі Полацка.

Для раскрыцця прадмета даследавання безумоўна важкім з’яўляецца вызначэнне паняцця “матэрыяльная культура”. Пад матэрыяльнай культурай у шырокім сэнсе неабходна разумець усе рэчавыя аб’екты (артэфакты), створаныя людзьмі ў працэсе жыццядзейнасці. Матэрыяльная культура паводле метадалогіі археалагічнага даследавання складаецца з нерухомых і рухомых артэфактаў, з якіх асобна вылучаюцца рухомыя рэчы як часткі архітэктурных аб’ектаў (Kowalski, 1993. S. 42 – 46). Апошнія дзве катэгорыі абраны ў якасці прадмета вывучэння. Архітэктурныя аб’екты (трэцяя група) разглядаюцца ў кантэксце развіцця побытавай рэчавай культуры палачан.

Жыццёвая прастора насельніцтва горада – гэта ступень арганізацыі і падначалення чалавекам навакольнай прасторы ў дакладна вызначаных

межах, існаванне штучнага асяроддзя, прыстасаванага для жыцця, стварэнне разгалінаванай інфраструктуры для задавальнення штодзённых фізічных і духоўных патрэб індывідаў і сацыяльных супольнасцей у залежнасці ад ступені развіцця грамадства. Жыццёвая прастора насельніцтва горада ўключае ў сябе такія кампаненты, як тапаграфічная структура, штучна створанае асяроддзе (аб'екты нерухомасці), рухомыя аб'екты, якія прыстасаваны для штодзённага жыцця і з'яўляюцца яго арганічнай часткай.

Асновай для вывучэння матэрыяльнай культуры насельніцтва Полацка сталі назапашаныя ў выніку шматгадовых археалагічных даследаванняў артэфакты (рэчавыя крыніцы), што захоўваюцца ў фондах Нацыянальнага Полацкага гісторыка-культурнага музея-запаведніка (далей – НПГКМЗ), Нацыянальнага музея гісторыі і культуры Беларусі (далей – НМГКБ), у Інстытуце гісторыі Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі (далей – ІГ НАНБ). Пераважная большасць апрацаваных рэчавых крыніц з музейных збораў, а таксама з раскопак Вал.А. Булкіна, А.Р. Мітрафанава, П.А. Русава, Г.М. Сагановіча, С.В. Тарасава і аўтара ўпершыню ўведзена ў навуковае абарачэнне. На аснове шматлікага археалагічнага матэрыялу, у сукупнасці з данымі пісьмовых крыніц прадстаўлена цэльная карціна развіцця матэрыяльнай культуры насельніцтва Полацка XVI – XVIII стст.

Трэба адзначыць, што накірунак комплекснага вывучэння жыццёвай прасторы гарадскога насельніцтва Беларусі ў XVI – XVIII стст. яшчэ не дастаткова распрацаваны ў айчыннай гістарыяграфіі. Выключэннем з'яўляецца навуковая манаграфія І.А. Марзалюка, прысвечаная гісторыі Магілёва XII – XVIII стст. (Марзалюк, 1998). У гэтай рабоце гісторыя матэрыяльнай культуры насельніцтва Магілёва, збольшага менавіта па перыяду XVI – XVIII стст., раскрыта ў кантэксце штодзённага гарадскога жыцця.

Сапраўдная работа не прэтэндуе на вычарпальнасць у вывучэнні ўсіх ступеняў арганізацыі жыццёвай прасторы насельніцтва Полацка – гэта папросту немагчыма ў межах адной манаграфіі і пры сучаснай колькасці апрацаваных археолагамі і гісторыкамі першакрыніц, але, спадзяемся, прадстаўлены *нарыс* акрэсліць асноўныя варункі яе развіцця ў XVI – XVIII стст.

Вывучэнне матэрыяльнай культры прынясе карысць усім, хто зацікаўлены ў захаванні лепшых здабыткаў і традыцый шматлікіх пакаленняў нашых славутых продкаў. Выказваем спадзяванне, што багатая матэрыяльная культура Полацка XVI – XVIII стст. стане арганічнай часткай сучаснага культурнага аблічча горада і будзе спрыяць яго далейшаму росквіту.

1. ГІСТАРЫЯГРАФІЯ І КРЫНІЦЫ

1.1. Гістарыяграфія

Вывучэнне археалагічных помнікаў Беларусі XVI – XVIII стст. займае значнае месца ў айчыннай гістарыяграфіі 1980 – 2000-х гадоў. Паслядоўнае вывучэнне артэфактаў XVI – XVIII стст. было распачата з самага прадстаўнічага віду архітэктурна-дэкаратыўнай керамікі – кафлярства, росквіт якога прыходзіцца на пазначаны перыяд.

У другой палове 1970-х гадоў найбольшы ўнёсак у справу вывучэння беларускай кафлі зрабіла Л.Г. Панічава, вынікам яе працы стала абарона кандыдацкай дысертацыі ў 1980 годзе “Белорусские изразцы XIV – XVII вв. как исторический источник” (Паничева, 1980 а). Вялікую ўвагу даследчыца прысвяціла вывучэнню полацкай кафлі, якая вылучаецца багаццем форм і жанравай разнастайнасцю. Атрыманыя дэндрахраналагічныя даты з комплекса полацкага княжацкага церама пазначылі самы ранні час з’яўлення кафляных печаў на тэрыторыі Беларусі (1304).

У 80 – 90-я гады XX ст. беларускімі археолагамі Ю.А. Заяцам, В.М. Ляўко, А.А. Трусавым, У.В. Угрыновічам створаны агульныя і рэгіянальныя тыпалогіі гэтага віду архітэктурна-дэкаратыўнай керамікі (Археалогія Беларусі, 2000; Беларуская кафля, 1989; Заяц, 1990; Левко, 1981; Паничева, 1980 а; Трусов, 1988; Угрыновіч, 1988).

Сярод прац, прысвечаных вывучэнню керамічнага посуду, вылучаюцца абагульняючыя даследаванні І.У. Ганецкай, Ю.А. Заяца, Н.І. Здановіч, В.М. Ляўко, В.Е. Собаля, А.А. Трусава (Ганецкая, 1995; Заяц, 1995; Здановіч, Трусаў, 1993; Левко, 1992; Соболь, 1988).

Агульная тыпалогія вырабаў XIV – XVIII стст. з чорных металаў прапанавана М.Ф. Гурыным, Ю.М. Боханам, Г.М. Сагановічам (Бохан, 2002; Гурын, 1981; Саганович, 1988). У справе вывучэння іншых масавых катэгорый, такіх як скураны абутак, шкляныя вырабы і посуд, будаўнічыя матэрыялы (цэгла, дахоўка, пліткі падлогі), вылучаюцца напрацоўкі В.М. Ляўко, С.В. Тарасава, А.А. Трусава, М.М. Яніцкай (Левко, 1984; Тарасов, 1989; Трусаў, 1985; Трусов, 1991; Яніцкая, 1977, 1980).

Вынікі даследавання беларускіх археолагаў сталі базай для вывучэння матэрыяльнай культуры насельніцтва Полацка XVI – XVIII стст. За аснову тыпалогіі і падзелу на мастацка-дэкаратыўныя стылі аздаблення полацкай кафлі прынята схема, распрацаваная А.А. Трусавым і У.В. Угрыновічам, якая прадстаўлена ў альбоме “Беларуская кафля” (Беларуская кафля, 1989). Расшыфроўка выяў полацкай гербавай кафлі стала магчымай, дзякуючы методыцы аналізу заслаўскай калекцыі, распрацаванай Ю.А. Заяцам (Заяц, 1990).

Пры вывучэнні полацкага керамічнага посуду, побытавых металічных рэчаў, вырабаў са шкла, скуры, каменю і косці, абрана традыцыйная ў беларускай гістарыяграфіі схема тыпалагізацыі адпаведных вырабаў па функцыянальнаму прызначэнню.

Пры напісанні манаграфіі выкарыстаны корпус сінтэзных работ расійскай, літоўскай, польскай і ўкраінскай гістарыяграфіі, што падаецца цалкам натуральным: ВКЛ у XVI – XVIII стст. уваходзіла ў склад Рэчы Паспалітай (напрыканцы разглядаемага перыяду – Расійскай Імперыі), і мела разгалінаваныя рамесныя стасункі з суседнімі краінамі. Гэтыя сувязі не ў малой ступені абумовілі спецыфіку і своеасаблівасць развіцця матэрыяльнай культуры насельніцтва гарадоў Беларусі.

З пачаткам сталага археалагічнага вывучэння багатая матэрыяльная культура Полацка прыцягвае ўвагу даследчыкаў. Шмат работ, у тым ліку манаграфічных, было прысвечана найстаражытнейшаму перыяду – часу існавання Полацкага княства. Адносна добра вывучана развіццё полацкага манументальнага дойлідства і гарадской тапаграфіі (Вал. А. Булкін, П.А. Рапапорт, С.В. Тарасаў, А.А. Трусаў, Г.В. Штыхаў). Побытавая матэрыяльная культура як аб’ект даследавання разглядалася ў манаграфіі Г.В. Штыхава “Древний Полоцк” (1975). У гэтай працы скарыстаны археалагічныя матэрыялы IX – XIII стст. і часткова XIV – XVI стст. (Штыхов, 1975). Г.В. Штыхаў паспяхова прымяніў метад стратыграфічнага датавання артэфактаў ранняга Новага часу і распрацаваў тыпалогію полацкага керамічнага посуду IX – XVI стст., аднак асноўную ўвагу даследчык прысвяціў IX – XIII стст. у межах даследуемага перыяду.

Па выніках раскопак П.А. Рапапорта княжацкага церама на Верхнім замку ў 1975 – 1976 гг. Л.Г. Панічавай былі апублікаваны два артыкулы (Паничева, 1980 б, 1981). Асобныя высновы даследчыцы па храналогіі і тыпалогіі беларускай кафлі сёння сталі ўжо хрэстаматыйнымі, таму прааналізаваныя ў абодвух артыкулах матэрыялы можна лічыць першай сістэматызацыяй даных аб полацкім кафлярстве. Важкім вынікам працы Л.Г. Панічавай з’яўляецца вызначэнне сувязі стылістычных матываў полацкай гатычнай і рэнесанснай кафлі XV – XVI стст. з дэкаратыўным мастацтвам заходнееўрапейскага і цэнтральнаеўрапейскага рэгіёнаў. Разам з тым у асобных высновах даследчыца перабольшвала ступень пераймання і засваення традыцый заходнееўрапейскага кафлярства, што часам прыводзіла да памылковых рэканструкцый.

С.В. Тарасаў з дапамогай стратыграфічнага метада вызначыў адноснае датаванне шэрагу рарытэтаў XVII ст. па матэрыялах буйнамаштабных раскопак 1987 – 1988 гадоў на Вялікім пасадзе (Тарасаў, 1988, 1998). У артыкуле “Технология и инструменты кожевенно-сапожного ремесла

Полоцка и Минска (XI – XVIII вв.)” даследчык вызначыў ступень развіцця гарбарнай вытворчасці Полацка і Мінска XI – XVIII стст., што стала асновай для далейшага вывучэння гэтай галіны рамяства (Тарасов, 1989). У манаграфіі С.В. Тарасава “Полацк IX – XVII ст.: Гісторыя і тапаграфія” прадстаўлены асобныя катэгорыі артэфактаў XVI – XVII стст. як ілюстратыўны матэрыял для характарыстыкі стратыграфіі культурных напластаванняў гістарычных частак горада (Тарасаў, 1998).

Асноўную ўвагу даследчык прысвяціў тапаграфічнаму развіццю Полацка ў шырокім храналагічным кантэксце. Пры гэтым варта падкрэсліць, што комплекснае даследаванне тапаграфіі Полацка С.В. Тарасавым было распрацавана ўпершыню, асабліва што тычыцца перыяду XIV – XVII стст. С.В. Тарасавым быў пераканаўча даведзены факт змены русла Палаты ў 1563 годзе, вызначаны асноўныя этапы тапаграфічнага развіцця Полацка, яго дэмаграфічная структура (Тарасаў, 1992, 1998). Сістэматызаваны, хаця і не зусім поўна, звесткі пра тапаграфічныя аб’екты Полацка (назвы вуліц, размяшчэнне будынкаў грамадскага прызначэння, вытворчых збудаванняў, цэркваў і інш.). Выказана меркаванне аб размяшчэнні гарадской ратушы, бернардзінскага кляштара, шэрагу цэркваў і грамадзянскіх пабудоў. Дасканала вывучаны пытанні развіцця гарадской фартыфікацыі (парадак размяшчэння абарончых вежаў XVI – XVII стст. Верхняга і Ніжняга замкаў, Вялікага пасада, а таксама прыведзены сведчанні археалагічных і пісьмовых крыніц пра наяўнасць умацаванняў Запалоцкага пасада). За аснову гістарычнага аналізу былі ўзяты ў першую чаргу даныя археалагічных крыніц, аднак іх адсутнасць па шэрагу пытанняў, напрыклад, развіцця левабярэжных пасадаў Полацка, прывяла да не зусім трывалых меркаванняў (Варонін, 2000 а).

Нарыс тапаграфіі Полацка 1563 года на падставе аналізу тэкста летапісу аб полацкім паходзе Івана IV прапанаваў у сваім апошнім даследаванні Л.В. Аляксееў (Алексеев, 2006. Ч. 1). Нарыс у цэлым карэлюецца з аналагічнымі напрацоўкамі С.В. Тарасава, аднак сцвярджэнне аб змене русла Палаты ў 1563 годзе, на думку Л.В. Аляксеева, патрабуе больш трывалых доказаў (Алексеев, 2006. Ч. 1. С. 108).

У аглядным артыкуле вядомага польскага даследчыка А.Ю. Бараноўскага, прысвечаным урбаністыцы Полацка XVI – XVIII стст., прапануецца аналіз развіцця манументальнай культавай забудовы горада і планіровачнай структуры яго цэнтральнай часткі (Baranowski, 1994). Аналагічныя пытанні больш дэталёва закранаюцца ў працы беларускага даследчыка Ю.У. Чантурыі (Чантурия, 2005). Абедзве работы маюць вялікае значэнне для рэканструкцыі асаблівасцей развіцця жыццёвай прасторы насельніцтва Полацка, аблічча горада эпохі ранняга Новага часу.

Вялікае значэнне ў вывучэнні гісторыі Полацка XVI ст., у першую чаргу сацыяльна-эканамічных працэсаў, мае дысертацыйнае даследаванне і шэраг артыкулаў В.А. Вароніна, у якіх закранаюцца ў тым ліку і пытанні забудовы і тапаграфіі Полацка; гісторыкам апублікаваны тэстамент полацкага лаўніка Д. Панкова, які ўтрымлівае каштоўную інфармацыю аб рухомай і нерухомай маёмасці заможнага палачаніна (Варонін, 2000 а, 2000 б, 2003).

Звесткі аб аб'ектах гарадской тапаграфіі (назвы вуліц, размяшчэнне асобных сядзіб, цэркваў, агародаў і інш.) па матэрыялах актавых кніг полацкага магістрата сярэдзіны XVII ст. прыводзяцца ў артыкуле М.Ю. Гардзеева і каментарыях да падрыхтаванага ім выдання актавай кнігі полацкага магістрата 1650 года. Пры гэтым гісторык адмыслова падкрэсліваў важнае значэнне звестак пісьмовых крыніц у справе археалагічнага вывучэння Полацка (Гардзееў, 2004, Актавая кніга полацкага магістрата 1650 года, 2006).

Артыкул, прысвечаны гісторыі Полацка 30-х гадоў XVII ст., прапанаваў А. Доўнар. Аўтар разглядае пытанні, звязаныя з рэгламентацыяй гандлю, упарадкаваннем гарадскога рынка і арганізацыяй яго работы (Доўнар, 2005). У прыватнасці, прыводзяцца звесткі пра парадак размяшчэння крам і месцапалажэнне гарадской ратушы адносна рынка.

У той ці іншай ступені пытанні гарадской тапаграфіі, катэгорый рухомай і нерухомай маёмасці палачан паводле даных пісьмовых крыніц разглядаліся ў работах беларускіх гісторыкаў: З.Ю. Капыскага (Капыскі, 1989; Полоцк: Ист. очерк, 1987), Л.А. Малчанавай (Молчанова, 1981), М.М. Улашчыка (Улащик, 1986), Ю.А. Якімовіча (Якимович, 1991), М.М. Яніцкай (Яніцкая, 1977, 1980) і інш.

Значную ўвагу тыпалогіі і храналогіі артэфактаў ранняга Новага часу ў сваіх працах прысвяціла Н.І. Здановіч (Здановіч, 1992, 1993, 1997, 1998, 2001). Даследчыца прапанавала тыпалогію полацкай кафлі XVII ст. і вылучыла асобныя катэгорыі полацкага посуду. У якасці эталоннага можна разглядаць даследаванне закрытага комплексу пабудовы палачаніна канца XVI ст. (Здановіч, 1998). Тыпалагічны і статыстычны метады пры апісанні і аналізу асобных катэгорый рэчавага матэрыялу былі закладзены ў аснову рэканструкцый умоў жыцця і побыту палачан.

На падставе археалагічнага даследавання Друі В.Я. Зайцавай зроблены параўнаўчы аналіз матэрыялаў полацкай і друйскай кафлі (Зайцава, 1990). Падаецца абгрунтаваная выснова аб перасяленні ў Друю сям'і полацкіх рамеснікаў у 40 – 50-я гады XVII ст., што дазваляе разглядаць Полацк як моцны рэгіянальны цэнтр, які паўплываў на развіццё Падзвінскага рэгіёну. Дадзеная работа акрэслівае праблему археалагічнага вывучэння малых гарадоў і мястэчак Беларускага Падзвіння на прадмет распаўсюджвання і засваення культурна-стылістычных навацый. Гэты накірунак з'яўляецца

вельмі перспектыўным для вывучэння. Удакладненне ролі Полацка ў сацыяльна-эканамічным развіцці Беларускага Падзвіння ў эпоху Сярэднявечча і ранняга Новага часу немагчыма без пашырэння археалагічных крыніц за кошт вывучэння ў першую чаргу мястэчак, што на сённяшні дзень праводзіцца недастаткова поўна.

У сумеснай працы В.Я. Зайцавай з І.І. Сінчуком была прапанавана дэталёвая рэканструкцыя вусця дзісненскай печы XVII ст., падчас якой скарыстаны матэрыялы з раскопак Н.І. Здановіч у Полацку (Синчук, Зайцева, 1997). Дзісненская печ з'яўляецца тыповай для сінхронных помнікаў іншых беларускіх земляў, у прыватнасці Полацка, што пашырае навуковую вартасць праведзенай рэканструкцыі.

Артыкул краязнаўцы А.А. Салаўёва прысвечаны вывучэнню полацкай цацкі XVII – XVIII стст. на падставе пад'ёмнага матэрыялу з асабістай калекцыі (Салаўёў, 2002). У працы бракуе сувязяў з археалагічнымі знаходкамі з раскопак у Полацку. Тым не менш як спроба ўвядзення ў навуковае абарачэнне пад'ёмнага матэрыялу згаданы артыкул варты ўвагі. Прадстаўляюць цікавасць і вынікі даследавання А.А. Салаўёвым дома № 15 па вул. Талстога, зробленыя падчас яго рамонта, у выніку якіх былі выяўлены рэшткі драўлянай забудовы XVIII – XIX стст. і шэраг рухомых артэфактаў (Соловьев, 2004).

У апошнія гады першаснай апрацоўкай, сістэматызацыяй і захаваннем археалагічных калекцый НПГКМЗ займаецца старшая навуковая супрацоўніца музея-запаведніка Н.Г. Лугіна. Вынікам яе працы стала каталагізацыя полацкай кафлі з раскопак Вал. А. Булкіна, Н.І. Здановіч, П.А. Рапапорта, П.А. Русава, С.В. Тарасава. Усяго каталагізавана 1393 экспанаты асноўнага і навукова-дапаможнага фонду (Лугіна, 1997, 1998, 1999, 2000, 2001, 2002).

Пазначаныя працы ў цэлым характарызуе адсутнасць комплекснага падыходу да вывучэння побытавай матэрыяльнай культуры насельніцтва Полацка XVI – XVIII стст. Асноўная ўвага археолагаў была прысвечана даследаванню асобных галін рамеснай вытворчасці ці асобных груп артэфактаў. Гэта ж тычыцца прац беларускіх гісторыкаў, якія ў той ці іншай ступені закраналі пытанні развіцця матэрыяльнай культуры палачан паводле даных пісьмовых і выяўленчых крыніц (В.А. Варонін, М.Ю. Гардзееў, Л.С. Іванова, Ю.А. Якімовіч і інш.). У выніку ў гістарыяграфіі адсутнічала сінтэзная карціна развіцця жыццёвай прасторы і матэрыяльнай культуры палачан у эпоху ранняга Новага часу. Папярэднія даследаванні паказалі унікальнасць і важкасць артэфактаў XVI – XVIII стст., што выклікала неабходнасць працягнення іх вывучэння і сістэматызацыі.

1.2. Агляд крыніц

Сапраўднае даследаванне пабудавана на комплексным вывучэнні наяўных археалагічных калекцый XVI – XVIII стст. Скарыстаныя археалагічныя крыніцы можна падзяліць на дзве групы. Першая група – гэта справаздачы па выніках археалагічнага вывучэння Полацка. Да другой, асноўнай групы, належаць артэфакты з музейных калекцый і прыватных збораў. Вывучэнне археалагічных калекцый дазваляе вызначыць варункі і ўзроўні развіцця рамёстваў, побытавыя ўмовы жыцця розных сацыяльных груп, а эстэтычныя асаблівасці артэфактаў – стылістычную прыналежнасць рэчаў.

Першыя звесткі аб артэфактах XVI – XVIII стст., знойдзеных падчас археалагічнага вывучэння Полацка, прадстаўлены ў справаздачы А.Р. Мітрафанава аб раскопках на Верхнім замку г. Полацка за 1959 год (калекцыя рэчаў з гэтага раскопу захоўваецца ў фондах НМГКБ) (Митрофанов, спр. 203). Нягледзячы на адсутнасць пісьмовага апісання матэрыялаў, да справаздачы прыкладзены фотаздымкі артэфактаў XVI – XVIII стст. (Митрофанов, спр. 376). Матэрыялы з раскопак А.Р. Мітрафанава ў 1959 годзе часткова былі ўключаны ў артыкул маскоўскага даследчыка Р.Л. Разенфельдта “Белорусские изразцы” (Розенфельдт, 1969), які, верагодна, карыстаўся таксама і матэрыяламі з раскопак М.К. Каргера (1957). Апісанне культурнага пласта XVI – XVIII стст. у цэнтральнай частцы Верхняга замка разам з комплексам спадарожных знаходак прадстаўлена ў справаздачы Г.В. Штыхава (1967) (Штыхов, спр. 349).

З 1967 года амаль на два дзесяцігоддзя навуковая фіксацыя артэфактаў XVI – XVIII стст. фактычна спыняецца. Адзіная заўвага тычыцца двух справаздач П.А. Рапапорта па выніках архітэктурна-археалагічных раскопак у Полацку ў 1975 – 1976 гадах (Раппопорт, спр. 511, 527) і справаздачы Вал. А. Булкіна за 1978 год (Булкин, спр. 594), дзе прыводзяцца даныя аб брусковай цэгле XVIII ст. і комплексе знаходак XIV – XV стст. з княжацкага церама.

Далейшае навуковае апісанне артэфактаў XVI – XVIII стст. адзначана ў справаздачах па выніках раскопак канца 80 – 90-х гадоў XX ст. С.В. Тарасава (Тарасов, спр. 953, 1014, 1084; Тарасаў, спр. 1496), Н.І. Здановіч (Здановіч, спр. 1148 б, 1213 а, в, 1373, 1374, 1376, 1447, 1450), П.А. Русава (Русаў, спр. 103, 1692), Г.М. Сагановіча (Сагановіч, спр. 975). Справаздачы ўтрымліваюць неабходныя звесткі па стратыграфіі даследуемых помнікаў, а таксама апісанне і статыстычны ўлік усіх знаходак.

Вынікі петраграфічнага аналізу групы полацкай керамікі прадстаўлены ў справаздачах Н.І. Здановіч (Здановіч, спр. 1213 в. С. 31 – 40; 1376. С. 25 – 35). Для валавага хімічнага даследавання быў абраны 41 фрагмент

керамічных вырабаў XII – XVIII стст., з якіх 33 датаваны XVI – XVIII стст. (Здановіч, спр. 1213 в. С. 31 – 40; спр. 1376. С. 25 – 35). У выніку было вызначана мясцовае (полацкае) паходжанне серый артэфактаў XVII ст. (кафля, керамічны посуд, пячная рошчына) і прыведзены даныя па характарыстыцы полацкага ганчарнага рамяства.

Інфарматыўнай археалагічнай крыніцай, якую неабходна разглядаць у комплексе з археалагічнымі знаходкамі, з'яўляецца культурны пласт Полацка XVI – XVIII стст. Значная плошча палявых даследаванняў помнікаў XVI – XVIII стст. (каля 5000 кв. м), дазваляе вылучыць асноўныя групы артэфактаў і зрабіць характарыстыку культурных напластаванняў. Культурны пласт XVI – XVIII стст. вельмі розніцца па структуры, складу, магутнасці і ступені захаванасці ў розных гістарычных частках горада (табл. 1).

Геаграфія распаўсюджвання культурнага пласта XVI – XVIII стст. не аднародная. Выразна напластаванні XVI – XVIII стст. вылучаюцца на тэрыторыі Вялікага пасада і лакальна – у Запалоцці, Верхнім і Ніжнім замках. Тут іх магутнасць у сярэднім роўная 1 – 1,5 м, месцамі (у мацерыковых ямах) – 3 м. Пласт XVI – XVIII стст. даволі рыхлы, пераважна цёмна-шэрага колеру, радзей светла-шэры. Мае шматлікія прапласткі і ўкрапленні, аналагічныя пласту XI – XIII стст. (Тарасаў, 1998. С. 31). Пласт XVI – XVIII стст. насычаны арганікай (драўлянымі трэскамі, косткамі хатніх жывёл і гноем). Вельмі розніцца яго структура – ад вільготнага, камкаватага, шчыльна ўтрамбаванага, да зярністага і сухога.

Спробы вылучыць выразны культурны пласт XVI – XVIII стст. у асобных гістарычных частках горада былі безвыніковыя. Напрыклад, тэрыторыя Ніжняга замка ў пазначаны перыяд так і не ўвайшла ў зону засялення найбольш уплывовай і заможнай часткі насельніцтва. Артэфакты ранняга Новага часу, даволі абмежаваныя па асартыменту, на Ніжнім замку прысутнічаюць у перамешаных і значна пашкоджаных напластаваннях XVI – XIX стст. (гл. табл. 1). Тая ж карціна назіраецца на старажытным полацкім гарадзішчы (у XVI – XVIII стст. – тэрыторыя гарадскіх могілак). Найменш даследаванымі з'яўляюцца Востраўскі і Задзвінскія пасады Полацка, раён Спаскага манастыра. Праведзеныя С.В. Тарасавым шурфоўкі помнікаў, у прыватнасці Вострава, паказалі, што культурны пласт познефеадальнай пары і ранняга Новага часу на ім знівеліраваны ці пашкоджаны, і яго вылучэнне не прадстаўляецца магчымым.

Пласт XVI ст. у многіх раскопах вылучаны ў асобны стратыграфічны гарызонт (пераважна ў цэнтральнай частцы Вялікага пасада і на тэрыторыі Бельчыцкага Барысаглебскага манастыра). Гэты пласт чырвонага адцення, з прапласткамі гліны, цаглянага друза і вугалю. Яго магутнасць у сярэднім роўная 0,2 – 0,4 м.

Табліца 1 – Стратыграфія культурных напластаванняў XVI – XVIII стст.
(па выніках археалагічных раскопак і назіранняў за будаўнічымі работамі ў г. Полацку)

Помнік	Кіраўнік раскопа, год і нумар раскопа	Плошча даследавання (кв. м)	Магутнасць культурнага пласта XVI – XVIII стст. (м)	Магутнасць культурнага пласта (м)	Характарыстыка пласта XVI–XVIII стст.
1	2	3	4	5	6
Верхні замак, вул. Замкавая	1959 – 1962, 1967 гг., р-2-4 В.Р. Тарасенка, А.Р. Мітрафанаў, Г.В. Штыхаў	160 (р-2), 160 (р-3), 162 (р-4)	Каля 1,0	4,0	Цёмна-шэрага колеру, з больш светлымі прапласткамі і лінзамі вапны (пласт XVIII ст.), цёмна-шэры, з прапласткамі насычанага чорнага колеру (пласт XVI –XVII стст.), моцна пашкоджаны
Вялікі пасад, дворык Богаяўленскай царквы	Г.М. Сагановіч, 1986, ш-1-10	39,5	0,8 – 1,2	2–2,5	Чорная вільготная зямля з вапнавымі прапласткамі і чырвонай глінай
Запалоцкі пасад, вул. Краснова, Шэнягіна	С.В. Тарасаў, 1986 г., р-1-2	60 (р–1), 170 (р-2)	Не вызначана	0,8 (р-1), 0,7 – 1,7 (р-2)	Моцна перамешаны, светла-шэры супесак з матэрыяламі XI – XVIII стст.
Вялікі пасад, плошча Свабоды	С.В. Тарасаў, 1987 – 1988 г., р-1	1040	1 – 1,5	3,0	Інтэнсіўнага чорнага колеру, са шлакамі, слядамі агня і пажарышчаў (пласт XIV – XVI стст.), шэравата-чорны пласт, з крапінамі гліны і драўлянай парахні (XVII – XVIII стст.)
Вялікі пасад, дворык гасцініцы “Славянская”, пр. К. Маркса, 13	С.В. Тарасаў, 1987 г., назіранне за прамысловымі работамі	100	0,25 – 1,2	2,5 – 2,8	Шэраватага адцення, з драўлянымі трэскамі і гноем

Працяг табліцы 1

1	2	3	4	5	6
Вялікі пасад, плошча Ф. Скарыны	С.В. Тарасаў, 1987 г., назіранне за будаўніцтвам фантана	100	1,4 – 1,5	1,4 – 1,5	Шэры, з драўлянымі трэскамі і гноем
Вялікі пасад, дворык дома № 4 па вул. Сака і Ванцэці	С.В. Тарасаў, 1987 г., ш-1	8	1,3	3,5	Цёмна-шэры, з драўлянымі трэскамі, і невялікімі прапласткамі гліны
Вялікі пасад, вул. Замкавая	С.В. Тарасаў, 1987 г., ш-1	4	2,2	3,8	Светла-шэры, з цагляным друзам (пласт XVII – XVIII стст. магутнасцю да 1,6 м), чорная зямля з вугалем і чырвонай глінай (пласт XV – XVI стст.)
Ніжні замак (стадыён Спартак)	С.В. Тарасаў, 1988 г., р-1	400	0,6	1,0	Моцна пашкоджаны, аднастайнага чорнага колеру, тлусты, з лінзамі пяску і пясчанымі прапласткамі
Вялікі пасад, пляцоўка ў дворыку гарадской друкарні, вул. Гагарына, 8	С.В. Тарасаў, 1991 г., ш-1-2	4	1,4 – 1,6	2,2	Вільготны, інтэнсіўна чорнага колеру з кавалкамі цэглы, трэскамі і гноем
Вялікі пасад, пляцоўка каля ваданапорнай вежы, вул. Ф. Скарыны, 21	С.В. Тарасаў, 1991 – 1992 гг., ш-1, р-1	4 (ш-1), 80 (р-1)	0,2 – 0,6	1,0 – 1,2	Вільготны, насычанага чорнага колеру, са знаходкамі пераважна ў дыяпазоне XVIII – XIX стст.
Вялікі пасад, вул. Стралецкая, 14 – 15	С.В. Тарасаў, 1993 г., ш-1-3	6	Не вылучаны	0,9 – 1,0 – 1,7	Аднародны, баластны чорны пласт з матэрыяламі X – XVIII стст.

Працяг табліцы 1

1	2	3	4	5	6
Верхні замак, тэрыторыя, прылеглая да Сафійскага сабора	С.В. Тарасаў, 1993 г., раскоп	360	Не вылучаны	1,9 – 2,8 – 3,0	Шэры пласт, насычаны цэглай і будаўнічым друзам, з матэрыяламі X – XVIII стст.
Вялікі пасад, вул. Еўфрасінні Полацкай, 1 – 3	Н.І. Здановіч, 1989 г., раскоп	52	0,3 – 1,4	1,85	Чорная вільготная зямля з рэшткамі арганікі і камянямі
Вялікі пасад, вул. К. Маркса, 1	Н.І. Здановіч, 1990 г., раскоп	550	0,9 – 1,7	Больш 2,4	Цагляны друз у перамешку з глінай (на месцы будынкаў XIX ст.), цёмна-шэры, насычаны вільгаццю пласт з рэшткамі арганікі (драўляныя трэскі, косткі жывёл). Месцамі светла-шэры, з прапласткамі гліны
Вялікі пасад, вул. Леніна, 25а	Н.І. Здановіч, 1990 г., ш-1-6	50	0,8 – 1,6	3,6 – 4,2	Цёмна-шэры, з рэшткамі арганікі (косткі, кавалкі бяросты) і цагляным друзам
Вялікі пасад, вул. Леніна, 35	Н.І. Здановіч, 1991 – 1992 гг., р-1, р-2	84 (р-1), 36 (р-2)	1,2 – 1,5	1,8	Цёмна-шэры, моцна перамешаны
Вялікі пасад, “Эканамічны дом” былога Богаяўленскага манастыра	Н.І. Здановіч, 1990 – 1991 гг.	420	1,8 – 2,2	2,2 – 3,0	Цёмна-шэры, з косткамі жывёл, кавалкамі цэглы і вапнай

Працяг табліцы 1

1	2	3	4	5	6
Вялікі пасад, вул. Еўфрасінні Полацкай, 1	Н.І. Здановіч, 1991 г., ш-1-5	Каля 30	1,4 – 1,6	1,8 – 3,0	Цёмна-шэры, моцна пашкоджаны, з цагляным друзам, утрымлівае шмат арганікі, у тым ліку костак хатняй жывёлы (пласт XVII – XVIII стст.). Цёмна-шэры, з рэдкімі крапінамі цэглы, вільготны (пласт XVI ст.)
Вялікі пасад, вул. Еўфрасінні Полацкай, 7	Н.І. Здановіч, 1991 г., ш-1-5	16	1,6	1,8	Вільготны, моцна пашкоджаны цёмна-шэры баластны пласт XVIII – XIX стст.
Верхні замак, прылеглая да Сафійскага сабора	М.В. Клімаў, 1995 г., раскоп	196	1 – 1,3	1,8	Шэры, цёмна-шэры, неаднароднай структуры, з прапласткамі вугалю, моцна пашкоджаны перакопамі
Вялікі пасад, пляцоўка пад будынак Аграпрамбанка (былы будынак генерал-губернатара)	П.А. Русаў, 1995 г., ш-1-3, р-1	46 (ш-1-3), 28 (р-1)	1,3 – 1,4	2,8	Шэрая, вельмі вільготная зямля, насычаная драўлянымі трэскамі, гноем
Вялікі пасад, вул. Сака і Ванцэці	В.Е. Собаль, П.А. Русаў, 1996 г., нагляд за прамысловымі работамі	200	1,2 – 1,7	2,5 – 2,7	Цёмна-шэры, насычаны трэскамі, гноем, будаўнічым смеццем

Працяг табліцы 1

1	2	3	4	5	6
Вялікі пасад, дворык каля Лютэранскай кірхі	Н.І. Здановіч, 1992, ш-1-3	12,5	2,2	1,8 – 2,4	Вільготны, цёмна-шэры, з драўлянымі трэскамі, камянямі і прапласткамі гліны
Вялікі пасад, дворык былога езуіцкага калегіума	Д.У. Дук, 2000 – 2003 гг., ш-1-3, р-1-4	270	0,4 – 2,8	1,4 – 3,0	Светла-шэры, сухі, з прапласткамі вугалю, цаглянага друза і вапны, насычаны арганікай (драўляныя трэскі, косткі жывёл). Месцамі цёмна-шэры, камкаваты (пласт XVII –XVIII стст.). Карычневы, камкаваты, з прапласткамі чырвонай гліны і вугалю (пласт XVI ст.)
Верхні замак, гарадская бальніца, паўночна-заходняя частка	Д.У. Дук, назіранне за будаўнічымі работамі ў 2001 г.	Каля 100	0,4	2,5	Перамешаны, цёмна-шэры, чырвонага адцення
Бельчыцкі Барысаглебскі манастыр	Д.У. Дук, назіранне за будаўнічымі работамі ў 2003 г.	Каля 200	0,5 – 1,5	1,8	Светла-шэры, сухі, з прапласткамі вугалю, цаглянага друза і вапны (пласт XVI –XVIII стст.). Месцамі карычневы, суглінкавы, камкаваты (пласт XV –XVI стст.)
Запалоцкі пасад, паўночная чатка, агароды	Д.У. Дук, 2003 г., шурф 1	6	1,8 – 2	1,1	Светла-шэры, камкаваты, з прапластакамі вапны, месцамі цёмна-шэры, суглінкавы, чырвонага адцення

Найгорш культурны пласт XVI – XVIII стст. захаваўся на Верхнім замку. У пераважнай большасці раскопаў ён асобна не вылучаецца з-за значнага пашкоджання і невялікай магутнасці (Тарасаў, 1998. С. 27). Выключэнне складае стратыграфія раскопа А.Р. Мітрафанава ў паўднёва-ўсходняй частцы Замкавай гары (1959). Да перыяду XVI – XVIII стст. належалі I – IV будаўнічыя гарызонты (Митрофанов, спр. 203. С. 6 – 38). У II – III будаўнічым гарызонце выяўлены пабудовы з падвор'ямі; IV гарызонт, магчыма, адносіўся да XVI ст. і захаваў характэрную папярэднім гарызонтам сістэму планіроўкі (Митрофанов, спр. 203. С. 6 – 38).

Канцом XVII ст. датуецца I будаўнічы гарызонт; II – сярэдзінай XVII ст.; у III будаўнічым гарызонце адзначаны невялікі культурны пласт – час яго існавання не быў працяглы. Па наяўнасці ў пласце характэрных рэчаў, III будаўнічы гарызонт можна датаваць першай паловай XVII ст. На жаль, адсутнасць дэталёвага апісання культурнага пласта ў межах будаўнічых гарызонтаў вельмі абмяжоўвае крынічную базу вынікаў раскопа.

На тэрыторыі паўночна-заходняй частцы Вялікага пасада (раскоп С.В. Тарасава, 1987 г.) вылучаны асобны будаўнічы гарызонт, які датуецца XVII – XVIII стст. (Тарасов, спр. 1014. С. 5). Да гэтага гарызонту належалі сляды вулічнай забудовы канца XVI – XVII стст. і адна зрубная пабудова.

Па вывучаемым перыядзе на сённяшні дзень вядомы два закрытых археалагічных комплексы – гэта пабудова першай паловы XVI ст. (даследавана аўтарам у 2001 – 2002 гг.) і пабудова, якая існавала на мяжы XVI – XVII стст. (даследавана Н.І. Здановіч у 1992 г.) (Дук, 2003 а; Здановіч, 1998). Абодва комплексы выяўлены на тэрыторыі паўднёва-ўсходняй і паўднёвай частцы Вялікага пасада.

Падчас археалагічных даследаванняў у розных частках Вялікага пасада былі неаднаразова знойдзены развалы печышчаў, рэшткі пабудоў XVI – XVIII стст. рознай ступені захаванасці. Найбольшая іх колькасць выяўлена ў раёне сучаснай вул. Леніна і ў дворыку былога кадэцкага корпуса, лакальна – у межах паўночнай (перыферыйнай) часткі пасада па вул. Сака і Ванцэці.

Да асноўнай групы крыніц належаць артэфакты, якія паходзяць з археалагічных раскопак. Пераважнай датуючай групай знаходак XVI – XVIII стст. з'яўляецца каробчатая кафля, металічныя падкоўкі ад скуранога абутку, асобныя формы архітэктурна-дэкаратыўнай керамікі і посуду: пліткі падлогі, цэгла-пальчатка, паліваны керамічны посуд, рэйнскі і рыжскі імпарт, шматлікі шкляны посуд, тытунёвыя люлькі і іншыя рэчы (Тарасаў, 1998. С. 35 – 36). Гэтыя артэфакты па колькасці знаходак у адным стратыграфічным гарызонце значна пераўзыходзяць усе ранейшыя.

Аўтарам апрацавана вялікая колькасць індывідуальных і масавых знаходак XVI – XVIII стст. (усяго больш 100000 адзінак). З іх для правядзення археалагічных класіфікацый адабрана 10000 артэфактаў, у тым ліку: кафлі 1393 адзінкі з фондаў НПГКМЗ, а таксама каля 500 адзінак з уласных раскопак і з фондаў НМГКБ; 2551 венцаў гаршчкоў; больш 3000 керамічных, жалезных, шкляных, каменных і іншых вырабаў.

Археалагічныя калекцыі з Полацка дагэтуль захоўваюцца ў розных гарадах. Частка артэфактаў з раскопак М.К. Каргера (1957), А.Р. Мітрафанава (1959 – 1960), Р.В. Тарасенкі (1961 – 1962) і Г.В. Штыхава (1959 – 1965) знаходзіцца ў фондах НМГКБ і ў ІГ НАНБ. У 2003 годзе матэрыялы з калекцыі А.Р. Мітрафанава з ІГ НАНБ былі перададзены ў НПГКМЗ.

У фондах НПГКМЗ сабраны археалагічныя калекцыі, пачынаючы з другой паловы 70-х гадоў XX ст. і па наш час. Не вызначаным застаецца лёс асобных артэфактаў з раскопак М.К. Каргера, А.Р. Мітрафанава, Р.В. Тарасенкі і Г.В. Штыхава на Верхнім замку (1957 – 1965). У фондах НМГКБ захоўваецца 3751 адзінка археалагічных знаходак з Полацка за 1957 – 1965 гады, аднак гэтая калекцыя далёка не поўная. Гэта тычыцца як масавых вырабаў, так і шэрагу рарытэтных знаходак. Інфармацыя пра асобныя унікальныя рэчы захавалася толькі ў выглядзе графічных малюнкаў ці фотаздымкаў.

Скарыстанае ў рабоце кола археалагічных крыніц не з’яўляецца вычарпальным з-за штогадовага папаўнення ў выніку правядзення археалагічных раскопак. Тым не менш на дадзеным этапе крыніц па вывучэнню матэрыяльнай культуры XVI – XVIII стст. дастаткова для навуковага аналізу. Далейшае пашырэнне крынічнай базы павінна ўдакладніць уяўленні аб гістарычным мінулым горада. Назапашванне археалагічных матэрыялаў дае падставы для працягнення работы па плённаму вывучэнню старажытнасцяў ранняга Новага часу па асобных накірунках: ганчарства, металаапрацоўкі, шкларобства і інш. Пашырэнне кола крыніц не патрабуе істотнага перагляду навуковай карціны, якая склалася ў справе вывучэння беларускіх помнікаў XVI – XVIII стст. – гэты працэс толькі стварае ўмовы для больш дэталёвага аналізу і асэнсавання гістарычнай спадчыны Полацка.

У рабоце разам з археалагічнымі выкарыстоўваюцца пісьмовыя і выяўленчыя крыніцы. Пісьмовыя крыніцы падзяляюцца на дакументальныя (цэхавыя ўставы, інвентары дзяржаўнай, царкоўнай і прыватнай маёмасці, матэрыялы бягучага справаводства) і наратыўныя (апавядальныя).

Дакументальныя крыніцы па гісторыі Полацка ў сувязі з археалагічным вывучэннем яго матэрыяльнай культуры даюць цікавыя, хаця і даволі абмежаваныя звесткі па гарадской тапаграфіі, інтэр’еру жылых пабудоў палачан. Інвентарныя апісанні пабудоў Верхняга замка, у прыватнасці

двара ваяводы, змешчаны ў Полацкай рэвізіі 1552 года (Полоцкая ревизия 1552 года, 1905. С. 14 – 15). Інвентарныя апісанні пабудоў двара архіепіскапаў за 1588, 1601 і 1618 гады больш інфарматыўныя і дазваляюць прасачыць развіццё і змены ў забудове на працягу 1588 – 1618 гадоў (Археографический сборник документов…, 1867. С. 167 – 171, 221; Акты, издаваемые Виленскою археографическою коммисіею..., 1878. С. 4). Каштоўныя даныя аб забудове і месцапалажэнні жаночага манастыра пры царкве св. Сафіі змешчаны ў інвентары за 1637 год (ИЮМ, 1901. С. 19).

Пэўныя звесткі пра гарадскую тапаграфію і аб'екты нерухомасці насельніцтва Полацка XV – пачатку XVI стст. змяшчаюцца ў полацкіх граматах, выдадзеных А.Л. Харашкевіч (Полоцкие грамоты, 1977, 1978, 1980, 1982). Інфармацыю пра асобныя канструкцыйныя асаблівасці дамоў палачан, сацыятапаграфічную структуру пасадаў першай паловы XVI ст., утрымлівае Полацкая рэвізія 1552 года (Полоцкая ревизия 1552 года, 1905). У рэвізіі 1552 года згадваюцца такія аб'екты нерухомасці, як масты Верхняга замка, гарадскія вароты, драўляныя крапасныя ўмацаванні, двор ваяводы. Крапасныя ўмацаванні XVI – XVIII стст., размяшчэнне крапасных вежаў і іх канструкцыя паводле пісьмовых і археалагічных крыніц з'яўляюцца аб'ектам грунтоўнага манаграфічнага даследавання С.В. Тарасава (Тарасаў, 1998), таму гэтыя пытанні ў сапраўднай рабоце адмыслова не асвятляюцца.

Матэрыялы бягучага справаводства з полацкіх магістрацкіх кніг XVI – XVIII стст., апублікаваныя А.П. Сапуновым (Витебская старина, 1885; Витебская старина, 1888) і змешчаныя ў зборніках: "Гісторыка-юрыдычныя матэрыялы..." (ИЮМ, 1873; ИЮМ, 1874; ИЮМ, 1875; ИЮМ, 1892; ИЮМ. Вып. 25; ИЮМ, 1895; ИЮМ, 1895); "Археаграфічны зборнік дакументаў..." (Археографический сборник документов…, 1867), Беларускі архіў" (Справы полацкага гродзскага суда..., 1928), "Актавая кніга полацкага магістрата 1650 г." (Актавая кніга полацкага магістрата 1650 года, 2006), даюць прадстаўленне пра асобныя катэгорыі нерухомасці, практычна не прадстаўленыя ў археалагічных калекцыях, як, напрыклад, адзенне, асобныя віды вырабаў з каштоўных металаў, дрэва і інш. З гэтых крыніц можна даведацца пра выгляд інтэр'ера жылых памяшканняў, асаблівасці карыстання асобнымі рэчамі, сацыятапаграфію асобных раёнаў горада і інш. Тут жа змяшчаецца шмат цікавых звестак пра забудову Полацка.

Асаблівасці забудовы і ўладкавання тапаграфічнай структуры Полацка падчас панавання ў горадзе расійскіх войскаў у 1563 – 1579 гадах можна знайсці ў разрадных кнігах, надрукаваных А.П. Сапуновым (Витебская старина, 1885). Ім жа выдадзены шэраг грамат Аляксея Міхайлавіча, адпіскі ваяводы Мікіты Вельямінава, скаргі палачан часоў вайны Расіі з Рэччу

Паспалітай 1654 – 1667 гадоў, у якіх сустракаюцца звесткі аб асаблівасцях матэрыяльнай культуры і забудове Полацка (Витебская старина, 1885).

Археалагічна вызначанымі з'яўляюцца межы, плошча і збольшага характар забудовы двух полацкіх пасадаў – Вялікага і Запалоцкага. Аналагічныя звесткі па задзвінскіх (левабярэжных) пасадах у структуры горада на сённяшні дзень адсутнічаюць. Даныя пісьмовых крыніц па гэтай праблеме з'яўляюцца пакуль што безумоўна прыярытэтнымі. Звесткі аб тапаграфіі і забудове задзвінскіх пасадаў змяшчае Полацкая рэвізія 1552 года (Полоцкая ревизия 1552 года, 1905. С. 25 – 27), шэраг дакументаў, апублікаваных у зборніках "Гісторыка-юрыдычных матэрыялаў...", як напрыклад, уводны ліст, па якому Іван Скірмонт 16 ліпеня 1623 года перадае мяшчан Крыўцовага пасада мястэчка Бельчыцы-Кабак з ведамства Барысаглебскага манастыра пад юрысдыкцыю полацкага магістрата (ИЮМ, 1892. С. 358 – 361) і іншыя дакументы (ИЮМ, 1892. С. 362 – 364; ИЮМ, 1901. С. 120 – 126).

Для лакалізацыі гарадскога рынка, ратушы, плошчы, шэрагу культавых аб'ектаў XVI ст. (бернардзінскага кляштара, царквы Ражаства Хрыстова) інфармацыйнымі з'яўляюцца новыя даныя з архіўных крыніц, апублікаваных за апошнія гады беларускімі гісторыкамі В.А. Вароніным, М.Ю. Гардзеевым, А.Б. Доўнарам, у тым ліку асобныя матэрыялы з полацкіх магістрацкіх кніг другой паловы XVII ст., тэстамент Д. Панкова, пацвярджальны прывілей Полацку 1633 года (Варонін, 2003; Гардзееў, 2004; Доўнар, 2004).

Каштоўнейшай наратыўнай крыніцай з'яўляецца твор Паўля Одэборна "Праўдзівы і грунтоўны аповед пра русаў, іх шлюбныя і пахавальныя абрады, побыт, адзенне і г.д., а таксама пра веру і звычаі татар" (падрыхтаваў да друку Г.М. Сагановіч) (Сагановіч, 2005). "Аповед" быў скончаны ў 1581 г., пабудаваны на матэрыяле Полацка-Дзісненскага Падзвіння, у ім прадстаўлены даволі падрабязныя звесткі пра побыт, матэрыяльную культуру і норавы мясцовага гарадскога і сельскага насельніцтва пасля вызвалення Полаччыны ў 1579 годзе.

Падрабязную характарыстыку выяўленчых крыніц, а гэта пераважна гісторыка-картаграфічныя дакументы, прадставіў у сваёй манаграфічнай працы С.В. Тарасаў (Тарасаў, 1998. С. 10 – 17). Так, самай старажытнай выявай горада з'яўляюцца два планы, складзеныя асабістым сакратаром Стэфана Баторыя С. Пахалавіцкім, якія адлюстроўваюць Полацк 1579 года. Другім вядомым планам з'яўляецца шведскі, выкананы ў 1707 годзе. Далей, вядомы план 1779 года, план рэгенерацыі горада 1778 года і два планы канца XVIII ст. (адзін з іх выкананы, на думку С.В. Тарасава, паміж 1779 і 1786 гг.). Шэраг планаў Полацка датуюцца XIX – XX стст. З гэтых планаў для раскрыцця прадмета сапраўднага даследавання найбольш інфармацый-

нымі з’яўляюцца планы 1579 і 1707 гадоў. Астатнія планы Полацка XVIII – пачатку XX ст., прадстаўляюць цікавасць пры рэтраспектыўным разглядзе гісторыі матэрыяльнай культуры XVI – XVIII стст.

З новых выяўленчых крыніц адзначым адкрытыя ў 1990-х годзе ў Віленскім касцёле святых Францішка і Бернардзіна фрэскі з выявай Полацка сярэдзіны XVI ст. Сюжэт адной фрэскі прысвечаны змаганню св. Георгія з цмокам, намаляванаму на фоне катаванняў полацкіх айцоў-бернардзінцаў маскоўскімі татарамі ў 1563 годзе. На фрэске змешчаны магчымыя рэалістычныя выявы бернардзінскага касцёла, саборнай царквы св. Сафіі, умоўныя выявы ўмацаванняў Верхняга замка і абарончых вежаў Запалоцця (Глініік, 2004).

Уяўляе цікавасць план-рэканструкцыя Полацка XVI – XVII стст., выкананага А.К. Марэлем і ўпершыню апублікаванага ў 2005 годзе Л.Ф. Данько, А.І. Суднікам і А.М. Супрановічам у серыі “Наследие Полоцкой земли” (Иезуиты в Полоцке, 2005. С. 8). Гэты план не згадваўся ў апошніх гістарычных рэканструкцыях тапаграфіі Полацка.

Прапанаваны агляд пісьмовых крыніц па вывучэнню матэрыяльнай культуры палачан XVI – XVIII стст. не прэтэндуе на вычарпальнасць. Намі пералічаны асноўныя пісьмовыя крыніцы, якія скарастаны падчас рэканструкцый матэрыяльных умоў, побытавай матэрыяльнай культуры і арганізацыі жыццёвай прасторы розных сацыяльных груп насельніцтва Полацка. Многія каштоўныя звесткі па гарадской тапаграфіі, асаблівасцях матэрыяльнай культуры палачан можна знайсці ў захаваных архіўных матэрыялах метрыкі ВКЛ, на што звярталі ўвагу беларускія гісторыкі (Гардзееў, 2004. С. 58). Тым не менш пісьмовыя крыніцы, уведзеныя ў навуковы зварот і скрыстаныя ў сапраўднай рабоце, дазваляюць ахарактарызаваць асноўныя катэгорыі матэрыяльнай культуры палачан. Аднак магчымасці пісьмовых крыніц, у параўнанні з археалагічнымі, у вывучэнні матэрыяльнай культуры палачан XVI – XVIII стст. абмежаваныя. Метады археалагічнай навукі ў асвятленні праблемы застаюцца прыярытэтнымі, а крынічная база больш поўная. Пісьмовыя і выяўленчыя крыніцы дазваляюць удакладніць, а часам пашырыць уяўленні пра матэрыяльную культуру, побыт і каштоўнасныя прыярытэты насельніцтва Полацка. З дапамогай пісьмовых крыніц зроблена ідэнтыфікацыя асобных рэчавых комплексаў, высветлены іх паходжанне і прыналежнасць, удакладнены даныя пра сацыятапаграфічную структуру полацкіх пасадаў, матэрыяльныя ўмовы жыцця і інш. Увядзенне ў навуковае абарачэнне пісьмовых крыніц і назапашванне археалагічных калекцый дазволіць удакладніць сучасныя прадстаўленні аб Полацку і палачанах XVI – XVIII стст.

2. НАРЫС ТАПАГРАФІЧНАГА РАЗВІЦЦЯ ПОЛАЦКА XVI – XVIII СТАГОДДЗЯЎ

Полацк у XVI – XVIII стст. пережыў розныя этапы палітычнага і сацыяльна-эканамічнага развіцця. За гэты час з найбуйнейшага горада ВКЛ, цэнтра намесніцтва (прыкладна да 1504 г.) і ваяводства (з 1504 па 1772 гг.), ён ў выніку адміністрацыйна-тэрытарыяльных рэформ канца XVIII ст. пераўтварыўся ў павятовы горад у складзе Расійскай Імперыі. У 1772 годзе Полацк становіцца адміністрацыйным цэнтрам правінцыі ў складзе Пскоўскай губерні, з 1776 года – губернскім горадам, з 1778 па 1796 год Полацк з'яўляўся цэнтрам намесніцтва, пасля чаго пераўтварыўся ў павятовы горад спачатку Беларускай, а пасля 1802 года Віцебскай губерні (Полоцк: Ист. очерк, 1987. С. 77).

Колькасць насельніцтва горада ў гэты час даволі істотна вагалася, па падліках беларускіх вучоных (В.А. Вароніна, З.Ю. Капыскага, С.В. Тарасава) у Полацку ў першай палове XVI ст. жыло ад 11 да 50 тыс. чалавек (Варонін, 2000 б. С. 30)[1]; больш 10 тыс. чалавек складала насельніцтва горада ў першай палове XVII ст. (Шайкоў, 1996. С. 147); 5 тыс. чалавек засталося ў час ваеннага ліхалецця 1654 года (Тарасаў, 1992. С. 61), у 30 – 40-я гады XVIII ст. у Полацку пражывала прыкладна 3 – 4 тыс. чалавек (Полоцк: Ист. очерк, 1987. С. 60); напрыканцы XVIII ст. колькасць гарадскога насельніцтва складала каля 6000 чалавек (Шайкоў, 1996. С. 148).

За вывучаемы перыяд Полацк зведаў значныя сацыятапаграфічныя змены ў забудове і планіроўцы гарадской тэрыторыі. Да першай трэці XVIII ст. пераважала драўляная грамадзянская і культавая забудова. У першай палове XVI ст. яшчэ захавалася большая частка мураваных праваслаўных цэркваў – помнікаў полацкай школы дойлідства XII ст. (каля 10). Па даных Полацкай рэвізіі 1552 года ў горадзе знаходзілася не менш 21 праваслаўнай царквы, абсалютная большасць з іх былі драўлянымі (Варонін, 2000 а. С. 253). Асобна падкрэслім, што ў рэвізіі не пазначаны цэрквы, якія размяшчаліся ў двух старэйшых полацкіх манастырах – Бельчыцкім Барысаглебскім і Спаса-Ефрасіннеўскім, а гэта мураваныя помнікі ў колькасці, не меншым за 5 храмаў. Пасля 1579 года (вяртанне Полацка ў склад ВКЛ) большасць мураваных праваслаўных храмаў знаходзілася ў руінах. З гэтага часу разам з паслабленнем пазіцый праваслаўнай царквы, абумоўленым наданнем езуітам абсалютнай большасці маёмасці праваслаўных манастыроў і цэркваў, распаўсюджваннем уніяцтва з 1596 года, а таксама крызісам самой праваслаўнай царквы, ідзе працэс развіцця драўлянага, пераважна каталіцкага, сакральнага будаўніцтва.

---

[1] Найбольш верагоднай з'яўляецца лічба блізу 11 тыс. чалавек з магчымай нязначнай карэляцыяй у бок павелічэння.

У другой палове XVIII – пачатку XIX ст. горад перажывае сапраўдны будаўнічы бум, у гэты час узводзіцца комплекс мураваных каталіцкіх кляштараў, будынкаў грамадзянскага прызначэння, фарміруецца архітэктурны ансамбль цэнтральнай рынкавай плошчы ў барокава-класічным стылі. У гэты час у Полацку паўсталі мураваныя ансамблі францысканскага, дамініканскага, базыліянскага і бернардзінскага кляштараў разам з касцёламі. У стылі Віленскага барока на месце ўзарванага ў 1710 годзе храма ўзводзіцца Сафійскі сабор (1738 – 1750), у сярэдзіне – другой палове XVIII ст. паўстаюць мураваныя будынкі езуіцкага калегіума разам з касцёлам св. Стэфана, узводзяцца жылыя карпусы Брацкай школы разам з праваслаўнай Богаяўленскай царквой, будуецца дом генерал-губернатара і шэраг іншых грамадскіх пабудоў (Baranowski, 1994). Абсалютная большасць пералічаных новабудоўляў была здзейснена ў тыя часы, калі Полацк уваходзіў у склад Рэчы Паспалітай. Па маштабам мураванага будаўніцтва XVIII ст. гэты час можна параўнаць з эпохай росквіту полацкай школы дойлідства XII ст., змянілася толькі ідэалагічная афарбоўка – раней выключна праваслаўнае, цяпер гэта было ўжо пераважна каталіцкае дойлідства. Тым не менш Полацк напрыканцы XVIII ст. стаў горадам з развітай паўнавартаснай еўрапейскай сістэмай забудовы цэнтральнай часткі горада, што, адпаведна, сведчыць не толькі пра высокі ўзровень развіцця культуры, але і адпаведны эканамічны падмурак такіх шырокамаштабных здзяйсненняў.

Вектар культавага будаўніцтва пачынае мяняцца пасля далучэння Полацка да Расійскай Імперыі (з 1772 года правабярэжная частка горада, з 1793 – увесь горад). У 1761 – 1779 гадах ўзводзіцца мураваная праваслаўная Богаяўленская царква. Аднак шырокага распаўсюджвання мураванае праваслаўнае дойлідства ў Полацку XVIII – пачатку XIX ст. так і не атрымала (Глініік, 2001. С. 199 – 200).

Паводле М.В. Без-Карніловіча, Полацк у другой палове XVIII ст. з’яўляўся буйнейшым горадам на тэрыторыі Беларускіх губерняў па колькасці уніяцкага, каталіцкага і праваслаўнага духавенства, па маштабам разгалінаванага гандлю, па колькасці мураваных помнікаў культавага дойлідства (Без-Корнилович, 1885. С. 93). Заўважым, што ўзровень эканамічнага і духоўнага патэнцыяла Полацка напрыканцы XVIII ст. добра ілюструе той факт, што ў 1776 годзе Полацк стаў губернскім горадам, а з 1778 па 1796 год горад з’яўляўся цэнтрам намесніцтва.

Тапаграфічнае развіццё горада XVI – XVIII стст. можна падзяліць на даінфлянцкі і пасляінфлянцкі перыяды, скарыстаўшы за аснову падзеі Інфлянскай вайны (1558 – 1582) і захоп Полацка маскоўскім войскам у 1563 – 1579 гадах. Пасля надання Полацку ў 1498 годзе магдэбургскага права і пабудовы ратушы (пасля 1510 г.) адміністрацыйны цэнтр горада перамясціўся з Верхняга замка на Вялікі пасад – у раён сучаснай плошчы

Свабоды. У пачатку XVI ст. тапаграфічная структура Полацка па-ранейшаму складалася з Верхняга замка (адміністрацыйны і культурны цэнтр), Вялікага і Запалоцкага пасадаў на правым беразе Дзвіны. Плошча Верхняга замка складала 9,44 га (Тарасаў, 1993. С. 508). Межы і плошча Запалоцкага пасада і, адпаведна, колькасць насельніцтва, даволі істотна вагалася на працягу першай паловы XVI ст. у выніку наступстваў шматлікіх войн з Маскоўскім княствам (Варонін, 2000 б. С. 30). Аднак наўрад яго плошча ў самыя неспрыяльныя гады была меней за 17 га, як у XIII ст. (Тарасаў, 1993. С. 509). Плошча і межы Вялікага пасада заставаліся ў гэты час стабільнымі і былі роўнымі каля 50 га (Тарасаў, 1993. С. 508). На левым беразе Дзвіны таксама існавалі заселеныя пасады, гаворка пра якія пойдзе ніжэй. Акрамя таго ў ваколіцах горада існавала сістэма манастыроў, самыя значныя з якіх былі Бельчыцкі Барысаглебскі і Спаса-Ефрасіннеўскі (мал. 1).



Малюнак 1 – Тэрыторыя распаўсюджвання культурнага пласта IX – XVIII стст. у Полацку: 1 – паселішчы канца – VIII – IX стст.; 2 – тэрыторыя горада ў XII – пачатку XIII ст.; 3 – паплавы на Палаце; 4 – курганы; 5 – цэрквы XII ст.; 6 – Полацкая Сафія; 7 – прыкладная мяжа гарадской тэрыторыі Полацка ў XVI – XVII стст.

У 1563 годзе па загаду Івана IV быў узведзены Стралецкі (Ніжні) замак і на тэрыторыі паміж старажытным гарадзішчам і паселішчам пракапана новае русла Палаты. Ніжні замак (плошча каля 6 га) быў узведзены на тэрыторыі старажытнага паселішча, якое з XI ст. стала паўночна-ўсходняй ускраінай Вялікага пасада. Усіх жыхароў асноўнай часткі Полацка – Вялікага пасада – тых, хто не трапіў у маскоўскі палон, маскоўскія стральцы перасялілі ў Запалоцце без права вяртання. У часы падначалення Полацка Івану IV (1563 – 1579) горад складаўся з Верхняга і Ніжняга замкаў і Запалоцкага пасада. На тэрыторыі Вялікага пасада было незаселенае месца – "пажарышча" (Памяць, 2002. С. 132). Звесткі пра левабярэжныя пасады Полацка (акрамя Вострава) ў гэты час адсутнічаюць.

Разрадная кніга полацкага паходу Івана IV на Полацк 1563 года ўтрымлівае цікавыя звесткі пра асаблівасці забудовы тагачаснага Полацка. Паводле кнігі, Іван Васільевіч загадаў "бояромъ и воеводамъ сделати светлица въ городе, въ которомъ месте пригоже, а на ночь въ светлицу еженочей пріезжати бояромъ и воеводамъ съ своими полки, переменяясь, каждо воевода съ своимъ полкомъ ночь ночюетъ въ светлице; а которая ночь доведетца боярину и воеводе въ светлице ночевать, и тому боярину и воеводе ездить возле города и головъ отъ себя посылати, и по городу съ фонаремъ отъ собя посылати; да въ светлице жъ велети ночевати на всякую ночь по сту человекъ стрельцовъ, сотцкимъ стрелецкимъ ночевати въ светлице, бояромъ и воеводамъ головъ посылати и по городу съ фонаремъ самимъ надъ ними надзирати, еженочей, переменяясь… А съ фонаремъ ходити по городу безпрестанно… а сделати бояромъ и воеводамъ судебня за городомъ, въ остроге, за Полотою, где царь и вел. кн. указалъ… А посадцкимъ людемъ житии въ остроге, за Полотою; а устроити ихъ въ остроге и места, какъ бы было отъ нихъ безстрашно темъ людемъ, которые воевода и дети боярскіе учнуть быти в остроге; а которые князи и дети боярскіе въ городе и въ остроге не вместятца, и бояромъ и воеводамъ княземъ и детемъ боярскимъ велети имъ дворы себе ставити промежъ города и валу, отъ Полоты реки, а по валу велети делати тынъ, по которому месту царь и вел. кн. бояромъ и воеводамъ указалъ, … а на болшомъ посаде, на гореломъ месте и на острову на Двине реке, дворовъ посадцкимъ людемъ ставити не велети" (Витебская старина, 1885. С. 59, 61).

Такім чынам, у гады панавання рускіх войскаў з 1563 па 1579 год у Полацку была пабудавана (напэўна, не адна) вялікая святліца на сто чалавек, размешчаная па загаду Івана IV на Верхнім замку. Адсюль ажыццяўляліся начныя патрульныя рэйды па тэрыторыі Запалоцкага пасада, дзе жылі палачане. На гэтым жа пасадзе была ўладкавана "судзебня". Відавочна, месца на Верхнім замку на ўвесь маскоўскі гарнізон не хапіла, і таму

Іван IV загадаў баярам, ваяводам і дзецям баярскім ставіць свае двары паміж Верхнім замкам і валам ад ракі Палаты. На валу цар загадаў ставіць паркан. Так пачаў узводзіцца Ніжні замак.

Што тычыцца забудовы Запалоцкага пасада, дзе ў час вайны жыло карэннае насельніцтва, то па звестках М.В. Без-Карніловіча яна выглядала наступным чынам: горад з усіх бакоў быў абнесены драўлянай сцяной і глыбокім ровам; вуліцы былі вузкія, крывыя, немашчоныя, брудныя; дамы нізкія, драўляныя з невялікімі вокнамі, дахі крыты дранкай ці саломай; гарадскія пабудовы былі размешчаныя ад вусця р. Палаты ўверх па яе праваму берагу да архіерэйскага летняга жытла (Без-Корнилович, 1855. С. 82). Апісанне гісторыка ілюструе відавочны заняпад матэрыяльнай культуры эпохі падначалення горада Івану IV.

Як пераканаўча паказаў С.В. Тарасаў, на будаўніцтва вала Ніжняга замка (т. зв. Вала Івана Грознага) спатрэбілася 230 тыс. м^3 зямлі, якую бралі з месца паміж старажытным полацкім гарадзішчам і паселішчам падчас пракопвання новага русла Палаты (Тарасаў, 1998. С. 49). У сваіх разліках даследчык абапіраўся на даныя археалагічнага даследавання, геадэзічных вымярэнняў і звестак, запісаных І.П. Дэйнісам ад мясцовага насельніцтва. Таму, на нашу думку, няма ніякіх падстаў ставіць пад сумненне факт змены русла Палаты ў 1563 годзе, што зроблена ў найноўшым фундаментальным даследаванні Л.В. Аляксеева (Алексеев, 2006. С. 108). Ніжні замак быў узведзены паміж 1563 і 1564 гадамі, верагодна, за вяснувосень 1563 года.

Пасля Інфлянцкай вайны горад складаўся з Верхняга і Ніжняга замкаў, Вялікага і Запалоцкага пасадаў, размешчаных на правым беразе Дзвіны, а таксама левабярэжных пасадаў (гл. мал. 1). Тапаграфічныя межы правабярэжных пасадаў вызначаны археалагічна (Тарасаў, 1998. С. 95 – 96). Такая тапаграфічная структура збольшага захавалася на працягу ўсяго разглядаемага перыяду.

Фартыфікацыйная сістэма Ніжняга замка падчас Інфлянцкай вайны сябе не апраўдала, горад быў захоплены войскамі Стэфана Баторыя з боку Верхняга замка, і маскоўскі гарнізон быў вымушаны здацца. Пасля Інфлянцкай вайны да сярэдзіны XVII ст. Ніжні замак паступова страчвае свае абарончыя функцыі (Тарасаў, 1998. С. 51).

Ніжні замак з часоў свайго заснавання (1563) і да XVIII ст. так і не здолеў увайсці ў рысу жыллёва-гаспадарчай забудовы найбольш заможнай і ўплывовай часткі палачан – за ўвесь час археалагічнага вывучэння Ніжняга замка не было знойдзена колькі-небудзь значнай колькасці кафлі, за выключэннем адзінкавых знаходак. Гэтая выснова добра карэлюецца з

данымі пісьмовых крыніц. У полацкіх гродскіх кнігах ад 24 ліпеня 1652 года захавалася скарга шляхціца Гаўрыіла Лакачэўскага на пушкароў полацкага замка. Сын Гаўрыіла – Самуіл – вяртаючыся на запалоцкі фальварак бацькі праз Ніжні замак сустрэў там “злодзеяў” і “рабаўнікоў” з ліку пушкароў полацкага замка. Пасля працяглага збівання і абрабавання Самуіла, злодзеі разбегліся па сваім дамам на Ніжнім замку (ИЮМ, 1874. С. 276 – 278). Прыклад выразна хуліганскіх паводзін жыхароў Ніжняга замка сведчыць пра пэўную крымінагеннасць дадзенага раёна горада і пражыванне ў ёй маргінальнай часткі гараджан. Дарэчы, пасля вызвалення горада ў 1667 годзе полацкі ваявода зноў адводзіць на Верхнім і Ніжнім замках месцы пад пабудовы дамоў пушкароў і стральцоў, вартаўнікоў гэтых замкаў (Без-Корнилович, 1855. С. 89).

Справа Лакачэўскага цікава яшчэ і тым, што ў ёй добра пазначаны асобныя тапаграфічныя аб’екты горада сярэдзіны XVII ст. Так, Самуіл Лакачэўскі спяшаўся з Ніжняга замка, дзе ён рамантаваў ружжо ў слесара Пятра Тынецкага, да дому – на фальварак бацькі, размешчаны за Палатой. Ён дайшоў да гэтак званага ўрочышча паблізу вуліцы Ніжняга замка і параўняўся з домам Пятра Плотніка, дзе і сустрэў злодзеяў. Пасля збівання Самуіл здолеў збегчы на млын, які знаходзіўся на рацэ Палаце пад Верхнім замкам, крыху ачуняўшы, ён стаў узбірацца на гару, дзе яго зноў дагналі злодзеі каля гумна Севасціяна Грабоўскага, размешчанага ў полі, за Верхнім замкам, на самой мяжы фальварка Лакачэўскага, на праезнай дарозе (ИЮМ, 1874. С. 276 – 278). Па гэтаму апісанню зразумела, як пралягаў маршрут Лакачэўскага: праз Палату каля гэтак званага ўрочышча (поплаў на Палаце ў раёне стрэлкі Ніжняга замка), праз праязныя вароты з Ніжняга замка да Палаты ён трапіў на млын (знаходзіўся на Палаце насупраць Ніжняга замка, верагодна, бліжэй да месца яго злучэння з Верхнім замкам). Далей шлях пралягаў на пагорак, дзе сёння размешчаны прыватны сектар паўночнай часткі Запалоцця па вуліцы і завулкам Ф. Міронавай паблізу мікрараёна Полацка “Аэрадром”. Тут, на краю пагорка, знаходзілася гумно, а сам фальварак, відаць, размяшчаўся на месцы сучаснай прыватнай забудовы Запалоцця па 4-му завулку Ф. Міронавай. Фальварак Снарокава пазначаны прыкладна на гэтым месцы і на плане Полацка 1788 года (Чантурия, 2005. С. 170). Пацвярджэнне размяшчэнню фальварка (ці фальваркаў?) па вул. і пер. Ф. Міронавай ёсць і па археалагічных крыніцах. Падчас археалагічнага нагляду за будаўнічымі работамі ў 2006 годзе па вул. Ф. Міронавай былі адкрыты рэшткі цаглянага падмурка дома XVIII ст. як магчымае сведчанне існавання аднаго ці некалькіх фальваркаў.

Падчас вайны Расіі з Рэччу Паспалітай 1654 – 1667 гадоў Полацк на працягу 13 гадоў знаходзіўся пад уладай Аляксея Міхайлавіча. За гэты час радыкальных зменаў гарадской тапаграфіі не адзначаецца. Паводле Граматы Аляксея Міхайлавіча ад 16 лютага 1657 года пустое ратушнае месца на Вялікім пасадзе “па малую вуліцу” было адведзена пад гасціны двор, за астрогам (верагодна, Верхні замак) для захоўвання тавараў загадана пабудаваць амбары і збіраць пошліну, таксама палачанам дазвалялася валодаць двума перавозамі па Дзвіне (Витебская старина, 1885. Ч. 2. С. 78).

Істотна не мянялася тапаграфія Полацка ў гады Паўночнай вайны (1700 – 1721), пра што яскрава сведчыць шведскі план Полацка 1707 года (мал. 2).



Малюнак 2 – План Полацка 1707 года:
1 – Верхні замак; 2 – Ніжні замак; 3 – Вялікі пасад; 4 – рынкавая плошча;
5 – езуіцкі калегіум; 6 – мяркуемая выява ратушы; 7 – Запалоцце; 8 – Сабор св. Сафіі;
9 – Чырвоная (Каралеўская вежа); 10 – Богаяўленскі манастыр
(друкуецца паводле Ю.У. Чантурыя, 2005. Рис. 187)

Гарадскія ўмацаванні ці не ў апошні раз падвяргаліся рамантаванню. Харчаванне для рускай арміі, сабранае на тэрыторыі Полацкага ваяводства, захоўвалася ў Верхнім замку, у старых ваяводскіх і архіепіскапскіх харомах. Артылерыю і афіцэраў размясцілі на Верхнім замку, а пяхоту паставілі на Вялікім і Запалоцкіх пасадах, ва ўсіх Задзвінскіх слабодах “з вялікім

уцясненнем, за малою колькасцю двароў” (Памяць: Гіст.-дакум. хроніка Полацка, 2002. С. 189 – 190).

Верхні і Ніжні замкі ў XVI – XVII стст. былі добра ўмацаваны. Апрача іх, крапасная сцяна з вежамі і форткамі акружала Вялікі і Запалоцкі пасады, Бельчыцкі Барысаглебскі манастыр. Дынаміка зменаў абарончай структуры пасадаў за гэты перыяд падрабязна разгледжана ў манаграфіі С.В. Тарасава (Тарасаў, 1998. С. 40 – 60).

На думку С.В. Тарасава, тапаграфічны рост гарадской тэрыторыі ў разглядаемую эпоху адбываўся, галоўным чынам, за кошт левабярэжных пасадаў. У XVI – XVIII стст. (магчыма, і раней) яны становяцца паўнавартаснай гарадской адзінкай. Як вядома з запісаў магістрацкіх кніг сярэдзіны XVII ст., рост гарадской тэрыторыі адбываўся таксама за кошт зямель, якія знаходзіліся на правабярэжжы Полацка, над Палатою на паўночны ўсход ад Ніжняга замка. Так, запіс ад 10 красавіка 1652 года сведчыць аб прыняцці ў мяшчанскі стан Міхалкі Хадаровіча, які жыве “на кгрунте мескомъ, на Мамоновщыне, за Шорошковскимъ бродомъ, надъ рекою Полотою” (Археографический сборник..., 1867. С. 390).

Прыкладная плошча Полацка ў XVII ст. была каля 200 га (Тарасаў, 1998. С. 95 – 96). На думку В.У. Чапко, плошча правябярэжнай часткі Полацка напрыканцы XVIII ст. (1770-я гг.) была роўная 112 га (Полоцк: Ист. очерк, 1987. С. 79). Даныя аб плошчы левабярэжных пасадаў напрыканцы XVIII ст. гісторыкамі не прыводзяцца. Калі прыняць на веру апошні разлік, дык прыдзецца прызнаць, што плошча правабярэжнай часткі Полацка напрыканцы XVIII ст. стала нашмат меншая, чым у XII ст., калі яна была прыблізна 140 га (Дук, 2006 в. С. 33).

Межы і плошча пасадаў на левым беразе Дзвіны археалагічна не вызначаны. На думку С.В. Тарасава, Полацк у XVI – XVII стст. меў шэсць пасадаў: Вялікі, Запалоцкі, Востраўскі, Крыўцоў, Слабодскі і Экіманскі (Тарасаў, 1998. С. 24). Паводле В.А. Вароніна, у XVI – XVII стст. горад складаўся з Вялікага, Запалоцкага, Востраўскага (ці Крыўцова), Экіманскага і Слабодскага пасадаў (Варонін, 2000 а. С. 250). В.А. Варонін звярнуў ўвагу, што ў Полацкай рэвізіі 1552 года атаясамліваюцца назвы двух пасадаў: Востраўскага і Крыўцова (Варонін, 2000 а. С. 249).

Найбольш аддаленым ад гістарычнага цэнтра Полацка быў Экіманскі пасад. Ён знаходзіўся на левым беразе Дзвіны на захад ад Востраўскага пасада. І калі Востраўскі, Крыўцоў і Слабодскі пасады знаходзіліся насупраць Верхняга замка і Вялікага пасада, то Экіманскі пасад выдаваўся далёка на захад ад мяжы Вострава. Гэта спрыяла пэўнай аўтаноміі пасада. Паводле “Рэвізіі 1552 года”, на Экіманскім пасадзе змяшчалася 269 двароў (Полоцкая ревизия 1552 года, 1905. С. 25 – 27), статус Экімані паводле той

жа рэвізіі вызначаецца і як пасад, і як прадмесце. Па стану на 1661 год пазначаецца, што “въ местечке Якимании въ рынку и по улицам погорелых домов, окрома кърамъ, 54, къ тому на урочищу ведле тоежъ Якиманни, Жабине на Славкю, пустых домовъ 4” (ИЮМ, 1895. С. 149 – 150). Такім чынам, рынак з крамамі знаходзіўся не толькі на Вялікім пасадзе, але і ў Экімані, апошняя да таго ж мела і своеасаблівае прадмесце Жабіна. Запіс 1670 года сведчыць, што на пасадзе (у інвентары ён пазначаны адначасова як факторыя і мястэчка Екіманія), было 136 населеных пляцаў (ИЮМ, Вып. 25. С. 183). У 1772 годзе Экіманія з’яўлялася адным з дзевяці найбуйнейшых фальваркаў полацкага езуіцкага калегіума (Памяць: Гіст.-дакум. хроніка Полацка, 2002. С. 208).

Паводле “Рэвізіі 1552 года” на Крыўцовым пасадзе было 30 двароў, Слабодскім – 103, Востраўскім – 151 (для параўнання, на Вялікім пасадзе – 771, Запалоцкім – 191) (Полоцкая ревизия 1552 года, 1905. С. 25 – 27). Такім чынам, на Задзвінскіх пасадах горада, разам з Экіманскім, у сярэдзіне XVI ст. размяшчалася 553 двары (больш трэці ўсіх гарадскіх двароў) з агульнай колькасці 1515.

Дзе ж размяшчаліся гэтыя “таямнічыя” Крыўцоў, Слабодскі пасады і ці існаваў Востраўскі пасад? Колькі пасадаў Полацка ў XVI – XVII стст. было на самой справе? Адказ на гэта пытанне знойдзем у пісьмовых крыніцах XVI – пачатку XVII ст.

Паводле рэвізіі 1552 года месцапалажэнне Слабодскага пасада вызначана “на земли церковъной манастыра Светых Борыса и Глеба” (Полоцкая ревизия, 1905. С. 27). У актавых кнігах полацкага магістрата пачатку XVII ст. захаваліся звесткі пра “мяшчан, купцоў і рамеснікаў бельчыцкіх з Крыўцовага пасада, названага Кабак” (*тут і далей падкрэслена аўтарам*) (Доўнар, 2004. С. 46). Запіс у гродскай кнізе за 1623 год згадвае мястэчка, што належала полацкаму архіепіскапу, “Кабак-Бельчыцы”, “недалеко места Полоцкого лежачого” (ИЮМ, 1892. С. 348). У прыведзеных паведамленнях атаясамліваюцца назвы Слабодскага, Крыўцовага пасадаў і мясцовасці Кабак, усё гэта мае дачыненне да тэрыторыі вакол Бельчыцкага манастыра, лакалізацыя апошняга не выклікае сумненняў.

Раней намі было выказана меркаванне, што ўсе пералічаныя ў пісьмовых крыніцах назвы былі сінанімічныя і маглі азначаць лакальныя гарадскія тэрыторыі на левым беразе Дзвіны (Дук, 2006 г. С. 37 – 38). Зараз, пасля аналізу зместу шэрага дакументаў XVII ст., гэтая думка цалкам пацверджана з пэўнымі ўдакладненнямі.

20 красавіка 1622 года вынесена пастанова каралеўскага суда па пытанню аб падначаленні мястэчка Бельчыцкага пасада, “вновь названного Кабаком”, прысуду і павіннасцям полацкага магістрата (ИЮМ, 1901.

С. 114 – 120). Паводле рашэння, усе “ўладычныя, княжацкія, папоўскія, панскія і баярскія” мяшчане Бельчыцкія Крыўцовага пасада, якія займаліся “гандлем, купецтвам, рамёсламі, шынкам”, былі перададзены пад юрысдыкцыю полацкага магістрата. 5 чэрвеня 1623 года была заключана здзелка паміж земянінам Іванам Іванавічам Баханьскім і яго жонкай Раінай Аляксандраўнай, з аднаго боку, і прадстаўнікамі полацкага магістрата, з другога, адносна мястэчка Бельчыцы-Кабака (ИЮМ, 1901. С. 120 – 126). Паводле здзелкі, Іван Іванавіч Баханьскі перадаваў сваіх мяшчан мястэчка Бельчыцы-Кабак, размешчанага пад Полацкам, каля Крыўцовага пасада за ракою Дзвіною, ва ўладанне полацкага магістрата. 16 чэрвеня 1623 года возны Іван Скірмонт перадаў ад землеўладальнікаў Баханьскіх пад юрысдыкцыю полацкага магістрата заселеныя і пустыя пляцы на Крыўцовым пасадзе ў мястэчку Бельчыца-Кабак і вакол мястэчка Кабака, каля ручая, з мяшчанамі і павіннасцямі (ИЮМ, 1892. С. 362 – 364).

Пазначаныя дакументы прыводзяць мінімум тапаграфічных звестак. А вось уводны ліст, па якому Іван Скірмонт 16 ліпеня 1623 года перадае мяшчан Крыўцовага пасада мястэчка Бельчыцы-Кабак з ведамства Барысаглебскага манастыра пад юрысдыкцыю полацкага магістрата, дае каштоўныя і вельмі інфарматыўныя звесткі пра тапаграфію полацкага левабярэжжа (ИЮМ, 1892. С. 358 – 361). Паводле ліста, 8 чэрвеня 1623 года адбылося вызначэнне тэрыторыі мястэчка Бельчыцы, названага Кабаком, якое размяшчалася на Крыўцовым пасадзе “подъ местомъ Полоцкимъ лежачомъ”. Тады ж былі пастаўлены капцы мяжы “того кгрунту Кобацкого, заведеного: вышедшы с того местечка Кобака и почавшы отъ ручъя, названого Ляхова, лощовиною черезъ дорогу великую, пускаючы кгрунтъ до местечка Бельчыцы-Кобака по левой руце; с тое лощыны на першый копецъ, коло елки надъ дорогою, которая дорога с того местечка идеть до Семенца и до розныхъ местъ; отъ того копца другий копецъ около березки малое; оттуль идучы ку Двине и пускаючы кгрунтъ до местечка Белчыцы Кобака по левой руце, копецъ подле дороги, которая идеть зъ Кобака до млыну Бельчыцкого, коло верховины сосновое другий копецъ; подле изгороды зъ елкою малою третий копецъ противо местечка Кобацкого, у которомъ кустъ лозовый, четвертый копецъ подле дороги, которая идеть с того местечка Кобака до манастыра Борисоглебского; тутъ се граница сконъчыла и тою жъ дорогою увошли есмо у тое местечко, пускаючы тотъ заводъ и кгрунтъ по левой руце” (ИЮМ, 1892. С. 360 – 361).

Верагодна, шлях рэвізораў пралягаў уздоўж левага берега Дзвіны з захаду на ўсход, але дзе? Магчыма, у раёне сучаснай вул. Дзяржынскага, лагчынаю, праз вялікую дарогу і далей, перасякаючы дарогу на Семянец і дарогу, якая вядзе на млын, размешчаны на рацэ Бельчыца, далей зноў да дарогі, якая вядзе з мясцовасці Кабака да Барысаглебскага манастыра

(магчыма, перакрыжаванне сучаснай вул. Цвяточнай і Дзяржынскага). Гэтай жа дарогай рэвізоры трапілі ў мясцовасць Бельчыца-Кабак.

На левабярэжнай частцы Полацка існавалі тры ручаі і рака Бельчыца. Які ручай маецца на ўвазе пад назвай "Ляхаў" зараз сказаць цяжка. На праектным плане горада першай паловы XIX ст. такой назвы не існуе, як і на іншых вядомых планах горада (Чантурия, 2005. С. 170 – 171, 273 – 274). У прыватнасці, згаданы план першай паловы XIX ст. і план Полацка 1910 года (Путеводитель по городу Полоцку 1910 года, 2006. С. 22 – 23) пазначаюць на левым беразе Дзвіны тры ручаі: Саловін (насупраць заходняй часткі Вострава); Свінец (насупраць усходняй часткі Вострава) і Крывы пасад[2] (насупраць Вялікага пасада). На захад ад ручаёў працякае рака Бельчыца. Магчыма, адзін з гэтых ручаёў ці іх рукавоў у XVII ст. меў назву "Ляхаў". Звернем увагу: па шляху рэвізораў ніводнага ручая не сустракалася, таму, верагодна, шлях іх пачынаўся ўсёж-такі ад Крыўцовага ручая ці яго прытока, гэты гідронім згадваецца ў пісьмовых крыніцах сярэдзіны XVII ст. (Актавая кніга полацкага магістрата 1650 г., 2006. С. 195).

Прыведзеныя звесткі дазваляюць упэўнена сцвярджаць, што ў першай трэці XVII ст. на левым беразе Дзвіны існаваў адзін пасад, які меў назву Крыўцоў. На гэтым пасадзе размяшчалася "мястэчка", у сэнсе "мясцовасць", Бельчыцы-Кабак, размешчанае дзесці паблізу Барысаглебскага манастыра, але не побач з яго сценамі. Калі параўнаць з сучаснай тапаграфіяй Полацка, то гэта адпаведна па розныя бакі ракі Бельчыца. Мястэчка Кабак мела важнае значэнне ў гарадской тапаграфічнай структуры, тут, верагодна, пры вусці Бельчыцы, існаваў перавоз ад ракі Дзвіны (Актавая кніга полацкага магістрата 1650 г., 2006. С. 170).

Бельчыцкі Барысаглебскі манастыр з'яўляўся буйнейшым у Полацку і безумоўным культавым цэнтрам Крыўцовага пасада, аднак манастыр, як паказана вышэй, размяшчаўся не на пасадскай тэрыторыі. На тэрыторыі непасрэдна Крыўцовага пасада ў 1671 годзе існавала царква, якая не мела прыналежнасці да Бельчыцкага манастыра. Гаворка ідзе пра царкву св. Мікалая, дарэчы, не згаданую ў папярэдніх даследаваннях тапаграфіі Полацка (Тарасаў, 1998. С. 84 – 87). Царква размяшчалася ў Полацкім прадмесці Кабак, "па-над ровам, пры дарозе, якой ужо няма, а дарога яшчэ ідзе праз роў" (запіс у гродскай кнізе ад 20 кастрычніка 1671 года) (ИЮМ, 1895. С. 247).

У 1622 – 1623 гадах мяшчане Крыўцовага пасада сталі падначаленымі полацкаму магістрату, г. зн. сталі паўнапраўнымі гараджанамі. У дачыненні да Экімані ў сярэдзіне XVI ст. ужываецца адначасова назва "пасад" і "прадмесце", у XVII ст. выкарыстоўваецца назва "мястэчка" і

[2] Гэты ручай на плане Полацка першай паловы XIX ст. мае назву "Крыўцоў".

“факторыя”. Гэта далёка не выпадкова. Экімань была перададзена Стэфанам Баторыем езуіцкаму калегіуму, з’яўлялася разам з Востравам яго найбуйнейшай юрыдыкай (Полоцк: Ист. очерк, 1987. С. 66) і, паводле земскіх кніг, з канца XVI ст. мела статус полацкага прадмесця (ИЮМ, Вып. 25. С. 133), аднак жыхары Экімані ў XVII ст. па-ранейшаму з’яўляліся мяшчанамі (Актавая кніга полацкага магістрата 1650 г., 2006. С. 86). Заўважым, што Слабодскі і Востраўскі пасады ў вядомых дакументах полацкай магдэбургіі XVII – XVIII стст. ні разу не згадваюцца. Замест апошняга ў 1650 годзе выкарыстоўваецца назва мясцовасці – “Востраў” (Актавая кніга полацкага магістрата 1650 г., 2006. С. 168). Гэта дазваляе выказаць гіпотэзу, што назвы Слабодскага пасада XVI ст., згаданага ў Полацкай рэвізіі 1552 года, і мясцовасці Бельчыцы-Кабак, названай у шэрагу дакументаў першай паловы XVII ст., азначаюць адно і тое ж. Сама назва “Слабодскі пасад” паходзіць, відаць, ад тапоніма “Бельчыцкая слабада”, г. зн. тэрыторыя, падначаленая Бельчыцкаму Барысаглебскаму манастыру. Гэтая тэрыторыя была перададзена полацкаму магістрату 16 чэрвеня 1623 года пад назвай Бельчыцы-Кабак (гл. мал. 1). Аднак і пасля перадачы “кабачане” прыпісваліся да земляў “царкоўных паселеных”, з іх спаганяліся штрафы за нехаджэнне ва уніяцкую царкву Барыса і Глеба (Витебская старина, 1888. Ч. 2. С. 188).

Доказам на карысць гэтай гіпотэзы з’яўляецца адсутнасць звестак пра Слабодскі пасад у аповядзе аб паходзе Івана Грознага на Полацк у 1563 годзе. Тут згадваюцца Верхні замак, усе пасады і розныя тапаграфічныя аб’екты горада: град (Верхні замак), астрог (Вялікі пасад), Востраў, Крыўцова слабада, Якіманская слабада, нарэшце, Бельчыцкі манастыр, але Слабодскі пасад не згаданы ні разу (Алексеев, 2006. С. 106). У пісьмовых крыніцах XVII ст. згадваюцца людзі як з прадмесця Кабака, так і з самого Полацка, “яко съ предместья и слободки его милости пана Воеводиной” (запіс у магістрацкай кнізе 1639 г.) (Витебская старина, 1888. С. 183). У запісу падкрэсліваецца прыналежнасць пэўнай часткі мяшчан Крыўцовага пасада ўжо да юрысдыкцыі полацкага ваяводы.

Заўважым таксама, што плошча задзвінскіх пасадаў у XVI – XVIII стст. не была вялікай. Яны працягнуліся ўздоўж Дзвіны дастаткова кампактна, дзесці па мяжы сучаснай вул. Дзяржынскага, як гэта пазначана на планах горада 1707 і 1788 гадоў (Чантурия, 2005. Рис. 102, 187). Рэтраспектыўна тое ж можна адзначыць і для XVI – XVII стст. Дакладнае вызначэнне плошчы пасадаў магчыма толькі пасля правядзення археалагічных раскопак.

Для маркіроўкі лакальнай прыналежнасці насельніцтва Полацка ў сярэдзіне XVII ст. карысталіся азначэннямі “заполочане” (жыхары Запалоцкага пасада), “заречане” (жыхары левабярэжнай часткі Полацка ўвогуле),

“кабачане” (жыхары мясцовасці Кабак). Паводле пастановы полацкага магістрата ад 7 верасня 1643 года ўсе пералічаныя жыхары горада павінны былі набываць тавары выключна на рынку (ИЮМ, Вып. 25. С. 351). Кабачане, як бачым, па-ранейшаму вылучаліся асобна з агульнай колькасці задзвінскага насельніцтва. Сярод іх было шмат хлебаробаў, пра што прама згадваецца ў пастанове магістрата ад 1 мая 1640 года (Витебская старина, 1888. С. 188).

Па звестках М.В. Без-Карніловіча, да 1772 года Полацк падзяляўся на пяць частак: “1) Предъ-Двинье, 2) За-Двинье, 3) Заполотье, 4) Верхній замокъ, 5) Нижній замокъ”. Асобна пазначаецца Востраў як маёмасць полацкіх езуітаў (Без-Корнилович, 1855. С. 93 – 94). Паказальна, што гісторык прыводзіць звесткі пра Полацк другой паловы XVIII ст. Ім згадваецца былы Вялікі пасад (Прыдзвінне), Запалоцкі пасад (Запалоцце), Верхні і Ніжні замкі, былы Крыўцоў пасад (Задзвінне). Экімань нават не ўзгадваецца, па той прычыне, што гэтае пасяленне да гарадской тэрыторыі ўжо не адносілася, таксама як і другая маёмасць езуітаў – Востраў.

У сярэдзіне XVI ст. галоўная гандлёвая плошча Полацка называлася “Вялікі Торг” (Варонін, 2003. С. 39). Магчыма, менавіта за кошт вольнай плошчы Вялікага Торга ў XVII ст. магістрат пры неабходнасці выдзяляў месцы пад крамы асобным мяшчанам. С.В. Тарасавым была выказана слушная думка, што цэнтральная гандлёва-вечавая плошча ў XII ст. змяшчалася на тэрыторыі Вялікага пасада каля Чорнага ручая (Тарасаў, 1998. С. 78). Але да якога часу? Паводле нешматлікіх пісьмовых крыніц XVI – XVII стст., рынак знаходзіўся на “кгрунте меском”, асобныя гандлёвыя рады з крамамі выходзілі да ратушы: “...у рыбном концу лицом противо самого ратуша стоячый...” (Гардзееў, 2004. С. 51). Таксама звяртае ўвагу, што рынак знаходзіўся непадалёк ад дамініканскага кляштара, лакалізацыя якога добра вядома (паўночна-заходняя тэрыторыя сучаснай плошчы Свабоды). Так, сын полацкага бурмістра Хрыстафора Старымовіча, Стэфан, 2 марта 1677 года вяртаўся ўвечары з манастыра дамініканаў праз мясніцкія рады на полацкім рынку, дзе на яго жыццё быў здзейснены замах (ИЮМ, 1875. С. 245). Стэфан Старымовіч быў навучэнцам езуіцкага калегіума. Цікава, што кніга, схаваная ў яго за пазухай, захавала яму жыццё: куля прабіла кунтуш і ўсю кнігу, але затрымалася ў вокладцы.

Месцапалажэнне ратушы дагэтуль не высветлена. Усяго ў пісьмовых крыніцах XVI – XVII стст. сустракаюцца толькі пяць згадак пра ратушу, большасць з іх не маюць тапаграфічнай прывязкі (Гардзееў, 2004. С. 51; Тарасаў, 1998. С. 72). Паводле прывілею Полацку на магдэбургскае права 1498 года, палачанам даваўся дазвол на пабудову ратушы “на местцы годном”. Будаўніцтва ратушы адбылося не раней 1509 года і дзеля гэтага адмыслова была пабудавана цагельня (“плітніца”) у мястэчку Бор (Полоц-

кие грамоты, 1980. С. 61). Бясспрэчна толькі тое, што будынак ратушы знаходзіўся каля рынка на Вялікім пасадзе. Пад ратушай размяшчаліся лаўкі, у памяшканнях пры ратушы дазвалялася меціць коней, прадаваць віно, мёд, піва (Полоцкие грамоты, 1982. С. 207 – 208).

На думку С.В. Тарасава, ратуша магла размяшчацца на месцы губернскага і гарадавога магістрата XVIII ст. (мал. 3) (Тарасаў, 1998. С. 72).



Малюнак 3 – План цэнтральнай часткі Полацка 1793 года:
дом генерал-губернатара (23, 24); верхняя і ніжняя расправа,
губернская канцылярыя (25) (друкуецца паводле Ю.У. Чантурыя, 2005. Рис. 102)

Можна выказаць меркаванне, што ратуша магла знаходзіцца на месцы дома генерала-губернатара, які таксама непасрэдна прымыкаў да плошчы. Менавіта тут П.А. Русавым былі даследаваны рэшткі цагляных будынкаў XVII – XVIII стст. (Русаў, спр. 1692. С. 10). Раскапаны падмурак цаглянага дома сярэдзіны XVII ст. памерамі 9 × 30 м. Была выяўлена рэнесансная кладка сцен, падлога сутарэнняў была заліта вапнавай рошчынай. Звяртае ўвагу той факт, што да прыезду Кацярыны II у Полацк (19 – 20 мая 1780 года) быў адбудаваны каменны, багата аздоблены палац на самім рынку (Сапунов, б, г. С. 9). Гэты палац з’яўляецца домам генерал-

губернатара, які да прыезду імператрыцы мог быць узведзены на месцы ратушы з уключэннем пэўнай часткі яе будынка. У гэты час забудова цэнтральнай часткі горада праводзілася па рэгулярнаму плану па праекту І. Зігфрыдэна (Чантурия, 2005. С. 275). Варта таксама падкрэсліць, што гарадская рынкавая плошча напрыканцы XVIII ст. па-ранейшаму знаходзілася ў раёне сучаснай плошчы Свабоды, хаця сам рынак да канца XVIII ст. быў перанесены ў раён сённяшняй плошчы Ф. Скарыны.

У гэтай сувязі заслугоўвае ўвагі план Полацка 1707 года (гл. мал. 2). На плане пазначаны Верхні і Ніжні замкі, Вялікі і Запалоцкі пасады і асноўныя грамадскія і культавыя пабудовы. На Вялікім пасадзе змешчаны выявы сямі архітэктурных аб'ектаў, з іх вылучаюцца Богаяўленская царква (на правым беразе Дзвіны), езуіцкі калегіум (побач з Ніжнім замкам) і вялікія пабудовы ў цэнтры пасада. Гэтыя пабудовы вылучаюцца сваімі памерамі, значна пераўзыходзячы езуіцкі калегіум і ўсе іншыя архітэктурныя аб'екты. У пазначаным комплексе аб'яднаны тры будынкі рознай вышыні і памераў, а пасярэдзіне, сярод іх, узвышаецца вежа з рэнесансным купалам.

Неабходна заўважыць, што на арыгінальным малюнку плана гэтая пабудова адзначана як бернардзінскі кляштар (Чантурия, 2005. Рис. 187). На думку Ю.У. Чантурыя, на месцы гэтага бернардзінскага кляштара ў XVIII ст. быў пабудаваны кляштар дамініканцаў (Чантурия, 2005. С. 187). Гэта відавочна памылкова, паколькі бернардзінцы пасля выгнання іх рускім царом Іванам IV у 1563 годзе зноў былі запрошаны ў Полацк толькі ў 1696 годзе ваяводай Д. Сангушкай і размешчаны ў слабадзе Кабак (лакалізацыя бернардзінскага кляштара ў сённяшнім Задзвінні не выклікае сумненняў) (Памяць: Гіст.-дакум. хроніка Полацка, 2002. С. 201). Паводле А.Ю. Бараноўскага, гэтая пабудова з'яўляецца дамініканскім кляштарам, адпаведна два астатнія – на паўднёвы ўсход ад яе касцёл Ф. Ксаверыя; на поўдзень – францысканскі кляштар. Усе яны, на думку гісторыка, замыкалі кампазіцыю рынкавай плошчы (Baranowski, 1994. S. 30). Запісы полацкіх гродскіх кніг пацвярджаюць, што дамініканскі кляштар існаваў напрыканцы XVII ст. на тэрыторыі, прылеглай да рынка (ИЮМ, 1875. С. 245). У той час ён быў драўляны (мураваны кляштар і касцёл былі пабудаваны толькі ў 1810 годзе) (Памяць: Гіст.-дакум. хроніка Полацка, 2002. С. 201). Драўлянымі былі і ўсе пабудовы, пазначаныя на плане Полацка 1707 года на тэрыторыі Вялікага пасада. Але чаму на плане не адлюстравана выява ратушы? На той час гэта павінен быць цагляны будынак дастаткова вялікіх памераў, які цяжка было б не заўважыць у ансамблі плошчы, тым больш вылучыць яго з агульнай драўлянай забудовы. Па гэтай прычыне, на нашу думку, пад выявай, памылкова маркіраванай "бернардзінскі кляштар", змешчана выява ратушы (гл. мал. 2: 6). На карысць гэтага меркавання (аднак, не абсалютызуючы яго!) можна прывесці дадатковыя аргументы.

Так, дастаткова спрэчным падаецца той факт, што на поўдзень ад згаданага будынка размешчана выява францысканскага кляштара. Апошні знаходзіўся непадалёк ад Богаяўленскай царквы на вул. Вялікай – цяпер вул. Леніна (пазнейшы мураваны жылы корпус францысканскага кляштара захаваўся да нашых дзён). Такім чынам, замыкаць з поўдня ансамбль рынкавай плошчы гэты кляштар не мог. Тым больш на плане 1707 года кляштар знаходзіцца на значным аддаленні ад Богаяўленскай царквы. З гэтага вынікае ўмоўнасць парадку размяшчэння пазначаных архітэктурных аб'ектаў адносна адзін аднаго ў цэнтральнай частцы Вялікага пасада на плане 1707 года, што, адпаведна, ставіць пад сумненне выснову аб размяшчэнні іх *вакол* рынкавай плошчы. Калі ўсё ж прыняць меркаванне А.Ю. Бараноўскага, трэба прызнаць, што ў пачатку XVIII ст. безумоўнай архітэктурнай дамінантай рынкавай плошчы з'яўляўся дамініканскі кляштар.

Калі прыняць да ўвагі выказаныя гіпотэзы і той факт, што гандлёвыя рады рынка знаходзіліся непасрэдна насупраць ратушы, то перспектыўная тэрыторыя для пошуку месцапалажэння рынка напрыканцы XVI – XVII стст. відавочная – заходняя частка сучаснага праспекта К. Маркса з вуліцамі Савецкай, Камуністычнай і ўласна плошчай Свабоды. Пры гэтым найбольшыя пытанні выклікае лакалізацыя ўсходняй мяжы рынка (Baranowski, 1994. S. 32). Што тычыцца тэрыторыі непасрэдна каля Чорнага ручая, то тут з 1581 года размясціліся драўляныя карпусы езуіцкага калегіума.

Археалагічныя раскопкі непасрэдна на плошчы Свабоды не праводзіліся. Вялікі раскоп (1100 кв. м) быў закладзены С.В. Тарасавым на Вялікім пасадзе на аддаленасці 40 м на поўнач ад плошчы. У першым будаўнічым гарызонце (XVII – XVIII стст.) выяўлены дзве вуліцы, адна зрубная пабудова (гаспадарчая падклець) і рэшткі драўляных і цагляных падмуркаў XVIII – XIX стст. У другім будаўнічым гарызонце, які датаваны X – XIII стст., выяўлена шчыльная грамадзянская забудова (Тарасов, спр. 1014. С. 4 – 5). Паміж першым і другім будаўнічым гарызонтам размяшчаўся пласт, які не ўтрымліваў драўляных канструкцый, быў невялікай магутнасці (0,2 – 0,4 м) і датуецца XIV – XVI стст. Адсутнасць шчыльнай грамадзянскай забудовы XIV – XVII стст. можа ўскосна сведчыць на карысць размяшчэння гарадскога рынка і плошчы.

Н.І. Здановіч на месцы будучай карціннай галерэі мастацкай школы (вул. К. Маркса), каля 100 м на ўсход ад плошчы, у 1990 годзе быў закладзены раскоп плошчаю 550 кв. м (Здановіч, спр. 1213 а. С. 3). У раскопе былі даследаваны рэшткі двух розначасовых цагляных дамоў. Першы быў пабудаваны не пазней сярэдзіны XVII ст. і меў падлогу з керамічных плітак, багата аздобленую кафляную печ і сцены, складзеныя з цэглы-пальчаткі. Пазней на яго месцы быў пабудаваны другі дом, які паўтараў абрысы першага. Плошча абодвух дамоў была не менш 48 кв. м. Не выключана, што дамы былі двухпавярховымі, а раскапаны першы ярус з'яўляўся крамай.

На карысць гэтага меркавання сведчыць наступны факт. Падчас раскопак на пляцоўцы каля мастацкай школы была знойдзена вялікая колькасць размаляваных талерак (цэлых і фрагментаў) – каля 30 % ад агульнай колькасці **ўсёй** керамікі (Здановіч, Трусаў, 1993. С. 56). Такая высокая доля размаляванага посуду больш нідзе не сустракалася падчас раскопак у Полацку, што можа ўскосна сведчыць пра размяшчэнне тут лаўкі са спецыялізацыяй на продажы размаляванага посуду.

Заўважым таксама, што дзесці ва ўсходняй частцы сучаснай плошчы Свабоды, альбо ў раёне заходняй частцы сённяшняга праспекта К. Маркса з сярэдзіны XVI ст. па сярэдзіну XVII размяшчаўся кальвінскі збор. Ён знаходзіўся непасрэдна на рынку (Baranowski, 1994. S. 32).

Такім чынам, меркаванне аб размяшчэнні гарадскога рынка напрыканцы XVI – XVIII стст. на Вялікім пасадзе ў раёне сучаснай плошчы Свабоды, па даным археалагічных і пісьмовых крыніц, падаецца найбольш аргументаваным. Вольная ад забудовы плошча Вялікага Торга можа быць лакалізавана ў раёне чатырохвугольніка Чорны ручай – схіл пагорка да вул. Леніна – плошча Свабоды – Ніжні замак (мал. 4).



Малюнак 4 – План Полацка 1956 года:
1 – мяркуемая тэрыторыя, на якой размяшчаўся бернардзінскі кляштар канца XV – першай паловы XVI ст.; 2 – мяркуемая тэрыторыя размяшчэння гарадскога рынка і плошчы ў XII – першай палове XVI ст.; 3 – тэрыторыя, на якой праводзіліся раскопкі ў 2003 годзе; + – царква на рове

Скарачэнне плошчы рынка адбылося пасля будаўніцтва езуіцкага калегіума ў 1581 годзе, які мог “захапіць” таксама ўласна рынкавую тэрыторыю з крамамі і лаўкамі. Вядома, што езуіцкі калегіум паўстаў на тэрыторыі паміж замкам і рынкам (Без-Корнилович, 1855. С. 86), як раз на вольнай ад забудовы старажытнай вечавай плошчы. Тады ж “вечавая” плошча – месца грамадскіх сходаў і розных мерапрыемстваў – перамясцілася бліжэй да ратушы, верагодна, непасрэдна на сучасную плошчу Свабоды ці крыху на поўнач ад яе. Відаць, пры гэтым істотна скарацілася і яе памеры. На плошчы, як сведчаць пісьмовыя крыніцы XVII ст., па-ранейшаму адбываліся пакаранні злачынцаў. Так, мешчанін Марк Сыса быў выведзены з ратушнай турмы ў дзевяць гадзін раніцы 11 лютага 1683 года на рынкавую плошчу, дзе і быў пакараны смерцю па прысуду полацкага магістрата (ИЮМ, 1874. С. 285).

З уключэннем Полацка ў склад Расійскай Імперыі, забудова горада праводзілася па праекту рэгулярнай перапланіроўкі 1778 года. На пачатковай стадыі ён быў нязначна зменены праектам І. Зігфрыдэна 1793 года. Плошча стала асноўным звяном трохчастковай структуры цэнтра, які ўключаў дзве гандлёвыя плошчы (другая знаходзілася ў раёне сучаснай плошчы Ф. Скарыны) (Чантурия, 2005. С. 274). Змянілася і функцыя плошчы, калі раней, у XVII – трэцяй чвэрці XVIII стст., плошча характарызавалася культавай у спалучэнні з вучэбнай, гандлёвай, адміністрацыйнай і іншымі функцыямі, то напрыканцы XVIII ст. яе роля як адміністрацыйнага цэнтра ўзмацнілася, а гандлёвая функцыя ліквідавана (Чантурия, 2005. С. 275).

Ніжэй схіла пагорка да вул. Леніна (надпойменная тэраса Дзвіны) у XVII ст. размяшчалася шчыльная грамадзянская забудова. Гэта вынікае з запісу ў земскай кнізе ад 16 чэрвеня 1623 года, калі ашмянскі стараста Войцех Гамоўскі “шолъ дей до канъцелярыи земъское Полоцкое, до дому пана Яна Дагиля, подписка земского Полоцкого, на венцу, надъ рекою Двиною стоячого, черезъ рынокъ, мимо домъ пана Юря Кгутановского, балъвера Полоцкого, въ рынъку стоячый” (ИЮМ…, 1892. С. 357). Такім чынам, земская канцылярыя размяшчалася “на венцу” з боку Дзвіны (абарончыя ўмацаванні Вялікага пасада), непасрэдна каля рынка, на поўдзень ад яго.

Непасрэдна каля Чорнага ручая, на мяжы пасадскай тэрыторыі, знаходзілася царква, якая ў навуковай літаратуры мае назву “царква на рове” (роў – гэта Чорны ручай). Царква была адкрыта ў 1976 годзе падчас раскопак П.А. Рапапорта і з’яўляецца помнікам полацкай школы дойлідства XII ст. (Раппопорт, 1980. С. 143).



Малюнак 5 – Царква на рове (Ражаства Хрыстова) XII ст. План раскапаных рэшткаў (паводле П.А. Рапапорта, 1980. Рис. 9)

Ад царквы захаваўся толькі фрагмент падмурка на месцы размяшчэння апсіды (мал. 5).

Царква пабудавана з плінфы і была аздоблена фрэскавым роспісам, час яе разбурэння дакладна не вызначаны.

На думку С.В. Тарасава, гэтая царква размяшчалася непасрэдна каля гандлёва-вечавай плошчы і прызначалася для абслугоўвання патрэбаў шырокага кола палачан (Тарасаў, 1998. С. 78).

Ёсць падставы меркаваць, што царква на рове і царква Ражаства Хрыстова, якая згадваецца ў шэрагу дакументаў XVI – XVII стст. (Тарасаў, 1998. С. 173), – гэта адзін і той жа храм.

Так, паводле каштарысных кніг, царква знаходзілася на Вялікім пасадзе – “в остроге против города” (Тарасаў, 1998. С. 173).

У актавых кнігах полацкага магістрата сярэдзіны XVII ст. прыводзяцца наступныя звесткі пра царкву: “тутъ, в месте Полоцъкомъ, на улицы одъ перевозу одъ реки Двины идучы ку церкъви Рожества Хрыстова с правое стороны на полъчверъти пляца збудованый, з однъное стороны подле дому Дмитра Бахъмета а зъ другое стороны подле дому земянина воеводъства Полоцького его м (ило) сти пана Томаша Селявы” (Гардзееў, 2004. С. 58). Згаданы перавоз ад ракі Дзвіны – гэта рэчышча Чорнага ручая, па якому падвозілі грузы. Чорны ручай упадаў у Дзвіну і падзяляў Верхні замак і Вялікі пасад. Менавіта тут у XVII ст. была пабудавана вежа, мост якой перакідваўся цераз Чорны ручай (Тарасаў, 1998. С. 78). Крочыць ад ракі Дзвіны – гэта значыць рухацца ў паўночным накірунку ўздоўж Чорнага ручая ў бок царквы на рове (Ражаства Хрыстова), лакалізацыя якой вызначана археалагічна.

Другая згадка ў актавай кнізе полацкага магістрата 1650 года пра царкву Ражаства Хрыстова яшчэ больш інфарматыўная: “тут, в месте Полоцъком, будучый, на улицы, которая идет од реки Двины мимо замок ку церкви Рожественской и в рынок, стоячый…” (Актавая кніга полацкага магістрата 1650 года, 2006. С. 130). Акрамя каштоўнай інфармацыі пра тое, што сучасны Замкавы завулак прыводзіў да царквы Ражаства Хрыстова (храма на рове), мы даведваемся аб блізкім размяшчэнні рынка (вера-

годна, адразу на ўсход і на поўнач ад драўляных карпусоў езуіцкага калегіума, у тым ліку паміж валам Івана IV і калегіумам).

На карысць меркаванню аб назве згаданага храма можна прывесці яшчэ адзін аргумент. Непадалёк ад рэшткаў храма на рове, у шурфе каля лютэранскай кірхі, Н.І. Здановіч была знойдзена гербавая кафля (мал. 6), якая належала Яну Селяве і датуецца другой паловай XVII ст. (Дук, 2002 а. С. 86). Нешматлікія звесткі пісьмовых крыніц пра Томаша і Яна Селяваў не дазваляюць вызначыць ступень іх радства. З упэўненасцю можна казаць толькі пра тое, што адна з сядзіб Селяваў размяшчалася ў раёне сучаснай вул. Леніна, каля лютэранскай кірхі. Пра гэта сведчаць прыведзеныя тапаграфічныя згадкі ў дакументах. Так, "в остроге против города" ў дадзеным выпадку азначае "на пасадзе, насупраць Верхняга замка" (у крыніцах ёсць прыклады выкарыстання тэрміна "астрог" у дачыненні да Вялікага пасада, а тэрміна "горад" у разуменні "Верхні замак") (Тарасаў, 1998. С. 8) і далей – "с правое стороны (*ад царквы Ражаства Хрыстова – Дз. Дук*) на полъчверъти пляца збудованый, з однъное стороны подле дому Дмитра Бахъмета а зъ другое стороны подле дому... Томаша Селявы".



Малюнак 6 – Кафля з выявай герба Яна Селявы
(друкуецца паводле Н.І. Здановіч, 1997. Мал. 9)

Такім чынам, прыведзеныя звесткі археалагічных і пісьмовых крыніц XVI – XVII стст. дазваляюць атаясамліваць царкву Ражаства Хрыстова з царквой на рове. Вядома, што царква мела цмінтар (месца размяшчэння царкоўнага падвор'я з могілкамі і агароджай) і была адбудавана дзесці ў пачатку XVII ст., верагодна, пасля Інфлянцкай вайны. Паводле заявы полацкіх праваслаўных мяшчан ад 12 красавіка 1621 года, "а мы дей церковь

будовали, намъ вольно тело умерлыхъ тамъ ховати” (Витебская старина, 1888. Ч. 1. С. 120). З другой трэці XVII ст. царква належала уніятам і была па-ранейшаму мураванай. Гэтая выснова вынікае са зместу каштарыснай кнігі Полацка за 1654 год “Въ остроге противъ города унейской церкве Рожества Христова 2 колокола, одинъ пудовъ въ 20, а другой пудовъ въ 5”, і далей, у гэтай жа кнізе, згадваецца царква Спаса ў Богаяўленскім манастыры, якая была “брусяная, рублена в 12 стенъ” (*падкрэслена аўтарам – Дз. Дук*) (Витебская старина, 1885. Ч. 2. С. 278).

Таксама з пэўнай верагоднасцю можна лакалізаваць размяшчэнне царквы св. Духа і будынкаў драўлянага бернардзінскага кляштара ў Запалоцці. Прывілеем 1498 года вялікага князя Аляксандра бернардзінцам дазвалялася жыць у Полацку на ўчастку горада, які ляжыць (цытуецца паводле В.А. Вароніна) “пад замкам... уздоўж ракі Палаты, пачынаючы ад ракі Палаты каля шырокага маста і трымаючыся паабапал дарогі ці гасцінца, які вядзе ад замка да царквы святога Духа, і зноў даходзячы да вышэйзгаданай ракі Палаты, разам з ... лугам, размешчаным там жа” (Варонін, 2000 а. С. 251). У тэксце акрэслены чатырохвугольнік: вусце Палаты, каля якога знаходзіўся мост, – дарога да царквы св. Духа – зноў рака Палата і луг.

Другая згадка сярэдзіны XVII ст. пра царкву св. Духа ў Запалоцці вызначае каардынаты вул. Зарачонай: “за Полотою в заулъку под улицы Заречоное, ку церкви Светог(о) Д(у)ха идучой, стоячый” (Гардзееў, 2004. С. 58).

На гравюры Я. Баптысты 1580 года ў заходняй частцы Запалоцця змешчана выява адной царквы (мал. 7).

Выразна бачна, што храм арыентаваны па накірунку ўсход – захад і мае двусхільны дах з шатровым пакрыццем і крыжом (гл. мал. 7). Да супрацьлеглага канца прымыкаў двух’ярусны аб’ём, які мог быць званіцай (Якимович, 1991. С. 271). Гэты комплекс не мог быць бернардзінскім кляштарам, паколькі апошні ў 1563 годзе быў спалены па загаду Івана IV (бернардзінцы вяртаюцца ў Полацк толькі напрыканцы XVII ст. і ўзводзяць спачатку драўляныя, а потым і мураваныя будынкі кляштара, ужо ў Задзвінні) (Ярашэвіч, 1999. С. 536). Найверагодней, што на плане адлюстравана царква св. Духа, а пазначаная ў Прывілее 1498 года тэрыторыя, якая належала бернардзінцам, размяшчалася ва ўсходняй частцы Запалоцкага пасада ў раёне сучасных вуліц Краснова і Міхайлаўскай. Дарэчы, поплаў і зараз знаходзіцца ў паўночна-ўсходняй частцы Запалоцця, насупраць заходняга мыса Верхняга замка (раён Машны). Царква св. Духа магла размяшчацца на захад ад пазначанай тэрыторыі, магчыма, у раёне сённяшняга аўтамабільнага маста праз Дзвіну.



а)

б)

Малюнак 7 – План Полацка паводле гравюры Я. Баптыста “Аблога Полацка войскам Стэфана Баторыя ў 1579 г.” (а) і мяркуемая выява царквы св. Духа ў Запалоцці (б) (Друкуецца паводле С.В. Тарасава. Памяць: Гіст.-дакум. хроніка Полацка, 2002. С. 146)

Аб знешнім выглядзе касцёла бернардзінцаў у Полацку можна меркаваць па выявам фрэсак касцёла святых Францішка і Бернардзіна ў Вільні. Фрэскі былі адкрыты ў 1990-х гадах; адна з іх прысвечана пакутніцкай смерці айцоў-бернардзінцаў у Полацку ў 1563 годзе. На думку В.В. Глінніка, пэўная частка сюжэта фрэскі мае падабенства з рэальным Полацкам XVI ст.

Калі гэта так, то на фрэске адлюстравана магчымая выява драўлянага бернардзінскага касцёла з вежай-званіцай (Глініік, 2004. С. 154).

Аб размяшчэнні бернардзінскага кляштара ва ўсходняй частцы Запалоцця ёсць ускоснае археалагічнае пацверджанне. У 2003 года намі былі праведзены раскопкі на паўночна-ўсходняй ускраіне Запалоцкага пасада (гл. мал. 4). Гэтая тэрыторыя знаходзіцца на правым беразе Палаты, насупраць Верхняга замка (раён г. зв. Машны). Сёння тут размешчаны агароды, побач (каля Палаты) – поплаў. З захаду і поўдня да пляцоўкі прымыкае ўскраіна шчыльна заселенага Запалоцця, з поўначы – сучасны мікрараён Полацка (“Аэрадром”). Адлегласць да Дзвіны складае 500 м.

У шурфе, закладзеным на адным з агародаў, на глыбіні 1 – 1,2 м ад дзённай паверхні была выяўлена аснова печы ў выглядзе прамавугольніка з цагляна-гліняным запаўненнем, памерамі 1,1 × 0,8 м. У гэтай печы выкарыстоўвалася гаршковая кафля (мал. 8: 1).



Малюнак 8 – Графічная рэканструкцыя печы XV ст. з Запалоцця (1) (зроблена А.А. Салаўёвым; раскопкі Д.У. Дука); графічная рэканструкцыя печаў XIV – XV стст. з княжацкага церама (2 – 4) (зроблена Ю.А. Заяцам; раскопкі П.А. Рапапорта)

Датаванне печы XV ст. вызначаецца як спектрам знаходак непасрэдна з яе самой (кафля, цэгла), так і з культурнага пласта каля печы (керамічны посуд і бронзавая зашпілька “пус ейпі”).

Падчас раскопак было высветлена, што даследуемая тэрыторыя ў XV ст. з’яўлялася месцам жыхарства заможных гараджан. Папярэдне вызначана, што ў паўночнай частцы Запалоцкага пасада месцілася сама меней адна феадальная сядзіба, сляды якой (развал кафлянай печы) былі зафіксаваны падчас шурфоўкі (Дук, 2006 д. С 104 – 106).

Тэхналогія, па якой пабудавана печ, дагэтуль выкарыстоўвалася толькі ў печах княжацкага церама XIV – XV стст. на Верхнім замку (гл. мал. 8).

На думку А. Дзярновіча, такія печы будаваліся нямецкімі майстрамі з Любека (Дзярновіч, 1996. С. 247).

Печы з гаршковай кафлі ў XIV – XV стст. былі вельмі рэдкімі і з’яўляліся заходнееўрапейскай навацыяй у матэрыяльнай культуры заможнай часткі палачан (Дук, 2005. С. 50).

Рамесныя кантакты ажыццяўляліся рознымі шляхамі. Вядома, напрыклад, што ў сярэдзіне XV ст. палачане куплялі ў Рызе вапну і запрашалі адтуль будаўнікоў-немцаў (Памяць: Гісторыка-дакументальная хроніка Полацка, 2002. С. 142).

Не выключана, што адкрыты археалагічны комплекс з’яўляўся часткай двара, які трымалі ганзейскія купцы і які з канца XV ст. мог належаць бернардзінскаму кляштару. У любым выпадку, тэрыторыя для размяшчэння кляштара была абрана не выпадкова. На працягу стагоддзяў размяшчэнне культавых пабудоў у Полацку заўсёды адпавядала патрэбам палачан. Каталіцкі храм мог быць узведзены на месцы пражывання максімальнай колькасці вернікаў адпаведнай канфесіі.

Выказаныя меркаванні аб размяшчэнні пазначаных тапаграфічных аб’ектаў могуць знайсці трывалае пацверджанне падчас правядзення новых археалагічных раскопак.

Канчаткова вырашыць пытанне пра месцазнаходжанне гарадской ратушы можна пры дапамозе новых звестак з пісьмовых крыніц, паколькі культурны пласт на месцы будынкаў вакол сучаснай плошчы Свабоды збольшага ўжо страчаны.

3. ПОЛАЦКАЯ АРХІТЭКТУРНА-ДЭКАРАТЫЎНАЯ КЕРАМІКА

3.1. Вытворчасць кафлі і аздабленне полацкіх печаў

У XVI ст. кафлю ў Полацку выраблялі ганчары, якіх пацвярджальная грамата Жыгімонта I гораду на магдэбургскае права 1510 года (ці 1509) называе сярод 17 рамесных спецыяльнасцяў (Полоцкие грамоты XIII – начала XVI в., 1980. С. 57). У XVII ст. у Полацку паскорылася канцэнтрацыя рамеснікаў у межах асобных цэхаў, аднак цэха кафляроў у горадзе створана не было. У XVII – XVIII стст. вытворчасцю кафлі па-ранейшаму займаліся рамеснікі-кафляры, што ўвайшлі з 1643 года ў цэх ганчароў (Археографический сборник..., 1867. С. 333).

3.1.1. Кафля першай паловы XVI стагоддзя

Па канструкцыйных асаблівасцях усю полацкую кафлю можна падзяліць на тры групы: гаршковую, праразную і каробчатую (пласцінчатую). Найбольш старажытны тып – гаршковая кафля, на яе долю прыходзіцца да 13 % знаходак з усіх тыпаў полацкай кафлі XIV – XIX стст. (табл. 2). У Полацку гаршковая кафля прадстаўлена чатырма варыянтамі (Дук, 2001 ж. С. 167 – 168).

У XV ст. на тэрыторыі ВКЛ адбываецца пераход да познегатычнай каробчатай кафлі. Гэты працэс патрабаваў змены канструкцыі печаў (Dąbrowska, 1987. S. 61). Познегатычная і раннерэнесансная печ мела больш складаную архітэктурную канструкцыю. Яе форма з характэрнай зменай праекцыі і шмат'яруснай кампазіцыяй падобна на гатычную вежу (Dąbrowska, 1987. S. 274, s. 331). Верагодна, такія печы мелі простую праматочную сістэму ацяплення. Зробленая Л.Г. Панічавай рэканструкцыя печы № 4 (Паничева, 1981. Рис. 2, б) будынка ля княжацкага церама, не з'яўляецца дакладнай і не мае дачынення да названага комплексу (Заяц, 1997. С. 94). Тым не менш двух'ярусныя печы з цыліндрычнай надстаўкай сапраўды існавалі ў Полацку (Дук, 2001 ж. С. 168).

Праведзеныя аўтарам разлікі паказваюць, што дыяметр надставы такой печы складаў каля 63 см, а карніз быў зроблены з 11 аднатыпных кафляў (мал. 9). Існаванне печаў з цыліндрычнай надстаўкай па еўрапейскіх матэрыялах прыпадае на час з канца XV па сярэдзіну XVI ст. (Dąbrowska, 1987. S. 161, ryc. 13 – 14, 18, 33).

Табліца 2 – Размеркаванне полацкай кафлі па тыпах (па матэрыялах фондавай калекцыі НПГКМЗ)

Тып кафлі і датаванне	Гаршковая і міскавая кафля XIV– сярэдзіны XVI стст.	Каробчатая кафля XV– першай паловы XVI ст.	Каробчатая кафля канца XVI – XVII стст.	Каробчатая кафля XVIII ст.	Каробчатая кафля XIX ст.	Усяго з калекцыі	Крыніца
Колькасць знаходак	1	–	116	25	20	162	Кафля з раскопак Н.І. Здановіч
	150	11	14	1	–	176	Кафля з раскопак П.А. Рапапорта
	–	–	51	35	–	86	Кафля з раскопак П.А. Русава
	1	–	192	67	22	182	Кафля з раскопак Вал.А. Булкіна
	9	7	450	45	24	535	Кафля з раскопак С.В. Тарасава
Усяго	161	18	823	173	66	1241	–
Усяго (%)	13	2	66	14	5	100	–



Малюнак 9 – Паўцыркульная карнізная кафля першай паловы XVI ст. (знойдзена А.А. Салаўёвым)

Па полацкіх матэрыялах добра прасочваецца эвалюцыя гаршковай кафлі. Памяншаецца агульная вышыня вырабу і пашыраецца прамавугольнае вусце. Донца гэтак званай “міскавай” кафлі ўпрыгожваецца насечкамі ў выглядзе салярнага круга, а з 20-х гадоў сярэдзіны XVI ст. у Полацку, як і ў іншых гарадах Беларусі і Польшчы, ужываецца паліва (Паничева, 1980 а. С. 12; Трусов, 1988. С. 136; Dąbrowska, 1987. S. 79).

Па прычыне фрагментарнасці знаходак пакуль што не ўдаецца вылучыць асобныя варыянты паліванай міскавай кафлі. Адзначым асабліва папулярны ў палачан арнамент з выявай шматпялёсткавай разеткі, на якой ужываецца зялёная паліва (Фонды НПГКМЗ. Кп-346).

Трансфармацыя формаў міскавай кафлі знайшла ўвасабленне ў пашырэнні вырабаў з рэльефнай рамкай і сегментападобным заглыбленнем у цэнтры пласціны (Фонды НПГКМЗ. Кп-203/133).

Аднатыпных фрагментаў у Полацку знойдзена пяць экзэмпляраў (Лугіна, 1999. С. 51), адна кафля цэлая (мал. 10: 1).

Наяўнасць амаль дакладных аналогій у беларускім і польскім кафлярстве (Звяруга, Сагановіч, 1993. С. 24; Zubrzycki, 1915. Ryc. 21) дазваляе датаваць гэтую групу полацкай кафлі першай паловай XVI ст.

Утылітарныя вырабы адметнай формы міскавай кафлі знойдзены падчас даследавання пабудовы першай паловы XVI ст. (мал. 11: 4).

Кафля была зроблена з белай гліны, таксама як і значная частка керамікі з гэтага раскопу. Кафля мае масіўнае донца дыяметрам 9,5 см, акруглае венца-раструб дыяметрам ад 16 да 20 см, агульная вышыня вырабу дасягае 13 см.

Самая старажытная каробчатая кафля – тэракотавая, бязрамачная, з высокім рэльефам (гарэльефам). Яе характэрнай рысай з’яўляецца незвычайная буйнанафігурнасць выяў. Датаванне бязрамачнай кафлі – сярэдзіна XV – першая палова XVI ст. (Паничева, 1981. С. 280).



Малюнак 10 – Міскавая (1) і каробчатая кафля XV – першай паловы XVI ст. (2 – 9); 1 – раскопкі Вал.А. Булкіна; 2 – 8 – С.В. Тарасава; 9 – Д.У. Дука

У Полацку ранняя каробчатая кафля прадстаўлена самай нешматлікай групай – 2 % ад усіх знаходак кафлі XIV – XIX стст. (гл. табл. 2).

Полацкая бязрамачная кафля падзяляецца на шэраг варыянтаў, па вызначэнню Л.Г. Панічавай, – не менш чатырох. Гэта гатычныя гарэльефы з выявамі людзей, драконаў, фантастычных і рэальна існуючых жывёл (Паничева, 1981. С. 276 – 278. Рис. 2). Да асобнага, пятага, варыянта трэба аднесці фрагмент кафлі-маскарона (Дук, 2001 ж. С. 168 – 169).

Сюжэт выявы кафлі-маскарона належыць да вечнага пытання барацьбы дабра са злом (гл. мал. 10: 4). Унізе пласціны размешчана тулава драконападобнай істоты з падвоенымі кіпцюрастымі лапамі. Над ёй –

выява чалавечага твару. У ВКЛ у канцы XVI ст. замест вобраза чалавека ў падобнай тэматыцы часта ўжываўся матыў “дрэва жыцця” (Угрыновіч, 1988. С. 47). На тэрыторыі Віленскага замка кафлі-маскароны з гратэскным арнаментам характэрны для першай паловы XVI ст. (Tautavičius, 1969. S. 13).



Малюнак 11 – Каробчатая кафля
з міфалагічнай тэматыкай XVI – XVII стст. (1 – 3); белагліняная міскавая кафля
з пабудовы першай паловы XVI ст. (4);
1 – 2 – раскопкі С.В. Тарасава; 3 – А.Р. Мітрафанава; 4 – Д.У. Дука

Асноўная група полацкай кафлі XVI ст. мае па баках контурную рамку, змешчаную на прамавугольнай, часта квадратнай, пласціне з румпай для мацавання ў сцяне печы. Сабраны нешматлікія фрагменты рамачнай кафлі, кожны з якіх прадстаўляе пэўны сюжэт з жыцця тагачаснага грамадства. На адной тэракотавай кафле адлюстраваны партрэт скамароха (Фонды НПГКМЗ. Кп-15-15564). Яго аблічча перададзена ў тэхніцы гарэльефа (гл. мал. 10: 2). На галаве юнак насіў чалму і, верагодна, з'яўляўся выхадцам з Усходу. Прафесія скамароха пазначана ў ліку 17 спецыяльнасцяў полацкіх рамеснікаў у 1510 годзе (ці 1509) (Полоцкие грамоты XIII – начала XVI в., 1980. С. 57). Да ліку "экзатычных" таксама можна аднесці прафесію цымбаліста яўрэя Сымона Іюды, згаданай у сярэдзіне XVII ст. (Актавая кніга полацкага магістрата 1650 г., 2006. С. 70). Гэты яўрэй пражываў у доме полацкага бурмістра Абрама Юрэвіча, які, відаць, актыўна карыстаўся яго паслугамі.

Фантастычная пачвара з тулавам, пакрытым рыбінай лускай, нагамі ільва, галавой, крыламі і кіпцюрамі арла змешчана на тэракотавай пласціне, што была знойдзена падчас раскопак А.Р. Мітрафанава на Верхнім замку (Фонды НМРБ. Кп-878/302). Пласціна цалкам адпавядае папулярным у Полацку гатычным сюжэтам XV ст. Верагодна, на кафлі адлюстраваны вобраз Сімаргла, які выступаў у розных абліччах і быў вельмі папулярны ў арабскай, візантыйскай, іранскай, славянскай і іншых міфалогіях (Тревер, 1933. С. 324 – 326). У Полацку выява Сімаргла сустракаецца нават на кафле сярэдзіны XVII ст. (вобраз нябеснага сабакі) (Дук, 2001 б. С. 42) (гл. мал. 11: 3).

Паліваная кафля з вельмі падобным малюнкам і тэхнікай выканання знойдзена на гарадзішчы ("Замак") каля вёскі Гарадок Маладзечанскага раёна (датуецца 1520 – 1530-мі гг.) (Звяруга, Сагановіч, 1993. С. 162), а таксама падчас прамысловых работ каля станцыі метро Няміга ў г. Мінску. Не выключана, што кафля з Гарадка і полацкая пласціна з выявай Сімаргла была выраблена ў адной матрыцы ці нават адным майстрам.

Адна са шматлікіх груп беларускай кафлі мае розныя варыянты выявы св. Юр'я (Георгія) змееборца (Здановіч, трусаў, 1993. С. 53; Трусов, 1990. С. 339 – 340). У Полацку таксама знойдзена стылізаваная выява св. Юр'я на кані (Фонды НМГКМЗ. Квф-2-978/100). Выява святога з німбам над галавой зроблена невысокім рэльефам, яго тулава развернута да гледача (гл. мал. 10: 3). У правай руцэ ён трымае ключы. Згодна з народнымі ўяўленнямі, гэтымі ключамі "осенний Юрий отмыкает рты волкам" і тыя пачынаюць хадзіць стаямі і нападаць на свойскую жывёлу, пакуль вясенні Юры "не замыкает рты зверям" (Булгаковский, 1890. С. 179).

Асобна сярод матываў полацкай кафлі вызначаецца выява рыцара (Фонды НПГКМЗ. Кп-15-15563). Каштоўнасць знаходкі вызначаюць дакладна перададзеныя дэталі ўзбраення рыцара (гл. мал. 10: 6). Воін мае прычоску на манер татарскіх вершнікаў – гэтая рыса перададзена дастаткова рэалістычна. Па часу ўжывання нагруднікаў з тапулем (г. зв.“зброі бляхавай”) кафлю можна аднесці да другой чвэрці XVI ст. (Бохан, 2002. С. 66). Вядома, што ў першай палове XVI ст. Полацк неаданаразова станавіўся аб’ектам нападу татараў (1508, 1519) (Памяць: Гіст.-дакум. хроніка Полацка, 2002. С. 130), але гэта не тлумачыць з’яўленне выявы на кафле. Падаецца найбольш верагоднай другая прычына: пад 1522 год маюцца звесткі аб наданні татарам-“казакам” зямельных уладанняў у Полацку (Любавский, 1892. С. 532). Адлюстраваны на кафле сюжэт павінен быць тыповым у жыцці палачан XVI ст., і яго можна разглядаць як прыклад этнічнай талерантнасці насельніцтва рэнесанснага Полацка.

Наступная група арнаментальных матываў прадстаўлена дзвюма паліванымі рэльефнымі выявамі – гэта мадонна з немаўляткам і русалка (Фонды НПГКМЗ. Кп-15-15571, кп-15-15572). Вонкавая паверхня абедзвюх пласцін злёгку ўвагнутая, з нешырокай (да 1 см) рамкай па краях, ужыты карычневаты, празрысты колер палівы. Па складу фармовачнай масы і мастацкім прыёмам выканання можна сцвярджаць, што гэтыя кафлі паходзяць з адной ганчарнай майстэрні. Ніякіх істотных адрозненняў, акрамя сюжэту выяў і несупадзення фармата пласціны, яны не ўтрымліваюць.

Выява мадонны нагадвае абраз “Маці Божая Замілаваная Спаручніца” (Высоцкая, 1986. С. 184). Маці Божая прадстаўлена ў кароне з шатамі і мафорыі (гл. мал. 10: 5). Карона выконвае рэпрэзентатыўную функцыю – падкрэслівае асаблівую значнасць вобраза ў аздабленні печы (Максімава, 1994. С. 143). Кафля з выявай мадонны, вельмі падобная на полацкую, знойдзена ў Друі і датуецца першай паловай XVI ст. (Зайцава, 1990. С. 81); пласціна з аналагічным матывам знойдзена на тэрыторыі Польшчы (Dąbrowska, 1987. S. 129). Па ўсіх прыкметах полацкую мадонну можна аднесці да першай паловы – сярэдзіны XVI ст.

У адрозненні ад выявы Маці Божай, вобраз русалкі (гл. мал. 10: 8) падаецца на пласціне з вертыкальным паўцыркульным паглыбленнем. Згодна з народнымі павер’ямі беларусаў, у русалкі няма рыбінага хваста. Відавочна, што ў дадзеным выпадку прасочваецца трансфармацыя заходнееўрапейскага ўплыву (жанчына з рыбіным хвастом) на мясцовай глебе. Русалка знаходзіцца пад вадой. У левай руцэ яна трымае сноп жыта, што адпавядае ўяўленням беларусаў аб норавах русалак – дэманічных істот, якія сцерагуць нівы (Federowski, 1897. S. 75; Pietkiewicz, 1938. S. 186).

У дэкоры кафлі відавочна спроба перадачы прасторавай кампазіцыі (другі план), што адлюстроўвае рэнесансныя тэндэнцыі.

Вялікую цікавасць прадстаўляе фрагмент кафлі з іканаграфічнай выявай прарока Даніила ў рове з ільвамі (гл. мал. 10: 9). Гарэльеф выкананы вельмі рэалістычна і мае сляды дапрацоўкі пасля адціскання ў форме. Па ўзроўню дэталізацыі гэтая кафля не мае аналагаў сярод полацкіх матэрыялаў.

Выява жанчыны, у адрозненні ад партрэтнай кафлі XVI ст., не ставіць мэтай перадачу характара ці статуса пэўнай асобы – гэта мастацкі вобраз (гл. мал. 10: 7), выкананы гарэльефам з ужываннем глухой зялёнай палівы (Фонды НПГКМЗ. Кп-15-15565). Вобразы жанчыны з алегарычным сюжэтам характэрны для сярэдзіны XVI ст. (Трусаў, 1992. С. 98 – 99, мал. 2). У другой палове XVI ст. на тэрыторыі ВКЛ атрымліваюць распаўсюджванне партрэтныя выявы (Tautavičius, 1969. S. 6).

Такім чынам, полацкая кафля XIV – сярэдзіны XVI ст. вылучаецца сярод архітэктурна-дэкаратыўнай керамікі з іншых гарадоў ВКЛ па разнастайнасці прыёмаў выканання і жанравай тэматыцы (найперш гэта тычыцца каробчатай кафлі). У тэматыцы выяў часта суіснуюць усходнія і заходнееўрапейскія сюжэты. На прыкладзе полацкай кафлі XVI ст. бачны эвалюцыйны пераход ад познегатычнай тэракотавай да рэнесанснай паліванай кафлі.

3.1.2. Кафля канца XVI – XVII стагоддзяў

Кафля канца XVI – XVII стст. – самая шматлікая ў колькасных адносінах – на яе долю прыходзіцца да 66 % ад усіх знаходак полацкай кафлі (гл. табл. 2).

Багацце дэкору і разнастайнасць матываў дазваляюць падзяліць яе на тры асноўныя групы:

1) геральдычная кафля;
2) сюжэтная кафля;
3) кафля з раслінным і геаметрычным арнаментам.

3.1.2.1. Геральдычная кафля

Ужыванне кафлі з гербамі ў Полацку адзначаецца з канца XVI ст., што адбылося амаль праз стагоддзе, чым у цэлым па Еўропе (Dąbrowska, 1987. S. 126; Dymnek, 1995. S. 34 – 35; Tautavičius, 1969. P. 16 – 17), і на паўстагоддзе пазней у параўнанні з беларускім кафлярствам. Гэта можа тлумачыцца наступствамі Інфлянцкай вайны (1558 – 1582).

Па сваёй прыналежнасці ўсе гербы падзяляюцца на дзяржаўныя і асабістыя кляйноты свецкіх ці духоўных феадалаў. Да першай групы належаць пласціны з выявамі герба “Пагоня” і арлоў у геральдычнай паставе

(Здановіч, 1997. С. 106 – 107). Выявы арлоў атрымалі шырокае распаўсюджванне ў еўрапейскім кафлярстве як сімал самай дасканалай, універсальнай формы дзяржавы (Марзалюк, 1992. С. 63 – 64).

Найбольш шматлікая і разнастайная група кафлі выраблялася ў Полацку па заказу прыватных асоб. На кафле звычайна месціліся гербы сярэдняй і заможнай шляхты, а таксама прадстаўнікоў буйных княжацкіх і шляхецкіх родаў, такіх як Дарагастайскія, Друцкія-Сакалінскія, Зяновічы, Кішкі. Полацкая шляхецкая геральдыка, як і ў цэлым па краіне, развівалася пад непасрэдным уплывам рэнесанснага і барочнага мастацтва, у выніку чаго ўтварыўся гэтак званы камбінаваны герб (Шаланда, 2001. С. 3).

На аснове супастаўлення шматлікіх фрагментаў удалося зрабіць графічную рэканструкцыю знешняга выгляду кафлі з выявамі гербаў роду Кішак (мал. 12: 1). Уся кафля знойдзена на Верхнім замку падчас нагляду С.В. Тарасава за будаўнічай траншэяй ў 1993 годзе.



1

2

Малюнак 12 – Кафля з выявай радавых гербаў Януша Кішкі (1)
і Крыштафа Друцкага-Сакалінскага (2);
1 – раскопкі С.В. Тарасава; 2 – С.В. Тарасава і Д.У. Дука

На вонкавай паверхні пласціны месціцца выява геральдычнай тарчы нямецкага тыпу з падзелам на чатыры часткі. У правым верхнім вуглу размешчаны герб “Дуброва” (падкова з трыма крыжамі), пад ім – герб

“Трубы”. Злева ўверсе – герб “Ліс”, ніжэй – “Касьцеша”. Тарча ўвенчана рыцарскім гелмам з каронай і птушыным крылом, працятым стралой, у кляйноце. Малая колькасць шчылінаў у гелме сведчыць аб даўняй радавітасці ўладальніка. Вакол тарчы змешчаны намёт у выглядзе парасткаў. Па ўсяму люстэрку кафлі – над тарчай, па баках намёта і пад ім – пачаргова адціснуты лацінскія літары “I K W P H P W X L P S”. Акрамя стандартнай абрэвіятуры “WXL”, што азначае “Wielkie Xięstwo Litewskie” (“Вялікае княства Літоўскае”), астатнія літары з’яўляюцца пачатковымі ад імя ўладальніка герба і яго пасады.

Дакладна такая ж тарча з чатырохчастковым дзяленнем і аднолькавымі гербамі вядома па пячаткам славутага шляхецкага роду Кішак (Цітоў, 1993. С. 46, 99). На адной з пячатак 1616 года Станіслава Кішкі над тарчай размешчана выява епіскапскай шапкі, што сведчыць аб пасадзе ўладальніка (біскуп Жмудскі). На пячатцы яго брата – падскарбія літоўскага Мікалая Кішкі – тарчу вянчае гелм і кляйнот з пёрамі. Адлюстраваны на полацкай кафле герб належыць Янушу Кішке – апошняму прадстаўніку свайго роду, які памёр у 1653 годзе і не пакінуў пасля сябе нашчадкаў па мужчынскай лініі. Надпіс на лаціне расшыфроўваецца як “Ianusz Kiszka Woiewoda Polotskij Hetman Polny WXL Parnawskij Starosta” (Януш Кішка, ваявода полацкі, палявы гетман ВКЛ, парнаўскі стараста).

Януш Кішка атрымаў у 1610 годзе Парнаўскае староства, а з 1621-га ён займае пасаду полацкага ваяводы. У 1635 годзе Я.С. Кішка становіцца палявым гетманам, пакуль у 1646 годзе не атрымаў званне вялікага гетмана Літоўскага (Boniecki, 1907. S. 104). Значыць, кафля з ініцыяламі Я.С. Кішкі была зроблена ў прамежку часу, калі ён займаў пасаду палявога гетмана, г. зн. паміж 1635 і 1646 гадамі.

Цікава адзначыць той факт, што тры браты апошняга пакалення Кішак змясцілі на полі тарчы аднолькавыя гербы. Уверсе, у правым вуглу тарчы, размешчаны асабісты герб Кішак – “Дуброва”; пад ім – герб “Трубы” Ганны Радзівіл, бабкі па бацькоўскай лініі Януша Станіслававіча і яго братоў, злева ўверсе – герб “Ліс” маці Эльжбеты Сапегі, а пад ім старажытны герб Хадкевічаў – “Касьцеша”. Адзначым, што ніводнае з правіл геральдыкі, пра якія распавядаюць польскія аўтары XVIII ст., у дадзеным выпадку не дзейнічае. На тарчы з чатырохчастковым дзяленнем (scutum quadripartitum) гербы змяшчаліся наступным чынам: у галоўнай частцы тарчы (справа ўверсе) – радавы герб уладальніка, злева ўнізе – герб жонкі дзеда. Далей, згодна з Ю.А. Ябланоўскім (Jabłonowski, 1748. Ee 2), злева ўверсе павінен размяшчацца герб маці, справа ўнізе – герб дзеда; паводле В.В. В’еландка (Wielądko, 1792. S. 2 – 3), адпаведна гербы дзеда і маці.

Відавочна, што складальнікі герба (а гэта мог быць любы з братоў) кіраваліся імкненнем сабраць на полі тарчы гербы сваіх найбольш радавітых продкаў і пазбегнуць такім чынам паўтора геральдычных матываў. У беларускай геральдыцы вядомы прыклады, калі гербы вельмі шануемых у родзе продкаў уключаліся ў кляйноты нават некалькіх пакаленняў (Бубенька, 1994. С. 116). Па гэтай прычыне сюды трапіў радавы герб Хадкевічаў – Ганна Хадкевіч была бабкай па мацярынскай лініі Януша Кішкі (Niesiecki, 1841. S. 244). Сваяцтва Кішак і Хадкевічаў працягвалася здаўна – Барбара Хадкевіч была другой жонкай Мікалая Пятровіча Кішкі, ваяводы падляшскага, іх нашчадкі ўтварылі другую галіну роду Кішак (Boniecki, 1883. Ryc. 20).

Такім чынам, герб Я.С. Кішкі састаўлены па прынцыпу: уверсе радавы герб і герб маці, унізе – гербы бабак па бацькоўскай і мацярынскай лініях. Дакладна такі ж парадак размяшчэння гербаў на поле тарчы адзначаны на заслаўскай кафле, што належала Глябовічам (Заяц, 1990. С. 33 – 34). Гэтае супадзенне цяжка аднесці да выпадковага. У беларускай і польскай геральдыцы вядомы прыклады адыхода ад склаўшыхся канонаў (Бубенька, Хмяльніцкая, 1994. С. 116; Цітоў, 2000. С. 66; Niesiecki, 1839. S. 480). Але ў дадзеным выпадку мае месца не просты адыход – пры састаўленні гербаў роду Глябовічаў і Кішак іх уладальнікі карысталіся традыцыяй, якая адрознівалася ад прынятай у Польшчы. Папярэдне можна адзначыць, што гэтай традыцыяй (як асноўнай) прадстаўнікі патрыцыяту карысталіся пры састаўленні гербаў, па меншай меры, у Полацкім ваяводстве.

Падчас раскопак у двары былога езуіцкага калегіума быў выяўлены невялікі фрагмент гербавай кафлі, якая належала старажытнаму роду князей Друцкіх. Прадстаўнікі буйной галіны гэтага роду – Друцкія-Сакалінскія – займалі розныя пасады ў Полацку і Полацкім ваяводстве.

Уцалела няпоўная выява тарчы з чатырохчастковым дзяленнем. Тарчу вянчае рыцарскі гелм з княжацкай мітрай (гл. мал. 12: 2). У правым верхнім вуглу змешчаны ўласны герб Друцкіх – меч паміж чатырма паўмесяцамі, звернутымі рагамі адзін да аднаго. Каб вызначыць імя ўладальніка, неабходна даведацца аб прыналежнасці ўсіх астатніх гербаў. Дзеля гэтага паспрабуем узяць за аснову традыцыю, якой карысталіся складальнікі гербаў Глябовічаў і Кішак.

Вынікае, што гэтая пласціна належала князю Крыштафу Міхайлавічу Друцкаму-Сакалінскаму (каля 1580 – 1639), які з 1625 года займаў пасаду полацкага кашталяна. Яго бацька, князь Міхаіл Міхайлавіч, ваявода полацкі, меў дзвюх жонак. Другая жонка – Ганна Пяноўская – была маці Крыштофа Міхаіла (Wolff, 1895. S. 481). Дзед Крыштофа Міхаіла па лініі маці – Якуб Пяноўскі – быў жанаты на Алене Лукомскай, прадстаўніцы

княжацкага роду герба “Рох” зменены (Kojałowicz, 1897. S. 263). Няпоўная (з-за пашкоджанасці) выява гэтага герба адлюстравана ў левым ніжнім вуглу тарчы (лілея з крыжам). У правым ніжнім вуглу змяшчаецца герб “Шэнява” бабкі Крыштафа Міхаіла па мужчынскай лініі Ганны Рагозы. Герб, змешчаны ў левым верхнім вуглу тарчы, павінен належаць маці Крыштафа Міхаіла – Ганне Пяноўскай. Сучасны стан даследаванняў не дазваляе вызначыць радавы герб Пяноўскіх; можна меркаваць па выяве, што ім мог быць герб “Боньча” ці “Адзінарог”.

Князь Крыштаф Міхаіл займаў пасаду полацкага кашталяна з 1625 года да сваёй смерці ў 1639 годзе. Час вырабу кафлі можна акрэсліць дзвюма датамі – паміж 1625 і 1639 гадамі.

Па вызначэнню Н.І. Здановіч, кафля з выявай герба “Ляліва” была выраблена ў самым пачатку XVII ст., не пазней 20-х гадоў (Здановіч, 1997. С. 105. Мал. 9). Знойдзена яна падчас раскопу на вул. Леніна, 35 і паходзіць з развалу печы адной драўлянай пабудовы, якая існавала ў XVI – пачатку XVII ст. (Здановіч, спр. 1450. С. 4, 9). У ніжняй частцы амаль квадратнай пласціны (19 × 19 см) пасярэдзіне на тарчы складанай формы месціцца герб ”Ляліва” (ляжачы паўмесяц з шасцівугольнай зоркай над ім). Над тарчай – гелм і кляйнот з пёрамі, на фоне якіх дубліруецца выява герба “Ляліва”.

Трэба адзначыць, што ў акрэслены перыяд нам невядомы ніводны прыклад выкарыстання гербавай кафлі прадстаўнікамі сярэдняй шляхты. Сярод полацкага патрыцыяту гербам “Ляліва” карысталіся ваяводы Станіслаў Глябовіч (пачатак XVI ст. – 1513), Ян Глябовіч (1532 – 1542), а таксама Мікалай Дарагастайскі (1576 – 1597) (Насевіч, 1999. С. 524; Niesiecki, 1839. S. 188). Магчыма дапусціць, што кафля з гербам “Ляліва” адлюстроўвае герб полацкага ваяводы Мікалая Мікалаевіча Дарагастайскага (каля 1530 – 1597) (Kojałowicz, 1897. S. 133; Wolff, 1885. S. 46) ці, паводле Г. Люлевіча і А. Рахубы, Мікалая **Алехнавіча** (Urzędnicy..., 1994. S. 205).

Аднак печ, складзеная з гэтай кафлі, знаходзілася ў пабудове іншага ўладальніка. Па звестках пісьмовых крыніц і па выніках археалагічных даследаванняў устаноўлена, што двор ваяводы і шэраг іншых двароў полацкага патрыцыяту знаходзіліся на Верхнім замку (Тарасаў, 1998. С. 70). Печ з гербам “Ляліва” М. Дарагастайскага размяшчалася ў пабудове невядомай на сённяшні дзень асобы. Можна меркаваць, што гэты чалавек быў на службе ў ваяводы, лічыў яе за гонар, і каб падкрэсліць сваю службовую прыналежнасць адбудаваў печ з гербам “Ляліва”. На карысць гэтай гіпотэзы можна прывесці факт адсутнасці ініцыялаў уладальніка і пачатковых літар яго пасады на пласціне кафлі.

Гербавая кафля з выявай стралы, накіраванай джалам угару, знойдзена Н.І. Здановіч у развале дзвюх печаў з розных частак Вялікага пасада

(Здановіч, 1997. С. 106). Па вуглах прамавугольнай пласціны бачны літары: “I”, “S”, “C”, “P” (гл. мал. 6). Па аналогіі з рэчамі, знойдзенымі разам, кафля папярэдне датавалася першай паловай – сярэдзінай XVII ст. (Здановіч, 1997. С. 106).

Герб, адлюстраваны на кафле, належаў старадаўняму полацкаму роду Селяваў, вядомаму з 1533 года (Boniecki, 1883. S. 311). У XVII ст. захаваліся звесткі пра некаторых прадстаўнікоў роду Селяваў, у тым ліку і Яна Селявы, падчашага полацкага (1674) (Niesiecki, 1841. S. 333). Менавіта яго ініцыялы змешчаны па вуглах уверсе пласціны і расшыфроўваюцца як “Ian Sielawa”. Астатнія літары сведчаць аб пасадзе ўладара і, згодна з пісьмовым паведамленнем, павінны змяшчаць: “Podczashy Połotski”. Але справа ў тым, што пасада падчашага і чашніка ў XVII ст. былі намінальныя і вызначалі шляхецкую годнасць, таму дапушчальна, што кафля была створана пасля таго, калі Ян Селява заняў пасаду чашніка. Не выключана, што абрэвіятура “C” можа з’яўляцца ўказаннем на пасаду харунжага (“Chorąży”). Такім чынам, поўны тэкст зашыфраванага паведамлення неабходна чытаць: “Ian Sielawa Czashnik (“Chorąży”?) Połotski”.

Невялікая колькасць гістарычных звестак пра дзейнасць гэтай асобы дазваляе толькі прыблізна акрэсліць час стварэння серыі кафлі з гербам “Селява”. Зроблена яна была напрыканцы XVII ст., а ў адзін набор з пячной кафляй з выявай букета ў вазе (першая палова – сярэдзіна XVII ст.) магла трапіць пасля перабудовы ранейшай печы.

На адной цэлай пласціне прадстаўлена выява герба “Дуброва” ў геральдычнай тарчы (мал. 13: 2), над ім – моцна стылізаваны рыцарскі гелм са шляхецкай каронай (Фонды НПГКМЗ. Кп-11-6461). Тарчу акаймуе намёт у выглядзе стылізаваных парасткаў. Вакол тарчы, паабапал яе, літары: уверсе ў адзін рад – “DW ZC C”, у другі – “W M”, унізе адпаведна – “S M” і “H S”. Вызначыць прыналежнасці кафлі пакуль што нельга, таму што гербам “Дуброва” ў ВКЛ карысталіся дзесяткі шляхецкіх родаў. Верагодна, кафля была выканана напрыканцы XVII ст.

Гербавая кафля другой паловы XVII ст. была знойдзена пры даследаванні рэшткаў печы № 3 у дворыку былога езуіцкага калегіума. Пласціна (24 × 18 см) утрымлівае выяву герба “Любіч” зменены (мал. 13: 1). Уверсе пласціны з правага боку чытаюцца літары “P” і “O”, у ніжнім правым куце – літара “P”. У Полацкім ваяводстве герб “Любіч” зменены, належаў тром знакамітым шляхецкім родам Герцыкаў, Стаброўскіх і Шантыроў (Kojałowicz, 1897. S. 161). З іх толькі Шантыры (Вінсэнт і Ян) у канцы XVII ст. былі прадстаўнікамі ордэна езуітаў, што дае падставы вызначыць прыналежнасць знойдзенай кафлі да роду Шантыроў (Niesiecki, 1841. S. 602). Самы знакаміты прадстаўнік гэтага роду, ураджэнец Полацка

Станіслаў Шантыр (каля 1763 – 1848), з’яўляўся аўтарам шэрага гістарычных прац (Podręczna encyklopedya kościelna, 1913. S. 357).



1



2



3

Малюнак 13 – Геральдычная кафля канца XVII – пачатку XVIII ст. (1 – 2) і кафля з выявай кветкі ў вазе пачатку XVIII ст. (3); 1 – раскопкі Д.У. Дука; 2 – 3 – С.В. Тарасава

Пры разглядзе калекцыі геральдычнай кафлі нельга абыйсці ўвагай некалькі вельмі адметных пласцін з выявай двухгаловых арлоў. Геральдычная кафля з “гербавымі” арламі па тыпалогіі Н.І. Здановіч падзяляецца на два варыянта (Здановіч, 1997. С. 106). “Чырвонапаліваная” пласціна з

выявай двухгаловага арла, знойдзеная падчас раскопак С.В. Тарасава на пл. Свабоды, з’яўляецца асобным, трэцім варыянтам (мал. 14: 1).



Малюнак 14 – Геральдычная кафля XVIII ст.
(раскопкі С.В. Тарасава)

У двары дома № 3 па пр. К. Маркса была знойдзена палова сценавай кафлі з выявай чалавека ў браме гатычнага замка, змешчанага ў поле тарчы (Тарасов, спр. 1084. С. 21). Усё разам гэта ўтварае герб “Гжымал”, аднак без ініцыялаў уладальніка сказаць аб яго прыналежнасці не прадстаўляецца магчымым (гл. мал. 14: 2). Мяркуючы па месцы мацавальнай адтуліны ў румпе (вышыня якой, дарэчы, перавышае 8 см, без уліку пласціны), кафля была зроблена ў пачатку XVII ст., не пазней 30-х гадоў.

Невызначаным застаецца прыналежнасць кутняй геральдычнай кафлі з раслінным арнаментам і лацінскімі літарамі “Hc”, “W”, “D” (гл. мал. 14: 3).

Асобную групу ўтварае кафля з фрагментамі лацінскіх надпісаў. Гэта, як правіла, паліваныя пласціны з манаграмай Ісуса Хрыста ў цэнтры (IHS) і сімвалам манаскага ордэна езуітаў (палаючае сэрца) пад ёй (мал. 15).

Малюнак 15 – Кафля першай паловы XVII ст. з выявай манаграмы ордэна езуітаў; раскопкі С.В. Тарасава, Д.У. Дука

Верагодна, манаграма паходзіць з лексікі сярэднявечнай артаграфіі імя IHeSus, выводзячы яго ад Iesum Habemus Socium (Żemigala, 1991. S. 265). Шматлікія варыянты гэтай кафлі лучыць сама манаграма і наяўнасць вакол яе авальнай рамкі з надпісам “INNOMINE IESV OMNE GENV ELECTATUR” (у імя абранага намі Бога-ўсятворцы) (Здановіч, 1997. С. 107). На кафле з раскопа С.В. Тарасава на плошчы Свабоды пад манаграмай размешчана выява Ісуса, трымаючага крыж (Тарасов, спр. 1014. Рис. 13: 1). Кафля паходзіць з першага будаўнічага гарызонта, які адносіцца да XVII – XVIII стст. (Тарасов, спр. 1014. С. 5).

Значыць, увесь камплект кафлі зроблены не раней XVII ст., што пацвярджае і наяўнасць рамкі з уступам.

На аснове наяўнага матэрыялу праведзена графічная рэканструкцыя знешняга выгляду геральдычнай карнізнай кафлі (Фонды НПГКМЗ. Кп-7-3913/18; кп-15-156343). Вонкавы бок пласціны падзелены па гарызанталі на верхні плоскі і ніжні прафіляваны кампазіцыйны рад (мал. 16: 1). Ніжні аздоблены расліннай арнаментыкай, малюнак верхняй часткі складаюць выявы двух звернутых адзін да аднаго фантастычных жывёл, якія трымаюць герб “Дэшпат”. Аніміалістычны сюжэт быў вельмі распаўсюджаны ў геральдыцы (жывёлы-тарчатрымальнікі) і найчасцей ужываўся ў дэкоры карнізаў печаў (Беларуская кафля, 1989. Мал. 94 – 96).

Амаль дакладны аналаг полацкай кафлі знойдзены ў Віцебску (датуецца першай паловай XVII ст.) (Левко, 1981. Рис. 8, 12). Такое падабенства нельга адносіць да выпадковага. Усё становіцца зразумелым, калі ўлічыць,

што “Дэшпат” з’яўляецца радавым гербам Зяновічаў, якія ў адзначаны перыяд займалі розныя пасады ў Полацку і Віцебску (Niesiecki, 1845. S. 169).



1



2

Малюнак 16 – Геральдычная кафля XVII ст. з выявай герба “Дэшпат” Мікалая Зяновіча (1) і герба “Радван” Даніэля Шчыта (2); раскопкі С.В. Тарасава

Паходжанне роду звязана з сербскім дэшпатам (намеснікам правінцыі) Зянонам Братошай (каля 1380 г.) (Kojałowicz, 1897. S. 41). Ад двух

прадстаўнікоў гэтага роду – Мікалая і Міхаіла – пайшлі дзве найбольш значныя галіны роду Зяновічаў. Мікалай Багуслаў, славуты палкоўнік, які загінуў падчас бітвы з туркамі пад Хоцімам, прыходзіўся праўнукам Мікалаю Юр'евічу. У ВКЛ ён займаў пасады чачэрскага і прапойскага старасты, а з 1618 па 1621 год быў кашталянам полацкім. Ян Янавіч, падстолі літоўскі, унук Міхаіла Юр'евіча, з 1594 па 1614 год служыў кашталянам у Віцебску (Niesiecki, 1845. S. 169 – 174). З гэтага вынікае, што карнізная кафля з радавым гербам Зяновічаў была зроблена ў час, калі Мікалай Багуслаў і Ян Янавіч займалі пасады кашталянаў у Полацку і Віцебску, адпаведна паміж 1618 – 1621 і 1594 – 1614 гадамі.

Паясковай кафлі ў Полацку знойдзена вельмі мала (Здановіч, 1997. С. 108). На адной цэлай пласціне змешчана выява герба "Радван" у акружэнні жывёл: ільва і аленя (Фонды НПГКМЗ. Кп-8-4345104). Тарча перададзена вельмі ўмоўна (гл. мал. 16: 2). Гелм і намёт адсутнічаюць, таму карона надзета непасрэдна на тарчу. Вакол кароны чытаюцца літары "D" і "S".

Герб "Радван" (касцёльная харугва з крыжам) меў шмат варыяцый. У Полацкім ваяводстве ён належаў шляхецкаму роду Шчытоў (Kojałowicz, 1897. S. 251). Ініцыялы (пачатковыя літары "D" і "S") дазваляюць вызначыць уладальніка кафлі – Daniel Szczyt. Даніэль Шчыт займаў пасаду полацкага падсудка (памочнік земскага суддзі), акрамя гэтага згаданы як пасол сеймаў (пад 1623, 1626, 1629 гг.) і дэпутат скарбовага трыбуналу ВКЛ (Niesiecki, 1841. S. 321). Зыходзячы з гэтых даных можна акрэсліць прыблізны час стварэння паясковай кафлі – другая чвэрць XVII ст.

Картаграфія знаходак полацкай геральдычнай кафлі дае ўяўленне аб размяшчэнні двароў уладальнікаў гербаў у горадзе Полацку (мал. 17).

Так, кафля з гербам Януша Кішкі адпавядае пісьмовым звесткам аб месцазнаходжанні двара Ваяводы на Верхнім замку (Полоцкая ревизия 1552 г., 1905. С. 14 – 15). У цэнтры замка, непадалёк ад Сафійскага сабора, у XVI – XVII стст. назіраецца вольная ад якіх-небудзь забудоў плошча (Тарасаў, 1998. С. 68). Размяшчэнне двароў полацкай знаці магло быць на тэрыторыі паўночна-заходняй частцы Верхняга замка (сучасная вул. Замкавая). Гэтая тэрыторыя ў археалагічным плане амаль не даследавалася. Нагляд за будаўнічай траншэяй у 1993 годзе выявіў вялікую колькасць знаходак пячной кафлі, сярод якіх былі пласціны з гербам М.Б. Зяновіча. Фрагменты карнізнай кафлі з гербам Зяновічаў знойдзены таксама на тэрыторыі цэнтральнай частцы Вялікага пасада і маглі належаць розным прадстаўнікам гэтага роду.

Пласціны з гербам Яна Селявы знойдзены ў развалах печаў дзвюх пабудоў з розных частках Вялікага пасада. Адзін будынак, відаць, знаходзіўся недалёка ад уезда на пасад з паўднёвага боку Верхняга замка, на вул. Вялікай (сучасная вул. Леніна) (Тарасаў, 1998. С. 68). На гэтай жа

вуліцы, толькі бліжэй да ўсходняй форткі, знойдзена кафля з гербам М.М. Дарагастайскага. З цэнтральнай частцы Вялікага пасада (плошча Свабоды) паходзіць кафля з гербам “Радван” і ініцыяламі Даніэля Шчыта.



Малюнак 17 – Месцазнаходжанне кафлі з выявамі гербаў полацкай шляхты: Δ – кафля з гербам М. Дарагастайскага; ∇ – кафля з гербам М. Друцкага-Сакалінскага; ■ – кафля з гербам М. Зяновіча; ▲ – кафля з гербам Я. Кішкі; ▼– кафля з гербам Д. Шчыта; ♦ – кафля з гербам Шантыроў; ● – кафля з гербам Я. Селявы; ━━ – абарончыя ўмацаванні Вялікага пасада XVII ст.

З канца XVI ст. нам вядомы пласціны з выявай герба Мікалая Мікалаевіча Дарагастайскага, кафля з геральдычнымі арламі і гербам “Гжымал”, а таксама дзяржаўны герб “Пагоня”. Большасць полацкай гербавай кафлі была зроблена ў другой чвэрці XVII ст. (пласціны належалі Янушу Кішке, Крыштафу Міхайлавічу Друцкаму-Сакалінскаму, Даніэлю Шчыту, Мікалаю Багуславу Зяновічу). Апошнімі дзесяцігоддзямі XVII ст. датуецца кафля з выявай герба Яна Селявы.

Каштоўнасць кожнай знаходкі кафлі з геральдычнымі матывамі цяжка пераацаніць. Гербавая кафля – гэта надзейны датуючы матэрыял. Яе вывучэнне дазваляе праводзіць сінхранізацыю паміж рознымі групамі архітэктурна-дэкаратыўнай керамікі і акрэсліць, такім чынам, узровень развіцця рамесніцтва ў адпаведны прамежак часу.

3.1.2.2. Сюжэтная кафля

Сюжэтная кафля ў Полацку прадстаўлена рыцарскай тэматыкай, анімалістычнымі матывамі і сцэнамі палявання (Дук, 2001 а, в; Здановіч, 1997. С. 107).

Кафля XVI – XVII стст. з выявамі рыцараў знойдзена амаль ва ўсіх буйных гарадах Беларусі акрэсленага перыяду (Здановіч, 2001), сярод яе па разнастайнасці і прадстаўнічасці выяў асабліва вылучаюцца полацкія і магілёўскія пласціны (Дук, 2001 в).

Большасць рыцарскіх выяў звязана з геральдыкай (гербы “Гжымал”, “Пагоня” і інш.). Па польскіх матэрыялах група кафлі з “рыцарскай” тэматыкай вядома з другой паловы XV ст., і з пачатку XVI ст. да 1560-х гадоў атрымала шырокае распаўсюджванне (Dąbrowska, 1987. S. 127 – 128). Мастакі адлюстроўвалі рыцарскія турніры, прыдворныя сцэны і партрэты асоб у рэнесансным абліччы. Пласціны кафлі ў гэты час мелі шырокую рамку са змешчанай у ёй прафіляванай аркадай – папулярны рэнесансны элемент дэкору. У ВКЛ партрэтная тэматыка была прадстаўлена вялікай колькасцю пласцін з мужчынскімі і жаночымі выявамі ў рэнесансных строях, якія, на думку даследчыкаў, у большасці выпадкаў не звязаны з канкрэтнымі асобамі, а адлюстроўвалі выключна мастацкую з’яву (Кушнярэвіч, Трусаў, 2000. С. 136 – 138). Рэнесансная партрэтная кафля знойдзена ў Полацку ў пластах сярэдзіны XVI ст. (Дук, 2001 д. С. 34).

Вялікую цікавасць прадстаўляе полацкая кафля з выявай мушкецёра (мал. 18: 1). Мураўлёная кафля знойдзена падчас нагляду за будаўнічай траншэяй на Верхнім Замку (гл. мал. 18: 2), паліхромная пласціна паходзіць з Вялікага пасада (раскопкі і нагляд С.В. Тарасава).

Памеры мураўлёных пласцін 18,3 × 21,8 см (гл. мал. 18: 1). Постаць воіна са стрэльбай у руцэ ўпісана ў высокую паўцыркульную рамку, якая закрывае з бакоў усё зрокавае поле (Дук, 2001 в).

Вядомая ў Полацку выява рыцара тыпалагічна належыць да серыі кафлі з гатычнымі і рэнесанснымі сюжэтамі XV – першай паловы XVI ст. (Паничева, 1981. С. 276). Шырокае распаўсюджванне “рыцарскага” сюжэта ў дэкаратыўным мастацтве прыпадае на эпоху барока. Традыцыйна даследчыкамі вылучаецца дзве плыні заходнееўрапейскага барока: першая, паўднёвая, прыйшла на Беларусь з Італіі напачатку XVII ст. і ў ВКЛ усталявалася раней, чым у іншых краінах Еўропы (Шматаў, 2001. С. 10 – 11); другая, паўночная, звязана з нідэрландскім уплывам і вызначаецца прыкметамі нідэрландскага рэнесансу (Шматаў, 2001. С. 14; Dąbrowska, 1987. S. 127).



Малюнак 18 – Кафля з выявай мушкецёра:
з зялёнай палівай (1) і з паліхромным роспісам (2); раскопкі С.В. Тарасава

У гады ваеннай кампаніі 1579 – 1582 гадоў пашырыліся сувязі ўсходняга і паўночнага рэгіёнаў ВКЛ з Заходняй Еўропай, адзнакай гэтага працэсу з'яўляецца полацкая кафля з выявамі мушкецёраў (гл. мал 18: 1). Можна канстатаваць, што маньерыстычная традыцыя ў Полацку склалася пад непасрэдным уплывам паўночнай (нідэрландскай) плыні еўрапейскага барока (Дук, 2001 в). Далейшае распаўсюджванне "рыцарскага" сюжэта ў адзначанай манеры выканання знаходзіць працяг у магілёўскім кафлярстве (Дук, 2001 в. С. 50).

Да сюжэтнай тэматыцы адносіцца невялікі фрагмент мураўлёнай пласціны з выявай воіна (мал. 19: 4). Левай рукой ён трымае галаўны ўбор накшталт берэта, правай абапіраецца на меч. Асобная выява мяча размешчана побач на ўцалелай частцы пласціны.

На захаваўшыхся фрагментах незвычайнай па форме паясковай каробчатай кафлі змяшчаецца выява фантастычнай жывёлы, якая рухаецца ўправа з узнятай правай лапай (гл. мал. 19: 5). Фантастычныя пачвары маюць тулава і хвост ільва, лапы ў іх з вялікімі драпежнымі (напэўна, арлінымі) кіпцюрамі, а вось галава хутчэй сабачая, чым ільвіная. Апошняе наўмысна падкрэслена мастаком наяўнасцю добра бачнага ашыйніка на кожным са звяроў. У кафлярстве вядомы прыклады ўжывання рэалістычнага вобраза сабакі пры перадачы геральдычных матываў (Zubrzycki, 1915. S. 12), аднак аблічча жывёл, якіх мастак змясціў на паясковай пласціне, атаясамліваецца з міфалагічным вобразам нябеснага сабакі, абаронцы і

вартаўніка Дрэва жыцця. Наяўнасць расліннага дэкору і салярнай арнаментыкі сведчыць на карысць менавіта засцерагальнай функцыі, якую павінна была забяспечыць гэтая кафля. Сама ж выява звера ёсць вобраз Сэнмурва (Сімаргла), вядомы ў арабскай, візантыйскай, іранскай, індыйскай, славянскай і іншых міфалогіях (Тревер, 1933. С. 324 – 326). Па шэрагу прыкмет кафля датуецца сярэдзінай XVII ст.



Малюнак 19 – Карнізная (1 – 2); сценавая (4) і перагародкавая кафля (3, 5) XVII ст.; раскопкі С.В. Тарасава

Нярэдка вобразы фантастычных жывёл звязваюцца з геральдыкай (Здановіч, Трусаў, 1993. С. 54; Zubrzycki, 1915. S. 9 – 10). Аднак у геральдыцы жывёлы (ільвы, леапарды, грыфоны) перадаюцца згодна з дакладна распрацаванымі канонамі (Гаттерер, 1805. С. 105), хоць бываюць і выключэнні (Дук, Мішын, 2002 б. С. 236).

У Полацку кафля з аніміалістычнымі матывамі прадстаўлена даволі вялікай групай. У гатычную эпоху былі распаўсюджаны вобразы драконаў, казачных вужак, а таксама рэальна існуючых жывёл (Паничева, 1981. С. 278). Напрыклад, перадача вобраза казачнага дракона з двума крыламі і выгнутай шыяй у дэкаратыўнай пластыцы ВКЛ з'яўляецца вельмі ўстойлівым элементам міфалагічнай кампазіцыі і сустаркаецца на шэрагу артэфактаў нават у XVII ст. (Lithuanian archaeology, 1998. P. 25). У XVII ст. найбольш папулярным міфалагічным матывам полацкага кафлярства з'яўляецца вобраз Сусветнага дрэва і зоамарфічных істот – яго вартаўнікоў (Тарасов, спр. 1014. Рис. 13: 2; Тарасов, спр. 1084. Рис. 11: 2).

Прыклады ўжывання арнаменту, семантыка якога напрамую звязана з апатрапейнай сімволікай, знаходзім у аздабленні асобных дэталяў канструкцыі печы – гэтак званых пячных дуг. У Полацку арнамент на дугі наносіўся круглым штампам з выяваю: 1) кола з васьмю (Здановіч, 1998. С. 129), 2) з чатырма спіцамі і 3) кола з сеткавым арнаментам (Здановіч, спр. 1213 в. Арк. 20).

Выява крыжа ў коле сустракаецца на полацкай кафле XVI ст., кола з крыжам унутры – папулярны матыў аздаблення полацкага посуду XVIII ст. (Здановіч, спр. 1450. С. 8). Кола з васьмю спіцамі адлюстроўвае культ сонца, тады як гэтак званы "касы" крыж у форме кола з чатырма шэўронамі з'яўляецца сімвалам чатырох бакоў свету і належыць да нябеснай сферы (Голан, 1994. С. 119). Крыж, асноўнае значэнне якога звязана з салярнай сімволікай, мог атясамлівацца таксама з чатырма парамі года, пры гэтым аналагічныя выявы крыжа на ганчарных вырабах усходніх славян вядомы са старажытнарускіх часоў (Раппопорт, 1989. Рис. 7). Кола з нанесеным сеткавым арнаментам у нашым выпадку, відаць, выконвала функцыю апатрапейнай сімволікі – вера ў магічную моц сеткі, якая здольная абараніць ад умяшальніцтва злых сіл (Голан, 1994. С. 119).

Для вызначэння зместа аднаго міфалагічнага сюжэта намі ўзята траістая кампазіцыя адной адметнай полацкай кафлі (Тарасов, спр. 1084. С. 21). Кафля захавалася больш чым напалову, малюнак уяўляе сабой кампазіцыю, у цэнтры якой знаходзіцца жаночая фігура, а па баках сіметрычныя выявы двух зоаморфных істот (гл. мал. 11: 1 – 2). Пачвары маюць птушыныя лапы з вялікімі драпежнымі кіпцюрамі, тулава сабакі, пакрытае лускай. Фантастычная істота з сабачай галавой і ашыйнікам вядома па вы-

яве мсціслаўскай кафлі (Беларуская кафля, 1989. Мал. 106). У Кіеве знойдзена кафля з выявай фантастычнай істоты з сабачай галавой (Шовкопляс, 1975. Рис. 4, 2), выявы сабак вядомы і ў польскім кафлярстве (Zubrzycki, 1915. S. 12, ryc. 6).

Левую руку жанчына працягвае да сонца, а ў правай, відаць, трымае месяц. Ніжняя частка яе выявы – "спадніца" – уяўляе сабой падзелены папалам трохвугольнік, з вяршыні якога прарастае квітнеючая расліна. Згодна з тэрміналогіяй А.К. Амброза, гэтая спадніца не што іншае, як паўромб – аснаванне сусветнага дрэва (Амброз, 1966. С. 63). Не выклікае сумнення той факт, што на кафле адлюстраваны міфалагічныя персанажы. Большасць даследчыкаў пагаджаюцца з высновай, што падобная жаночая фігура ў цэнтры кампазіцыі прадстаўляе выяву вялікай Багіні, Багіні ўрадлівасці, Багіні-Маці (Голан, 1994. С. 160).

Другое, не менш важкае пытанне – наколькі разгледжаны сюжэт карэлюецца з распаўсюджаным у кафлярстве матывам Дрэва жыцця?

У светаўяўленні земляроба вобраз прарастаючага зерня цесна пераплятаецца з вобразам жанчыны, якая чакае нараджэння дзіцяці. Сімвалы ўрадлівасці – жанчына і дрэва – часта сумяшчаюцца і, па сутнасці, з'яўляюцца адным і тым жа (Рыбаков, 1967. С. 94). Такім чынам, ёсць падставы казаць аб аднолькавым семантычным значэнні выявы Багіні-Маці і Дрэва жыцця, што пашырае сферу ўжывання пададзенага міфалагічнага сюжэта.

Такім чынам, нягледзячы на гарадскі характар архітэктурна-дэкаратыўнай керамікі, на ёй нярэдка змяшчаліся сюжэты, якія атаясамліваліся з дабрабытам і былі звязаныя з культамі плоднасці і ўрадлівасці. Апошняе можа сведчыць аб цесных сувязях горада з акругай, а таксама і аб вясковым паходжанні пэўнай часткі гарадскіх рамеснікаў, што было натуральнай з'явай у XVII ст.

3.1.2.3. Кафля з раслінным і геаметрычным арнаментам

Кафля канца XVI ст. па полацкіх матэрыялах складае адносна нешматлікую групу, што абумоўлена, на наш погляд, наступствамі Інфлянцкай вайны. Дамінуе сюжэтная арнаментыка і геральдычныя матывы (пласціны са сцэнамі палявання, з гербамі "Пагоня", "Ляліва"), гарадкі і каронкі гэтага часу нагадваюць фігурныя краты. Асобна вылучаецца кафля з разнастайнымі маўрэскамі, якая мае датаванне ў межах канца XVI – сярэдзіны XVII ст. (Здановіч, 1997. С. 103 – 108).

Арнаментальныя матывы на кафле канца XVI – пачатку XVII стст. маюць прыкметы, характэрныя для рубяжа эпох. Выразнае аздабленне стыля барока накладаецца на рэнесансныя матывы, зводзячы апошнія да схематызму альбо пераўтвараючы іх у маньерыстычнай традыцыі. Маньерызм –

гэта новы стыль еўрапейскага мастацтва, свайго роду “протабарока” (Лазука, 2001. С. 68). У Польшчу і ВКЛ гэты напрамак быў занесены ў сярэдзіне XVI ст. і традыцыйна звязваецца з Контррэфармацыяй і Трыдэнцкім саборам (1563). У маньерызме Рэчы Паспалітай з 1570 года вылучаецца ўплыў з боку Нідэрландаў (Historia sztuki Polskiej w zarysie, 1962. S. 9).

Самая прадстаўнічая і багатая па дэкору кафля – сценавая – падзяляецца на шэраг груп па характару арнаментальных матываў.

Матыў геаметрычнай пляцёнкі сеткавага тыпу з зоркамі ўнутры (мал. 20: 2), з зоркамі і крыжамі (Розенфельдт, 1969. Рис. 1, 5), а таксама выкананы лініямі ў выглядзе хваль і квадратаў у Полацку быў даволі распаўсюджаны (мал. 20: 2, 5). На кафле ўжывалася паліва зялёнага, цёмна-зялёнага і карычневага колераў.

Да пачатку XVII ст. трэба аднесці кафлю з чатырохчленнай сіметрыяй у выглядзе квадратаў (Дук, спр. 1921. Фота 46). Пласціны з падобным арнаментам шырока вядомы пры даследаванні культурных напластаванняў канца XVI – пачатку XVII ст. гарадоў Беларусі і Польшчы (Трусаў, Краўцэвіч, 1994. С. 229; Żemigala, 1998. S. 160 – 161). У гэты час у Полацку атрымала распаўсюджванне кафля з паліхромнай размалёўкай: на яе долю прыходзіцца да 6,4 % знаходак ад агульнай колькасці пласцін XVI – XVIII стст. (гл. табл. 2).

Паводле Н.І. Здановіч, у канцы XVI – XVII стст. найбольшае распаўсюджванне атрымала кафля з чатырохбаковай сіметрыяй, з выявай букета ў вазе і дывановая кафля (Здановіч, 1997).

Паясковай кафлі ў Полацку знойдзена няшмат, на адной увагнутай пласціне адлюстраваны раслінны арнамент з матывам каванага металу (гл. мал. 19: 3). Кафля мацавалася ў печы з дапамогай гарызантальнага шыпа і па ўсіх прыкметах была выраблена ў канцы XVI – пачатку XVII ст.

У другой палове XVII ст. набыў папулярнасць матыў вітых калонак (балясін) (Дук, 2001 б. С. 42). На адной кафлі малюнак размешчаны ў нешырокай (0,4 см) рамцы, якая адступае ад краю пласціны (гл. мал. 20: 1). Традыцыя аздабляць пласціну рамкай з водступам ад краю стала дамінуючай у XVIII ст., тады ж раслінны дэкор паступова замяняецца кампазіцыяй ракайля або картуша (Дук, 2001 б. С. 43).

Вуглы печаў XVII ст. нярэдка мелі трохчастнае дзяленне за кошт ужывання адпаведнага тыпу кафлі. У Рэчы Паспалітай такія печы пачалі будавацца з першай паловы XVII ст. (Каталинас, 1988. С. 139 – 140; Dąbrowska, 1987. S. 93, 165). Звычайна яны рабіліся з паловы сценавай кафлі, якая злучалася з кутняй (Genys, 1984. P. 47). Верхняя частка кутняй кафлі ўтварала прамы вугал, пад якім знаходзілася заглыбленне ў выглядзе аркі на ўсю вышыню пласціны. У Полацку пакуль што не знойдзена нівод-

най цэлай кутняй кафлі з трохчастным дзяленнем; асобныя фрагменты сведчаць аб ужыванні разнастайнага дэкору (гл. мал. 20: 3 – 4).



Малюнак 20 – Кафля XVII ст. з раслінным і геаметрычным арнаментам; раскопкі С.В. Тарасава

Карнізная (гзымсавая) кафля вельмі розніцца па сваім дэкаратыўным аздабленні. Сярод яе можна вылучыць некалькі тыпаў арнаментыкі. Дзеля спрашчэння апісання карнізнай кафлі мы падзялілі яе на асобныя варыянты.

Варыянт 1 прадстаўлены зялёнапаліваным карнізам з радам сямі прафіляваных геаметрычных фігур, якія нагадаваюць снегавікоў (мал. 21: 1).



Малюнак 21 – Карнізная кафля XVII – пачатку XVIII ст.; раскопкі С.В. Тарасава

Карнізная кафля варыянта 2 была вельмі распаўсюджана ў Полацку. Гэта кафля з выявамі рада стылізаваных дубовых лісцяў з рознымі вары-

яцыямі аздаблення (гл. мал. 21: 2). Згодна з тыпалогіяй Е. Аконьскага (E. Okoński), падобная кафля з'яўляецца гэтак званым карнізным навершшам, і прызначалася яна для аздаблення надставы печы (Okoński, 1988. Tabl. 8, 5).

Кафля варыянта 3 спалучае ў сябе раслінныя і геаметрычныя элементы, прычым сустракаюцца як тэракотавыя экзэмпляры, так і пакрытыя зялёнай палівай (гл. мал. 21: 3). Вельмі падобны на яе малюнак кафлі наступнага варыянта 4 (гл. мал. 21: 4) (Дук, 2001 б. С. 43).

У тэхніцы выканання ўсіх чатырох варыянтаў закладзена адзіная традыцыя, якая развівалася на працягу пэўнага прамежку часу. Кафлю варыянта 3 – 4 можна датаваць пачаткам XVII ст., тады як кафля варыянта 1 – 2 утрымлівае рысы, характэрныя для сталага барока другой паловы XVII ст.

Пры супастаўленні наяўнага матэрыялу ўдалося аднавіць знешні выгляд карнізнай кафлі варыянта 5 (гл. мал. 19: 1). Большасць фрагментаў мураўлёныя, адзін паліхромны з малюнкам жоўтага колеру па зялёнай аснове. Раслінны арнамент у спалучэнні з развітай паліхраміяй і матывамі каванага металу быў характэрны менавіта для першых дзесяцігоддзяў XVII ст. (Звяруга, Сагановіч, 1993. С. 38; Tautavičius, 1969. S. 44).

Варыянт 6 прадстаўлены тэракотавымі пласцінамі з раслінным арнаментам (гл. мал. 19: 2). Малюнак нанесены невысокім рэльефам, што з'яўляецца адметнасцю гэтай кафлі.

Асобнай групай прадстаўлены паліхромныя фрагменты карнізаў з геаметрычным арнаментам, на адным з іх была ўжыта пяцікаляровая палітра паліў. Па ўсіх прыкметах – паліхраміі, невысокаму рэльефу, значнай таўшчыні пласціны (каля 2 см), складу цеста – гэтую кафлю можна аднесці да канца XVI – пачатку XVII ст. Блізкі дэкор прафіляванай частцы пласціны сустракаецца на кафле з Мірскага замка (Здановіч, Краўцэвіч, Трусаў, 1994. Мал. 88, 11), замка ў Аджыконі (Dąbrowska, 1987. Ryc. 30, 3).

Адметны геаметрычны арнамент – матыў "оваў" – стаў дамінуючым у эпоху класіцызма (Соколова, 1972. С. 120). На прыкладзе карнізнай кафлі другой паловы XVII ст. відавочна выкарыстанне "оваў" разам з маскароннымі выявамі ў межах аднаго дэкаратыўнага сюжэта (мал. 22).

Адным з галоўных элементаў дэкору печаў было іх навершша. У асноўнай масе ўсе элементы навершша падзяляюцца на сярэдзінныя (да іх традыцыйна адносяцца каронкі ці гарадкі) і наружныя (вуглавыя).

Першую групу прадстаўляюць ажурныя каронкі, вышыня пласцін якіх прыкладна напалову меншая за даўжыню (мал. 23: 1 – 6). Такія каронкі маюць дзве гарызантальныя рамкі і ў дэкоры печаў прадстаўляюць суцэльны дэкаратыўны рад.



Малюнак 22 – Карнізная кафля другой паловы XVII ст. з выявай маскарона; раскопкі Д.У. Дука

У асноўным знойдзены мураўлёныя пласціны. Большасць з іх захавалася фрагментарна, некалькі пласцін цэлых. Адна з каронак мае памеры 9,5 × 17 см (гл. мал. 23: 5), другая – 8 × 20,5 см (гл. мал. 23: 6).

На першай пласціне паліва нанесена па ангобу. Лучыць іх тып арнамента – гэтак званы масверкавы (праразны) і псеўдамасверкавы (з выкарыстаннем розных геаметрычных элементаў). Наяўнасць адметнага дэкору дазваляе аднесці гэтыя два навершшы да канца XVI – першай трэці XVII ст. Адно навершша канца XVII – пачатку XVIII ст., выкананае ў выглядзе ажурнай лілеі і пакрытае белай заглушанай палівай (гл. мал. 14: 2), знаходзіць аналаг у сярэднявечным кафлярстве Кракава і Познані (Piątkiewicz-Dereniowa, 1977. S. 196).



Малюнак 23 – Пячныя каронкі XVII – першай паловы XVIII ст.; раскопкі С.В. Тарасава

Другую групу прадстаўляюць каронкі з вертыкальнай восевай сіметрыяй (мал. 24: 1 – 6), вышыня пласцін якіх большая за шырыню або роўная з ёй (Дук, 2001 б. С. 44).

Пласціна з алегарычным сюжэтам (захавалася фрагментарна) знойдзена падчас раскопу С.В. Тарасава і М.В. Клімава ў 1995 годзе на Верхнім замку (гл. мал. 24: 6). З гэтага ж раскопу паходзяць два фрагменты кутніх навершшаў, адно з іх паўсферычнай формы (мал. 25: 1). З тыльнага боку на ім зроблены вертыкальны шып, з дапамогай якога кафля мацавалася ў паз на куце печы. Аналагічную канструкцыю мае навершша-маскарон з раскопу Н.І. Здановіч па вул. Леніна, 35 (гл. мал. 25: 3). Асобна вылучаецца кутняе навершша з выявай жанчыны, якое мела іншы спосаб мацавання ў

печы: заглыбленне-крапёж з тыльнага боку (гл. мал. 25: 5). Знаходкі кутніх навершшаў у Полацку – выключна рэдкія. Большасць навершшаў пакрыта празрыстай зялёнай палівай, другім колерам палівы быў белы, зроблены на цаніннай аснове (гл. мал. 25: 2).



Малюнак 24 – Пячныя каронкі XVII – першай паловы XVIII ст.; раскопкі С.В. Тарасава

Для полацкага кафлярства звычай ужываць драўляныя матрыцы для фармоўкі пласціны не быў характэрны. Гэтую выснову пацвярджаюць вынікі візуальнага агляду. Знойдзеныя ў Полацку матрыцы (4 фрагменты) выраблены з гліны (Дук, 2001 б. С. 44 – 45; Лугіна, 2001. С. 56). Даныя

петраграфічнага аналізу пацвердзілі мясцовую вытворчасць кафлі XVI – XVIII стст. Тэмпература, пры якой абпальвалася зялёнапаліваная кафля, дасягала 900 ºС (Здановіч, спр. 1376. С. 33). Пры гэтым група кафлі XVII ст. мае адметнасці па фізічнаму і хімічнаму складу керамічнага цеста (павышанае ўтрыманне двухвокісу крэменю і паніжанае ўтрыманне вокісу кальцыя), што можа служыць дадатковай прыкметай для датавання іншых керамічных груп (Здановіч, 1213 в. С. 31).



Малюнак 25 – Пячныя навершшы (1 – 3, 5) XVII – XVIII стст. і гаршковая кафля XVII ст. (4); 1 – раскопкі С.В. Тарасава і М.В. Клімава; 2 – С.В. Тарасава; 3 – Н.І. Здановіч; 4 – з фондаў НПГКМЗ; 5 – Д.У. Дука

Такім чынам, усю полацкую кафлю XVII ст. можна падзяліць на тры ўстойлівыя храналагічныя групы.

У пачатку XVII ст. абуджаецца цікавасць да абставінаў паўсядзённага жыцця. Алегарычныя вобразы замяняюцца рэалістычнымі выявамі ўзброеных воінаў, сцэнамі палявання. Узбагачаецца геаметрычны арнамент, звычайным становяцца рэльефы сеткавага тыпу, часта пакрытыя рознакаляровымі заглушанымі палівамі. Да першай трэці XVII ст. належаць большасць пласцін з геральдычнымі матывамі. Выявы геральдычнага зместу змяшчаюцца на пласцінах з уступчатай, багата дэкараванай рамкай, і вызначаюцца як багаццем дэкору, так і сэнсавай нагрузкай. Усе пазначаныя рысы даюць падставы для вылучэння прыкмет стылю маньерызму ў традыцыі аздаблення полацкай кафлі канца XVI – першай трэці XVII ст. Маньерыстычны этап развіцця полацкага дэкаратыўнага мастацтва існаваў, як і ў цэлым па Беларусі, адносна невялікі час – на мяжы XVI – XVII стст., і вызначаўся такімі рысамі, як сімвалізм, алегорыя, захаванне традыцый народна-плебейскай культуры і арыентацыяй на засваенне новых формаў элітарнай культуры (Лазука, 2001. С. 68 – 70).

Росквіт вытворчасці кафлі ў Полацку прыпадае на 40 – 50-я гады XVII ст., менавіта ў гэты час сценавая кафля пачала замацоўвацца паміж сабой па вертыкалі, вонкавыя пласціны набылі прамавугольныя абрысы, адбылася стандартызацыя іх памераў (у сярэднім каля 18 × 22 см). Гэтыя тэндэнцыі абумоўлены распаўсюджваннем уніфікацыйных плыняў (эстэтычных стэрэатыпаў) у развіцці гэтак званага “нізавага” барока (Лазука, 2001. С. 74 – 79), што яскрава бачна на прыкладзе асобных сюжэтаў полацкай кафлі, напрыклад, у папулярным матыве вазы з кветкамі (Здановіч, 1997. С. 104 – 105) ці пласцінах з сімволікай ордэна езуітаў. Трываласць матываў тлумачыцца імкненнем да ахоўніцтва, захавання ў непарушнасці спосабу жыцця, норм паводзін і бытавых звычаяў (Лазука, 2001. С. 74).

Кафлі другой паловы XVII ст. знойдзена адносна няшмат, і прадстаўлена яна, у асноўным, карнізамі і навершшамі. Дакладна фіксуюцца толькі тыя сценавыя пласціны, якія былі выраблены ў сярэдзіне XVII ст. (кафля з дывановым арнаментам) ці ў канцы XVII ст. (кафля з матывамі чатырохпялёсткавай разеткі, кутняя з балясінамі). У некаторых кампазіцыях полацкай кафлі выразна прасочваюцца арыенталістычныя тэндэнцыі (кафля з некаторымі відамі раслінных выяў, напрыклад, цюльпанаў). Асобныя арнаментальныя матывы гэтага часу надалей ужываліся ў полацкім кафлярстве XVIII ст.

3.1.3. Кафля XVIII стагоддзя

У XVIII ст. адбываецца уніфікацыя арнаментальнага аздаблення кафлі. Кафля XVIII ст. прадстаўляе другую па колькасці групу знаходак (14 % ад усёй кафлі XIV – XIX стст.), аднак па багаццю дэкору яна ўжо не такая прадстаўнічая. Гэта можа тлумачыцца агульным заняпадам ганчарнай цэхавай вытворчасці ў XVIII ст. (Полоцк: Ист. очерк, 1987. С. 61).

Абсалютную большасць полацкай кафлі XVIII ст. можна ўмоўна падзяліць на дзве вялікія групы – гэта пласціны з выявай вянка і пласціны з тарчай. Абедзве групы маюць характэрныя асаблівасці па наяўнасці ўстойлівага атрыбута дэкору – вянка (I група) і тарчы (II група).

Кафля з вянком мае прататып у езуіцкіх пласцінах XVII ст. з надпісам у гонар Бога-ўсятворцы. На мяжы XVII – XVIII стст. дэкор спрашчаецца за кошт размяшчэння лаўровага вянка ў цэнтры пласціны. Знойдзены розныя варыянты гэтага арнаменту: часцей вянок упрыгожваўся разеткамі з трылістнікамі ці шматпялёсткавымі кветкамі па вуглах (мал. 26: 1) (Здановіч, спр. 1213 а. С. 31).



Малюнак 26 – Сценавая кафля сярэдзіны – другой паловы XVIII ст.;
1 – 2 – раскопкі С.В. Тарасава; 3 – 4 – Н.І. Здановіч

Асноўная колькасць гэтай кафлі – са змешчанай рамкай, якая адступае ад краю пласціны прыкладна на 1 см. Развал печы з такой кафлі быў знойдзены па вул. Леніна, 35 (Здановіч, спр. 1450. С. 20). Печ складалася з тэракотавых, зялёнапаліваных і з карычневай палівай пласцін з выявай тарчы (гл. мал. 26: 2 – 4). Дакладна такі ж малюнак тарчы, толькі размешчаны гарызантальна, мелі карнізныя кафлі са светла-блакітнай палівай. Гэтага ж колеру паясковыя пласціны з раслінным арнаментам, балясіна, кавалкі кутняй кафлі, а таксама кавалкі гарадка (Здановіч, спр. 1450. С. 20). Прычым шырыня люстраной кафлі роўная даўжыні паясковай (17 см) і амаль роўная карнізнай (17,3 × 17,5 см).

Цікава, што печ праіснавала да сярэдзіны XIX ст., і падчас рамонту некаторыя пласціны карнізаў былі заменены гладкімі тэракотавымі, без арнаменту.

Яшчэ адна печ з шурфа № 2 па вул. Леніна, 35 датуецца першай паловай XVIII ст. (Здановіч, спр. 1450. С. 21). Яна была складзена з зялёнапаліванай кафлі са змешчанай рамкай, фігурнай тарчай у цэнтры і кветкамі па вуглах. Кафля вялікіх памераў: 22 × 32 (?) см, рамка адступае на 1 – 1,5 см ад краю пласціны. На яе прыкладзе бачны эвалюцыйны пераход да пласцін эпохі класіцызма з высокім рэльефам другой паловы XVIII ст. Дэкор дробных дэталяў па краях пласціны ад рэалістычных выяў кветак трансфармуецца ў бок стылізацыі, альбо знікае ўвогуле, а з другой паловы XVIII ст. рамка знікае, і кафля пераўтвараецца ў бязрамачную з высокай фігурнай выявай тарчы пасярэдзіне (памеры 16,5 × 26 см). Вышыня рэльефа застаецца нязменнай – 1 – 1,5 см. Глухая паліва характарызуецца ўстойлівым наборам адценняў, пераважаюць зялёнапаліваныя пласціны, а таксама пласціны з рознымі адценнямі карычневага з белымі плямкамі, дэкор развіваецца ў межах стылю класіцызму. Адзінкавымі знаходкамі прадстаўлена паліхромная кафля XVIII ст. (табл. 3).

Тэракотавая кафля з вянком і са змешчанай рамкай мае памеры адпаведна 17,5 × 27 (?) см і 16,5 × 21,5 см. На адной пласціне размешчана стылізаваная выява кветкі ў вазе (гл. мал. 13: 3). Расліна знаходзіцца ў цэнтры круглага вянка, па краях – усё тыя ж кветкі. Ваза на кафле займае прыкладна 1/12 даўжыні пласціны.

Выкарыстанне гербавай кафлі ў дэкоры полацкіх печаў XVIII ст. – з’ява выключна рэдкая. На адной тэракотавай бязрамачнай кафлі (Фонды НПГКМЗ. Кп-405/2) у цэнтры круглага лаўровага вянка змешчана манаграма з літар “КІА” (мал. 27: 3).

Табліца 3 – Размеркаванне па тыпах і спосабах аздаблення полацкай кафлі XIV – XVIII стст. з раскопак С.В. Тарасава

Тып кафлі і датаванне	Гарш-ковая XVI ст.	Каробчатая першай паловы XVI ст.		Каробчатая канца XVI – XVII ст.				Каробчатая XVIII ст.				Кафля з крапежным шыпам XVII – XVIII стст.				Уся-го
Аздабленне вонкавай паверхні	б п	з п	б п	з п	б п	а	п	з п	б п	а	п	з п	б п	а	п	
Колькасць знаходак	9	2	5	314	42	21	33	13	10	–	2	49	4	1	6	511
Колькасць знаходак, %	1,8	0,4	0,9	61,4	8,3	4,2	6,4	2,5	1,9	–	0,4	9,6	0,8	0,2	1,2	100

Заўвага: з п – з аздабленнем палівай; б п – без палівы;
а – ангабаваная; п – паліхромная.



Малюнак 27 – Кафля з выявай разеткі XVII – XVIII стст. (1 – 2) і геральдычная кафля сярэдзіны XVIII ст. (3); раскопкі С.В. Тарасава

Адметнай рысай тэхналогіі вытворчасці полацкай кафлі першай паловы XVIII ст. з’яўляецца выкарыстанне штампа для адціскання малюнка (кафля з выявай чатырохпялёсткавай кветкі). Папярэдне адфармаваную пласціну клалі на роўную паверхню, замацоўвалі па краям у прадольных рэйках, пасля чаго зверху прыкладалі драўляны штамп. Атрыманы адбітак быў не вельмі выразны, амаль заўсёды ўтрымліваў сляды драўляных валокан, таму для далейшага аздаблення на пласціну наносілі паліву. Некаторыя пласціны з’яўляліся ганчарным бракам і змяшчалі, напрыклад, падвоены адбітак ці змешчаную, асіметрычную выяву кветкі.

Прадстаўнічая калекцыя кафлі XVIII ст. знойдзена ў Полацку на месцы былога губернатарскага дома. Верагодна, яна паходзіць з цаглянага

будынка канца XVII ст., які пасля перабудовы стаў цэнтральнай часткай комплексу дома генерал-губернатара (Русаў, спр. 1692. С. 10). Тут знойдзены шматлікія фрагменты кафлі з вянком, з выявамі чатырохпялёсткавых кветак, кафлі з тарчамі розных канфігурацый, кутняй кафлі з балясінамі і перагародчатай кафлі (Русаў, спр. 1692. Ліст 11 – 12, 15, 17). Апошняя ў Полацку, як і ў Віцебску, з'явілася не раней першай паловы XVIII ст. (Бубенько, 1993. С. 13). Кафля ўтварала наборы для печы (фрагменты карнізаў, невялікія кавалкі навершшаў). Але самая адметная кафля – гэта "гладкія" пласціны, аздобленыя "галандскай" размалёўкай з набора адной печы (Русаў, спр. 1692. Ліст 5 – 7). "Галандская" кафля сустракаецца трох асноўных тыпаў: карнізная, кафля-цяга (перамычкавая) і сценавая (Лугіна, 2000. С. 30 – 31).

Вылучаюцца два асноўныя матывы размалёўкі "галандскай" кафлі: першы – гэта выявы кветак, зробленыя зялёным і жоўтым колерам з акантоўкай цёмна-карычневай фарбай, другі – гэта выява тарчы складанай канфігурацыі з геаметрычным сеткавым арнаментам унутры. Уся размаляваная кафля мае значную таўшчыню пласціны (1,5 – 2 см) і зроблена з добра адмучанай гліны без слядоў копаці падчас эксплуатацыі печы. Крапежны шып праходзіць праз вертыкальныя сценкі румпы.

Такім чынам, на прыкладзе полацкай кафлі XVIII ст. відавочна прасочваецца пераход да ракайльнай і класічнай традыцыі ў дэкаратыўным мастацтве (Лазука, 2001. С. 79 – 81). Адметнасць гэтай традыцыі заключаецца ў стандартызацыі матываў, у першай палове XVIII ст. большасць з іх зводзіцца да двух асноўных: ракайля і вянка.

Кафля працягвае развівацца на папярэдняй аснове прыкладна да сярэдзіны стагоддзя, калі было вынайдзена прынцыпова новае рашэнне ў спосабе стварэння пластычнай выявы: замест кампазіцыі, у якой галоўную ролю адыгрываў рэльеф выяў з дапаможным (але не абавязковым!) аздабленнем колерам, з'яўляюцца матывы размалёўкі, пры гэтым паверхня пласціны мае выключна дапаможную функцыю як аснова, на якой праводзіцца размалёўка.

Новы напрамак (класіцызм) з сярэдзіны XVIII ст. стаў пануючым да сярэдзіны XIX ст. На змену класічнай прыходзіць мадэрновая рэльефная кафля, распаўсюджаная ў памяшканнях грамадскіх устаноў і пабудовах заможных мяшчан.

3.2. Канструкцыя і знешні выгляд печаў XVI – XVIII стагоддзяў

Кафляныя печы па канструкцыйных асаблівасцях маглі быць розных варыянтаў, але па функцыянальнай прыкмеце ўсе яны падзяляюцца на печы з праматочнай ці камернай сістэмай ацяплення (Смирнов, 1956. С. 84 – 85).

Рэшткі печаў з праматочнай сістэмай ацяплення XIV – XV стст. у Полацку выяўлены П.А. Рапапортам і А.В. Шолахавай пры даследаванні пабудовы каля княжацкага церама ў 1976 – 1977 гадах (гл. мал. 8: 2, 3) (Заяц, 1997. С. 92 – 95). У 2003 годзе на тэрыторыі Запалоцця намі была раскапана печ, зробленая з гаршковай кафлі (Дук, спр. 2079 а). Печ захавала галоўныя канструкцыйныя асаблівасці і датавана XV ст.

Аснова печы ў выглядзе прамавугольніка памерамі 1,1 × 0,8 м (гл. мал. 8:1). Сценкі печы мелі таўшчыню 0,2 м, вышыню 0,3 м і зроблены з чырвонай гліны, вапны, камянёў розных памераў, цэглы і цаглянага друза. Рабочая (унутраная) частка печы займала прастору 0,45 × 0,75 м. Вусце печы мела шырыню каля 0,2 м. Знутры печы, каля вусця, зроблена своеасаблівая падлога з чатырох камянёў 10 × 15 см, пакладзеных у адзін рад, і дзвюх цаглін у другім радзе. Быў знойдзены фрагмент дугі печы, які, верагодна, з’яўляўся скляпеннем вусця. Дуга прадстаўляе сабой выгнутую аплаўленую цагліну, пакрытаю карычневай шкламасай – вынік тэрмічнага ўздзеяння. Магчыма вызначыць толькі таўшчыню дугі – 4 см, мяркуемая даўжыня – 20 – 25 см, дыяметр вонкавага выгіну каля 40 см.

Для будаўніцтва печы выкарыстоўваўся розны спадручны матэрыял: цэгла другаснага выкарыстання, камяні памерамі да 0,2 м, пры гэтым якая-небудзь вызначаная сістэма ў тэхніцы будаўніцтва не назіраецца. Так, паўднёва-ўсходняя сценка была зроблена з цэглы шырынёй 10 і 12 см і даўжынёй да 22 см. Пра таўшчыню цэглы з печы ў Запалоцці можна меркаваць па фрагментах. Падчас раскопак культурнага пласта каля печы былі знойдзены: цэгла памерамі 9,7 × ? × 4,5 см, 8 × ? × 4 – 4,5 см; асобныя фрагменты таўшчынёй 3 см, 3,5, 3,7 і 4 см. Цэгла дрэннай якасці, крохкая, вызначыць яе таўшчыню вельмі цяжка, часта фіксуецца толькі чырвоная пляма развала будаўнічага друза на месцы залягання цэглы. Заўважым, што дрэнна абпаленая цэгла была знойдзена падчас даследавання рэшткаў кафляных печаў XIV – XV стст. у полацкім княжацкім цераме. Керамічнае цеста, з якога зроблена цэгла, аднароднага чырвонага колеру з дамешкамі буйной (да 0,8 см) жарствы. Можна выказаць меркаванне, што для будаўніцтва печы разам з камянямі і брусковай цэглай бралі плінфу шырынёй 22 см.

Непасрэдна каля сценак і ўнутры печы сабраны нешматлікія фрагменты гаршковай кафлі ў колькасці 9 адзінак. Венцы кафлі круглыя, іх дыяметр роўны 14 см, дыяметр донцаў – 8 см. Магчымая вышыня кафлі – 20 см. Кафля сфармавана на ручным ганчарным крузе на падсыпцы з зярністага пяску і жарствы. Таўшчыня сценак 0,7 – 1 см. Адсутнасць у печы цэлых кафляў і наяўнасць нешматлікіх фрагментаў сведчыць аб тым, што на пэўным этапе печ была старанна разабрана да асновы, пры гэтым былі сабраны нават дробныя кавалкі кафлі.

Найбольш шырока печы з гаршковай кафлі будаваліся ў Полацку на працягу XV – першай паловы XVI ст., аднак працягвалі выкарыстоўвацца для ацяплення і гатавання ежы ў дамах радавых палачан аж да канца XVII ст.

У XVII ст. шырокае распаўсюджванне атрымалі камерныя печы, зробленыя са сценавай кафлі. Пабудаваць камерную печ каштавала нятанна, таму іх сляды археалагічна зафіксаваны ў дамах заможных мяшчан і шляхты. Будаўніцтвам печаў займаліся муляры, якія ў 1643 годзе ўтварылі ў Полацку свой цэх (Игнатенко, 1963. С. 32).

У пабудове канца XVI ст. (раскопкі Н.І. Здановіч у 1991 г.) захавалася аснова печы. Печ трымалася на чатырох драўляных слупах дыяметрам 30 см і мела памеры асновы 180 × 110 см (Здановіч, 1998. Мал. 3). У ёй знойдзены 7 фрагментаў пячных дугаў, некалькі фрагментаў румпаў вышынёй 10 см і фрагмент кафлі з падвоенай уступчатай рамкай (Здановіч, 1998. С. 126). Археалагічны матэрыял дазваляе меркаваць пра камерную канструкцыю печы.

Полацкія печы XVII – XVIII стст. былі пабудаваны на выбрукоўцы з камянёў розных памераў ад 10 – 15 да 30 – 40 см. Кораб печаў са сценавай кафлі награваўся павольней у параўнанні з печамі з гаршковай ці міскавай кафлі, затое цяпло ў камерных печах выпраменьвалася даўжэй (Dąbrowska, 1970. S. 9).

Падчас раскопак у Полацку ў 2001 годзе каля будынка былога езуіцкага калегіума былі знойдзены развалы чатырох печаў (Дук, спр. 1921. С. 6 – 7). Самая старажытная печ з пабудовы першай паловы XVI ст., ад яе захаваліся толькі фрагменты міскавай кафлі з вусцем вялікага дыяметра. Вядома, што падлога каля печы была выкладзена керамічнымі пліткамі з мэтай супрацьпажарнай бяспекі, дакладна такая ж з’ява адзначалася пры даследаванні печаў з пасадскіх будынкаў XVI – XVII стст. (Здановіч, 1998. С. 130).

Комін печы № 2 быў складзены з цэглы, якая моцна аплавілася і прадстаўляла сабой спечаныя з растворам цёмна-шэрыя бясформеныя кавалкі. Гэта была камерная печ, якая неаднаразова перараблялася. Пячны набор кафлі складаўся са сценавых пласцін з выявай манаграмы “IHS”, дывановай кафлі, карнізаў з геаметрычным і раслінным арнаментам і каронак з праразным (масверковым) арнаментам (мал. 28). Пра знешні выгляд печы можна меркаваць пры дапамозе распрацаванай методыкі супастаўлення сты-

лістычных асаблівасцяў кафлі, вызначэння яе марфалагічных, тэхналагічных і метрычных прыкмет і параўнання іх з памерамі асновы печы (Заяц, 1990. С. 51 – 52; Dąbrowska, 1994. S. 16).



Малюнак 28 – Графічная рэканструкцыя печы сярэдзіны – другой паловы XVII ст.; раскопкі Д.У. Дука

Печ № 2, ад якой захавалася аснова, была складзена з кафлі з выявай манаграмы “IHS” ордэна езуітаў (развал гэтай кафлі знойдзены побач з асновай печы). Гэтыя пласціны былі шырока вядомыя ў Полацку і вырабляліся не раней 30-х гадоў XVII ст. У дадзенай печы яны знаходзіліся ў аснове (ніжнім ярусе), пры супастаўленні метрычных паказчыкаў “езуіцкай” кафлі ўдалося высветліць, што вонкавы бок асновы печы быў упрыгожаны шасцю пласцінамі кафлі ў адным радзе, верхні ярус упрыгожвалі шэсць пласцін дывановай кафлі ў адным раддзе. Печ была пабудавана ў сярэдзіне XVII ст. і, верагодна, існавала да пачатку XVIII ст.

Под печы складзены з камянёў, а сценкі асновы (захаваліся на вышыню да 30 см) – з цэглы на гліняным растворы (памеры цэглы прыведзены ў табл. 4).

Сценкі печы зроблены з цэглы па сістэме лажок – тычок – лажок, пры гэтым папярочныя цагліны былі разломлены напалову, а лажковыя таксама толькі зрэдку сустракаліся цэлымі. Уся цэгла была другаснага выкарыстання, разам з ёй знойдзены два фрагменты ганчарнай формы для вытворчасці карнізнай і сценавай кафлі, аналагічнай той, якой была аздоблена печ. Прастора каля печы была абкладзена тэракотавымі пліткамі падлогі.

Высветлена, што печ мела памеры асновы 111 × 92 см, вышыня ўсёй печы магла дасягаць 2 м. Цяжка сказаць, якім было запаўненне асновы печы, камяні сярэдняга памеру (10 – 15 см) і кавалкі цэглы з развала печы дазваляюць выказаць меркаванне, што яно было аналагічнае вядомым у Пскове печам XVII ст., дзе камяні і цэгла пакладзены на гліну і звонку гэтае гліняна-каменнае запаўненне падтрымліваў кафляны кажух і жалез-

ныя звязкі (Спегальский, 1968. С. 75). Не выключана і іншае прызначэнне камянёў – яны маглі выкарыстоўвацца як цокаль, на якім будавалася цагляная аснова печы. Такая камерная печ вядома па раскопкам Мірскага замка (Здановіч, Краўцэвіч, Трусаў, 1994. Мал. 24, 25), дзе цалкам захаваліся цагляныя сценкі ніжняга яруса печы. Рэшткі ніжняга яруса з цэглы зафіксаваны і ў печы № 2, таму верагодна, што сценкі асновы (базы) печы былі зроблены з цэглы і кафлі.

Табліца 4 – Метралагічныя характарыстыкі цэглы з гістарычных частак г. Полацка

Помнік	Час існавання	Фармат цэглы, см	Крыніца
1	2	3	4
Дворык езуіцкага калегіума	Стратыграфічны пласт першай паловы XVI ст.	? × 16 × 7,5 (пальчатка 6 барознаў)	Дук, спр. 2046. С. 24
Дом генерал-губернатара	Другая палова XVII ст.	25 × 12 × 6, 27 × × 12 – 13 × 6; 27 × 15 × ?	Русаў, спр. 1692. С. 10
Дом 25а па вул. Леніна	XVIII ст.	26 – 26,5 × 12 – 13 × × 6 – 6,5 (выкарыстоўваліся як пліткі падлогі)	Здановіч, спр. 1213 в. С. 26
Дом па вул. К. Маркса, 1	Сярэдзіна XVII ст.	28 – 30 × 14 – 15 × × 6 – 7 (пальчатка)	Здановіч, спр. 1213 а. С. 20
Брацкая школа Богаяўленскага манастыра	Сярэдзіна XVIII ст.	27 × 12 × 3,5 (прафіляваная трохвугольная цэгла)	Сагановіч, спр. 975. Ф. 15
Эканамічны дом Богаяўленскага манастыра	Сярэдзіна XVIII ст.	28 – 30,5 × 13,5 – 15 × × 5,5 – 6,5 (некаторая – пальчатка 4 барозны на адной з пастэляў) ? × 13 × 6,5 ? × 14 × × 5,5 ? × 14 × 6 (пальчатка з прамымі барознамі)	Здановіч, спр. 1148 б. С. 8 – 9, 24
Езуіцкі калегіум	Першая палова XVIII ст.	32 × 17 × 6, 29 × 13 × 6, 32 × 17 × 6, 31 × × 15 × 7 (пальчатка 3 – 4 барозны), 25 × ? × 6, 24 × 15 × 6, 26 × × 12 × 6	Дук, Тарасаў, спр. 1880. С. 4, 6 – 7

Працяг табліцы 4

1	2	3	4
Падмурак будынка па вул. Леніна, 7	Канец XVII ст.	29 × 14 × 5 – 6 (пальчатка 3 барозны)	Назіранне аўтара (2002)
Базыліянскі кляштар	Другая палова XVIII ст.	31 × 14,5 × 7,5, 29 × × 14 × 8, 28 × 17,5(18) × × 11,5	Тарасаў, спр. 1496. С. 7
Под кафляной печы (Вялікі пасад)	Сярэдзіна XVII ст.	? × 14 – 14,5 × 6 – 8, 25 × ×12,5 × 5,5 – 7,5, 28 × × 13,5 × 6,5 (пальчатка) ? × 16 × 5,5	Дук, спр. 1921. С. 6 – 7
Храмы Бельчыцкага манастыра	Рамонт 1770 – 1779 гг.	? × 14 × 7 (7,2 – 7,5)	Трусаў, спр. 1251 а, б. С. 9
Храмы Бельчыцкага манастыра	Сярэдзіна XVII – пачатак XVIII стст.	? × 14 × 4,5 (5) (пальчатка 3 барозны)	Трусаў, спр. 1251. С. 9

На пабудову печаў бралі цэглу другаснага выкарыстання і камяні, ужываліся нават адпрацаваныя керамічныя формы ад вытворчасці кафлі, асноўным звязваючым матэрыялам была чырвоная гліна і вапна.

Печ знаходзілася ў жылым будынку, слядоў якога не захавалася. Вядома, што комін камерных печаў нярэдка выходзіў у суседні гаспадарчы пакой. У рэдкіх выпадках удалося прасачыць размяшчэнне печаў у доме. Прынамсі, у асобных пабудовах на Вялікім пасадзе XVII ст. печы зафіксаваны на значным аддаленні ад сценаў дома, а гэта значыць, што і тапіліся яны непасрэдна з жылога, а не гаспадарчага пакоя.

У Полацку не знойдзены рэшткі ад зборных керамічных колцаў, якія звычайна выкарыстоўваліся як матэрыял для будаўніцтва жаравых калодзежаў і былі універсальным элементам канструкцыі печаў на тэрыторыі Усходняй і Цэнтральнай Еўропы (Спегальский, 1968. С. 75; Buśko, 1995. S. 156). Не выключана, што цагляны развал на месцы размяшчэння печы з'яўляецца рэшткамі гарызантальных дымаходаў (Синчук, Зайцева, 1997. С. 250).

З канструкцыйных дэталяў захаваліся керамічныя дугі ад скляпення печы, яны былі неарнаментаваныя, а супастаўленне іх памераў дазволіла вызначыць, якім было пячное вусце. Дугі ад печы маюць памеры 8 × 5 см пры ўнутраным дыяметры 40 см, тарцы дуг маюць форму трапецыі аналагічна раней знойдзеным у Полацку вырабам (Здановіч, 1998. С. 129).

У XVII – XVIII стст. засланкі ад печаў былі керамічныя. Падчас раскопак Н.І. Здановіч быў знойдзены фрагмент засланкі з адбіткам дзяньгі 1740 года, засланка мела дыяметр 39 см і таўшчыню 1,5 см (Здановіч, спр. 1373. С. 19). Рэдкай знаходкай з'яўляецца выяўлены ў Дзісне комп-

лекс пячных дуг і фрагментаў керамічных засланак XVII ст., па выніках супастаўлення наяўнага матэрыялу І.І. Сінчуком і В.Я. Зайцавай прапанавана графічная рэканструкцыя коміна печы (Синчук, Зайцева, 1997. С. 246). Наяўнасць шматлікіх падабенстваў асобных артэфактаў Дзісны, Друі і Полацка XVII ст. дае падставы для разгляду друйскіх печаў у кантэксце вырабаў полацкіх майстроў (Зайцава, 1990. С. 88).

Комін печы XVII ст. з Дзісны меў закруглёнае скляпенне-перакрыцце, хутчэй за ўсё цыліндрычнае. Мінімальная вышыня засланкі складае 35 см, радыус верхняй частцы 18 – 18,5 см, ручка была арыентавана вертыкальна (Синчук, Зайцева, 1997. С. 247 – 248). Вусці комінаў полацкіх печаў мяжы XVI – XVII стст. мелі дыяметр верхняй цыліндрычнай часткі ад 46 да 58 см, з другой трэці XVII – XVIII стст. памеры дыяметраў вусцяў памяншаюцца і складаюць у сярэднім каля 37 – 40 см.

Неабходна заўважыць, што дагэтуль у Полацку не зафіксавана камерных печаў, якія б захаваліся цалкам і данеслі ўсе канструкцыйныя асаблівасці. Таму створаныя даследчыкамі рэканструкцыі толькі прыадчыняюць таямніцу будаўніцтва печаў і пакідаюць месца для далейшага вывучэння гэтага віду рамеснай дзейнасці.

3.3. Архітэктурна-дэкаратыўныя элементы аздаблення інтэр'ераў і экстэр'ераў гарадскіх пабудоў

Да архітэктурна-дэкаратыўных элементаў аздаблення інтэр'ераў і экстэр'ераў розных тыпаў пабудоў традыцыйна адносіцца дахоўка, цэгла і пліткі падлогі.

Дахоўка з'яўляецца універсальным будаўнічым матэрыялам. У Полацку яна была знойдзена ў месцах размяшчэння культавых і свецкіх пабудоў XVI – XVIII ст. на Верхнім замку, Вялікім пасадзе, Задзвінні, Запалоцці, і ў параўнанні з іншымі відамі архітэктурна-дэкаратыўнай керамікі, напрыклад, з кафляй, дахоўка не вызначалася вялікай разнастайнасцю формаў. Гэта можа тлумачыцца, па-першае, уніфікацыяй будаўнічай тэхналогіі ў адзначаны перыяд, а, па-другое, спецыфікай размяшчэння дахоўкі, якая прадвызначала перавагу утылітарнай функцыі вырабаў над іх дэкаратыўным зместам.

З археалагічных раскопак у Полацку вядома некалькі асноўных відаў дахоўкі. У XVI – XVII стст. дахоўкай аздабляліся дахі драўляных будынкаў езуіцкага калегіума, кляштара бернардзінцаў, францысканцаў і дамініканцаў, будынкаў базыліянскага манастыра і Богаяўленскага брацкага манастыра, па аналогіі з Віцебскам можна меркаваць аб ужыванні дахоўкі пры перакрыцці вежаў гарадскіх умацаванняў (Калядзінскі, 2001. С. 95). З XVIII ст. большасць манастырскіх збудаванняў і будынкаў губернскага

магістрата былі ўжо мураваныя – гэтым тлумачыцца частае знаходжанне рэшткаў дахоўкі ў культурным пласце пераважна другой паловы XVIII ст. у розных месцах гістарычнай часткі Полацка (Страчаная спадчына, 1998. С. 240).

Самай ранняй археалагічна выяўленай дахоўкай у Полацку з'яўляецца плоская дахоўка канца XVI – XVII стст., закругленая з аднаго боку (мал. 29: 1), якая мела назву "манастырская" (Калядзінскі, 2001. С. 95). Знойдзена яна ў двары дзіцячай мастацкай школы (вул. К. Маркса, 1), на тэрыторыі, якая раней прымыкала да будынкаў дамініканскага кляштара (мураваны з 1785 г.) (Страчаная спадчына, 1998. С. 240), і ў раскопе каля будынка былога езуіцкага калегіума (мураваны з 1749 г.) (Шалькевіч, 1999. С. 535). Гэты тып дахоўкі ўжываўся да канца XVII ст. і быў прыстасаваны для пакрыцця стромкіх дахаў. На супрацьлеглым прамавугольным выступе плоскай дахоўкі знаходзіўся крапёжны выступ акруглай ці трохвугольнай формы (Археалогія Беларусі, 2001. С. 318; Трусов, 1986. С. 188). Аналагічная дахоўка знойдзена пры даследаванні мураваных помнікаў заходняга рэгіёну Беларусі (Гародні і Мірскага замка) (Трусов, 1988. С. 188) і Магілёва (Археалогія Беларусі, 2001. Мал. 215, 12). Аналіз праводзіўся на аснове вывучэння 17 наяўных адзінак. Полацкая плоская дахоўка мае значную таўшчыню (каля 1,5 – 2 см), шырыню 17 – 18 см і сляды барознаў ад пальцаў, на некаторай дахоўцы зафіксавана да васьмі барознаў, што з'яўляецца больш ранняй храналагічнай прыкметай.



Малюнак 29 – Дахоўка канца XVI – XVII стст.; раскопкі Н.І. Здановіч

Выгнутую форму ў XVII ст. захавала толькі вільчаковая (каньковая) дахоўка (Трусов, 1986. С. 188). Датаваць яе можна па таўшчыні, якасці керамічнай масы і наяўнасці дэкаратыўнага шыпа (Археалогія Беларусі, 2001. С. 318). У Полацку вільчаковая дахоўка знойдзена ў выглядзе невялікіх фрагментаў у колькасці 10 адзінак, на адным з іх знаходзіўся адбітак мана-

грамы “IHS” па памерах роўны манаграме Ісуса на полацкай кафле сярэдзіны XVII ст., паходжанне артэфакта звязана з езуіцкім калегіумам.

Плоская дахоўка змяняецца хвалістай на мяжы XVII – XVIII стст. (Трусов, 1986. С. 190), таўшчыня яе каля 1 см, звычайна яна мела прамавугольны крапежны шып (Здановіч, спр. 1213 в. С. 26). Гэтая дахоўка ў вялікай колькасці знойдзена падчас архітэктурна-археалагічнага даследавання езуіцкага калегіума ў 2000 – 2002 гадах (адабрана больш 50 фрагментаў) (Дук, Тарасаў, спр. 1880. Мал. 21); дахоўка мела шырыню 25 см і яе профіль нагадвае лацінскую літару “S” (гл. мал. 29: 2). Тут жа была знойдзена ранняя плоская дахоўка фарматам 25 × 40 см, якая ў сярэдзіне XVIII ст. выкарыстоўвалася як будаўнічы матэрыял пры выкладцы цагляных падмуркаў і ўнутраных скляпенняў калегіума.

Цэгла з’яўляецца самым масавым відам будаўнічай керамікі. Выразная прыкмета цэглы XVII – XVIII стст. заключаецца ў наяўнасці на адным з бакоў прадольных ці дыяганальных палосак-барознаў (звычайна трох-чатырох), якія наносіліся пальцамі пры фармоўцы.

Эвалюцыя памераў цэглы на працягу XIII – другой паловы XVII ст. адпавядае зменам фарматаў аднатыпных вырабаў з суседніх тэрыторый Польшы, Літвы, Расіі і Украіны (Кошовий, 1989. С. 77). У другой палове XVII ст. у беларускім дойлідстве пераважае тонкая цэгла таўшчынёй ад 5 да 6,5 см. Побач з памяншэннем таўшчыні павялічваецца яе шырыня і даўжыня, пры гэтым розніца ў даўжыні цэглы можа дасягаць ад 3 – 3,5 см (Трусов, 1991. С. 114) да 5 – 7 см (Соболь, 1988. С. 121). Апошняе цалкам правамоцна для полацкай цэглы, якая ў гэты час не вызначаецца стандартнымі памерамі (гл. табл. 4).

Так, полацкая цэгла другой паловы XVII ст. мае памеры 25 – 28 × × 12 – 16 × 5,5 – 8 см. Цэгла першай паловы XVIII ст. – фармата 29 – 32 × × 13 – 17 × 6 – 7 см і фармата 24 – 26 × 12 – 15 × 6 см, цэгла другой паловы XVIII ст. – 28 – 30,5 × 13,5 – 15 × 5,5 – 6,5 см. У канцы XVIII ст. распаўсюджваецца цэгла вялікага фармата: 31 × 14,5 × 7,5 см; 29 × 14 × 8 см і нават 28 × 17,5 (18) × 11,5 (!) см. Вялікая розніца ў памерах цэглы аднаго фармата можа тлумачыцца пераходам у XVII – XVIII стст. да безсістэмнай раўнаслойнай муроўкі з выкарыстаннем тынкоўкі (Трусов, 1991. С. 116). Аналагічныя прапорцыі суадносінаў памераў даўжыні, шырыні і таўшчыні цэглы (формула 4 : 2 : 1) характэрны для шэрага помнікаў беларускага дойлідства сярэдзіны – другой трэці XVII ст. (Сінчук, 1992. С. 196). Адметнасцю полацкай цэглы можна лічыць устойлівасць шырыні цэглы каля 6 см на працягу ўсяго XVIII ст. і суадносіны шырыні і таўшчыні цэглы як 2 : 1.

Цэгла больш ранняга часу асобна не вылучаецца па прычыне нешматлікай колькасці мураваных помнікаў XVI – першай паловы XVII ст. Крытэрыі для вызначэння цэглы XVI – пачатку XVII ст. не распрацаваны. Адзіным цагляным будынкам XVI ст. у Полацку з'яўляецца ратуша, якая дагэтуль археалагічна не выяўлена. Вядома, аднак, што цагельня (плітніца) была пабудавана ў мястэчку Бор (магчыма, сучасная Баравуха 2 ці 3) пасля 1509 года. Гэтая цагельня прызначалася для пабудовы ратушы (Полоцкие грамоты, 1980. С. 61).

У XVII – XVIII стст. колькасць мураваных свецкіх і культавых пабудоў адносна традыцыйнай драўлянай забудовы была невялікая, таму выкарыстанне азначэння "масавая вытворчасць" прыведзена ў дачыненні да рэальных патрэб мураванага дойлідства.

Паверхня некаторых цаглін захавалі адбіткі сабачых лап (Дук, спр. 1921. Фота 46), ракавін ад дажджу, пясочнай падсыпкі і слядоў зёлак (Тарасаў, спр. 1496. С. 7). Пры даследаванні былога Эканамічнага дома Богаяўленскага манастыра і базыліянскага кляштару знойдзена прафіляваная трохвугольная цэгла XVIII ст., лекальная і фігурная цэгла ад аконнага перакрыцця.

Як вынікае з аналізу даных, прыведзеных у табліцы 4, масавая вытворчасць цэглы пачынаецца ў Полацку з сярэдзіны XVII ст. Гэта пацвярджаюць і пісьмовыя крыніцы: у 1643 годзе ў Полацку быў утвораны цэх цагельнікаў (Игнатенко, 1963. С. 32). У актавых кнігах полацкага магістрата ад 1 красавіка 1650 года ёсць звесткі пра цагельню, якая належала полацкаму райцу Яну Размысловічу і пасля смерці ўладальніка была перададзена яго жонцы Ефрасінні і нашчадкам (Гардзееў, 2004. С. 52). Цагельня з участкам знаходзілася за гарадскім парканам ад вул. Выганнай да вул. Малой. Вакол цагельні знаходзіліся два агароды, размешчаныя побач, адзін – па вул. Бацечкавай. Размяшчэнне агародаў вакол цагельні адпавядала патрабаванням супрацьпажарнай бяспецы. Актыўнае мураванае будаўніцтва каталіцкіх касцёлаў, кляштараў і калегіума ў Полацку сярэдзіны XVIII – пачатку XIX ст. патрабавала масавай вытворчасці цэглы. У 1786 годзе ў Полацку быў створаны цагельны завод, які выпускаў да 50 тыс. цаглін у год (Игнатенко, 1963. С. 22), аднак, відавочна, што буйныя мануфактуры па вытворчасці цэглы павінны былі існаваць у Полацку раней гэтага часу. Па хуткасці і маштабам мураванага, пераважна каталіцкага, дойлідства сярэдзіны XVIII – пачатку XIX ст. забудову горада можна параўнаць толькі з перыядам росквіту старажытнаполацкай школы мураванага дойлідства XII ст. Істотныя змены зазнала толькі ідэалагічная скіраванасць, раней – праваслаўе, зараз – каталіцызм.

Пліткі падлогі найчасцей сустракаліся ў культавых пабудовах: з даўніх часоў імі ўпрыгожвалі інтэр'еры цэркваў; адметнасцю XVI – XVIII стст. можна лічыць шырокае выкарыстанне керамічнай падлогі ў пабудовах простых гараджан. Так, яшчэ ў перыяд готыкі падлога амаль поўнасцю пазбавілася дэкаратыўнай функцыі, больш саступаючы месца утылітарнаму прызначэнню (Трусаў, 1985. С. 193). У Полацку керамічныя пліткі XVII – XVIII стст. знойдзены пры даследаванні Сафійскага сабора (Трусаў, 1985. С. 193), езуіцкага калегіума (Дук, Тарасаў, спр. 1880. С. 7) і ў шэрагу грамадзянскіх пабудоў полацкіх пасадаў.

Самыя раннія археалагічна выяўленыя пліткі падлогі, якія выкарыстоўваліся ў грамадзянскай пабудове, знойдзены разам з рэчавым комплексам першай паловы XVI ст. у колькасці 21 адзінкі (Дук, спр. 1921. С. 9). Верагодна, пліткі падлогі паходзяць ад прасторы вакол печы. Памеры плітак падлогі з пабудовы: 3 × 15 × ? см, 3,5 × 13 × ? см, 4 ×13 × ? см. Яны выраблены з чырвонай слаба абпаленай гліны з дабаўленнем вялікай колькасці грубай жарствы (каменьчыкаў памерамі да 1 см) і арганічных дамешак (парасткаў раслін). Выкарыстанне тэракотавых плітак падлогі ў грамадзянскіх пабудовах першай паловы XVI ст. – адметная з'ява ў гісторыі матэрыяльнай культуры Полацка.

Масіўныя пліткі падлогі памерамі 3 × 30 × 30 см (езуіцкі калегіум, XVIII ст.) – 3 × 20 × 20 см (Запалоцкі пасад, XVIII ст.) (Тарасов, спр. 953. С. 3) выкарыстоўваліся для аздаблення інтэр'ераў вялікіх мураваных памяшканняў.

Каля печы сярэдзіны XVII ст. выяўлены тэракотавыя пліткі падлогі (знойдзены фрагменты) таўшчынёй 3 і 3,5 см і шырынёй адпаведна 15 і 30 см. Адзін фрагмент ад пліткі падлогі 27 × 27 × 4,5 см трапіў, верагодна, ад будынка езуіцкага калегіума (Дук, спр. 1921. С. 7). З раскопу Н.І. Здановіч на Вялікім пасадзе паходзяць пліткі падлогі двух памераў: квадратныя з бокам 20 – 21 × 3 – 3,5 см і 31 × 31 × 6 см (Здановіч, спр. 1213 а. С. 34). З гэтых плітак падлогі была зроблена суцэльная цагляная падлога ў доме сярэдзіны XVII ст.

Асобнай групай прадстаўлены паліваныя пліткі падлогі, якія датуюцца XVII – XVIII стст. На Вялікім пасадзе Полацка знойдзена лекальная плітка падлогі, памерамі 20 × 19,5 × 7 см, на якой ужывалася зялёная паліва (Фонды НПГКМЗ. Квф-2-978/100) і фрагмент пліткі з палівай жоўтага колеру (Фонды НПГКМЗ. Кп-15-4345/20) (раскопкі С.В. Тарасава). Аналагічныя адзінкавыя матэрыялы былі знойдзены аўтарам у 2002 годзе падчас раскопак на Вялікім пасадзе. Гэта азначае, што маюцца прамыя

сведчанні аб выкарыстанні гараджанамі ў XVII – XVIII стст. плітак падлогі з палівамі розных адценняў.

Вынікае, што вытворчасць цэглы і дахоўкі ў Полацку атрымала значнае развіццё з канца XVII ст., а керамічныя пліткі падлогі ў пабудовах гараджан з'явіліся ўжо ў другой палове XVI ст., што звязана з пашырэннем будаўніцтва цагляных печаў.

Такім чынам, аналіз дэкору і вывучэнне канструкцыйных асаблівасцяў полацкай архітэктурна-дэкаратыўнай керамікі як адной з самай масавай і прадстаўнічай катэгорыі рэчавага матэрыялу XVI – XVIII стст. дазваляе вызначыць наступныя палажэнні:

– па-першае, архітэктурна-дэкаратыўную кераміку, у прыватнасці кафлю, неабходна разглядаць як паўнавартасны твор прафесійнага дэкаратыўнага мастацтва;

– па-другое, багацце дэкору і масавы характар знаходак кафлі, дазваляе прасачыць этапы станаўлення мастацкіх стыляў рэнесансу, маньерызму, барока і класіцызму ў матэрыяльнай культуры палачан і рабіць праекцыі на іншыя катэгорыі побытавага рэчавага матэрыялу (керамічны і шкляны посуд, ювелірныя вырабы);

– па-трэцяе, марфалагічныя прыкметы кафлі, канструкцыі печаў, цэглы і іншых архітэктурна-дэкаратыўных элементаў пры комплексным вывучэнні з'яўляюцца важнай крыніцай па характарыстыцы рамесных сувязяў насельніцтва Полацка, вылучэння асноўных этапаў яго развіцця і асаблівасцяў матэрыяльнай культуры.

4. ГАНЧАРНЫ ПОСУД І ДРОБНЫЯ КЕРАМІЧНЫЯ ГРУПЫ

4.1. Вытворчасць, пытанні тыпалогіі і храналогіі полацкага керамічнага посуду XVI – XVIII стагоддзяў

З моманту вынаходніцтва керамічны посуд з'яўляецца самым распаўсюджаным археалагічным матэрыялам, яго масавай вытворчасці спрыяла, па-першае, шматвяковая традыцыя, па-другое, зручнасць выкарыстання і таннасць сыравіны, па-трэцяе, універсальнасць прызначэння. Як адметная рыса перыяду ранняга Новага часу вылучаюцца разнастайныя тэхнікі дэкаравання керамічнага посуду і яго аздаблення да такой ступені, што некаторыя віды посуду губляюць утылітарную функцыю і становяцца творамі мастацтва, шырока прадстаўленымі ў паўсядзённым жыцці гараджан.

Праблема вывучэння керамікі ранняга Новага часу ў беларускай археалогіі застаецца вельмі актуальнай (Зайцева, 1996. С. 129 – 132). Чакаюць разгляду шэраг нявырашаных пытанняў храналогіі і сістэматызацыі ганчарнага посуду, вывучэнне паліў і тэхнікі іх накладання, відаў дэкору і інш. У польскай гістарыяграфіі для абазначэння шырокага спектра ганчарных вырабаў XVI – XVIII стст. выкарыстоўваецца тэрмін "keramika nowożytna" (новачасная кераміка) (Kajzer, 1996. S. 217). Складанасць сістэматызацыі формаў посуду заключаецца ў тым, што асартымент керамічных вырабаў XVII – XVIII стст. не паддаецца падлічэнню (Gajewska, 1990. S. 164).

У першай палове – сярэдзіне XVI ст. паступова адбываецца пераход да новых тэхналогій вырабу керамікі, які абумоўлены выкарыстаннем нажнога ганчарнага круга з рухомай воссю (Hołubowicz, 1950. S. 124; Kajzer, 1996. S. 216). Полацкія матэрыялы XVI ст. дазваляюць сцвярджаць аб пасляпоўным развіцці тэхналагічных прыёмаў цэнтральна- і заходнееўрапейскага ганчарства (Здановіч, 1998. С. 127). Напрыклад, масавае ўкараненне тэхнікі "тачэння" посуду ў ВКЛ і Польшчы прыпадае на сярэдзіну XVI ст. (Gajewska, 1990. S. 163; Kruppé, 1967. S. 77). Новыя прыёмы значна апярэджвалі развіццё маскоўскай керамічнай вытворчасці амаль на цэлае стагоддзе – нават у адносна блізкім да Полаччыны Смаленску з'яўленне "тачонай" керамікі фіксуецца не раней другой паловы XVII ст. (Сергина, 1981. С. 239). І хоць формы смаленскага посуду часта дублююць маскоўскую кераміку, тэхніка нанясення паліў паступова набліжаецца да беларускіх аналагаў (Сергина, 1981. С. 242 – 244).

Сярод усяго керамічнага посуду з адной пабудовы першай паловы XVI ст. паліванае начынне склала ўсяго толькі 2 %, у пабудове канца XVI ст. – ужо 15,2 % (Здановіч, 1998. С. 127). Па статыстычнай выбарцы посуду з асобных раскопаў можна канстатаваць, што паліванае начынне магло перавы-

шаць па колькасці непаліванае і дасягаць 55 % (Тарасаў, 1998. Мал. 46) – 63,6 % (Дук, спр. 1921. Мал. 14) ад агульнай масы посуду ў стратыграфічным гарызонце XVII – XVIII стст. Аднак звычайна доля паліванага посуду не перавышала паловы, напрыклад, у пластах XVI – XVIII стст. раскопу 3 на Вялікім пасадзе яна дасягала толькі 13,2 % (Дук, спр. 2046. С. 30). Паліваны посуд цаніўся вышэй, таму ў некаторых раскопах яго адносная колькасць магла быць значна меншая ў залежнасці ад сацыяльнай стратыфікацыі насельніцтва пэўнай гарадской тэрыторыі.

Полацкі посуд XVI – XVIII стст. вельмі разнастайны па форме і прызначэнню. Традыцыйны для беларускай археалогіі метад тыпалагізацыі па функцыянальнаму прызначэнню падзяляе яго на посуд для гатавання ежы (кухонны), сталовы, тарны, гігіенічны і дэкаратыўны (Здановіч, Трусаў, 1993. С. 24). У іншых выпадках за аснову бяруцца тэхналагічныя асаблівасці (склад) керамічных мас і паліў ці спосаб нанясення арнаменту (для паліваных вырабаў) (Зайцева, 1996. С. 131).

Вытворчасцю керамічнага посуду займаліся ганчары. У 1643 годзе полацкія ганчары ўтварылі свой цэх, устаў якога прадугледжваў экзамен па спецыяльнасці на выраб 5 прадметаў: гарнца шырынёю ў тры пядзі альбо ў далонь; збана такога ж памеру; даёнкі ў карэц велічынёй; рынкі і міскі ў чвэрць шырынёй (Археографический сборник..., 1867. С. 333). У 1654 годзе ў Полацку вядома 3 ганчары з ліку каля 750 рамеснікаў іншых спецыяльнасцей (Игнатенко, 1963. С. 11). Да канца XVIII ст. у сувязі з масавай вытворчасцю шклянога посуду колькасць ганчароў значна скарацілася і займала толькі шостае месца (2,3 %) у параўнанні з рамеснікамі іншых прафесій (Лютый, 1987. С. 125).

Асноўная маса керамікі выраблена з чырвонай гліны з вялікім утрыманнем жалеза (г. зв. жалезістыя гліны) (Сайко, 1982. С. 10). Такая гліна зафіксавана на тэрыторыі Вялікага пасада ў другой надпойменнай тэрасе Дзвіны (Дук, спр. 1921. С. 10). Сыравінай для керамічнай вытворчасці полацкага посуду з’яўляліся азёрна-алювіяльныя гліны (Здановіч, спр. 1213 в. С. 31). Керамічнае цеста па значэнню належыць да групы нармальных цагляных глін, па тэхналагічным асаблівасцям сфармавана з кіслых і паўкіслых глін (Здановіч, спр. 1213 в. С. 31). Агульнай характэрнай асаблівасцю керамічнага цеста з’яўляецца адсутнасць ці вельмі малое ўтрыманне вокісу натрыя, што можа быць абумоўлена асаблівасцямі радовішчаў глін Полацкага рэгіёну (Здановіч, спр. 1213 в. С. 33).

Другое важнае пытанне – месцазнаходжанне радовішчаў белай гліны, з якой мясцовымі майстрамі была выраблена вялікая колькасць керамікі першай паловы XVI ст., знойдзенай на тэрыторыі Вялікага пасада ў 2001 – 2002 гадах. З сумарнай колькасці керамікі з адной пабудовы яе доля

дасягала 65 % (277 фрагментаў). З белай гліны было выраблена не толькі кухоннае начынне (гаршчкі), але таксама і міскавая кафля. Папярэдне можна вызначыць, што белагліняная кераміка зроблена з гэтак званых цэментных глін, радовішчы якіх сустракаюцца на тэрыторыі Віцебскай вобласці і выяўлены ў раёне Полацка (Пилецкий, 1999. С. 26). Наяўнасць вялікай колькасці белаглінянай керамікі мясцовай вытворчасці з'яўляецца адметнай рысай матэрыяльнай культуры палачан XVI ст.

4.1.1. Кухонны посуд

Гаршчкі з'яўляюцца самым шматлікім відам посуду. Іх функцыя звязана з гатаваннем і захоўваннем ежы. Сярод непаліванага полацкага посуду XVI – XVIII стст. гаршчкі працягваюць пераважаць па колькасці знаходак.

Гаршчкі першай паловы XVI ст. працягваюць вырабляцца ў традыцыйнай для папярэдніх стагоддзяў тэхніцы спіральнай ляпніны на ручным ганчарным крузе. Донца такой керамікі мае сляды падсыпкі пяску. Калі ў керамічнай вытворчасці заходняга рэгіёну ВКЛ XVI ст. гэта – час шырокага ўкаранення нажнога ганчарнага круга (Зданович, 1983. С. 99), то ў Полацку нават у канцы XVI ст. большасць ужываных у побыце непаліваных гаршчкоў была выраблена на ручным ганчарным крузе (Здановіч, 1998. С. 127).

Маюцца ўсе падставы для заключэння аб мясцовай вытворчасці белаглінянага посуду з малажалезістых глін, тым больш што белагліняны посуд аднолькавай формы з чырвонагліняным знойдзены падчас даследаванняў культурных напластаванняў пасяленняў XVI – XVII стст. Беларускага Падняпроўя і Панямоння (Ганецкая, 1995. С. 33). Донцы белагліняных гаршчкоў утрымліваюць сляды падсыпкі сярэдне-і буйназярністага пяскурачніка. Паверхня посуду загладжана падчас фармоўкі, аднак даволі няроўная – візуальна фіксуюцца сляды злучэння асобных тасмаў гліны.

Большасць гаршчкоў з пабудовы першай паловы XVI ст. (усяго сабрана 425 фрагментаў) выраблены з белай гліны з дабаўленнем невялікай колькасці сярэднезярністага пяску-рачніка – 277 (65 %), астатнія – 148 (34,8 %) – з чырвонай гліны, абпаленыя ў акісліцельным – 103 (24,2 %) і аднаўленчым – 44 (10,3 %) асяроддзі. Паверхня белаглінянага посуду апрацавана ў тэхніцы гэтак званага плямістага абварвання ў хлебным растворы (Бобринский, 1978. С. 239). Плямы абвару на белай керамічнай паверхні маюць светла-карычневы ці крэмавы колер і фіксуюцца з абодвух бакоў сценак гаршчкоў.

У XV – першай палове XVI ст. частка гаршчкоў абпальвалася ў акісліцельным асяроддзі і мела чырвоны ці карычневы колер палівы. Абпаленыя ў аднаўленчым асяроддзі гаршчкі маюць шэрагліняны колер. Асоб-

ныя чырвонагліняныя гаршчкі апрацаваны ў абварной тэхніцы. З другой паловы XVII ст. да 2/5 усіх гаршчкоў пакрываецца палівай.

Усе гаршчкі XIV – XVIII стст. падзелены на дзве групы паводле тэхналогіі фармавання на ручным і нажным ганчарным крузе. Статыстычны аналіз быў праведзены на аснове параўнання 2551 венцаў гаршчкоў. Гаршчкі групы I – выключна непаліваныя – бытавалі на працягу XIV – першай паловы XVI ст. (мал. 30). Сярод гаршчкоў групы II вылучаецца як паліванае, так і непаліванае начынне, гэты посуд бытаваў напрыканцы XVI – XVIII стст. (мал. 31).

Група I. Гаршчкі тыпу I маюць адагнутае венца і пукатыя плечукі, нярэдка з рабром пры пераходзе ў шыйку. Дыяметр венцаў гаршчкоў ад 16 да 28 см, чарапок шэры, порысты, без грубых уключэнняў. Па матэрыялах раскопак Г.В. Штыхава, на Верхнім замку найбольшая іх колькасць знаходзілася ў III – IV будаўнічых гарызонтах, якія датуюцца XIV – XV стст. (Штыхов, 1975. С. 83).

Да тыпу II належаць гаршчкі з моцна адагнутым вонкі венцам, пад якім прысутнічае невысокі наляпны валік. Сярод гэтага тыпу гаршчкоў сустракаюцца і белагліняныя, аналагічныя тым, што былі знойдзены пры даследаванні пабудовы першай паловы XVI ст. Памеры дыяметра венцаў ад 15 да 32 см. Гаршчкі з наляпным валікам пад венцам у вялікай колькасці прысутнічаюць у закрытых археалагічных комплексах Полацка, а таксама некаторых рускіх гарадоў (Пскова, Масквы), і датуюцца XV – пачаткам XVI ст. (Бойцов, 1999. Рис. 5; Заяц, 1997. Рис. 4: 8 – 21; Королёва, Харлашов, 1994. Рис. 11, 19).

Гаршчкі тыпу III маюць вертыкальна пастаўленую (прамую) шыйку, венца дыяметрам ад 14 да 22 см і гарызантальна размешчаны плячук. Па форме венца яны аналагічныя стандартнай маскоўскай чырвонаглінянай кераміцы другой паловы XV – пачатку XVI ст. (Бойцов, 1999. Рис. 3), блізкія па форме прысадзістыя гаршчкі вырабляліся ў XV – XVI стст. на тэрыторыі Наўгародчыны і Пскоўшчыны (Конецкий, Сивохин, 1995. С. 26).

Большасць гаршчкоў тыпу IV маюць адагнутае пад вуглом 45º венца, высокую шыйку і плячук з палогім рабром. Гэтае начынне з’яўляецца прататыпам распаўсюджанай у XVIII ст. формы гаршчкоў. Гаршчкі тонкасценныя з порыстым чарапком і грубымі дамешкамі, дыяметр венцаў ад 14 да 24 см. Каля 52 % венцаў гаршчкоў XIV – XV стст. утрымліваюць арнаментацыю ў выглядзе хваляў (з нахілам у левы бок), насечак і прамых гарызантальных палосак. Датуецца посуд гэтага тыпу XV – пачаткам XVI ст.



Малюнак 30 – Тыпалогія венцаў полацкіх гаршчкоў XIV – XVI стст.



Малюнак 31 – Тыпалогія венцаў полацкага посуду канца XV – XVIII стст.: гаршчкоў (I – IX); збаноў (X – XI)

Гаршчкі тыпу V з’яўляюцца пераходнымі да рэнесанснай керамікі XVI ст. Яны захавалі істотныя прыкметы гаршчкоў XIV – XV стст. (грубае цеста, масіўнасць і аднолькавую таўшчыню сценак), але набылі новую форму – рабрыстасць па плечуку і акруглае, крыху патоўшчанае венца.

Гаршчкі тыпу VI маюць прамыя аналогіі з керамікай XV ст. Гродна (Трусаў, Собаль, Здановіч, 1993. С. 46, мал. 60: VI), складанапрафіляваны край венцаў гаршчкоў гэтай серыі, як правіла, мае выступ у выглядзе своеасаблівага карнізіка з унутрананага боку (мал. 32: 1, 3). На нашу думку, гэты “карнізік” не што іншае, як творчая пераапрацоўка полацкіх рамеснікаў папулярнай у познім Сярэднявеччы формы посуду з загнутым унутр венцам. Такая кераміка бытавала ў XV – XVI стст. на паўночным усходзе Беларусі – Горы, Віцебск (група 1: Е) (Левко, 1992. Табл. 2).



Малюнак 32 – Начынне XVI – XVIII стст.:
гаршчкі (1 – 7); рукамыі (8, 10); гаршчок-зліван (9); збан (11);
1 – 9 – раскопкі Н.І. Здановіч; 10 – Д.У. Дука; 11 – Г.М. Сагановіча

Тып VII – гэта выключна белагліняныя абварныя гаршчкі, якія маюць дыяметр венца ад 24 да 28 см. Венца з валікападобным авальным краем пастаўлена вертыкальна, гаршчкі маюць невысокую шыйку і пакатае рабро. Керамічнае цеста – з дамешкамі сярэднезярністага пяску; чарапок – порысты, трохслойны.

У гаршчках тыпу VIII назіраецца тэндэнцыя да павелічэння вышыні шыйкі, венца становіцца больш масіўным, яго круглы край адагнуты вонкі, шыйка мае ледзве прыкметны ўступ, некаторыя гаршчкі арнаментаваны па рабру хвалістым арнаментам. Дыяметр края венцаў гаршчкоў вагаецца ад 13 да 24 см. Большасць пасудзін шэра-і белагліняная, маюць сляды копаці па знешняму боку, зрэдку – з унутранага. Керамічнае цеста гэтых гаршчкоў утрымлівае дамешкі жарствы дыяметрам да 2 мм.

Гаршчкі тыпу VII – VIII не маюць прамых аналогій з посудам іншых помнікаў Беларусі, іх паходжанне звязана з уплывам усходняй (верагодна, наўгародскай) традыцыі (Бойцов, 1999. Рис. 6; Сергина, 1994. Рис. 1: тип 5, 7).

Гаршчкі тыпу IX зроблены ў традыцыі XIV – XV стст., іх характэрнай рысай з'яўляецца наяўнасць рабра па плечуку і ляпніны – валіка – пад венцам. Некаторыя венцы маюць раўчук пад накрыўку. Посуд гэтага тыпу шырока сустракаецца на тэрыторыі Украіны ў XIV – XV стст. (Івакін, Козубовский, 1993. Рис. 5).

Да тыпу X належыць большасць гаршчкоў акрэсленага перыяду. Гэтае начынне мае аналагічныя тыпу VII прапорцыі, за выключэннем края венца, якое ў гаршчкоў тыпу X крыху адагнута вонкі, нярэдка ў форме карнізіка. Знойдзена як белагліняныя, так і шэрагліняныя гаршчкі, якія маюць дыяметр венца ад 13 да 26 см.

Захаваліся два гаршчкі поўнага профілю тыпу X: белагліняны і шэрагліняны (мал. 35). Гэта прысадзістыя, шырокія пасудзіны, максімальнае пашырэнне прыходзіцца на верхнюю частку тулава. Сярод беларускіх помнікаў XV – XVI стст. поўныя аналогіі гэтыя гаршчкі маюць з Віцебскім (Бубенько, 2002. Рис. 9: 29) і Мсціслаўскім (тып II) посудам (Здановіч, Трусаў, 1985. С. 85), а таксама з асобнымі тыпамі гаршчкоў другой паловы XV – XVI ст. Масквы (Бойцов, 1999. Рис. 5), Пскова (Седов, Белецкий, 1992. С. 17), Смаленска (Сергина, 1994. Рис. 1: тип 5), Арэшка, Таржка і Наўгародчыны (Бойцов, 1999. Рис. 6; Конецкий, Сивохин, 1995. Рис. 2: 5, 8).

Гаршчкі тыпу XI маюць высокую шыйку, востры, аднолькавы са сценкамі па таўшчыні край венца. Край венцаў гаршчкоў тыпу XI прыстасаваны пад накрыўку дыяметрам ад 19 да 28 см.

Сценкі гаршчкоў тыпу VII – X даволі тонкія, каля 0,5 см, тады як сценкі гаршчкоў тыпу XI больш масіўныя, таўшчынёй да 1,2 см. Большасць гаршчкоў маюць груба апрацаваную паверхню, гэта тычыцца як белаглі-

нянай, так і шэраглінянай керамікі з адной толькі розніцай – у керамічным цесце белаглінянай абварной керамікі адсутнічае жарства. Па вызначэнню В.М. Ляўко, грубае цеста і дрэнна абпалены чарапок з'яўляецца характэрнай прыкметай керамікі паўночнага рэгіёну Беларусі XIV – XV стст. (Левко, 1992. С. 32). Вядома, што гаршчкі тыпу I працягвалі вырабляць у другой палове XVI ст. (Здановіч, 1998. Мал. 6: 2 – 5) і некаторыя з іх мелі вялікія памеры, як, напрыклад, цэлае начынне з Запалоцця (мал. 33: 3). Гаршчкі тыпу VII – VIII, як асноўная група, датуюцца XV – сярэдзінай XVI ст., начынне тыпу IX – XIV – XV стст.



Малюнак 33 – Начынне XVI – XVIII стст.:
гаршчкі (1 – 3, 8); фляга (4); збан (5), глякі (6 – 7);
1 – 2, 8 – раскопкі Н.І. Здановіч, 3, 5 – з фондаў НПГКМЗ;
4 – раскопкі С.В. Тарасава; 6 – 7 – Г.М. Сагановіча

Заўвага. Для 3 і 5 адно дзяленне – 10 см.

Большасць донцаў гаршчкоў першай паловы XVI ст. (87 %) захавалі сляды падсыпкі сярэднезярністага пяску і жарствы. Сценкі ў прыдоннай частцы адагнутыя пад вуглом каля 45º і маюць розную таўшчыню – ад 0,8 да 1,5 см (мал. 34: 12 – 19), донцы ўвагнутыя, з некалькімі канцэнтрычнымі акружнасцямі з унутранага боку. Памеры донцаў ад 10 да 13 см.



Малюнак 34 – Донцы начыння XVI – XVIII стст.:
паліваныя (1 – 11) і непаліваныя (12 – 19); раскопкі Д.У. Дука

Па выніках даследавання пабудовы канца XVI – пачатку XVII ст. Н.І. Здановіч было высветлена, што паліваныя вырабы складалі 15,2 % з усёй групы керамічнага посуду, з гэтай групы гаршчкі прадстаўлены толькі 16,2 % знаходак (Здановіч, 1998. С. 127 – 128). Факты сведчаць аб значнай перавазе ў канцы XVI – пачатку XVII ст. непаліванага посуду, як найбольш таннага.

Неабходна звярнуць увагу на наступную акалічнасць: у Полацку белагліняная кераміка ў вялікай колькасці знойдзена толькі ў раскопах 1 – 3 на Вялікім пасадзе (2001 – 2002). Па-другое, адны і тыя ж формы гаршчкоў з пабудовы першай паловы XVI ст. выраблены з белай і чырвонай гліны. Па-трэцяе, формы белагліняных гаршчкоў з'яўляюцца тыповымі для полацкай керамікі XVI ст., што не дазваляе разглядаць белагліняны посуд як прывазны.

Узнікае пытанне: чаму з'явілася патрэба вырабляць посуд з белай гліны, які не быў шырока распаўсюджаны ў паўночным рэгіёне Беларусі? На гэта можа быць наступнае тлумачэнне: полацкі ганчар засвоіў і ўвасобіў у серыі сваіх вырабаў традыцыю, якую ён запазычыў у іншых землях. У першай палове XVI ст. белагліняную кераміку масава выраблялі ў трох асноўных рэгіёнах, да якіх мог прычыніцца полацкі рамеснік: Масковія (Гжэль) (Бойцов, 1999. С. 156); Украіна (Кіеўшчына і Чарнігаўшчына) (Виногродська, 1997. С. 138); Польшча (Ніжняя Сілезія і Малапольшча) (Здановіч, Трусаў, 1993. С. 64; Mikołajczyk, 1977. S. 27 – 28). Першы рэгіён вельмі верагодны, калі ўлічыць частыя памежныя войны ВКЛ з Маскоўскім княствам у першай палове XVI ст. Полацкі рамеснік мог трапіць у маскоўскі палон ці апынуцца ў Масковіі ў выніку якіх-небудзь іншых абставін, а пасля вяртання на радзіму ён пачаў вырабляць кераміку, у аснову фармовачнай масы якой была пакладзена белая гліна. На паўднёвы "вектар" культурнай навацыі ўказваюць рэчы ўсходняга паходжання (фрагменты керамічных фляг і рукамыяў), якія знойдзены разам з белаглінянымі гаршчкамі, аднак гэтая акалічнасць можа толькі пацвердзіць факт шырокага ўжывання ў побыце палачан разнастайнай катэгорыі імпартных рэчаў, што было распаўсюджанай з'явай у пабудовах гарадскога насельніцтва Беларусі.

Асобныя тыпы полацкіх гаршчкоў XV – XVI стст. маюць дакладныя аналогіі з керамікай паўночна-ўсходняга рэгіёну Беларусі (Падзвінне, Падняпроўе), а таксама памежных гарадоў ВКЛ і гарадоў маскоўскай дзяржавы: Арэшка, Масквы, Пскова, Смаленска, Таржка (Бойцов, 1999. Рис. 6: 12).

Характэрнымі рысамі полацкіх гаршчкоў групы I з'яўляюцца:

1) прысадзістасць начыння, максімальнае пашырэнне якога прыходзіцца на верхнюю частку тулава;

2) наяўнасць прамога венца, нярэдка аформленага ў выглядзе акруглага ці авальнага валіка, і амаль поўная адсутнасць шыйкі (тыпы III, VI – VIII). Аналагічная рыса ўласціва і маскоўскай кераміцы (Рабинович, 1949. Рис. 8: 1);

3) наяўнасць белаглінянай керамікі – па складу фармовачнай масы і тэхналогіі абпалу белагліняныя гаршчкі з Полацка найбольш блізкія менавіта ўсходняй (маскоўскай) кераміцы, яны вызначаюцца тымі ж характарыстыкамі, што і маскоўскі посуд (чарапок белы, тонкі, шурпаты, на зломе

мае цёмную прапластку недастаткова пракаленай гліны, пакрыты плямамі абвару) (Рабинович, 1949. С. 61; Розенфельдт, 1968. С. 44).

Як вынікае з даследавання Е. Крупэ (J. Kruppé), кераміцы цэнтральна- і заходнееўрапейскага рэгіёнаў у XIV – XVI стст. пазначаныя характарыстыкі, у прыватнасці прысадзістасць і адсутнасць шыйкі, не былі характэрны, наадварот, польскаму посуду ўласціва выцягнутасць прапорцый, прамое венца і выразная S-падобная шыйка (Kruppé, 1981 в).

Прапорцыі ўкраінскіх гаршчкоў XIV – XVI стст. падобныя на распаўсюджаныя ў цэнтральных і ўсходніх рэгіёнах Беларусі (Виногродська, 1993. С. 129). Гэтая рыса характарызуе групу гаршчкоў, выробленых на ручным ганчарным крузе ў традыцыях старажытнарускай кераміцы. Паказальна, што з укараненнем тэхнікі “тачэння” начынне набывае стройныя, выцягнутыя прапорцыі і робіцца з высокаякаснай светлай (каалінітавай) гліны (Виногродська, 1993. С. 129). Гэтых рысаў у полацкага посуду з пабудовы XVI ст. не назіраецца.

Згодна тыпалогіі гаршчкоў паўднёвага і заходняга рэгіёнаў ВКЛ: Мазыр (Трусаў, Здановіч, 1993. Мал. 13); Ашмяны (Краўцэвіч, 1993. Мал. 18); Слонім (Ганецкая, Здановіч, 1996. Мал. 3); Мір (Здановіч, Краўцэвіч, Трусаў, 1994. Мал. 34, 36); Гродна (Трусаў, Собаль, Здановіч, 1993. Мал. 60) прысадзістыя гаршчкі з пукатымі плечукамі і кароткай шыйкай “без венца” былі даволі распаўсюджаны, пачынаючы з XV – XVI стст. Прамых аналогій гэтага посуду з полацкім начыннем групы I не выяўлена.

На большасці гаршчках XVI ст. з помнікаў паўночнай, цэнтральнай і ўсходняй Беларусі: Заслаўе (Заяц, 1993. С. 109, рис. 33); Мінск (Соболь, 1988. С. 98, табл. 13); Віцебск (Левко, 1984. С. 69); Магілёў (Марзалюк, 1998. Мал. 23: 14); Горы (Бектинеев, Левко, 1993. Рис. 5) прысутнічае вызначальная рыса – адагнутае вонкі і як бы зрэзанае венца-“карнізік”, наяўнасць валіка пад венцам і рабрысты плячук пры пераходзе шыйкі ў тулава, што з большага характарызуе полацкія гаршчкі групы I (тыпы II, IX – X).

Такім чынам, неабходна прызнаць, што некаторыя тыпы полацкіх гаршчкоў канца XV – XVI стст. маюць шэраг прамых аналогій з помнікамі паўночнай, цэнтральнай і ўсходняй Беларусі, а таксама паўночна-заходняга рэгіёну Расіі (у першую чаргу з Псковам). Пры супастаўленні формаў полацкіх гаршчкоў можна заўважыць, што полацкія гаршчкі XIV – XVI стст. па марфалагічных прыкметах больш падобныя на сярэднявечную беларускую і маскоўскую кераміку, чым на заходнюю (польскую і нямецкую), а гэта азначае, што масавая вытворчасць полацкага керамічнага посуду XVI ст. у цэлым працягвала развівацца на ўсходнеславянскай аснове. Невялікі працэнт паліванага посуду ў сярэдзіне XVI ст. сведчыць аб пачатку пранікнення ў Полацк заходнееўрапейскіх тэхналогій.

Прыведзеныя даныя не ставяць мэтай абсалютызацыю роднасці непаліваных полацкіх гаршчкоў з керамікай усходняга рэгіёну ВКЛ у цэлым. У той ці іншай ступені кераміка XIV – XVI стст. паўночнага рэгіёну Беларусі мела падабенства і з заходнееўрапейскім, і з прыбалтыйскім посудам (Левко, 1992. С. 38). Асабліва важным у дадзеным выпадку прадстаўляецца факт наяўнасці прамых рамесных стасункаў з паўночна-заходнімі гарадамі Расіі, у прыватнасці з Псковам, што далёка не выпадкова – менавіта Пскоў з XVI ст. становіцца адным з галоўных цэнтраў гандлю Маскоўскай дзяржавы з краінамі Захаду (Кильдюшевский, 1981. С. 89).

Наступная група (II) – гэта непаліваныя і паліваныя гаршчкі канца XVI – XVIII стст. Гаршчкі гэтага перыяду вылучае, па-першае, склад фармовачнай масы – яна больш пластычная і ўтрымлівае меншую колькасць дамешак. Гаршчкі канца XVI – пачатку XVII ст. захавалі вызначальную рысу керамікі папярэдняй традыцыі – яны такія ж устойлівыя і прысадзістыя, аднак выраблены ўжо на нажным ганчарным крузе (гл. мал. 31). Пераважная большасць непаліваных гаршчкоў XVII ст. маюць патоўшчанае, звычайна валікападобнае, адагнутае вонкі венца, невысокую шыйку і рабро па плечуку.

Гаршчкі тыпу I непаліваныя, як правіла, маюць рабрысты плячук пры пераходзе яго ў тулава і венца з “карнізікам” на крыху ўвагнутай унутр, прамой ці крыху адагнутай вонкі шыйкай, прычым па меры адхілення шыйкі рабро на плечуку робіцца менш прыкметным, пакуль увогуле не знікне (Здановіч, 1998. Мал. 7). Дыяметр венцаў гаршчкоў тыпу I вагаецца ад 16 да 26 см. Наяўнасць венца-“карнізіка” найбольш характэрна для паліванага посуду. Гаршчкі тыпу I групы II можна лічыць больш раннімі, у Полацку яны пачынаюць бытаваць з канца XVI ст. (Здановіч, 1998. Мал. 6: 1 – 12).

Венца гаршчкоў тыпу II адагнута вонкі і мае памеры ад 16 да 26 см, пераход асновы шыйкі ў плячук мае форму трапецыі. Гаршчкі тыпу II ужываюцца з канца XVI ст. (Здановіч, 1998. Мал. 6: 1 – 12), і па аналогіі з посудам іншых рэгіёнаў Беларусі, начынне гэтага тыпу становіцца дамінантнай формай на працягу XVII – XVIII стст. (Заяц, 1993. С. 115).

Гаршчкі тыпу III аб’ядноўвае характэрная рыса – прысадзістае тулава з рабрыстым плечуком пры пераходзе яго ў кароткую шыйку і кастылепадобны край венца.

Дыяметры венцаў гаршчкоў тыпу IV ад 16 да 28 см, пры вышыні 18 см (мал. 35: 7). Венцы маюць кастылепадобны профіль у форме валіка і трапецыі. Некаторыя гаршчкі захавалі рабрысты выступ на шыйцы. Усе гаршчкі прысадзістыя па форме, паверхня іх старанна загладжана, зроблены яны з добра вымешанай гліны з пяском і дробнай жарствой, некаторыя пакрыты плямамі абвару чорнага колеру знутры і звонку.



Малюнак 35 – Гаршчкі XVI – XVII стст. (1, 3, 5 – 7)
і рэйнская кераміка XVII – XVIII стст.: сценка бутэлькі (2) і чарніліца (4);
1, 3, 5–7 – раскопкі Д.У. Дука; 2 – А.Р. Мітрафанава; 4 – з фондаў НПГКМЗ

Гаршчкі тыпу V маюць валікападобнае “дутае” венца пры захаванні асноўных характарыстык гаршчкоў тыпу IV. Дыяметр венцаў гэтых пасудзін вагаецца ад 16 да 21 см.

У гаршчкоў тыпу VI невысокая, плаўна адагнутая шыйка з патоўшчаным венцам дыяметрам 14 – 26 см, іх можна лічыць пераходнымі да тонкасценных гаршчкоў другой паловы XVII ст. Сярод гэтага тыпу сустракаецца паліванае начынне.

Тонкасценныя гаршчкі тыпу VII па форме нагадваюць паліваныя, некаторыя з іх мелі ручку (гл. мал. 35: 5 – 6). Ручка ў месцы мацавання з тулавам захоўвае сляды трох ямкавых адбіткаў, зробленых пальцам. Апошняя рыса збліжае полацкія гаршчкі з тарным посудам заходняга рэгіёну Беларусі, у якім таксама прысутнічае сваесаблівае кляймо ў месцы мацавання ручкі са сценкай (Здановіч, Трусаў, 1993. Мал. 105: 1). Гаршчкі тыпу VII маюць прамыя аналогіі сярод польскага посуду (Kruppé, 1981 в. Ryc. 41: 17) і посуду заходняга рэгіёну Беларусі (Здановіч, Трусаў, 1993. Мал. 28).

Стылістычна адзіны, але разнастайны арнамент маюць гаршчкі другой паловы XVIII – пачатку XIX ст. (гл. мал. 33: 8) (тып VIII). Выпуклабокія, з нізкай шыйкай, з рабром па плечуку гаршчкі розніліся менавіта арнаментам, нанесеным па гэтай рабрыне (у тэхніцы накола ці насечкі). Керамічная маса ў гаршчкоў добра спечаная, чырвонага колеру (Здановіч, спр. 1373. С. 18).

Гаршчкі тыпу IX маюць коса зрэзанае вонкі ці ўнутр венца з “карнізікам”, край якога мае адну-дзве вострыя грані. Посуд гэтай групы паліваны і датуецца XVII – XVIII стст.

Усе пазначаныя тыпы гаршчкоў XVII ст. зроблены на нажным ганчарным крузе, пры гэтым гаршчкі тыпаў V – VII апрацаваны больш дасканала, у керамічным цесце адсутнічае жарства, чарапок порысты, чырвонага колеру. Гаршчкі тыпаў I – IV бытавалі на мяжы XVI – XVII стст. і ў першай палове XVII ст., а гаршчкі групы VIII працягвалі вырабляцца ў другой палове XVII ст. (аналогіі ім вядомы ў Міры і Мсціслаўлі) (Здановіч, Трусаў, 1985. С. 198). Істотнай рысай гаршчкоў тыпаў I – IV і VIII з’яўляецца ўжыванне абварной тэхнікі.

Сярод непаліваных венцаў гаршчкоў першай паловы XVI ст. арнаментацыя прысутнічае толькі на 11,1 % фрагментах; сярод гаршчкоў другой паловы XVI – пачатку XVII ст. – да 5,8 % (Здановіч, 1998. С. 128); на гаршчках XVII ст. ужыванне арнаментыкі вылучана толькі на 1,3 % посуду. Самым папулярным тыпам арнаменту XVI – пачатку XVII ст. па-ранейшаму заставаўся хвалісты з нахілам у левы бок. Некалькі фрагментаў венцаў арнаментаваны прамымі гарызантальнымі палоскамі. Паліваныя гаршчкі з’яўляюцца ў Полацку ў пачатку XVII ст. Гэта адпавядае традыцыі, згодна з якой паліва спачатку пачала ўжывацца на сталовым посудзе і толькі пасля – на кухонным (Wyrobisz, 1976. S. 210).

Такім чынам, гаршчкі групы II вырабляліся ў рэчышчы развіцця заходне-і цэнтральнаеўрапейскага рамяства XVII – XVIII стст., на што ўказвае, па-першае, форма вырабаў, па-другое, тэхналагічныя прыёмы выканання (нажны ганчарны круг, склад фармовачнай масы). Відавочны пералом у развіцці ганчарнай вытворчасці не парывае з традыцыямі папя-

рэдняй эпохі, якія праяўляюцца ў трансфармацыі многіх ганчарных формаў XVII ст.: лакальныя асаблівасці сярэднявечнага ганчарства паўночнага рэгіёну Беларусі накладваюць адбітак на развіццё асобных груп керамічных вырабаў XVII – XVIII стст.

Накрыўкі прадстаўлены ў асноўным фрагментарна, яны маюць конусападобную форму з дыяметрам венца ад 18 да 23 см і сценкі, нахіленыя звычайна пад вуглом да 45° (мал. 36: 1, 4).



Малюнак 36 – Керамічныя вырабы XVI – XVIII стст.:
накрыўкі (1 – 5); бакалы (6, 8); чарка (7); памадныя слоікі (13, 15 – 17);
друшляк (9); донца падсвечніка (14) і падсвечнік (12);
рыбалоўныя грузілы (10 – 11); 1 – 8, 12 – 17 – раскопкі Н.І. Здановіч;
9 – В.А. Булкіна; 10 –11 – Г.М. Сагановіча

Са старажытных часоў форма накрывак засталася амаль нязменнай. Асноўнымі прыкметамі, якія вызначаюць храналагічную прыналежнасць асобных тыпаў накрывак, з’яўляюцца: склад фармовачнай масы, тэхналогія апрацоўкі паверхні і наяўнасць палівы.

У XVI ст. працягвалі выкарыстоўвацца ручкі двух тыпаў: петлепадобныя (мал. 37: 12 – 13, 15) і канічныя з крышачкай-стапой, аналагічнай старажытнарускай кераміцы (гл. мал. 36: 1, 4; мал. 37: 14, 17 – 18). Накрыўкі з плоскай крышачкай-стапой вядомы і ў польскім ганчарстве XIV – XVI стст. (Kruppé, 1981 в. Ryc. 63 – 64). На тэрыторыі Беларусі такая форма накрывак ужывалася з XII ст. (Закурина, 1991. С. 81).



Малюнак 37 – Керамічныя вырабы XVI – XVIII стст.:
скарбонкі (1 – 2, 4); салонка (8); слоікі пад парфуму (5 – 7); слоік для спецый (11); падсвечнік (10); друшляк (3); накрыўкі (12 – 18); носік рукамыя (9); раскопкі С.В. Тарасава

Памеры накрывак напрамую залежылі ад формы і памераў венцаў посуду, для якога яны прызначаліся. Напрыклад, у XVI ст. дыяметры накрывак дасягалі 22 – 24 см, што адпавядала самым вялікім па памерам гаршчкам

(Здановіч, 1998. С. 128). Полацкія накрыўкі, як правіла, маюць скразную адтуліну ў стапе, краі вырабаў прыспушчаны ўніз ці прамыя (мал. 38: 2).



Малюнак 38 – Рэчы з пабудовы першай паловы XVI ст.:
сценка макотры (1); накрыўкі (2); венца збана (3); аконныя шыбкі (4, 10);
венца латкі (5); рукамый (6); донца дымленага бакала (7);
сценка дэкаратыўнага начыння (8); донца келіха (9); ножка рынкі (11);
1 – 3, 5 – 8 – кераміка; 4, 9 – 10 – шкло; раскопкі Д.У. Дука

Накрыўкі XVII ст., пакрытыя зялёнай палівай, краі венцаў маюць складаны профіль, адбываецца памяншэнне іх памераў (гл. мал. 36: 2 – 3, 5), крышачка-стапа набывае прамавугольныя абрысы. У XVIII ст. асноўны колер палівы – розныя адценні карычневага.

Рынкі – гэта высокія пасудзіны авальнай формы на трох ножках з утулкай для драўлянай ручкі (Здановіч, Трусаў, 1993. С. 25). Праведзены аналіз саміх вырабаў, а таксама іканаграфічных і пісьмовых крыніц дазволіў вызначыць, што рынкі выкарыстоўваліся перш за ўсё для смажання мяса – даўжэйшым бокам рынку ставілі да агню з мэтаю збірання тлушчу (Rębkowski, 1995. S. 70). Паліва пакрывала іх унутраны бок, таму яе эстэтычная функцыя адыгрывала другасную ролю.

Па полацкіх матэрыялах рынкі вядомы з XVI ст. Самыя першыя датаваныя вырабы паходзяць з інвентару пабудовы першай паловы XVI ст. Былі знойдзены: 1 фрагмент донца: 2 ручкі ад рынкі; кавалак донца, які пакрыты зялёнай палівай.

Рынкі XVII ст. плыткія з дыяметрам патэльні 19,5 см пры вышыні ад донца да края венца ад 3,5 да 4 см (тып I) (Фонды НМРБ. Кп-878/70, 239, 266, 274). У полацкіх рынак тыпу I гарызантальна зрэзанае венца з адагнутымі краямі і пляскатае донца (мал. 39: 1). Чарапок на зломе двухслойны, што сведчыць пра недобраякасны абпал. Рынкі тыпу I датуюцца 20 – 30-мі гадамі XVII ст.



Малюнак 39 – Артэфакты XII – XVIII стст.:
рынка (1); бакал (2); гаршочкі (3 – 4); накрыўка (5); сякерка (7);
ігольніца? (8); нож (9); шпора (6); дэталь замка (10); спражка (11);
абутковая (12) і конская падковы (13); 1 – 5 – кераміка;
6, 9 – 13 – жалеза; 7 – 8 – косць; з раскопак А.Р. Мітрафанава

Рынка поўнага профілю (тып II) мае дыяметр венца 24 см пры вышыні патэльні 3,5 см, агульная вышыня вырабу – 10 см. Рынкі гэтага тыпу маюць закруглёнае венца ручкі (мал. 40: 7). Суадносіны дыяметраў ручак рынак да іх даўжыні наступныя: 4 × 5,5; 4 × 6; 3,5 × 5 см (Фонды НМРБ. Кп-878/274). Усе гэтыя прыкметы характарызуюць рынкі, выробленыя на мяжы XVI – XVII стст. (Археалогія Беларусі, 2001. С. 302).



Малюнак 40 – Керамічнае начыння XVI – XVIII стст.:
макотры (1 – 4); патэльні (5 – 6, 9 – 11); рынкі (7 – 8, 12);
1 – 7, 9 – 11 – раскопкі Н.І. Здановіч; 8 – з фондаў НПГКМЗ;
12 – раскопкі А.Р. Мітрафанава

Рынкі тыпаў I – II маюць пэўныя падабенствы з рынкамі іншых гарадоў Беларусі заходняга і ўсходняга рэгіёнаў (Здановіч, Трусаў, 1993. Мал. 33, 40), але тыпалагічна нідзе не вылучаны. На полацкіх рынках тыпу I паўсюдна сустракаецца адбітак пальцаў (своеасаблівае кляймо) у месцы мацавання бліжэйшай ад ручкі ножкі, дакладна такая ж з'ява адзначаецца на рынках заходняга рэгіёну Беларусі з Ліды, Крэва, Гродна (Здановіч, Трусаў, 1993. С. 33).

Даўжыня і форма ўтульчатых выцягнутых ручак вельмі разнастайная, гэта ручкі ў выглядзе раструба (тып II), а таксама ручкі з патройным валікам, падпраўленыя шматрадным грабенчыкам і цыліндрычным патаўшчэннем па краю (Фонды НМРБ. Кп-878/239) (гл. мал. 40: 12). Апошнія, больш познія, існавалі ў другой палове XVII ст. Характэрнай асаблівасцю ручак ад рынак XVI ст. можна лічыць выцягнутасць іх прапорцый (мал. 41: 5), венца з раструбам і невялікі дыяметр утулкі (3,5 см) (Здановіч, спр. 1213 в. Фота 46).



Малюнак 41 – Керамічныя вырабы з пабудовы першай паловы XVI ст.: патэльня (1); фрагменты фляг (2, 4); донца макотры (3); ручка рынкі (5); раскопкі Д.У. Дука

Бліжэйшыя аналагі ручак полацкіх рынак тыпу I вядомыя па матэрыялах Лідскага і Крэўскага замка (Здановіч, Трусаў, 1993. Мал. 35, 37). Ручкі мацаваліся крыху ніжэй края венца, само венца часта аздаблялася шматрадным лінейным арнаментам з пальцавымі зашчыпамі (гл. мал. 40: 7), а таксама карбоўкай (сеткавым арнаментам) па венцу і пад венцам са знешняга боку.

Унікальнай па форме з'яўляецца адна рынка мініяцюрных памераў на трох ножках: вышыня вырабу разам з ножкамі 6 см пры дыяметры венца 7,2 см (гл. мал. 40: 8). Захавалася рыначка фрагментарна, знутры яна пакрыта зялёнай палівай, ручка яе адбіта. Па форме вельмі падобна на кубкі XVII ст., патэльня трымаецца на невысокіх ножках, якія завяршаюцца шырокімі платформамі, зробленымі для большай устойлівасці. Функцыянальнае назначэнне выраба дакладна не ўстаноўлена, можна меркаваць па форме, што маленькая рыначка прызначалася для падагрэву вадкасцяў для дзіцяці. У іншых гарадах Беларусі падобных вырабаў пакуль што не выяўлена.

Па форме і арнаментыцы полацкіх рынак нельга не заўважыць шматлікіх падабенстваў з рынкамі заходняга рэгіёну Беларусі, што можна растлумачыць гандлёвымі і рамеснымі кантактамі, а таксама заходнім вектарам распаўсюджвання культурных уплываў.

У XVIII ст. рынкі як від посуду ўжо не вырабляюцца. Верагодна, іх выціскае металічны посуд. У культурных напластаваннях XVIII ст. знойдзены толькі керамічныя патэльні без палівы, якія не маюць ручак і ножак.

Макотры – гэта род глыбокіх гліняных пасудзін з круглым дном і значна большым за дно шырокім вусцем (Здановіч, Трусаў, 1993. С. 24). У Беларусі шырока ўжывалася непаліванае і паліванае начынне гэтага віду. Першае прызначалася для расцірання (драблення) ежы, другое – для замешвання цеста і прыгатавання салатаў (Здановіч, Трусаў, 1993. С. 25). Макотра магла выкарыстоўвацца як сталовы посуд і гэтай разнастайнасцю функцый тлумачыцца розніца ў памерах гэтага віду посуду.

Макотры XVI ст. выраблены ў сярэднявечнай традыцыі на ручным ганчарным крузе і маюць рыфлёныя сценкі, адагнутае венца і таўшчыню сценак больш за 1 см (гл. мал. 40: 1). Знойдзенае ў пабудове першай паловы XVI ст. донца і сценка макотры (дыяметр 23 см) мела ўсе вышэйзгаданыя прыкметы: таўшчыня сценкі ў прыдоннай частцы дасягала 1,5 см, на зломе бачны дамешкі буйной жарствы (гл. мал. 41: 3), сценка макотры была аздоблена ляпнінай – жгутавым арнаментам (гл. мал. 38: 1).



Малюнак 42 – Сталовы посуд XVI – XVII стст.:
міскі (12, 14 – 16, 20 – 22); паўміскі (17 – 18); талеркі (19) і латкі (1 – 11, 13);
раскопкі Н.І. Здановіч

Макотры XVI ст. маюць вялікі дыяметр венца – да 24 – 25 см. У пачатку XVII ст. рыфленне сценак макотраў знікае і крыху змяншаюцца агульныя памеры вырабаў. На некаторых фрагментах прысутнічае наляпны жгут у выглядзе карнізіка пад венцам (гл. мал. 40: 2).

Макотры другой чвэрці XVII – XVIII стст. маюць прамыя, амаль гарызантальныя сценкі і дыяметр венца ад 13 да 20 см (гл. мал. 40: 3 – 4).

Самымі надзейнымі прыкметамі для вызначэння храналогіі макотраў з'яўляюцца тэхналагічныя паказальнікі – наяўнасць палівы і яе колер: зялёны (XVII ст.) ці карычневы (XVIII ст.); наяўнасць рыфлення сценак, грубыя і сярэднезярністыя дамешкі ў складзе керамічнай масы (XVI – XVII стст.).

Патэльні – гэта шырокія плоскія пасудзіны з невысокімі борцікамі, якія прызначаліся для смажання. Іх функцыя часта сумяшчалася з функцыяй латак і рынак. Па нашым назіранням можна адзначыць, што патэльні былі распаўсюджаны нароўні з рынкамі да пачатку XVIII ст., пасля рынкі паступова знікаюць, а тэракотавыя патэльні і латкі застаюцца папулярнымі відамі посуду.

Патэльні першай паловы XVI ст. выраблены на ручным ганчарным крузе, па форме і знешняму выгляду яны аналагічныя старажытнарускім патэльням – латкам (гл. мал. 40: 10; гл. мал. 41: 1). Начынне фармавалася на ручным ганчарным крузе і мае сляды нагару ад працяглага выкарыстання.

У Полацку знойдзена некалькі патэльняў, профіль якіх можна цалкам аднавіць. Найбольш распаўсюджаны від патэльняў – без ручкі, дыяметр венцаў ад 15 да 24 см, вышыня вырабаў ад 4 да 5,5 см пры дыяметры донцаў ад 14 да 20 см (гл. мал. 40: 5 – 7, 9 – 11; 41: 1). Датаваць вырабы можна па прыёмах апрацоўкі знешняй паверхні: патэльні XVII – пачатку XVIII ст. шэраватага колеру з дамешкамі ў цесце сярэднезярністага пяску і невялікіх каменьчыкаў (гл. мал. 40: 5; мал. 41: 1). Паверхня патэльняў другой паловы XVIII – пачатку XIX ст. добра апрацавана, мае чырвоны колер, на некаторых вырабах прысутнічаюць сляды глянцавання (гл. мал. 40: 9), а донца захоўвае сляды фармоўкі ў выглядзе рэльефных канцэтрычных палосак. Як правіла, са знешняга боку ўсіх патэльняў прысутнічаюць сляды копаці.

Даволі рэдкім відам посуду з'яўляюцца патэльні з ручкай, як у рынкі, але без ножак. Адна такая патэльня была знойдзена ў Полацку падчас раскопак Н.І. Здановіч у 1990 годзе (гл. мал. 40: 6); па знешняму боку, каля венца, яна ўпрыгожана насечкамі.

Латкі ўжываліся для пражання стравы. Па прапорцыях гэты посуд нагадвае міскі з той розніцай, што венцы ў латак, як правіла, загнуты ўнутр (Здановіч, Трусаў, 1993. С. 25). Звычайна латкі мелі вялікі дыяметр венца,

які перавышаў у 2 – 2,5 разы дыяметр донца і быў амаль роўны вышыні пасудзіны.

Усе полацкія латкі – непаліваныя, выраблены на ручным і нажным ганчарным крузе. Большасць фрагментаў па форме венца можна аднесці як да латак, так і да місак, макотраў (Здановіч, Трусаў, 1993. С. 26).

Полацкія латкі можна падзяліць на дзве групы:

1) латкі XVI – XVII стст.;

2) латкі XVIII ст.

Латкі першай групы маюць венца вялікага дыяметра (да 34 см), па форме венца яны нагадваюць макотру, а па прапорцыях – патэльню (гл. мал. 42: 2). Неабходна адзначыць, што функцыі патэльні і латкі сумяшчаліся, што напрамую ўплывала на форму вырабаў (гл. мал. 42: 9). Большасць латак XVI – XVII стст. маюць злёгку адагнутыя сценкі і рабро па ўнутранаму краю (гл. мал. 38: 5; 42: 1, 3), венцы піялападобных латак зрэзаны пад вуглом унутр (гл. мал. 42: 10). Па знешняму боку сценак і донцаў латак прысутнічаюць сляды нагару ад доўгатэрміновага выкарыстання пры гатаванні страў.

Латкі канца XVII – XVIII стст. па форме нагадваюць міскі (гл. мал. 42: 4 – 7, 11, 13), некаторыя з іх можна лічыць патэльнямі, зробленымі ў сярэднявечнай традыцыі (гл. мал. 42: 13). Амаль усе латкі канца XVII – XVIII ст. маюць складанапрафіляванае, часта адагнутае венца і манжэту па знешняму боку. Па прапорцыях – гэта высокае начынне з дыяметрам венца да 23,4 см і вышынёй да 9,3 см (гл. мал. 42: 5). У XVIII ст. працягваюць вырабляць піялападобныя латкі – яны больш мініяцюрныя, з дыяметрам венца 15 см (гл. мал. 42: 8).

Адзначым папулярнасць у Полацку піялападобных місак (гл. мал. 42: 10, 20). Піялападобныя міскі знойдзены падчас даследавання Мірскага замка, па прапорцыях і знешняму выгляду яны вельмі падобныя на полацкія (Здановіч, Трусаў, 1993. Мал. 50: 6, 8).

Фрагменты донцаў *друшлякоў (цадзілак)* знойдзены ў пластах канца XVII – XVIII ст. (Дук, спр. 1921. С. 15; Здановіч, спр. 1213 а. С 24). Знутры донцы пакрыты зялёнай ці карычневай палівай і маюць адтуліны дыяметрам каля 5 – 7 мм (гл. мал. 34: 1; 36: 9; 37: 3) (Фонды НПГКМЗ. Квф-2-978/100).

На жаль, у Полацку не зафіксавана ніводнага друшляка, профіль якога можна было б цалкам рэканструяваць. Формы і памеры донцаў, а таксама спосаб іх спалучэння са сценкамі, нагадвае міскі дыяметрам каля 12 см. Друшлякі прызначаліся для адцэжвання ежы, праціравання тварагу, вараных гарбузоў і інш. (пры прыгатаванні страў) і мелі форму місак з вухам і з адтулінамі ў донцы (Милюченков, 1984. С. 118).

4.1.2. Сталовы посуд

Талеркі для падачы ежы вядомы з пачатку XVII ст., па форме венцаў і прапорцыях яны аналагічныя размаляваным талеркам (мал. 43: 3). Большасць сталовых талерак XVIII ст. мае асаблівую прыкмету – вертыкальна пастаўлены край венца ў выглядзе шырокай манжэты з рыфленнем (гл. мал. 42: 17). Празрыстая зялёная паліва наносілася толькі з унутранага боку непасрэдна на чарапок.



Малюнак 43 – Дэкаратыўны посуд XVI – XVIII стст.:
талеркі (1 – 6, 8 – 14, 16 – 17) і паўміскі (7, 15, 18); раскопкі Н.І. Здановіч

Ежу падавалі ў *місках*, хоць не выключана і выкарыстанне для гэтай мэты некаторых тыпаў паліваных латак. У адрозненні ад латак, дыяметр місак звычайна не перавышаў 20 см і выкарыстоўваліся яны ў асноўным для падачы ежы (Здановіч, Трусаў, 1983. С. 26).

Міскі XVI – XVIII стст. паліваныя, як правіла, з унутранага боку празрыстымі палівамі зялёнага (канец XVI – XVII ст.), карычневага ці жоўтага колеру (XVIII ст.).

Полацкія міскі XVII – XVIII стст. у асноўным падзяляюцца на чатыры групы. Міскі тыпу I (канец XVI – першая палова XVII стст.) з венцам-манжэтай, нярэдка аформленым ў выглядзе наляпнога жгута па краю. Гэтыя міскі маюць рыфлёныя сценкі і арнамент у выглядзе насечак пад венцам, у гэты час вылучаюцца як паліўныя, так і непаліўныя вырабы.

Міскі тыпу II – гэта начынні піялападобнай формы канца XVI – XVII ст. (гл. мал. 42: 14), шырока вядомыя ў заходнім рэгіёне Беларусі. Памеры дыяметраў венцаў і донцаў адпаведна 13 – 20 см і 5,6 – 9 см пры вышыні да 6 см. Міскі-піялы другой паловы XVIII ст. прызначаліся для падачы вадкіх страў альбо пітва, маюць дыяметр венцаў 12 – 14 см, донцаў 4 – 5,5 см, пры вышыні ад 5 да 5,5 см (гл. мал. 42: 20). Характэрнай рысай піялападобных місак XVII ст. з’яўляецца гарызантальна адагнутае венца шырынёй 2 см з арнаментам, нанесеным карбоўкай і палівай з унутранага боку (гл. мал. 42: 14).

Міскі тыпу III з’яўляюцца ў канцы XVIII ст. і працягваюць бытаваць у XIX ст. (гл. мал. 42: 12, 16). Зялёная паліва наносілася па ангобу ці адразу на чарапок. Бліжэйшыя аналагі вядомы сярод посуду ўсходняга рэгіёну ВКЛ (Магілёў, Мсціслаў) (Здановіч, Трусаў, 1993. Мал. 52: II в).

Паўміскі і талеркі тыпу IV (XVIII – XIX стст.) маюць вертыкальны борцік вышынёй ад 1,5 да 3,2 см, дыяметр венца 15 – 19 см і донца 7 – 8 см (гл. мал. 42: 15, 17); некаторыя талеркі аздоблены карбаваннем.

Міскі тыпу IV маюць вялікія памеры: вышыня 11 см і дыяметр венца да 31 см, часта яны аздабляліся контурнай размалёўкай ангобам пад паліву (гл. мал. 42: 22).

Такім чынам, міскі тыпаў I і II вырабляліся пад уплывам заходнееўрапейскай рамеснай традыцыі (наяўнасць наляпнога жгута па краю венца і модныя ў тагачаснай Еўропе піялападобныя формы). На працягу XVII – XVIII стст. вытворчасць місак стандартызуецца і фарміруецца агульная для паўночна-ўсходняга рэгіёну ВКЛ традыцыя. Тое ж можна адзначыць і ў дачыненні да полацкіх талерак – наяўнасць шырокай манжэты з рыфленнем з’яўляецца ўстойлівай рэгіянальнай прыкметай гэтага віду сталовага посуду XVIII ст.

Начынне для пітва ў археалагічных калекцыях прадстаўлена *куфлямі, кружкамі, кубкамі і міскамі-піяламі*.

У аснове формы куфляў і кружак ляжыць цыліндр. Кружка па форме больш прысадзістая і шырэйшая, куфель звычайна больш высокі, часам мае прамавугольнае вуха, часам і два, размешчаных сіметрычна (Здановіч, Трусаў, 1993. С. 28). У адрозненні ад куфляў і кружак, кубачкі па форме нагадваюць невялікія паліваныя гаршочкі з ручкай, якія звычайна маюць дыяметр вусця 7 – 8 см.

Полацкія *куфлі* – гэта высокае (да 12,5 см) начынне з закруглёнымі, альбо прамавугольнымі ручкамі (мал. 44: 1 – 3, 7, 11), некаторыя куфлі маюць вузкае донца, размешчанае на высокім паддоне (гл. мал. 44: 7). Куфлі канца XVI – XVII стст. звонку аздоблены падпаліўной ангобнай размалёўкай, знутры пакрытыя празрыстай палівай зялёных адценняў (гл. мал. 44: 1 – 3). Куфлі XVIII ст. пакрытыя рознакаляровай палівай, напрыклад, зялёнай звонку і светла-зялёнай знутры (Фонды НПГКМЗ. Кп-878/76). У XVIII ст. прафіліроўка куфляў спрашчаецца да звычайнага цыліндра з прамымі сценкамі, у канцы XVIII – пачатку XIX ст. асноўным колерам палівы становіцца светла-карычневы.

Полацкія *кружкі* XVI – XVIII стст. звычайна больш прысадзістыя і па прапорцыях упісваюцца ў квадрат (гл. мал. 44: 8 – 9, 14). Ранняй формай кружак з'яўляецца начынне канца XV – сярэдзіны XVI ст. з рыфлёнымі сценкамі і дыяметрам венца 7,5 см пры вышыні 6,5 см. Такія вырабы фармаваліся на ручным ганчарным крузе і выраблены ў традыцыях папярэдніх стагоддзяў. Кружкі другой паловы XVI – XVII стст. вялікія па памерах з дыяметрам венца 16 – 17 см, маюць рэльефны арнамент па знешняму боку сценак (гл. мал. 44: 8 – 9). У XVIII ст. таўшчыня сценак патанчаецца к венцу (гл. мал. 44: 14); пачынае ўжывацца паліва карычневатых адценняў.

Кубкі з'яўляюцца самай распаўсюджанай катэгорыяй посуду для пітва – на іх долю прыпадае каля 70 % ад усяго полацкага посуду гэтага прызначэння (аналагічная з'ява адзначана і ў іншых беларускіх гарадах) (Здановіч, Трусаў, 1993. С. 39). Сваёй формай яны нагадвалі невялікія гаршчкі з ручкамі. Кубкі сустракаюцца розныя па памерах – ад мініяцюрных да вялікіх (гл. мал. 44: 4 – 6, 10, 12 – 13). Самыя раннія – гэта прысадзістыя кубачкі з падпаліўной ангобнай размалёўкай у выглядзе гарызантальных палосак ад края венца да сярэдзіны тулава; па форме яны нагадваюць міску ці прысадзісты гаршочак (гл. мал. 44: 5 – 6, 10, 12). Выраблялісся таксама адметнай формы глянцаваныя кубачкі-бакальцы (гл. мал. 38: 7). Дыяметр кубкаў другой паловы XVI ст. дасягае 14 см; у пачатку XVII ст. дыяметр іх венцаў ужо не перавышаў 12 см (гл. мал. 44: 5). Кубкі другой паловы XVII ст. па прапорцыях нагадваюць гаршчок, аздабляюцца па плечуку геаметрычным арнаментам і пакрываюцца з абодвух бакоў зялёнай, а з XVIII ст.

карычневай палівай (гл. мал. 44: 4, 22). У гэты час адзначаецца памяншэнне памераў, некаторыя кубачкі маюць дыяметр венца да 8 см (гл. мал. 44: 13, 18). Кубкі XVIII ст. пакрытыя знутры палівамі карычневатых адценняў і па форме набліжаюцца да бакалаў на высокім паддоне (гл. мал. 44: 20).



Малюнак 44 – Керамічнае начынне для пітва XVI – XVIII стст.:
куфлі (1 – 3, 7, 11, 15 – 17); кружкі (8 – 9, 14); кубкі (4 – 6, 10, 12 – 13, 20, 22); піялы (19, 21) і бакальцы (18); 1 – 7 – раскопкі С.В. Тарасава; 8 – 22 – Н.І. Здановіч

Міскі-піялы другой паловы XVII – XVIII ст. маглі прызначацца для падачы вадкіх страў альбо пітва (42: 20; гл. мал. 44: 21), некаторыя з іх у XVIII ст. трансфармуюцца ў піялападобныя бакальцы вышынёй да 6 см і дыяметрам венца каля 9 см (гл. мал. 44: 17) з двухколернай карычневай і зялёнай палівай. Магчыма, фрагменты імпартаваных місак-піял вельмі якаснай апрацоўкі знойдзены падчас раскопак у Полацку (мал. 45: 9, 11, 12)



▼ – белы; ▲ – аранжавы; ● – зялены; ■ – цемна-сіні;
♦ – карычневы; ◡ – шэры; ◠ – жоўты; ▬ – чорны

Малюнак 45 – Керамічныя вырабы XVII – XVIII стст.:
цацкі (1 – 7); люлька (8); фрагменты імпартаванай керамікі (9 – 14);
раскопкі Д.У. Дука

Асобная катэгорыя посуду для пітва па форме нагадвае памадныя слоікі, з той толькі розніцай, што іх памеры больш вялікія, дыяметр венцаў 6,5 – 8,5 см пры вышыні ад 5,5 да 8,5 см (гл. мал. 44: 15 – 16). У адрозненні ад слоікаў пад парфуму, кружкі-бакальцы маюць больш тонкія сценкі без палівы і пазней XVII ст. не ўжываюцца. Блізкія па форме керамічныя кружкі, гэтак званыя бакалы ўсечана-канічнай формы, выкарыстоўваліся ў Магілёве і Мсціславе, дзе таксама пераважная іх большасць была непалі-ваная ці дымленая (Здановіч, Трусаў, 1993. С. 41).

У XVIII ст. кубкі як від посуду ў Полацку не ўжываюцца, ва ўсялякім выпадку археалагічна яны не былі выяўлены. Верагодна, з масавага ўжытку іх выцясняюць кружкі, якія і да гэтага часу застаюцца асноўным відам керамічнага посуду для пітва. Змяншэнню асартыменту керамічнага посуду для пітва ў XVIII ст. садзейнічаў фактар рэзкага павелічэння колькасці і разнастайнасці шклянога посуду, які з гэтага часу становіцца адной з дамінуючых катэгорый археалагічнага матэрыялу.

4.1.3. Тарны і гігіенічны посуд

Збаны – гэта керамічнае начынне для захоўвання і пераноскі вады і вадкіх страў, большасць з якіх (мёд, квас, піва, віно) вядомы яшчэ з ранняга Сярэднявечча. Збанам называецца высокая гліняная пасудзіна, завужаная ўверсе, з вухам і носікам-злівам (Здановіч, Трусаў, 1993. С. 27). Збаны – адносна нешматлікая катэгорыя знаходак сярод усяго керамічнага посуду, у адным раскопе на іх долю прыходзіцца звычайна не больш 30 % ад агульнай колькасці паліванай керамікі (Здановіч, 1998. С. 128).

Збаны тыпу I знойдзены ў пластах XV – пачатку XVII ст. (гл. мал. 33: 5). Яны маюць высокае горла, якое па прапорцыях роўнае вышыні тулава (гл. мал. 31, тып XI). Гэты тып збаноў набліжаны да групы імпартаванай керамікі, знойдзенай у напластаваннях другой паловы XIII ст. з Полацка (Штыхов, 1975. С. 86) і мае аналогіі з польскім посудам XIV – XV стст. (Kruppé, 1967. Il. 48: 7). У пачатку XVI ст. збаны пачынаюць аздабляцца палівай і карбаваным арнаментам (гл. мал. 38: 3). Сярод збаноў гэтага тыпу сустракаюцца і дымленыя (Здановіч, 1998. С. 129). Памеры горлаў збаноў вагаюцца ад 10 да 16,5 – 18 см, вышыня вырабаў роўная 20 см.

Начынне тыпу II прадстаўляе самую ўстойлівую форму збаноў (гл. мал. 32: 11; мал. 46: 2), якая з канца XVI ст. засталася амаль нязменнай на працягу ўсяго XVII ст. (Здановіч, 1998. Мал. 8: 2). Збаны мелі манжэту вакол венца і ручку з раўчуком пасярэдзіне, прымацаваную да края венца, звонку і знутры па шыйцы яны пакрываліся зялёнай палівай (Фонды НМРБ. Кп-22455). Наяўнасць манжэты – выразная прыкмета заходнееўрапейскага ўплыву (Левко, 1992. С. 39). Адметнай рысай збаноў тыпу II з’яўляецца звычай прымацоўваць ручку да ніжняга краю манжэты (гл. мал. 46: 2), падобныя збаны выраблялі магілёўскія майстры (Здановіч, Трусаў, 1993. С. 42).

Збаны тыпу III вылучае акруглае венца-карнізік ці венца-манжэта. Многія збаны маюць рыфленне па верхняй частцы тулава. Збаны тыпу III вядомы ў Полацку з канца XVI ст. і застаюцца распаўсюджанай формай да пачатку XIX ст. (Здановіч, 1998. С. 128) (гл. мал. 31: тып X; мал. 32: 2, 4 – 5). Гэтыя вырабы знутры пакрываліся зялёнай ці карычневай палівай, звонку паліва наносілася, як правіла, толькі па венцу ці да паловы тулава (гл. мал. 31:

тып X; мал. 32: 4 – 5; мал. 46: 1; мал. 38: 3). Збаны тыпу III мелі наступныя памеры: дыяметр венца ад 7,5 да 16 см; дыяметр донцаў ад 7 да 10 см; вышыня ад 12 да 20,5 см. Арнамент выкарыстоўваўся ў выглядзе дзвюх паралельных ліній па сценцы тулава, найчасцей арнаментацыя адсутнічае. Збаны тыпу III знаходзяць аналогіі сярод польскага посуду, дзе падобная форма прысадзістых збаноў з'явілася яшчэ ў XIV ст. (Kruppé, 1981 в. Ryc. 41: 17).

зяленая паліва

Малюнак 46 – Збаны (1 – 2);
раскопкі А.Р. Мітрафанава

Глякі – гэта гліняныя пасудзіны шарападобнай формы з вузенькім горлам і плоскім дном (Здановіч, Трусаў, 1993. С. 27). Археолагам трапляюцца звычайна круглыя ці з дзюбкай горлы ад гэтых вырабаў. Гляк поўнага профілю быў знойдзены падчас раскопак С.В. Тарасава на Вялікім пасадзе; дыяметр амаль круглага тулава каля 12 см, дыяметр горла роўны 5 см. Гляк выраблены на нажным ганчарным крузе, керамічнае цеста светлашэрае з дамешкамі дробназярністага пяску. Тулава было аздоблена арнаментам у выглядзе акружнасцяў, упісаных адна ў адну (гл. мал. 33: 4), звонку гляк пакрыты зялёнай палівай і датуецца канцом XVI ст.

Глякі XVIII ст. з раскопу Г.М. Сагановіча маюць выцягнутую шыйку і венца дыяметрам 4 см (Сагановіч, спр. 975. С. 28), абодва пакрыты празрыстымі палівамі карычневага адцення па слою ангоба (гл. мал. 33: 6 – 7).

Флягі – пасудзіны для транспартыроўкі вадкасці ў дарозе – мелі выцягнутае ад донца да горла авальнае і плоскае тулава з вушкамі па баках і маленькімі дзірачкамі (Здановіч, Трусаў, 1993. С. 28). Адзіныя на сённяшні

дзень знаходкі ў Полацку двух фрагментаў керамічных фляг датуюцца першай паловай XVI ст. (гл. мал. 41: 2, 4). Флягі былі зроблены са светла-шэрай гліны і пакрыты зялёнай палівай; па знешняму боку быў нанесены рэльефны арнамент з паралельных ліній і “сардэчкаў” з акружнасцямі каля вастрэйшага краю, упісанымі адна ў адну. Аналагічная дэталь арнаменту (“сардэчкі”) прысутнічае на флягах з помніка Лучна-1 паблізу Полацка, дзе таксама (вуснае вызначэнне М.В. Клімава) стратыграфічна датуецца першай паловай XVI ст. Па светла-шэраму колеру керамічнага цеста з дамешкамі дробназярністага пяску (выраб сфармаваны на ручным ганчарным крузе) і выразна арыенталісцкаму арнаменту фляга адносіцца да групы керамікі, зробленай пад уплывам традыцый Усходу, што не выключае яе мясцовую вытворчасць.

У Полацку былі знойдзены каля 5 носікаў рукамыяў ці насатак – керамічных пасудзін з адным ці двума носікамі і вушкамі для падвешвання (гл. мал. 32: 8, 10; мал. 37: 9). Полацкія насаткі па памерах блізкія да гаршчкоў з шырокім вусцем (Здановіч, Трусаў, 1993. С. 28).

Рукамыі выраблялiся ў Полацку з канца XVI – першай паловы XVII ст., сфармаваны з грубага керамічнага цеста (чарапок цёмна-шэрага колеру з плямамі празрыстай палівы). Носікі рукамыяў другой трэці XVII ст. (гл. мал. 32: 10) аздабляла рэльефная палоска каля венца, яны зроблены з чырвонай гліны з дамешкамі сярэднезярністай жарствы. Усе рукамыі (вядома каля 30 вырабаў) маюць адну спецыфічную рысу – у іх шырокія, адкрытыя зверху насы і пераборка з адтулінамі ў месцы мацавання з тулавам (гл. мал. 32: 8 – 10).

Адметнай формы рукамый знойдзены ў пабудове першай паловы XVI ст. Гэты выраб з’яўляецца імітацыяй усходняй, верагодна, турэцкай керамікі (гл. мал. 38: 6). Рукамый зроблены на ручным ганчарным крузе і з абодвух бакоў пакрыты празрыстай зялёнай палівай.

Па ўсёй верагоднасці, рукамый мясцовай вытворчасці, аб чым сведчаць тэхналагічныя прыкметы яго выканання (цеста з сярэднезярністымі дамешкамі, ручны ганчарны круг), аднак майстар, які зрабіў рукамый, быў добра знаёмы з традыцыямі аздаблення блізкаўсходняй керамікі, што наклала адбітак на знешні выгляд усяго вырабу (Дук, 2003 а. С. 96).

4.1.4. Дэкаратыўны посуд

Заўважана, што змены ў арганізацыі жыццёвай прасторы, гэта значыць працэсы, якія непасрэдна вызначаюць прадмет археалогіі, сведчаць пра пераасэнсаванне грамадскіх каштоўнасцяў. З надыходам эпохі Рэнесансу адбываецца разбурэнне традыцыйнага грамадства. У ВКЛ гэты працэс супадае з пашырэннем правоў шляхецтва і колькасным ростам пану-

ючага саслоўя, адасабленнем “эліты” ад “людзей простых”. Горад паступова пераўтвараецца ў цэнтр субкультуры пэўных прафесійных груп. Гарадскія рамеснікі становяцца замкнёнай сацыяльнай адзінкай, што яскрава бачна на прыкладзе цэхавага ўладкавання – іх прадукцыя вырабляецца па замове шляхты і магнатаў, густы апошніх залежаць ад запатрабаванняў, найперш, еўрапейскай моды. Па вызначэнню П. Бэрка, “сістэма цэхаў спрыяла стварэнню рамеснікамі і гандлярамі агульнай культуры, адрознай ад культуры сялян” (Бэрк, 1999. С. 62).

Яскравым прыкладам “індывідуалізацыі” побытавай культуры служыць рэзкае павелічэнне асартыменту рамеснай прадукцыі ганчароў, якая ў XVII – XVIII стст. не паддаецца падлічэнню. Асаблівае значэнне набывае эстэтыка. “Эстэтызм” матэрыяльнай культуры прасочваецца ў разнастайнасці аздаблення керамічнага посуду як самай распаўсюджанай у побыце катэгорыі рэчавага матэрыялу. Размаляваны посуд выконваў выключна дэкаратыўную функцыю. Полацкі дэкаратыўны посуд XVI – XVIII стст. прадстаўлены шматлікай групай керамічных вырабаў.

Пры разглядзе полацкага размаляванага посуду абраны прынцып вылучэння асобных груп вырабаў па тэхніцы нанясення размалёўкі. Прапануецца падзел па формах размаляваных талерак як самага распаўсюджанага віду дэкаратыўнага посуду ў межах кожнай з груп. У якасці аб’екта аналізу абраны посуд, профіль якога захаваўся цалкам, ці яго можна графічна рэканструяваць. Такім чынам, для класіфікацыі падыходзілі 18 размаляваных талерак і больш трох дзесяткаў фрагментаў з фондавай калекцыі НПГКМЗ (гл. мал. 43). Прадстаўнічая калекцыя размаляваных талерак паходзіць з раскопа Н.І. Здановіч у двары дзіцячай мастацкай школы (вул. К. Маркса, 1), дзе яны складалі каля 30 % усяго посуду (Здановіч, Трусаў, 1993. С. 56).

Вылучаюцца чатыры асноўныя прыёмы (спосабы) размалёўкі, якія характарызуюць полацкую вытворчасць XVI – XVIII стст.

Першы прыём – гэта размалёўка белым ці падфарбаваным ангобам па сухому чарапку (Здановіч, Трусаў, 1993. С. 56). Раслінны ці геаметрычны арнамент, выкананы белым ангобам, наносіўся адразу на чарапок, пасля чаго пакрываўся празрыстай палівай карычневага ці зялёнага адцення. Гэты посуд (група I) можна лічыць найбольш архаічным, на некаторых талерках па знешняму боку захаваліся сляды копаці (!) (Фонды НПГКМЗ. Кп-14-9926). Па польскіх матэрыялах вядома, што дэкараванне талерак не заўсёды пазбаўляла іх утылітарнай функцыі: напрыклад, некаторыя глыбокія талеркі маглі выкарыстоўвацца для падачы страў (Urbaniak, 2000. S. 227).

Асаблівасць другога прыёму заключаецца ў размалёўцы каляровымі палівамі па беламу ангобнаму фону (Ганецкая, Здановіч, 1993. С. 28).

Заўважана, што ў Полацку гэты посуд (група II) быў не вельмі распаўсюджаны (Здановіч, Трусаў, 1993. С. 56), ён у асноўным прадстаўлены размаляванымі збанамі і талеркамі. На адной талерцы па слою белага ангоба была выкарыстана тэхніка размалёўкі карычневымі глінкамі ў выглядзе хвалістага арнаменту па борціку і донцу, бясколерная паліва надала вырабу жаўтаватае адценне (Фонды НПГКМЗ. Кп-14-9921). Такі посуд абпальваўся два разы – першы раз пасля фармоўкі на ганчарным крузе і накладання слоя ангоба, другі – пасля нанясення бясколернай палівы.

Защважым, што тэхніка размалёўкі керамічнымі фарбамі па беламу ангобу (гэтак званая паўмаёліка) была распаўсюджана ў Польшчы толькі ў сярэдзіне XVII ст. (Dąbrowska, Gajewska, Kruppé, 1993. S. 249), тады як аналагічны посуд на Беларусі напрыканцы XVI ст. ужо асобна не ўжываецца (Здановіч, 1998. С. 127).

Талеркі I і II групы (8 адзінак) маюць абсалютныя падабенствы па форме. Дыяметр талерак па краю борціка складае ад 26 да 32 см; дыяметр донца – ад 11 да 13 см. Талеркі маюць складанапрафіляванае венца з рабром па ўнутранаму краю (гл. мал. 43: 1), а таксама адагнутае ў выглядзе манжэты венца (гл. мал. 43: 2, 3).

Трэці прыём – самы распаўсюджаны – гэта размалёўка посуду светлымі каляровымі глінкамі па цёмнаму ангобнаму фону пад бясколерную паліву (група III).

Размалёўка талерак праводзілася ў два этапы. Спачтаку наносілі фонавы ангоб пры дапамозе тэхнікі “вільготнай” размалёўкі (Зайцева, 1996. С. 134). Наступным этапам на падсушаную сілікатную аснову з дапамогай ражка наносіўся малюнак па контуру выявы. Пасля гэтага прасушаны выраб падвяргаўся першаснаму абпалу (Зайцева, 1996. С. 134).

На карысць падвойнага абпалу сведчыць адсутнасць зацямнёных праслоек глінянага чарапка пад слоем ангоба, якія ўтвараюцца звычайна пры першасным абпале з ужо нанесенай палівай. Бясколерная паліва, якой праводзілася канчатковая апрацоўка паверхні вырабу, часта захоўвала зеленаватае ці жаўтаватае адценне, яна наносілася праз пытлік, пасля чаго выраб паўторна абпальваўся (Зайцева, 1996. С. 134). Бясколерная паліва надавала паверхні бляск, дадатковую насычанасць і глыбіню цёмнай фонавай паверхні.

У Полацку тэхніка контурнай размалёўкі белым ангобам па цёмнай фонавай паверхні характэрна для другой трэці XVII ст. (Здановіч, 1998. С. 127). Распаўсюджванне гэтага прыёму размалёўкі можна звязаць з уплывам рамеснай вытворчасці нямецкіх земляў паўднёвай Маравіі, усходняй Германіі і Баварыі (Зайцева, 1996. С. 131).

Талеркі III групы маюць дыяметр па краю борціка ад 22,5 да 34 см і дыяметр донца ад 6,5 да 15 см.

Талеркі (гл. мал. 43: 4, 5, 6, 16) і паўміскі (гл. мал. 43: 7, 15) тыпу I (16 адзінак) маюць складанапрафіляванае венца з рабром па ўнутранаму краю.

Талеркі тыпу II (5 адзінак) маюць складанапрафіляванае венца з двума рэбрамі па ўнутранаму краю (гл. мал. 43: 8, 9).

Да III тыпу (8 адзінак) належаць талеркі з адагнутым у выглядзе карнізіка венцам, пад якім праходзіць раўчук (гл. мал. 43: 10, 11).

IV тып (15 адзінак) – гэта талеркі са знешне патоўшчаным венцам-манжэтай (гл. мал. 43: 12, 13)

Да IV групы полацкага размаляванага посуду належыць талерка поўнага профілю першай паловы XVIII ст. з размалёўкай па эмалі. Талерка мае загнутае ўнутр венца са зрэзаным краем і ўвагнутае донца (гл. мал. 43: 14). Аналагічнае венца мае паўміска пачатку XVIII ст. і талерка з вялікім пляскатым донцам дыяметрам 15 см (гл. мал. 43: 17, 18).

Донцы ўсіх полацкіх талерак захавалі сляды зразання ніткай з ганчарнага круга. Некаторыя донцы ўтрымліваюць сляды ад загладжвання, адбіткі пальцаў рамесніка, барозны ад драўляных трэсак.

У Полацку была распаўсюджана складаная тэхніка контурнай размалёўкі марганцам з наступным запаўненнем дэталяў малюнка каляровымі эмалямі. Контур рабіўся эмаллю вязкай кансістэнцыі пры дапамозе ражка і выконваў функцыю перагародак у ювелірнай тэхніцы перагародчатых эмаляў (Ганецкая, 1995. С. 33). Гэтая тэхніка нанясення малюнка была перанята еўрапейскімі керамістамі ад майстроў Блізкага Усходу з XV ст. (Ганецкая, 1997. С. 76 – 77). У Полацку знойдзены нешматлікія фрагменты, адзін з якіх ад куфля (Ганецкая, 1995. Мал. 11: 1). Арыенталістычныя акцэнты – гэта тая афарбоўка, якую набывае агульная накіраванасць барочнага стылю ў Рэчы Паспалітай (Лазука, 2001. С. 81).

З канца XVII ст. новая мода дэкаравання выклікала карэнныя змены ў тэхналогіі аздаблення вырабаў (Ганецкая, Здановіч, 1993. С. 28). Цяпер керамічную паверхню спачатку пакрывалі белай эмаллю, потым пэндзлем наносілі аднатонны ці каляровы малюнак, у якасці фарбаў ужывалі вадкія палівы. Прыкладам такой размалёўкі з’яўляюцца талеркі другой чвэрці XVIII ст. з раслінай арнаментыкай (Фонды НПГКМЗ. Кп-14-9927. Размалёўка зроблена па белай эмалі, пры гэтым шырока выкарыстоўваюцца рознакаляровыя палівы: лісце раслін – зялёнага колеру; кветкі – блакітныя; сцеблі раслін выкананы чырвонай керамічнай фарбай.

У якасці прыклада ўжывання маёлікавай размалёўкі трэба прывесці дэкаратыўны збанок-кветнічак пачатку XVIII ст. Двухбаковая размалёўка зроблена рознакаляровымі глухімі эмалямі: знутры – жоўтай, звонку – белай,

па якой чорнай контурнай фарбай пэндзлем нанесены раслінны арнамент у выглядзе парасткаў кветак з бутонамі (мал. 47: 4).

Аналагічны тып збанка з падобным малюнкам, маёлікавай размалёўкай і датай “1683” знойдзены ва Уніёвіцэ (Польшча) (Mikołajczyk, 1977. Tabl. XXVII/3); на Беларусі кветнічкі з маёлікавай размалёўкай знойдзены ў Гродне (Здановіч, Трусаў, 1993. Мал. 119). Верагодна, полацкі кветнічак быў выраблены ў прамежку часу з канца XVII да другой чвэрці XVIII ст.



Малюнак 47 – Дэкаратыўны посуд XVII – XVIII стст.:
талеркі (1 – 3) і маёлікавы кветнічак (4);
1 – 3 – раскопкі Н.І. Здановіч; 4 – Д.У. Дука

Асобнай катэгорыяй знаходак прадстаўлены посуд, які трапіў у Полацк з Усходу. Да гэтай катэгорыі адносяцца 5 дробных кавалкаў размаляванага начыння (гл. мал. 45: 9 – 12, 14). Усе яны маюць светла-шэры порысты чарапок з невялікімі дамешкамі дробназярністага пяску і адфармаваныя на нажным ганчарным крузе.

Да ліку керамікі XV – XVI стст. адносяцца 3 фрагменты піялы (?), звонку пакрытыя рознакаляровымі эмалямі белага, сіняга, зялёнага і карычневага колеру ў чорнай акантоўцы (гл. мал. 45: 9, 11 – 12). Фрагмент вазы (?) знутры пакрыты белай глухой палівай, а звонку – сіняй. Начынне мае дэкараваную рэльефным арнаментам паверхню, якая дадаткова аздоблена белым колерам (гл. мал. 45: 14). Венца белаглінянага кубка (?) звонку пакрыта празрыстай саляной палівай (гл. мал. 45: 13).

Па вызначэнню І.У. Ганецкай (праведзена падчас вуснай кансультацыі), гэтая група размаляванага посуду была прывезена ў Полацк з Блізкага Усходу – у XVI ст. такую кераміку выраблялі на тэрыторыі Турцыі. Пра наяўнасць гандлёвых сувязяў палачан з Турцыяй сведчаць пісьмовыя крыніцы. У 1561 годзе полацкі ваявода Станіслаў Давойна атрымаў права бязмытнага пропуску праз усю тэрыторыю ВКЛ чатырох вазоў тавараў з Полацку ў Турцыю і назад (Варонін, 2000 б. С. 50). Ці не з’яўляюцца выяўленыя рэшткі керамікі часткай тавара, прывезенага С. Давойнай з Турцыі?

Фрагмент сценкі керамічнага начыння з пабудовы першай паловы XVI ст. сфармаваны са светлай порыстай гліны і мае далікатна выкананую рэльефную выяву жалуда, звонку і знутры начынне пакрытае празрыстай глазурай з крэмавым адценнем (мал. 38: 8).

Такім чынам, полацкі размаляваны посуд XVI – XVIII стст. прадстаўлены даволі вялікай групай разнастайных па форме і прызначэнню вырабаў. Дэкаратыўны посуд, які знойдзены пры археалагічных даследаваннях, дазволіў вызначыць храналагічныя дыяпазоны распаўсюджвання асобных матываў размалёўкі і фармоўкі вырабаў у межах станаўлення мастацкіх стыляў маньерызму (канец XVI – першая чвэрць XVII ст.) і сталага барока (другая трэць XVII – першая палова XVIII ст.).

4.1.5. Дробныя керамічныя групы

Разнастайнасць відаў ганчарнай прадукцыі дазваляе звесці асобныя, больш дробныя катэгорыі полацкай керамікі XVI – XVIII стст. у адну групу.

Невысокае (да 3 – 5 см) піялападобнае начынне накшталт сучасных сальнічак выкарыстоўвалася для захоўвання спецый (Здановіч, Трусаў, 1993. С. 47). Такое начынне мела шматлікія невялікія адтуліны ў купалку (гл. мал. 37: 11).

Мініяцюрнае начынне ў выглядзе збанка з дыяметрам донца 1,3 см і вышынёй 3,1 см (гл. мал. 37: 8), пакрытае карычневай палівай, выкарыстоўвалась у якасці *салонкі* (Соболь, 1988. С. 107) ці *слоіка пад парфуму* (Археалогія Беларусі, 2001. С. 314). Салонкі вядомы ў напластаваннях XVII – XVIII стст. Мінска, па форме яны нагадвалі збанкі з пашыранымі да асновы сценкамі (Соболь, 1988. С. 107).

Памадныя слоікі прызначаліся для захоўвання парфумы і ў якасці аптэчнага посуду. Яны падзяляюцца на раннія (XVII ст.) і познія (XVIII – XIX стст.) (Археалогія Беларусі, 2001. С. 314). Раннія слоікі выраблены з чырвонай гліны і пакрыты зялёнай палівай (гл. мал. 36: 15), зроблены не вельмі старанна – у керамічным цесце сустракаюцца дамешкі жарствы. Па складу фармовачнай масы і колеру палівы яны аналагічныя полацкаму посуду XVII ст., што дазваляе зрабіць выснову аб іх мясцовай вытворчасці.

Слоікі XVIII ст. вырабляліся з гліны чырвонага колеру з дамешкамі сярэднезярністага пяску, знутры і звонку па венцу яны пакрываліся палівай карычневага ці зялёнага колеру (гл. мал. 37: 6 – 7), альбо заставаліся тэракотавымі (гл. мал. 36: 16 – 17). Вышыня вырабаў вагаецца ад 4,5 да 7 см, дыяметр венцаў ад 4,5 да 8 см, донцаў ад 3 да 5 см.

У гістарычнай літаратуры існуе меркаванне аб імпартным (маскоўскім) паходжанні памадных слоікаў XVIII ст. (Археалогія Беларусі, 2001. С. 314). Безумоўна, частка слоікаў, асабліва выробленых з белай гліны, трапіла з Масквы, дзе існавалі майстэрні па вытворчасці аптэчнай керамікі (Рабинович, 1949. С. 66). Маскоўскае начынне мае цыліндрычныя сценкі і перпендыкулярна адагнутае венца, але ў некаторых полацкіх слоікаў іншая прафіліроўка, пры гэтым венца часта адсутнічае – гэты факт сведчыць на карысць іх мясцовай вытворчасці.

Нязначнай колькасцю фрагментаў прадстаўлены *скарбонкі* (гл. мал. 37: 1 – 2, 4). Скарбонкі, да якіх аднесена 3 адзінкі, мелі купалападобную форму з плоскім, як у гаршчкоў, донцам (мал. 49: 4). Вонкавая паверхня пакрыта палівай зялёнага колеру.

Керамічныя *чарніліцы* знойдзены ў пластах XVI – XVII стст. Захаваліся два унікальныя вырабы поўнага профілю (мал. 48: 3, 4). Адна чарніліца зроблена на нажным ганчарным крузе (захавалася толькі сценка начыння). Малюнак у выглядзе двух антрапаморфных фігур прадрапаны па вільготнай гліне, а асобныя элементы нанесены метадам карбавання. Зроблена рэканструкцыя знешняга выгляду гэтага вырабу (гл. мал. 48: 4).

Вышыня сценкі чарніліцы 8,8 см, з улікам таўшчыні накрыўкі яе вышыня была не меней за 9 см. Дыяметр донца 8,4 см, венца – 9 см. Таўшчыня сценак і донца адпаведна 0,8 і 0,5 см. Выраб сфармаваны на нажным ганчарным крузе (з унутранага боку захаваліся характэрныя сляды

ў выглядзе гарызантальных палосак-штрыхоў), аднак донца і накрыўка даляплялася пасля фармоўкі вырабу. Край донца загладжаны пальцамі, таксама як і паверхня начыння каля малюнку. Таўшчыня накрыўкі каля 0,4 см. Керамічнае цеста добра вымешанае, з дамешкамі пяску. Чарапок аднароднага шэрага колеру, вонкавая паверхня практычна чорная. Верагодна, разбурэнне вырабу адбылося пры абпале па прычыне неадпаведнасці тэхналогіі фармоўкі вырабу – донца і накрыўка былі нетрывала дапасаваны да сценак. Гэтая асаблівасць – магчымае сведчанне недакладнасці валодання ганчаром тэхналогіяй фармавання начынняў на нажным ганчарным крузе, што дапушчальна ў XVI ст.



Малюнак 48 – Керамічныя вырабы XVI – XVIII стст.:
кружка (1); падсвечнік (2); чарніліца (3);
графічная рэканструкцыя чарніліцы з выявай князёў Барыса і Глеба (4);
1 – 2, 4 – раскопкі Д.У. Дука; 3 – з фондаў НПГКМЗ

Малюнак нанесены драўляным стэкам пасля фармоўкі выраба па вільготнай гліне[3]. Асобныя дэталі адзення і імітацыя літар на кнізе над антрапаморфнымі выявамі нанесены шляхам карбоўкі. Уся кампазіцыя змешчана ў нешырокай рамцы (падвойнай з левага краю), паміж рамкай і антрапаморфнымі выявамі прамаляваны крылы анёлаў (мал. 49: 2). На сценцы начыння выяў было некалькі – не менш чатырох, усе яны былі змешчаны ў прамавугольныя рамкі. Як можна меркаваць па захаванаму фрагменту, памеры кампазіцыі былі аднолькавыя: 4 × 6,5 см.

1

2

Малюнак 49 – Мсціслаўская кафля з выявай св. Георгія (1)
і сценка керамічнай чарніліцы з Полацка (2)

Выява двух антрапаморфных фігур – не што іншае, як перадача вобразаў князёў Барыса і Глеба. Такое заключэнне вынікае з двух аргументаў. Першы – чарніліца знойдзена непасрэдна каля падмуркаў царквы Барыса і Глеба падчас археалагічнага нагляду ў 2003 годзе, другі – асноўны аргумент – вынікае з характару стылізацыі выяў. Абедзве фігуркі знешне падобныя, перададзены дастаткова ўмоўна, з усіх дэталяў адзення найбольш рэалістычна прамаляваны галаўныя ўборы. Іх малюнак на абедзвюх фігурках аднолькавы – гэта высокія трапецыяпадобныя шапкі накшталт княжацкіх вянцоў. Згодна з іканаграфічнай праваслаўнай традыцыяй XVII ст. княжацкія (царскія) вянцы перадаваліся менавіта такім чынам. Варта (як

[3] Вызначэнне зроблена мастаком-рэстаўратарам Нацыянальнага Полацкага гісторыка-культурнага музея-запаведніка А.А. Хатулевай, за што прыношу ёй шчырую падзяку.

прыклад) прывесці выяву цара на мсціслаўскай кафлі сярэдзіны XVII ст. з аналагічным галаўным уборам[4] (гл. мал. 49: 1).

Уверсе над выявамі князёў Барыса і Глеба адлюстравана кніга. Аналагічная па прапорцыях і канструкцыі керамічная чарніліца была знойдзена ў Полацку старшым навуковым супрацоўнікам Нацыянальнага Полацкага гісторыка-культурнага музея-запаведніка А.А. Салаўёвым падчас археалагічнага нагляду на тэрыторыі Вялікага пасада. Выраб у пашкоджаным выглядзе захаваўся цалкам, на сённяшні дзень ён адрэстаўраваны і захоўваецца ў фондах НПГКМЗ (гл. мал. 48: 3).

Па тэхналагічным прыкметам абедзве чарніліцы ідэнтычныя і зроблены з шэра-карычневай добра адмучанай гліны без грубых дамешак. Паверхня шурпатая, загладжаная ў верхняй частцы, амаль чорная як звонку, гэтак і знутры.

Чарніліца з фондаў НПГКМЗ не ўтрымлівае выяў, аднак падабенства формы і блізкасць прапорцый з вышэйзгаданым фрагментам відавочнае. Верхняя яе частка захавала адбіткі пальцаў рамесніка ў выглядзе чатырох барознаў шырынёй 0,7 см. Дыяметр донца – 7,8 см; венца –10,5 см; вышыня сценак 8 см; агульная вышыня выраба з улікам накрыўкі – 9,5 см. Накрыўка чарніліцы мае адтуліну дыяметрам 1,5 см, яшчэ адна гарызантальная адтуліна зроблена ў вушку накрыўкі, тут яе дыяметр складае 0,9 см. Адтуліна ў вушку можа сведчыць аб тым, што чарніліца падвешвалася на вяровачцы. Праз адтуліну ў накрыўцы можна прапусціць пяро і пры патрэбе закрыць коркам.

Чарніліца з фондаў НПГКМЗ была знойдзена ў недатаваным пласце, таму адзіным храналагічным маркерам можа з’яўляцца яе тэхналагічныя прыкметы. Як у першым, так і ў другім выпадку накрыўкі дапасаваны да сценак пасля фармоўкі вырабаў на нажным ганчарным крузе, у адной чарніліцы накрыўка прытоплена ад краю на 1,2 см дзеля прыдухілення выцякання чарнілаў. Сценкі начыння тонкія – каля 0,5 см, паводле згаданых прыкмет выраб датаваны другой паловай XVI – XVII стст.

Мастацкія вартасці чарніліцы з Барысаглебскага манастыра вельмі адметныя. Выява на чарніліцы рэдкая ў беларускім сярэднявечным мастацтве і адпавядае праваслаўнай іканаграфічнай традыцыі (Żemigala, 1998, s. 268). Напрыклад, сюжэт магілёўскай кафлі, дзе святы Георгій забівае цмока, выкананы ў стылі заходнееўрапейскага барока (Марзалюк, 1998, мал. 44, 2). Стылізацыя выяў князёў Барыса і Глеба на фрагменце полацкай чарніліцы вельмі падобная па выяўленчым вартасцям на выяву мсціслаўскай кафлі і з’яўляецца пакуль што адзінкавым прыкладам дэкаратыўнага аздаблення

[4] На малюнку выява цара змешчана побач з выявай св. Георгія на кані.

керамічнага начыння такога кшталту. У адрозненні ад мсціслаўскай кафлі, малюнак на чарніліцы нанесены мастаком без выкарыстання матрыцы, што сведчыць аб непаўторнасці гэтага твора дэкаратыўнага мастацтва.

Прыкметамі для вызначэння часу стварэння вырабу з'яўляюцца:

1) факт выкарыстання нажнога ганчарнага круга;

2) месцапалажэнне рэчы ў стратыграфічным пласце;

3) архаічная праваслаўная традыцыя выканання выявы, аналагічная традыцыі выканання выявы на мсціслаўскай кафлі.

Традыцыя перадачы выяў у сярэднявечным мастацтве магла існаваць дзесяцігоддзі і нават стагоддзі. Стратыграфічныя даныя без правядзення археалагічных раскопак не з'яўляюцца поўнымі, можна вылучыць толькі храналагічны дыяпазон керамікі з трэцяга стратыграфічнага гарызонта. Гэта кераміка маркіруе пласт, з якога паходзіць фрагмент чарніліцы, XV – XVI стст. Час распаўсюджвання нажнога ганчарнага круга ў Полацку прыпадае на другую палову XVI ст., інтэнсіфікацыя гэтага працэсу адбываецца ў першай трэці XVII ст. Такім чынам, найбольш верагоднае датаванне чарніліцы – мяжа XVI – XVII стст.

Керамічныя *падсвечнікі і свяцільнікі* былі вядомы ў Полацку з XVII ст. Падсвечнікі мелі двух-ці аднаярусную структуру з шырокай стапой для збірання сцякаючага воску і ножкай-стрыжнем з гняздом для свечкі. Адзін цэлы падсвечнік XVII ст. пакрыты падпаліўным ангобам (гл. мал. 37: 10), другі падсвечнік (гл. мал. 48: 2) пакрыты празрыстай зялёнай палівай і мае дакладны аналаг з віцебскім падсвечнікам (17,5 × 12,5 см) (Русецкий, 2001. С. 115). Падсвечнікі, выробленыя ў XVIII ст. (гл. мал. 36: 14), пакрытыя цаніннай палівай карычневага колеру; яны вядомы ў Віцебску, Магілёве, Мінску і іншых беларускіх гарадах (Археалогія Беларусі, 2001. С. 315; Марзалюк, Яцкевіч, 1992. С. 6; Соболь, 1988. С. 110).

Найбольш распаўсюджанай формай гліняных падсвечнікаў быў бакал усечана-канічнай формы дыяметрам 3 – 3,5 см і вышынёй да 10 см (гл. мал. 36: 6), часта з петлепадобнай ручкай пасярэдзіне ці бліжэй да венца. У Полацку знойдзены паліваныя (6 адзінак) і непаліваныя (4 адзінкі) вырабы (Здановіч, Трусаў, 1993. С. 47). У канцы XVII – XVIII стст. гліняныя падсвечнікі-бакалы пачынаюць усталёўвацца на дыскападобным паддоне (гл. мал. 36: 8). Як адзін з варыянтаў падсвечнікаў-бакалаў можна разглядаць касцельныя свяцільнікі, якія ўстаўляліся ў спецыяльныя металічныя трымальнікі і выкарыстоўваліся падчас набажэнстваў (гл. мал. 37: 5).

Падчас раскопак А.Р. Мітрафанава ў 1959 годзе былі знойдзены 4 падсвечнікі, якія нагадваюць збанкі вышынёй ад 7 да 10 см і дыяметрам да 5 см (гл. мал. 36: 12; 39: 2). Вырабы знутры пакрыты празрыстай палівай

зялёнага і карычневага колераў і датуюцца XVIII ст. (Фонды НМГБ. Кп-3639/349).

У пластах XVII ст. знойдзены *керамічныя грузілы* ад сетак. Яны зроблены з чырвонай гліны, даволі масіўныя і прызначаліся для лоўлі рыбы ў рацэ. Даўжыня аднаго выраба роўная 6 см, дыяметр – 3 см; другое грузіла мае памеры адпаведна 4 × 3,5 см; дыяметры адтулін вагаюцца ад 1 да 1,3 см (гл. мал. 36: 10 – 11).

Начынне з "каменнай масы" храналагічна падзяляецца на ранняе (XV – XVII стст.) і позняе (XVIII – пачатку XIX стст.). "Каменная маса" фарміруецца са светла-шэрай або бялявай гліны, якая пры абпале дае цвёрды ("каменны") чарапок (Археалогія Беларусі, 2001. С. 312 – 313).

У Полацку пакуль што археалагічна не выяўлены самы ранні "каменны тавар" (Steinzeug) тыпу "Якабеі" (Jakobäa-Kanne) (Белецкий, 1978. С. 292 – 293). Адно цэлае начынне такога тыпу знойдзена на феадальнай сядзібе Лучна-1 паблізу Полацка (Археалогія Беларусі, 2001. С. 92).

Мяжой XVI – XVII стст. датуюцца асобныя фрагменты "каменнага посуду" (кружка, збан і 5 фрагментаў сценак са срабрыстым глянцаваннем) (Здановіч, спр. 1213 а. С. 21). Падчас раскопу Н.І. Здановіч быў знойдзены фрагмент рэйнскага збана-маскарона XVII ст., па якому ўдалося правесці графічную рэканструкцыю знешняга выгляду ўсяго выраба (Здановіч, спр. 1373. Ліст 16: 2). Збан быў пакрыты саляной палівай "кава з малаком", колер палівы вызначае прыналежнасць начыння да прадукцыі майстэрань Зігбурга блізу Кёльна (Иванова, 1975. С. 275). На тэрыторыі Беларусі аналагічны збан-маскарон знойдзены ў Мірскім замку (Здановіч, Трусаў, 1993. С. 65).

Асобна прадстаўлены 2 *чарніліцы* з гліны крэмавага колеру, пакрытыя бясколернай палівай (мал. 50: 9; гл. мал. 35: 4). Чарніліцы маюць вышыню 5,5 см і дыяметр тулава 5 см. Верагодна, абедзве чарніліцы паходзяць з майстэрняў Зігбурга блізу Кёльна, на што ўказвае колер чарапка (Иванова, 1975. С. 275), датаваць падобную кераміку можна шырока ў межах XVII – XVIII стст.

Адметным вырабам з "каменнай масы" з'яўляецца фрагмент сценкі начыння (мал. 35: 2) з кляймом у выглядзе вензеля "SL" і фрагментам лацінскага надпісу "A L S A" (раскопкі А.Р. Мітрафанава на Верхнім замку ў 1959 г.) (Фонды НМРБ. Кп-3639/231). Тыпалагічна блізкая кераміка знойдзена ў пластах XVIII – XIX стст. у Віцебску (Археалогія Беларусі, 2001. Мал. 205).

Не раней за XVIII ст. датуецца керамічны выраб з "каменнай масы" светлага колеру, пакрыты саляной глазурай (мал. 36: 13). Па форме выраб нагадвае памадныя слоікі, але не выключана іншае прызначэнне рэчы.



Малюнак 50 – Вырабы XVI – XIX стст.:
люлькі (1 – 7, 10 – 18); чарніліца (9); свісцёлка (8); бурштынавы муштук (19);
10 – 15, 17 – 19 – раскопкі Н.І. Здановіч; 1 – 9 – С.В. Тарасава

Распаўсюджанымі знаходкамі ў пластах XVII – XVIII стст. з'яўляюцца *дзіцячыя цацкі* ў выглядзе конікаў, птушак і вершнікаў на коніках. Усяго падчас раскопак у Полацку было знойдзена каля трох дзесяткаў керамічных цацак. Іх дэкор і выкананне найперш залежылі ад мясцовай школы ганчарнай вытворчасці, таму лічыцца, што выраб глінянай цацкі нідзе на Беларусі не пераўтварыўся ў асобны від промыслу (Касцюкевіч, 2000. С. 11).

Большасць цацак пакрыта ангобамі ці палівамі карычневага і зялёнага колеру па ангобу (гл. мал. 45: 1, 2 4, 5, 7). Самая вялікая калекцыя полацкіх гліняных свісцёлак была знойдзена падчас раскопаў Н.І. Здановіч і С.В. Тарасава на Вялікім пасадзе (Здановіч, спр. 1450. Ліст 35; Тарасов, спр. 1084. С. 108). Частка цацак (мал. 51: 13 – 20) знаходзілася ў межах пабудовы першай паловы XVIII ст., іх знешняе афармленне, прапорцыі і тэматыка адрозніваюцца ад вядомых цацак з іншых гарадоў Беларусі.

Знойдзена адна унікальная цацка – вершнік з рэалістычна выкананымі дэталямі адзежы, форма якой падкрэслена ангобнай размалёўкай (гл. мал. 51: 17).

У калекцыі А.А. Салаўёва захоўваюцца гліняныя цацкі ў выглядзе жывёл, птушак, чалавечкаў (Салаўёў, 2002. С. 50).



Малюнак 51 – Керамічныя свісцёлкі XVII – XVIII стст.:
1 – 12 – раскопкі С.В. Тарасава; 13 – 20 – Н.І. Здановіч

Мурмельшпілі (ад ням. murmelspiel) – гліняныя шарыкі для гульні ў каменьчыкі – знойдзены ў культурных напластаваннях XVII – XVIII стст.,

але найбольш пашыраны менавіта ў XVII ст. Шарыкі выраблялісь з гліны чырвонага ці белага колеру дыяметрам ад 1 см (Здановіч, спр. 1213 а. С. 21) да 3 см (Дук, спр. 1921. Фота 36), але звычайна яны мелі памеры 1,6 – 1,8 см. Мурмельшпілі знойдзены пры раскопках многіх беларускіх гарадоў і памежных земляў (Калядзінскі, 1993. С. 447). Некаторыя керамічныя шарыкі аздабляліся простым малюнкам у выглядзе жартоўнай выявы чалавечага твару ў стылі "кропка, кропка, коска…" (гл. мал. 45: 3).

Люлькі належаць да групы вырабаў дробнай пластыкі і іх прызначэнне было дваякае: з аднаго боку, люлькі – гэта твор мастацтва (сувенір); з другога – утылітарны выраб (Здановіч, Трусаў, 1993. С. 49). Вялікая калекцыя керамічных люлек (10 адзінак) была знойдзена падчас раскопа Н.І. Здановіч па вул. К. Маркса, 1.

Люлькі падзяляюцца на дзве групы: прывазныя і мясцовай вытворчасці. Самыя раннія з чырвонагліняных глянцаваных люлек знойдзены на тэрыторыі Верхняга замку падчас раскопу А.Р. Мітрафанава (гл. мал. 46: 3), гэтыя вырабы належаць да найбольш ранняга тыпу чырвонаглянцаваных люлек (Левко, 1992. С. 53). Люлькі канца XVII – пачатку XVIII ст. выраблены з чырвонай (гл. мал. 50: 10 – 12, 16) ці белай гліны (гл. мал. 50: 13 – 15, 18), сярод іх вылучаюцца тэракотавыя (мал. 50: 10 – 11), пакрытыя туркусавай, светла-карычневай палівай (гл. мал. 50: 12 – 13), палівай салатавага колеру (гл. мал. 50: 18) ці бялявай эмаллю (гл. мал. 50: 14; 52:5). Па наяўнасці штампаванага дэкору люльку з туркусавай палівай можна аднесці да часу не раней другой паловы XVIII ст. Багата арнаментаваны люлькі, што былі знойдзены С.В. Тарасавым на плошчы Свабоды (гл. мал. 50: 1 – 7), некаторыя ўтрымліваюць штампаваны геаметрычны арнамент з выявамі разетак – прыкмета XIX ст.

Да тыпу "галандскіх" глянцавых люлек належыць 3 экзэмпляры (гл. мал. 50: 15, 17, 18). Унікальная калекцыя з чатырох галандскіх люлек была сабрана падчас раскопу А.Р. Мітрафанава ў 1959 годзе. Захаваліся фотаздымкі знаходак, далейшы лёс саміх артэфактаў дагэтуль не вызначаны (мал. 52: 1 – 4).

Дзіцячае начынне (знойдзены невялічкія гаршочкі) (гл. мал. 39: 3 – 4) выкарыстоўвалася і як цацкі, і як ёмістасць для спецый (Трусаў, Собаль, Здановіч, 1993. С. 47). Некаторыя з іх выконвалі дэкаратыўную функцыю, як, напрыклад, размаляваная "кубышка" з пабудовы канца XVI ст. (Здановіч, 1998. С. 129).

З прыведзенай класіфікацыі керамічнага посуду вынікае, што палачане на працягу стагоддзяў выпрацавалі ўласную традыцыю вытворчасці.

Асобныя формы полацкага посуду сведчаць аб разгорнутых рамесных кантактах з іншымі рэгіёнамі Беларусі і суседнімі землямі як на Захадзе, так і на Усходзе. Полацкія ганчары мелі ўласныя здабыткі ў фармоўцы і дэкараванні посуду, цацкі. На падставе вывучэння самай масавай катэгорыі полацкага посуду – гаршчкоў – можна заўважыць, што да 20 – 30-х гадоў XVII ст. у іх вытворчасці пераважалі сярэднявечныя традыцыі ўсходняга рэгіёну ВКЛ (Беларускае Падзвінне і Падняпроўе). Разбурэнне сярэднявечных традыцый звязана з распаўсюджваннем перадавых заходнееўрапейскіх тэхналогій (нажнога ганчарнага круга, палівання), што пачынае фіксавацца ў сярэдзіне XVI ст. У эпоху ранняга Новага часу афармляюцца падняпроўска-падзвінскія рэгіянальныя асаблівасці ў аздабленні і форме посуду, у чым можна ўбачыць сувязь з напрацоўкамі папярэдняга перыяду.





Малюнак 52 – Керамічныя “галандскія” люлькі (1 – 4);
люлька XIX ст. (5);
раскопкі А.Р. Мітрафанава

5. АПРАЦОЎКА МЕТАЛАЎ. ШКЛАРОБСТВА ВЫРАБЫ СА СКУРЫ, З КОСЦІ, ДРЭВА І КАМЕНЮ

5.1. Вырабы з металаў

Апрацоўка металаў здаўна займала адно з галоўных месцаў сярод рамесных заняткаў гарадскога насельніцтва. Металургія ў Полацку суіснавала з кавальскай справай у межах пасадскай тэрыторыі. У культурных напластаваннях XVI – XVIII стст. Вялікага пасада трапляецца вялікая колькасць шлакаў вагой да 4 – 5 кг, што сведчыць аб цэхавай вытворчасці жалеза на гарадской тэрыторыі (Дук, спр. 1921. С. 8). Прыкметны аб'ём меў увоз металаў на Полаччыну. У першай палове XVI ст. з замежных купцоў ад патэльняў, сякер, лемяшоў спаганялася трыццатая частка, а ад пяцісот кос – 30 грошаў шырокіх. Па аб'ёму імпарт металічных рэчаў можна параўнаць толькі з увозам тканін (Варонін, 2000 б. С. 48).

Па звестках пісьмовых крыніц, у 1601 годзе ў Полацку было ўтворана два цэхі. Адзін з іх аб'ядноўваў кавалёў, кацельнікаў, слесараў, мечнікаў і златароў, другі – краўцоў (Полоцк: Ист. очерк, 1987. С. 49). У 1619 годзе шапачнікі і кушняры вылучыліся з аб'яднанага цэха і стварылі самастойны. З цягам часу да гэтага ж цэху далучыліся скурнікі і краўцы. З сярэдзіны і да канца XVII ст. у Полацку стварыліся 6 новых цэхаў: цырульнікаў (1642); ганчароў, печнікаў, муляраў і цагельнікаў (1643 г); скурнікаў і кушняроў (1683). З 1640 года стаў вядомы самастойны цэх чабатароў, а з 1677 года – кавальскі і слясарскі цэх (Гардзееў, 2003. С. 177). Акрамя таго, актавыя кнігі полацкага магістрата за 1656 – 1657 гады сведчаць аб існаванні цэху слесараў, кавалёў, катляроў і мечнікаў (Гардзееў, 2003. С. 179 – 180).

Златары былі вельмі паважанымі людзьмі ў Полацку, яны мелі высокае грамадскае становішча і вылучаліся заможнасцю як сярод рамеснікаў, так і ў мяшчанскім асяроддзі ўвогуле (Варонін, 2000 б. С. 38). Полацкія ювеліры былі вядомыя і за межамі дзяржавы: у 1660 годзе ў Аружэйную палату былі вывезены 68 полацкіх і віцебскіх рамеснікаў, сярод якіх першымі згадваюцца майстры "срэбранай" справы (Игнатенко, 1963. С. 13).

5.1.1. Побытавыя рэчы

У Полацку за апошнія дзесяцігоддзі археолагамі сабрана вялікая калекцыя металічных вырабаў. Большасць прадметаў мае шырокі храналагічны дыяпазон бытавання па прычыне масавай вытворчасці, універсальнасці і адносна невысокага кошту. Да гэтай катэгорыі знаходак, як правіла, адносяцца рэчы паўсядзённага карыстання гараджан. Прадметы індывідуальнай формы звычайна звязаны з катэгорыяй узбраення ці належаць да

ювелірнай вытворчасці, з іх асаблівую цікавасць прадстаўляюць тыя артэфакты, якія маюць мясцовае паходжанне і з'яўляюцца творамі полацкіх рамеснікаў.

Пры вырабе распаўсюджанай катэгорыі кавальскай прадукцыі – нажоў – выкарыстаны розныя тэхналагічныя прыёмы. На аснове металаграфічнага аналізу віцебскіх жалезных вырабаў XIV – XVII стст. М.Ф. Гурыным зроблена выснова, што мясцовыя кавалі добра валодалі зваркай, цэментацыяй, тэрмаапрацоўкай і горнавай пайкай (Гурын, 1981. С. 104).

Нажы часцей за ўсё рабіліся з прамой спінкай і шырокім лязом, якое разам з плоскай ручкай выкоўвалася з адной нарыхтоўкі. Да ручкі пры дапамозе заклёпак мацаваліся касцяныя альбо драўляныя накладкі (Археалогія Беларусі, 2000. С. 256). Такія гаспадарча-універсальныя нажы з накладнымі тронкамі ў побыце гараджан з XVI ст. выціскаюць традыцыйныя чаранковыя (Археалогія Беларусі, 2000. С. 268). Звычайна тронкі мацаваліся з жалезным палатном пры дапамозе трох (зрэдку пяці) шыпоў, пры гэтым мацавальныя шыпы на полацкіх нажах з канца XVI ст. вырабляюцца, як правіла, з жалеза (дагэтуль – з медзі).

Гаспадарча-універсальныя нажы з'яўляюцца самымі распаўсюджанымі сярод іншых тыпаў рэжучых прылад працы. Вялікая калекцыя нажоў XVI – XVIII стст. сабрана падчас раскопаў 2001 – 2003 гадоў на тэрыторыі Вялікага пасада (32 адзінкі). Нажы маюць касцяныя накладкі на дзяржанне з жалезнымі заклёпкамі і падзяляюцца на шэраг тыпаў.

Гаспадарчыя нажы XVI ст. маюць дзяржанне, вузейшае за лязо (мал. 53: 10; мал. 54: 33; 55: 1). Усе нажы XVI – XVIII стст. маюць касцяныя тронкі (гл. мал. 53: 2 – 19). У XVIII ст. распаўсюджанай формай становіцца выцягнуты нож з лязом, якое плаўна патанчаецца да вастрыя пад невялікім вуглом (гл. мал. 53: 9, 17). Шырыня лёзаў гэтых нажоў 1,6 – 1,8 см, шырыня дзяржанняў 1,1 – 1,4 см.

У канцы XVII – XVIII стст. шырыня лёзаў нажоў становіцца большая за дзяржанне прыкладна на трэць, павялічваецца вышыня касцяных тронкаў да 0,5 см, пры гэтым у XVIII ст. канцы лёзаў набываюць, як правіла, закругленыя абрысы (гл. мал. 53: 1, 3, 5, 13). Нажы канца XVIII – XIX ст. маюць цалкам сучасны выгляд.

Сцізорыкі – катэгорыя нажэй, якая ў адзначаны перыяд ужывалася ў побыце пераважна гарадскога насельніцтва, сустракаюцца яны таксама і пры раскопках замкаў і феадальных двароў (Археалогія Беларусі, 2000. С. 269; Саганович, 1988. С. 84). У культурных напластаваннях XVI – XVIII стст. знойдзена 3 такіх вырабы. Аснову сцізорыка XVI – XVII стст. складае металічная абойма з касцянымі накладкамі на заклёпках і запіраючае прамое лязо (гл. мал. 53: 14). Гэты нож мае сучасную канструкцыю, даўжыня ручкі – 8,7 см.

Цэлы сцізорык з пласта пачатку XVIII ст. мае аднолькавую даўжыню ляза і чаранка 9,5 см. Касцяныя тронкі на трох жалезных заклёпках закрываюць 1/3 дзяржання, дзяржанне нажа цэльнаметалічнае з прораззю для ляза на ўсю даўжыню, лязо мае зрэзаны край (гл. мал. 53: 7). Падобную форму мае сцізорык канца XVIII ст. (гл. мал. 53: 15).



Малюнак 53 – Жалезныя нажы (1 – 11, 13 – 20); тупік (12) XVI – XVIII стст.; раскопкі Д.У. Дука

Нажы індывідуальных формаў знойдзены ў напластаваннях XVI ст. (гл. мал. 39: 9; 55: 5). Нажы маюць прафіляваную шыйку паміж лёзам і чаранком, што ўвогуле характэрна для сталовых і раздзелачных нажоў XVI – XVII стст. (Археалогія Беларусі, 2000. С. 268), клеймы на іх адсутнічаюць. Не выключана, што гэтыя нажы імпартаваны з нямецкіх земляў (Археалогія Беларусі, 2000. С. 268).



Малюнак 54 – Вырабы з жалеза XVI – XVIII стст.:
ключы (1 – 5, 7); замок (6); завесы і апорная клямка (8 – 9, 15, 38); крэсіва (13); дужкі ад вёдзер (10, 14); скабяныя вырабы (11 – 12, 15); лучнікі (20 – 22); прабойнік (26); нажы (16 – 18, 31 – 35); свердзел (23); цэпатрымальнік (24); нажніцы (27 – 28); піла (29), малаток (30); шпора (36); накавальня (37); размеркавальнік (39); дэталі вырабаў невядомага прызначэння (19, 25); раскопкі С.В. Тарасава

Падчас раскопу 2001 года быў знойдзены нож з лязом даўжынёй не менш 12 см (канец клінка абламаны). Нож захаваўся на даўжыню каля 22 см, агульная даўжыня вырабу каля 23 – 25 см (гл. мал. 53: 17). Касцяныя тронкі мацаваліся да дзяржання пры дапамозе трох жалезных заклёпак, лязо нажа прамое, з крыху выгнутай спінкай. Стратыграфічна выраб датуецца

XVII ст., нож мае касцяныя тронкі паўкруглай формы, якія роўныя шырыні палатна дзяржання і пазбаўлены арнаментацыі. “Захаляўны” (баявы) нож аналагічнай формы клінка знойдзены ў Віцебску (Здановіч, 1992. С. 467), нож з Полацка хутчэй за ўсё належыць да універсальна-гаспадарчага тыпу, на што ўказвае невялікая таўшчыня спінкі (0,3 см) і адсутнасць іншых прыкмет баявога нажа.



Малюнак 55 – Металічныя вырабы з пабудовы першай паловы XVI ст.: нажы (1, 5); дзвярныя клямкі (3, 7) і ручка (4); дэкаратыўны цвік (8); аконная завеса (9); абутковая падкоўка (6); акладкі аконных шыбак (10); 1 – 9 – жалеза; 10 – свінец; раскопкі Д.У. Дука

Трохзубыя відэльцы з’явіліся на Беларусі даволі позна – у XVIII ст. (Археалогія Беларусі, 2000. С. 269). Гэтым часам датуецца адзіная

знаходка з раскопак у Полацку (мал. 56: 29). Зроблены відэлец з жалеза, паміж развілкай і ручкай ёсць прафіляваная шыйка, зубцы гранёныя і дасягаюць у даўжыню 5 см. Дзяржанне відэльца мела касцяныя тронкі.



Малюнак 56 – Вырабы з жалеза XVI – XVIII стст.:
цвікі (1 – 8, 10 – 15); шыла (9); абутковыя падкоўкі (16 – 22);
шпора (23); конскія падковы (24 – 27); дзвярная завеса (28); відэлец (29);
1 – 15 – раскопкі Д.У. Дука; 16 – 27 – А.Р. Мітрафанава; 28 – Н.І. Здановіч

Асобную групу знаходак прадстаўляюць ключы і замкі, якія бытавалі ў эпоху позняга Сярэднявечча і ранняга Новага часу. У пачатку XV ст. мя-

няецца форма традыцыйнага навяснога замка, які захаваў прынцып спружыннага механізма, але набыў разнастайную форму корпуса; такія замкі атрымалі назву снічных і бытавалі на працягу XV – XVII стст. (Заяц, 1993. С. 111).

Да снічных замкоў тыпу “Е” па класіфікацыі Б.А. Колчына належаць два ключы, знойдзеныя на Вялікім пасадзе (гл. мал. 54: 1 – 2). Такія замкі мелі трохвугольны корпус і ўжываліся ў XV – XVI стст. (Колчин, 1982. С. 160).

У пластах XIV – XVI стст. знойдзены цыліндрычны замок (гл. мал. 54: 6), падобны на тып “Ж” па наўгародскай класіфікацыі (Колчин, 1982. С. 161). Гэта тып спружыннага замка з паваротным ключом, але ў гэтых замках ключ выконваў тую ж функцыю, што і ў больш старажытных формах: сціскаў лопасцямі спружыны дужкі.

З XVI ст. з’яўляюцца замкі, падобныя па канструкцыі і знешняму выгляду на сучасныя (мал. 57: 7). Яны маюць дужку, якая трывала замацавана з аднаго боку і магла свабодна адкідвацца. Форма карпусоў такіх замкоў вельмі разнастайная.



Малюнак 57 – Вырабы з жалеза XVI – XVIII стст.:
баявая сякера (1); лязо касы (2); вялікі путны замок (3);
матыка (4); акоўка рыдлёўкі (5); сякерка (6); навясны замок (7);
2 – 3 – раскопкі Г.М. Сагановіча; 4 – 5 – Н.І. Здановіч; 1, 6 – 7 – Д.У. Дука

Знойдзены ключыкі і гэтак званыя “рэпчатыя” замкі XVIII ст. (гл. мал. 54: 7; 58: 1; 59: 26, 28). Ключык ад “рэпчатага” замка мае простую форму трубкі з акруглай ажурнай галоўкай. Па знешняму выгляду і механізму дзеяння такі замок не адрозніваецца ад сучасных вырабаў.



Малюнак 58 – Вырабы з жалеза XVI – XVIII стст.:
замкі (1 – 2, 16); дзвярныя завесы (3 – 4, 18); спражкі (6, 19); цуглі (7 – 8);
падковы (9 – 14); ключ (8); дзвярная клямка (10); тупік (12); піла (18);
дзвярная скаба (20); крукі (17, 24); лучнік? (5); абутковыя падкоўкі (13, 21 – 23);
раскопкі С.В. Тарасава



Малюнак 59 – Вырабы з жалеза XVI – XVIII стст.:
дзвярное кольца (1); дзвярныя ручкі (13–16), клямка дзвярная са скабой (2), кручкі (10 – 11, 20, 23), скобы (3, 5, 12, 22), зажым (18), дзвярная засаўка (25), аконная завеса (17), дзвярныя клямкі (4, 8, 21) і язычкі (7, 19, 21, 27), ключык (26), замок (28) і дэталь замка (9); раскопкі Д.У. Дука.

Вялікі путны замок стратыграфічна датаваны XVIII ст. (Сагановіч, спр. 975. С. 28). Замок па форме корпуса належыць да тыпу паўпрызматычных; адтуліна пад ключ зроблена ў пярэдняй сценцы замка. Гэтыя вырабы разам з “рэпчатымі”, прамавугольнымі і трохвугольнымі замкамі з’яўляюцца асноўнымі формамі на працягу XVI – XVIII стст. Бліжэйшыя аналагі полацкім замкам знойдзены ў сінхронных па часу напластаваннях Ніжняга замка Віцебска (Бубенько, 2002. Рис. 2).

Абутковыя падкоўкі і іх фрагменты сустракаюцца вельмі часта (у сярэднім па адзінке на кожныя 4 кв. м напластаванняў XVII – XVIII стст.). Абутковыя падкоўкі на Беларусі не ўжываліся да канца XV ст., яны з'явіліся разам з распаўсюджваннем абутку на цвёрдай аснове з абцасам (Саганович, 1988. С. 98 – 99). Самыя раннія падкоўкі (г. зв. "уразныя") высокія, з пласцінчатай асновай, яны мацаваліся пры дапамозе шыпоў, якія абгіналі абцас з бакоў такім чынам, што іх ніжні край знаходзіўся трохі ніжэй абцаса; такія падкоўкі дадаткова прымацоўвалі скураныя пласцінкі да падэшвы (мал. 60: 3 – 10).



Малюнак 60 – Абутковыя падкоўкі XVI – XVIII стст.;
раскопкі С.В. Тарасава

Раннія падкоўкі ўжываліся з канца XV на працягу XVI ст. і мелі вышыню каля 2 – 3 см (Дук, спр. 1921. Мал. 30: 8; Здановіч, Краўцэвіч, Трусаў, 1994. С. 66; Саганович, 1988. С. 99). У напластаваннях гэтага часу знойдзены 2 плоскія падкоўкі (мал. 39: 12; 55: 6), яны маюць тры невысокіх шыпа і, магчыма, з'яўляюцца прывазнымі.

Другі тып падковак – дугападобныя шыпавыя з квадратнай у сячэнні асновай, яны шырока сустракаюцца ў Полацку ў культурных пластах канца XVI – XVII стст. (гл. мал. 60: 1 – 2, 11 – 13, 18 – 20, 22 – 23) (Здановіч, 1998. С. 129 – 130). Сярод гэтай групы падковак вылучым набойку на жаночы абцас, якая мацавалася пры дапамозе шыпа (Дук, спр. 1921. Мал. 30: 10).

Асобна вылучаюцца камбінаваныя падкоўкі (Векслер, Лихтер, Осипов, 1997. С. 116). Падкоўкі гэтага тыпу маюць шып, але па знешняму выгляду

яны падобныя да плоскіх набіўных падковак (гл. мал. 58: 13; 60: 14). У канцы XVII – пачатку XVIII ст. распаўсюджваюцца падкоўкі з мацаваннем пры дапамозе цвікоў – гэтак званыя набіўныя, якія ўжываюцца разам з камбінаванымі падкоўкамі (Векслер, Лихтер, Осипов, 1997. С. 116; Саганович, 1988. С. 101).

Да прадметаў асвятлення належаць металічныя лучнікі самых разнастайных памераў і формаў. Лучнікі звычайна ўяўлялі сабой брусок жалеза, які заканчваўся двума, чатырма ці шасцю зажымамі для лучыны. Лучнік убіваўся ў драўляны чурбак ці падстаўку вертыкальна так, што лучына, якая ўстаўлялася ў яго, знаходзілася ў гарызантальным становішчы. Лучнікі з шасцю зажымамі з'яўляюцца ў XVI ст. і бытуюць да XVIII ст. (Лобанов, 1991. С. 119 – 120); акрамя утылітарнага значэння (хатняе асвятленне), яны мелі дэкаратыўны характар. Дэкаратыўныя лучнікі (гл. мал. 54: 20 – 22; 61: 4) былі знойдзены ў Полацку ў пластах канца XVI – XVII ст.; адзін – у пабудове першай паловы XVI ст. (Дук, Тарасаў, спр. 1880. С. 9). Працягвалі выкарыстоўвацца і больш простыя лучнікі з чатырма і двума зажымамі (гл. мал. 54: 21); па форме і памерах яны не адрозніваліся ад вядомых лучнікаў суседніх тэрыторый.



Малюнак 61 – Вырабы з жалеза XVI – XVIII стст.:
крук для падвешвання ліхтара (1); касцельны свяцільнік (2);
лучнік (4) і вырабы невядомага прызначэння (3, 5 – 7); раскопкі Д.У. Дука

Да рэдкага тыпу асвятляльных прыбораў належыць удасканалены ўзор аднаражковага лучніка (мал. 62: 1). На металічным стрыжні ўмацавана засовачная планка з трымальнікам для лучыны, якая ў залежнасці ад патрэбы магла паварочвацца на 180°.



Малюнак 62 – Вырабы з жалеза XVI – XVIII стст.:
лучнік (1); абутковая падкоўка (2, 9 – 10); нажніцы (8); нажніцы для рэзкі па металу (3); уток дзіды (5); спражка (4); разец (6); слясарны інструмент для адладкі зуб'яў пілы (7); раскопкі А.Р. Мітрафанава

Трымальнікі для лампадак, аналагічныя полацкім (гл. мал. 61: 2: 5), знойдзены пры даследаванні Віленскага княжацкага замка (Vilniaus žemutinės pilies rūmai (1988 metų tyrimai), 1989. S. 111). У Полацку трымальнікі для лампадак выкарыстоўваліся для асвятлення каталіцкіх кляштараў (знаходкі

на Верхнім замку каля Сафійскага сабора) і будынкаў езуіцкага калегіума XVII ст., на Вялікім пасадзе яны знойдзены разам з крукамі (гл. мал. 61: 1) для падвешвання ліхтара на скляпеннях памяшканняў (Vilniaus žemutinės pilies rūmai (1988 metų tyrimai), 1989. Il. 63).

Скабяныя вырабы прадстаўлены завесамі, дзвярнымі скобамі, дзвярнымі язычкамі, цвікамі і інш. (гл. мал. 54; 58; 59). Вельмі рэдкімі знаходкамі з'яўляюцца свінцовыя аправы ад ваконных шыбак (гл. мал. 55: 10). Такія аправы былі знойдзены ў пабудове першай паловы XVI ст., адна з іх – у пласце XVII ст. (раскопкі 2002 года на Вялікім пасадзе). Шырыня свінцовых апраў была стандартнай (0,5 – 0,6 см), шыбкі ўстаўляліся ў свінцовы ліст з двух бакоў на глыбіню да 0,2 см і зажымаліся яго краямі. Высветлена, што памеры шыбак не перавышалі 10 см.

Цвікі не з'яўляюцца датуючым матэрыялам па прычыне таго, што іх форма на працягу стагоддзяў засталася амаль нязменнай (Саганович, 1988. С. 112). Дэкаратыўныя цвікі з гранёным навершшам, з акруглай і прадаўгаватай галоўкай дыяметрам да 2 см знойдзены ў пластах XVI – XVIII стст. (мал. 63: 19; гл. 56: 2 – 4, 14 – 15).



Малюнак 63 – Вырабы з жалеза XVI – XVIII стст.:
напільнік (3); хірургічны нож (скальпель) (2); нажніцы (11); зубіла (12);
шылы (1, 10, 15, 18); долаты (4 – 8, 14, 17); выраб невядомага прызначэння (9);
накавальня (16) дэкаратыўны цвік (19); стамескі (13, 20); раскопкі Д.У. Дука

У XIX ст. масава распаўсюджваюцца вінты і заклёпкі правільнай формы і стандартных прапорцый (гл. мал. 56: 12 – 13).

Для цвікоў XVII – XVIII стст. характэрна квадратная па форме галоўка з плаўным пераходам да стрыжня (гл. мал. 56: 5). Знойдзены таксама доўгія цвікі з плоскай, навісаючай з двух бакоў выцягнутай галоўкай (гл. мал. 56: 6, 8, 11). Кастылепадобныя цвікі (гл. мал. 56: 1) прызначаліся для абіўкі кроўлі, завесаў, варот, яны вядомы з XVI ст. (Саганович, 1988. С. 114). Цвікі-“падкавякі” маюць клінападобны чатырохгранны стрыжань, які плаўна пераходзіць у пірамідальную шляпку (гл. мал. 56: 6,7).

Асобнай катэгорыяй рэчаў прадстаўлены металічныя зажымы, скобы, дужкі ад вёдзер, жалезныя размеркавальнікі, крэсівы (гл. мал. 54). Для апошніх характэрнай формай у XVI – XVIII стст. з’яўляецца авал (мал. 64: 7).



Малюнак 64 – Вырабы з металу XVI – XVIII стст.:
рыбалоўны кручок (1); блясна (2); павадок (3); краты (5); крэсіва (7); дрот (8); дзвярная завеса (9); размеркавальнік (11); варган (10); уток дзіды з дрэўкам (12); ланцуг (13); мерніца парахаўніцы (14); выраб невядомага прызначэння (6); 1 – 5, 7 – 13 – жалеза; 6 – свінец; 14 – каляровы метал; раскопкі Д.У. Дука

Да вельмі рэдкіх вырабаў трэба аднесці маленькую сякерку – дакладную копію вялікай баявой сякеры, магчыма, зробленую як абярог ці як цацка (гл. мал. 57: 6). Верагодна, тыпалагічна і функцыянальна падобная на яе з'яўляецца арнаментаваная касцяная сякерка з раскопу А.Р. Мітрафанава (мал. 39: 7). Металічныя сякеркі-абярогі былі шырока вядомы ва Усходняй, Паўночнай і Цэнтральнай Еўропе ў Сярэднявеччы і, на думку большасці даследчыкаў, адлюстроўвалі культ Тора ці Перуна (Panasiewicz, Wołoszyn, 2002. S. 261 – 265). Полацкая сякерка знойдзена ў пабудове першай паловы XVI ст., і застаецца толькі канстатаваць факт распаўсюджвання рэліктаў паганскіх вераванняў у асяроддзі палачан XVI ст. Не выключана, аднак, што сякера магла выкарыстоўвацца ў цяслярскай справе.

Сякерка выканана вельмі старанна – каваль імкнуўся перадаць нават дробныя дэталі, і калі ўлічыць памеры выраба, то становіцца зразумелым, што ўвесь працэс быў надзвычай працаёмкі і вырабляць сякерку ў якасці дзіцячай цацкі было абсалютна не мэтазгодна, больш таго, карыстацца такой цацкай было б проста небяспечна.

Такім чынам, калекцыя побытавых металічных рэчаў характарызуе асноўныя аспекты жыццядзейнасці палачан. Большасць артэфактаў з'яўляецца тыповай для матэрыяльнай культуры насельніцтва беларускіх земляў XVI – XVIII стст. Асобныя вырабы (нажы, скабяныя вырабы, мініяцюрная сякерка і інш.) дазволілі значна пашырыць уяўленні пра асартымент кавальскай прадукцыі і ўдакладніць час бытавання асобных рэчаў.

5.1.2. Інструменты вытворчасці

Металічныя прылады працы прадстаўлены шырокім спектрам вырабаў, традыцыйных для гарадской матэрыяльнай культуры ранняга Новага часу.

Масіўнае зубіла (гл. мал. 63: 12), цэльнаметалічныя стамескі з абухом і долаты розных памераў і формаў знойдзены ў пластах XVI – XVII стст. (гл. мал. 63).

Жалезны свердзел з пятлёй на адным баку і свярдзёлкам на другім стратыграфічна датуецца XV – XVI стст. (гл. мал. 54: 23). Свердзел мае прамавугольны ў сячэнні стрыжань і спіраль у два абароты. На Беларусі такія вырабы вядомы з XI ст. (Археалогія Беларусі, 2001. С. 263). Адметнай формы малаточак XV – XVI стст. (гл. мал. 54: 30) знойдзены ў I будаўнічым гарызонце на Вялікім пасадзе (раскопкі С.В. Тарасава ў 1987 годзе), ён пласцінападобны, плоскі з аднаго боку і клінападобны з другога.

Вельмі рэдкімі знаходкамі з'яўляюцца жалезныя кавадлы, стратыграфічна датаваныя XVII ст. Першая кавадла аднарогая і добра апрацаваная (гл. мал. 54: 37), такія кавадлы выкарыстоўваліся выключна ў кавальскай справе. Другая кавадлачка авальнай формы магла паходзіць з ювелірнай

майстэрні (гл мал. 63: 16), яна выраблена з высакаякаснай сталі і пасярэдзіне мае прадольны выступ. Канструкцыя прадольнага выступа дазваляла, напрыклад, секчы дрот і адфармоўваць металічныя нарыхтоўкі.

Форма і памеры тупікаў (спецыяльных інструментаў для выдалення валосся са скуры) у XVII – XVIII стст. нічым не адрозніваліся ад аналагічных вырабаў XIII ст. (гл. мал. 53: 12; 58: 12) (Штыхов, 1975. С. 57).

Шыла даўжынёй 7,5 см мае петлепадобную галоўку (гл. мал. 56: 9) і шматгранны стрыжань. Формы гэтых прылад вызначаюцца стабільнасцю на працягу ўсяго Сярэднявечча. Па класіфікацыі Г.М. Сагановіча, шыла належыць да тыпу III (Археалогія Беларусі, 2001. С. 264). У гарбарнай справе выкарыстоўвалася спецыяльнае шыла даўжынёй 15 см з рамбавідным сячэннем вастрыя 0,5 × 0,5 см. Гэтае шыла мела драўлянае дзяржанне (гл. мал. 63: 1). Асобна прадстаўлены прамавугольныя і шматгранныя ў сячэнні шылы (мал. 63: 5, 7, 8,10).

Інструменты слесара і ювеліра ўтвараюць асобную групу знаходак. Адметнай формы напільнік стратыграфічна датуецца XVIII ст. Гэты напільнік мае плоскую рабочую частку з насечкамі ў выглядзе дыяганальных ліній і паўкруглую форму тыльнага боку палатна. Напільнік аснашчаны доўгай вузкай ручкай з лыжачкай на канцы (гл. мал. 63: 3).

Хірургічны інструмент – скальпель – па форме рабочай частцы імітуе нож (гл. мал. 63: 2), а па агульнаму выгляду падобны на вышэйпрадстаўлены напільнік. Такія скальпелі з доўгім вузкім дзяржаннем і шырокім лязом знойдзены на тэрыторыі Латвіі ў напластаваннях XVI – XVII стст. (Закурина, 1991. Рис. 136). Полацкі скальпель стратыграфічна датуецца XVIII ст., што не выключае яго больш ранняе паходжанне.

Шырокалязовая сякера з плоскім абухом (мал. 65: 4) рэпрэзентуе ўзор цяжкіх вытворчых прылад працы, прызначаных для працаёмкіх і грубых аперацый (тып IV па класіфікацыі Г.М. Сагановіча) (Археалогія Беларусі, 2001. С. 262 – 263). Такая форма сякер стала дамінантнай у XVIII ст. і з’яўляецца прататыпам сучасных рабочых сякер.

Нешматлікай групай знаходак прадстаўлены фрагменты палотнаў пілы (гл. мал. 54: 29; 58: 15), што сведчыць аб выкарыстанні гэтага інструмента ў цяслярскай справе.

Разец з рамбавіднай лыжкай мае на канцы незапаянае вушка-пятлю для падвешвання на пояс (гл. мал. 62: 6) і стратыграфічна датуецца XVI – XVII стст.

Асобна вылучаюцца нажніцы для рэзкі металу (гл. мал. 62: 3), металічны прадмет для адладкі зуб’яў пілы (гл. мал. 62: 7), шарнірныя (гл. мал. 54: 27, 28; 62: 8; 63: 11) і спружынныя нажніцы (Здановіч, спр. 1373. Ліст 25: 8). Уся група вырабаў стратыграфічна датуецца XVI – XVII стст.



Малюнак 65 – Прадметы ўзбраення і гаспадарчыя прылады XVI – XVIII стст.: баявая сякера (1); шпага (2); універсальна-гаспадарчыя сякеры (3 – 4); 1, 3 – 4 – жалеза; 2 – жалеза, каляровы метал; раскопкі Д.У. Дука

Знойдзены ў пластах XVI – XVIII стст. і традыцыйныя сельскагаспадарчыя прылады працы: лязо касы шырынёй 4,5 см; акоўкі ад рыдлёўкі; матыка (гл. мал. 57: 2, 4, 5).

Рыбалоўныя прылады прадстаўлены традыцыйным наборам – гэта кручкі, блешні і металічны павадок для лоўлі вялікай рыбы (гл. мал. 64: 1 – 3).

Не выключана позняе паходжанне рэдкага музычнага інструмента – варгана (гл. мал. 64: 10), які быў знойдзены ў перамешаным пласце XVII – XIX стст. Індывідуальнай формы выраб са свінца (гл. мал. 64: 6), па ўсёй верагоднасці, выкарыстоўваўся ў гаспадарчых мэтах як рабочы інструмент.

Знойдзеныя ў Полацку інструменты вытворчасці сведчаць аб высокім узроўні развіцця рамесніцтва XVI – XVIII стст. і яго шматгаліновым

характары, што адлюстравана ў разнастайнасці тыпаў прадметаў. Многія рэчы захавалі традыцыйны для папярэдніх стагоддзяў выгляд, аднак большасць набылі прынцыпова новую канструкцыю, што набліжае асобныя групы артэфактаў да сучаснасці.

5.1.3. Рыштунак вершніка і каня

У вялікай колькасці знойдзены прадметы рыштунку каня, у тым ліку падпружныя спражкі, цвікі-“падкавякі”, шпоры і конскія падковы.

Тып шпоры, што паходзіць з раскопу А.Р. Мітрафанава на Верхнім замку (гл. мал. 39: 6), з’явіўся ў XV ст. Такія шпоры мелі выцягнутыя дужкі з шыйкай, якая мела характэрныя патаўшчэнні ці паяскі і выгнуты шып (Бохан, 2002. С. 225 – 226). Дужка шпоры “V”-падобная, зробленая з жалезнага стрыжня, які мае форму паўкруга ў сячэнні. Яе плечукі прамыя, канцы маюць акруглыя петлі з адтулінамі. Ад дужкі адыходзіць прамая шыйка, якая завяршаецца патаўшчэннем у форме колца і пераходзіць у вілку, адагнутую ўніз пад вуглом 20º, у ёй маецца разрэз для зубчатага колца-рапейкі, дыяметрам 1 – 1,5 см. Агульная даўжыня шпоры – 9,5 см; даўжыня шыйкі – 1 см; вілкі – 2 см; шырыня дужкі – 10 см. Усе пазначаныя характарыстыкі цалкам адпавядаюць шпоры, знойдзенай падчас раскопак Крэўскага замка, якая датуецца першай паловай XVI ст. (Сагановіч, 1993. С. 96).

Шып шпоры, знойдзенай на тэрыторыі Вялікага пасада ў 1987 годзе (раскопкі С.В. Тарасава), зроблены ў выглядзе простага стрыжня чатырохвугольнага сячэння, скіраванага пад нязначным вуглом уніз. Даўжыня шыпа складае 3,2 см, шырыня дужкі – 1,2 см (гл. мал. 54: 36). Падобныя шпоры ў ВКЛ бытавалі ў XV – XVI стст. (Бохан, 2002. С. 225 – 226).

Да ліку шпор XVIII ст. належыць экзэмпляр, які знойдзены ў культурным пласце гэтай пары. Шпора мае невялікія памеры: даўжыня шыпа – 4,5 см; агульная даўжыня выраба – 12 см. Шып аснашчаны калёсікам дыяметрам 2 см; шырыня дужак таксама нязначная – 0,7 см; дужкі ў сячэнні паўкруглай формы (мал. 66: 2). У Магілёве падобныя шпоры стратыграфічна датаваныя XVIII ст., што адпавядае стратыграфічнаму датаванню полацкай знаходкі (Марзалюк, 1998. Мал. 53: 13 – 14).

Страмёны знойдзены ў пластах канца XVIII – XIX ст.: адно з іх уяўляе сабой простую дужку з палоскі металу (гл. мал. 66: 1); другое стрэмя – больш складанае, дугападобнай формы з вушкам для падвешвання ў верхняй частцы дугі і акруглымі адтулінамі па канцах (гл. мал. 66: 3).



Малюнак 66 – Вырабы з жалеза XVI – XVIII стст.:
страмёны (1, 3); шпора (2); спражкі (5 – 10, 12); цуглі (11, 13);
дэталі конскай вупражы (4, 14 – 16); раскопкі Д.У. Дука

Падковы XVI – XVIII стст. полацкай калекцыі прадстаўлены чатырма асноўнымі тыпамі. Першы – гэта падковы, якія маюць шырокую (да 4 см) верхнюю частку дугі са шчытком, па канцам падкоў ёсць выступ вышынёй да 1 см (гл. мал. 56: 25). Памеры падкоў 11 × 10,5 см. Знойдзена 3 адзінкі; датуюцца падковы падобнага тыпу XV – XVI стст. (Соболь, 1988. С. 127).

Другі тып падкоў (гл. мал. 56: 26 – 27) мае памеры 12 × 10 см і пазбаўлены шчытка ў верхняй частцы дугі (знойдзена 5 адзінак.). Уздоўж дугі гэтых падкоў праходзіць раўчук з адтулінамі для цвікоў. Датуюцца вырабы XVI – XVIII стст. (Соболь, 1988. С. 127), але найбольш раннімі

лічацца падковы з шырокім цэнтрам дугі (XVI – першая палова XVII ст.) (Археалогія Беларусі, 2000. С. 272).

Трэці тып падкоў (1 экз.) пазбаўлены шчыткоў і выступаў (гл. мал. 56: 24). Аналагаў гэтаму тыпу падкоў не знойдзена.

Падковы чацвёртага тыпу даволі рэдкія, на тэрыторыі Беларускага Падзвіння яны знойдзены ў Віцебску (Левко, 1984. Рис. 28). Мяркуецца, што гэта найбольш ранні тып падкоў, які існаваў на беларускіх землях (Археалогія Беларусі, 2001. С. 271 – 272) (гл. мал. 39: 13). Такія падковы былі зроблены ў выглядзе паўкруга з адным пярэднім шыпам і чатырма адтулінамі для цвікоў, храналогія бытавання падкоў гэтага тыпу на Беларусі не распрацавана (Археалогія Беларусі, 2001. С. 271). Полацкая падкова знойдзена на Верхнім замку ў моцна пашкоджаных пластах XIV – XVI стст.

Цуглі і фрагменты рыштунку верхавога каня па форме і прызначэнню былі тыповыя для свайго часу і маюць шмат агульнага з падобнай катэгорыяй знаходак іншых рэгіёнаў Беларусі (гл. мал. 66).

Распаўсюджанай катэгорыяй знаходак з'яўляюцца падпружныя спражкі (гл. мал. 62: 4; 66: 5 – 10, 12). За час раскопаў у 2001 – 2003 гадах на тэрыторыі Вялікага пасада было знойдзена каля 27 спражак і іх фрагментаў. Частка спражак магла выкарыстоўвацца і ў якасці дэталяў адзення (Никитин, 1971. С. 42). Да ліку апошніх адносяцца спражкі індывідуальнай работы з рухомым стрыжнем (гл. мал. 66: 9, 12), якія маюць больш далікатную апрацоўку і шырока вядомы ў XVI – XVIII стст. на тэрыторыі ВКЛ і Маскоўскай дзяржавы (Заяц, 1995. С. 66; Никитин, 1971. С. 42).

Падчас рэстаўрацыйных работ у двары былой брацкай школы быў знойдзены нагруднік ад конскай вупражы. На скураным рамяні 0,8 × 0,1 × 51 см нанізаны дзесяць гузікаў сегментападобнай формы праз інтэрвал 5 – 7 см (Фонды НПГКМЗ. Кдф-3-980/15). Гузікі дыяметрам 3,2 см зроблены з бронзы і маюць прыкляпанае вушка-пяцельку вышынёй 1,5 см; унутры сегментападобнай часткі гузіка, вакол вушка, захавалася скураная высцілка. Гузікі вельмі падобныя да элементаў амуніцыі рускай арміі і папярэдне могуць датаваць выраб канцом XVIII – пачаткам XIX ст.

5.1.4. Зброя

Гісторыя Полацка неразрыўна звязана з канфліктамі і войнамі, якія былі абумоўлены як геапалітычным размяшчэннем горада, так і яго важным палітычным і эканамічным значэннем. Па гэтай прычыне мілітарыстычныя рэчы сустракаюцца падчас археалагічных раскопак у Полацку. Аднак у цэлым археалагічныя крыніцы па катэгорыі ўзбраення вельмі абмежаваныя. Такога роду прадметы ва ўсе часы з'яўляліся аб'ектам пільнай увагі, гэта тычылася нават пашкоджаных рэчаў. Так, інвентар полацкага

Верхняга замка за 1664 год складаецца з некалькіх старонак вопісаў пераважна зброі. Сярод зброі неаднаразова згадваюцца “стволы карабинные”, “шпаги”, “мушкеты”, “бердыши”, “карабины”, “пистоли”, “пищали”, “топорки”, “чеканы”, “сабли”, “палаши”, “ядра”, “пули”, “пушки медные”, “заряды дроби”, “порох”, “пульки литые”. Падрабязна пазначаецца, напрыклад, што кулі захоўваліся ў “дву бочкахъ, по весу съ бочками и съ рогожами и съ веревками 32 пуда съ полупудомъ” (Витебская старина, 1885. Ч. 2. С. 203 – 204). Прадметы ўзбраення калі і траплялі ў зямлю, дык гэта здаралася ў выключных выпадках і, як правіла, з невялікімі па памерах рэчамі. У інвенатары старанна апісваецца нават сапсаваная зброя, што сведчыць пра яе падрабязны ўлік.

Па свайму характару археалагічныя крыніцы падзяляюцца на ўласна артэфакты (прадметы ўзбраення) і рэчы з мілітарыстычнымі выявамі. Да ліку апошніх, выяўленых падчас археалагічных раскопак, належыць кафля XVI – XVII стст. з выявамі рыцараў (Дук, 2001 в. С. 48 – 49; Дук, 2001 ж. С. 168).

Рэчы, якія аднесены да катэгорыі ўзбраення, прадстаўлены мячом (клінковая зброя), трыма рыцарскімі сякерамі (абуховая зброя), шпагай, нажом (колюча-сякучая зброя), ядрамі, мушкетнымі кулямі (агнястрэльная зброя) і ўтокамі коп’яў.

Сякера, знойдзеная ў Запалоцці, з’яўляецца унікальным відам абуховай зброі (гл. мал. 65: 1). Згодна з класіфікацыяй М. Глосэка (M. Glosek) сякера найбольш блізкая да тыпу XIII. Яна мае шырокае палатно з двума сіметрычна закруглёнымі носікамі і авальнае лязо, вузкая правушына клінападобнай формы плаўна пераходзіць у высокую шыйку (Glosek, 1996. S. 53). Шыйка сякеры таксама мае два сіметрычна размешчаных бакавых выступы ў форме трохвугольніка. Вышыня жалезкі складае 18 см; шырыня ляза – 15 см.

Падобны тып сякер быў распаўсюджаны ў Цэнтральнай, Заходняй і Паўночнай Еўропе (Польшча, Англія, Скандынавія), дзе яны датуюцца XIII – XV стст. (Glosek, 1996. S. 53). Іканаграфічныя крыніцы з розных частак акрэсленага абшару прэзентуюць гэты тып сякер у батальных сцэнах канца XV ст., напрыклад, аблога Мальбарка 1460 года (абраз 1481 – 1488 гг.) (Glosek, 1996. S. 53) ці алтарная выява касцёла Найсвятлейшай Дзевы Марыі 1477 – 1489 гадоў (Uzbrojenie w Polsce średniowiecznej 1350 – 1450, 1990. S. 523). Адрозненне полацкай сякеры перш за ўсё ў большай вышыні тапарыскі – яна амаль роўная шырыні ляза (адпаведна 13 і 15 см), што надае вырабу ўзнёсласць і змяняе прысадзістасць, характэрную для цэнтральнаеўрапейскіх сякер, на выцягнутыя ў плане прапорцыі. У Полацку сякера магла ўжывацца з канца XV па сярэдзіну XVI ст. (Дук, 2003 б. С. 119).

Наступны тып сякер шырока вядомы ў Польшчы, Чэхіі, Літве, Швецыі (Glosek, 1996. S. 42 – 43, tabl. IV: Ixa). Гэтыя сякеры ўжываліся ад XIV да XVII ст. і, па меркаванню некаторых даследчыкаў (Археалогія Беларусі, 2001. С. 280; Glosek, 1996. S. 43), належылі да універсальна-гаспадарчага тыпу, але адначасова маглі выкарыстоўвацца і як грозная зброя (гл. мал. 65: 3). Вывучэнне полацкай сякеры дазваляе зрабіць выснову, што яна была зроблена менавіта ў якасці зброі (Дук, 2003 б. С. 119 – 120).

У фондах НПГКМЗ захоўваецца сякера, якая мае шырыню ляза менш паловы агульнай даўжыні (Фонды НПГКМЗ. Кдф-3-1340). Вонкавая грань корпуса сякеры блізкая да прамой, абух плоскі ў верхняй частцы. Такія вырабы бяруць пачатак з XII – XIII стст., аднак такі тып абуха пачынае ўжывацца не раней XV – XVI стст. (Археалогія Беларусі, 2001. С. 262). Памеры сякеры: даўжыня 19 см; шырыня ляза 9 см; шырыня абуха 4,5 см (гл. мал. 57: 1). Па лязу сякеры праглядаецца гравіроўка ў выглядзе чатырох трохвугольных зубцоў, якія размешчаны ўздоўж паласы, паралельна верхняй грані. Функцыянальна не выключана баявое прызначэнне сякеры (Glosek, 1996. S. 40).

З прадметаў узбраення ўсходняга (маскоўскага) паходжання трэба адзначыць стралецкую сякеру-бярдыш XVI – XVII стст. у выглядзе паўмесяца з моцна адцягнутым уніз краем, лязом-каскай і з абухом трохвугольнага сячэння. Памеры бердыша 50 × 13,5 × 2,2 см (Фонды НПГКМЗ. Кп-14-10407).

Да выключна рэдкіх знаходак можна аднесці шпагу (рапіру), знойдзеную падчас нагляду за пракладкай траншэі пад дрэнаж на Верхнім замку ў 2001 годзе (гл. мал. 65: 2) (Дук, 2003 б. С. 120 – 121). Захаваўся эфес з пятой ад клінка. Шпага мае выгнутую крыжавіну, шырынёй каля 9,5 см, якая пераходзіць у ахоўную дужку з адным захаваным крукам (служыў для абароны пальцаў); плоскі клінок, які не захаваўся і ад якога засталася толькі чатырохгранная, прамавугольная ў плане пята (0,6 × 1 см у сячэнні). Традыцыйна пятка знаходзілася знутры гарды і не мела заточкі (Бехайм, 1995. С. 318). Дзяржанне цэльнаметалічнае, авальнае ў плане з паўсферычным выступам на канцы, з двума вострымі гранямі і двума прадольнымі рыфлёнымі палоскамі, яго даўжыня 7 см пры максімальнай шырыні 3,5 см.

Нашэнне шпагі стала звычайным у паўднёваеўрапейскай пяхоце пасля 1560 года (Бехайм, 1995. С. 214). Нягледзячы на асобыя віды практычнага выкарыстання, шпага, у рэшце, стала дварцовым атрыбутам і паступова ў гэтай якасці згубіла сваё значэнне як зброя – яна стала знакам прыналежнасці да вышэйшага стану (Бехайм, 1995. С. 214).

Полацкая шпага найбольш падобная тыпу IX па класіфікацыі В. Бехайма. Падобная форма клінка з’явілася ў Мілане, самы знакаміты

клінок – гэта шпага Карла V з нанесеным календаром 1530 года (Бехайм, 1995. С. 212). Па аналогіі з заходнееўрапейскімі клінкамі полацкую знаходку можна датаваць сярэдзінай XVI – пачаткам XVII ст. Найбольш верагодна, што полацкая шпага з'яўляецца баявой, на карысць гэтага ўказвае адсутнасць дэкарацый, што характэрна менавіта для баявога тыпу рапір.

Шпага знойдзена ў заходняй частцы Верхняга замка, якая непасрэдна прымыкала да старажытных замкавых умацаванняў. Паходжанне шпагі цяжка высветліць, магчыма дапусціць, што яна звязана з паходам Стэфана Баторыя 1579 года, у выніку якога былі штурмам узяты ўмацаванні Верхняга замка. У выправе, акрамя апалчэння ВКЛ, прымалі ўдзел польскія, нямецкія і угорскія палкі. І немцы, і угры маглі мець непасрэднае дачыненне да полацкай знаходкі, бо на тэрыторыі Германіі і Угоршчыны знаходзіліся самыя вядомыя майстэрні па вытворчасці рапір (Żygulski, 1982. S. 156).

Не выключана, што пэўная частка шпаг і сабель выраблялася ці, прынамсі, рамантавалася ў сярэдзіне XVII ст. на месцы, пра што сведчыць існаванне ў Полацку болдыша[5] Сямёна Іванавіча Палубеса (Актавая кніга полацкага магістрата 1650 года, 2006. С. 62 – 63).

Баявы нож стратыграфічна датаваны XVI – XVII стст. (гл. мал. 53: 20). Нож захаваўся на даўжыню 16 см; клінок роўны 13 – 13,5 см; чаранок абламаны; таўшчыня спінкі нажа – 0,35 см пры максімальнай шырыні 2,2 см. Уздоўж спінкі па бакавой грані нажа зроблены спецыяльны раўчук (дол), што з'яўляецца надзейным індыкатарам функцыянальнага прызначэння рэчы (Археалогія Беларусі, 2001. С. 279). Можна меркаваць, што нож меў драўлянае дзяржанне (захаваліся драўляныя валокны) і прызначаўся для нанясення колючых удараў.

Шырокае ўжыванне клінковай наступальнай зброі ў ВКЛ пацвярджае знаходка так званага колючага мяча каля вёсак Боркавічы і Гараўцы Верхнядзвінскага раёна Віцебскай вобласці. Меч датуецца XV – пачаткам XVI ст. і паходзіць з полацкай акругі (Бохан, 2003. С. 28 – 31). Мячы падобнага тыпу былі найбольш характэрны для цэнтральнаеўрапейскага рэгіёну і пакуль што ў адзінкавых выпадках знойдзены на тэрыторыі Беларусі (Бохан, 2003. С. 31).

З прадметаў дрэўковай зброі ў асобную групу можна аднесці ўтокі коп'яў. Усе ўтокі ўтульчатыя, адзін з іх масіўны, мае даўжыню 30 см і дыяметр утулкі – 5 см, стрыжань квадратны ў сячэнні (1 × 1 см) (мал. 62: 5). Па віцебскіх матэрыялах падобны ўток датуецца XV ст. (Русецкий, Русецкий, 2001. С. 110). Два фрагменты ўтока ад дзідаў (адзін з дрэўкам)

[5] Рамеснік, які спецыялізаваўся на вырабе болдзіц-эфесаў і рукаятак да халоднай зброі.

маюць дыяметр утулкі 4,5 см, абодва знойдзены ў пластах XVII ст. на Вялікім пасадзе (гл. мал. 64: 12).

У канцы XVI – XVIII ст. пашыраецца вытворчасць чыгунных і жалезных ядраў, выраб якіх патрабаваў ад каваля дакладнага валодання тэхналогіяй апрацоўкі металаў (Археалогія Беларусі, 2001. С. 286). Усяго ў Полацку знойдзена два дзесяткі металічных і каменных ядраў, якія можна аднесці да перыяду XVI – XVIII стст. Жалезныя і чыгунныя ядры маюць дыяметр ад 4,7 да 15 см; пераважная большасць з іх дыяметрам 5 – 5,5 см (табл. 5), такія ядры выкарыстоўваліся ў пішчалях і тарасніцах (калібр 40 – 100 мм) (Бохан, 2002. С. 183 – 184).

Табліца 5 – Каменныя і металічныя ядры XVI – XVIII стст.

Памеры (дыяметр, см)	Матэрыял, прызначэнне і датаванне	Паходжанне
22,5	Камень, гарматнае XIV – XVI стст.	1979 год, раскопкі Вал.А. Булкіна на Верхнім замку
20	Тое ж, XIV – XVI стст.	Там сама
25	“-“	“-“
15	Чыгун, гарматнае XVI ст.	“-“
12	Тое ж	“-“
7	“-“	“-“
5	“-“	“-“
5,5 (3 шт.)	“-“	1976 год, раскопкі Вал.А. Булкіна на Верхнім замку
6	Каменнае, гарматнае, XV – XVI стст.	1978 г. раскопкі Вал.А. Булкіна на Верхнім замку
4,7	Жалезнае, гарматнае XVI – XVIII стст.	1987 год, раскопкі С.В. Тарасава на Вялікім пасадзе
25	Каменнае, гарматнае XIV – XVI стст.	Верхні замак, выпадковая знаходка
5	Жалезнае, XVII ст.	1978 год, раскопкі Вал.А. Булкіна на Верхнім замку
3	Жалезнае, куля ад аркебузы	1978 год, раскопкі Вал.А. Булкіна на Верхнім замку
19,5	Каменнае, гарматнае XIV – XVI стст.	1986 год, раскопкі С.В. Тарасава ў Запалоцці
35	Каменнае, гарматнае, вага 66 кг, XIV – XVI стст.	Верхні замак, выпадковая знаходка
5,5	Жалезнае, гарматнае XVII ст.	2002 год, раскопкі Д.У. Дука на Вялікім пасадзе
	Каменнае, гарматнае (?) авальнай формы XIV – XVI стст.	2002 г. раскопкі Д.У. Дука на Вялікім пасадзе

Выявы агнястрэльнай зброі змяшчаліся на полацкай кафле канца XVI ст. Знойдзеныя артэфакты агнястрэльнага ўзбраення – гэта кулі дыяметрам ад 0,8 да 1,3 см (XVII ст.) і адна рэдкая знаходка – мерніца для пораха, якую насілі на поясе, прымацоўвалася спецыяльным шнурком ці ланцужком (гл. мал. 64: 14).

Такім чынам, прыведзеныя даныя аб прадметах узбраення XVI – XVII стст. сведчаць аб заходне-і цэнтральнаеўрапейскім паходжанні большасці з іх. Прамых аналогій некаторым знаходкам не выяўлена (баявы нож, рыцарскія сякеры). Пазначаныя рэчы вельмі рэдкія ў катэгорыі клінковага і абуховага ўзбраення – гэты факт дае падставы для папярэдняга заключэння аб магчымасці іх мясцовай вытворчасці. Што тычыцца шпагі XVI – пачатку XVII ст., то яе заходнееўрапейскае паходжанне не выклікае сумнення.

5.1.5. Ювелірныя рэчы

Вытворчасць рэчаў з каляровых металаў у Полацку, як і ў цэлым па Беларусі, у XVI – XVIII стст. працягвала актыўна развівацца, нягледзячы на адсутнасць мясцовай сыравіны. Сведчаннем гэтаму з'яўляецца, па-першае, асартымент ювелірных вырабаў, а па-другое, прылады для ювелірнай вытворчасці, знойдзеныя у культурных напластаваннях Полацка XVI – XVIII стст. У якасці красамоўнага прыкладу можна прывесці той факт, што з 19 знойдзеных тыгляў з усходняга раскопу на Верхнім замку 11 прыпадае на пласты XIV – XVII стст. (Штыхов, 1975. С. 64).

Згодна з даследаваннем Э.О. Максімавай (Максимова, 1987), развіццё полацкага ювелірнага мастацтва можна падзяліць на два этапы: першы – да сярэдзіны XVII ст., калі златарская справа развівалася на мясцовай глебе з традыцыйнай арыентацыяй на візантыйскае і старажытнарускае мастацтва, другі перыяд – пасля 1667 года, на якім вызначальную ролю адыгрывала сувязь полацкіх майстроў-златароў з буйнейшымі рамеснымі цэнтрамі Рэчы Паспалітай (Вільня, Познань) (Максимова, 1987. С. 34; Jasinski, 1971. Ryc. 44). Адносная нешматлікасць захаваных твораў ювелірнага мастацтва XVI – XVIII стст. тлумачыцца частымі войнамі, падчас якіх каштоўныя рэчы вывозіліся ў якасці ваенных трафеяў (Памяць: Гіст.-дакум. хроніка Полацка, 2002. С. 193 – 194). Вядома некалькі такіх артэфактаў, сярод якіх вылучаюцца крыж-рэлікварый і сярэбраная чарка з гербам Полацка (Пуцко, 1972. С. 210 – 218; Пуцко, 2000. С. 164 – 165). Звязаць з гэтымі рэчамі імёны выдатных полацкіх майстроў на сённяшні дзень не прадстаўляецца магчымым.

У 2005 годзе, падчас выратавальных раскопак на паўночна-ўсходняй ускраіне плошчы Свабоды, былі адкрыты сляды ювелірнай майстэрні першай паловы XVII ст. Уражвае асартымент вырабаў з бронзавага сплава, якія належылі да прадукцыі гэтай майстэрні. Усяго знойдзена 96 гатовых вырабаў і нарыхтовак. Фізічныя ўласцівасці сплава, з якога зроблены рэчы, вельмі цікавыя, паколькі за стагоддзі метал не страціў жоўтага бляску і візу-

альна вельмі падобны на золата (Дук, 2006 а. С. 15). Большасць вырабаў не кранута карозіяй, на некаторых нават адсутнічае паціна. Акрамя таго, металадэтэктары ніякім чынам не рэагуюць на гэты сплаў. Папярэдне вызначаны толькі хімічны склад металу – гэта бронзавы сплаў на аснове медзі з невялікімі дамешкамі серабра[6]. Усе рэчы мясцовай вытворчасці, аб чым сведчыць вялікая колькасць кавалкаў тыгляў (50 адзінак) і нарыхтовак (мал. 67).



Малюнак 67 – Бронзавыя вырабы з ювелірнай майстэрні XVII ст.: паўфабрыкаты і нарыхтоўкі (1 – 20); таварная пломба (21); раскопкі Д.У. Дука

[6] Хімічны аналіз праведзены ў лабараторыі кафедры хіміі Полацкага дзяржаўнага універсітэта.

Сярод вырабаў цэлых пус ейпі знойдзена 32 шт.; нарыхтовак (трубачкі, дрот, пляценне з дроту, пласцінкі) – 20 шт.; кручкоў ад кафтана – 5 адзінак, зашпілек з загнутай С-падобным навершшам – 2 шт., мініяцюрных іголачак – 2 шт.; іголак – 10 шт. (гл. мал. 67; мал. 68, 69).



Малюнак 68 – Вырабы з бронзы канца XVI – XVII стст.:
язычок засцежкі, кручкі-зашпількі ад верхняга адзення (2, 12, 14 – 15, 21);
напарстак (3); пус ейпі (4 – 11, 19 – 22); паўфабрыкаты (17 – 18); накладкі (13, 23, 28);
завушніцы (24 – 25); пранізка (26); капавушка (27); бранзалет (29);
кніжная накладка (30); засцежка (31); абразок-складзень (32); 1 – 30 – раскопкі
Д.У. Дука; 31 – з фондаў НПГКМЗ; 32 – раскопкі Г.М. Сагановіча



Малюнак 69 – Бронзавыя пус ейпі з ювелірнай майстэрні XVII ст.; раскопкі Д.У. Дука

Асобныя ювелірныя вырабы прадстаўлены язычком ад фібулы, бранзалетам, дзвюмя завушніцамі, вялікай шавецкай іглой, напарсткам, накладкай на рамень, капавушкай, спіралепадобнай пранізкай, круглай, ромбападобнай і фігурнай накладкамі, масіўнай зашпількай – пус ейпі (гл. мал. 68: 22), пломбай з выявай кляйма рамесніка або цэха злотнікаў (гл. мал. 67: 21). Пломба зроблена чаканкай, мае круглую форму дыяметрам 2,2 см. Выява размешчана ў полі дыяметрам 1,6 см, краі няроўныя, рваныя, метал вельмі тонкі. Пасярэдзіне зафіксаваны дзве круглыя адтуліны для падвешвання на ніць альбо дрот дыяметрам 1 мм на адлегласці адна ад адной 4 мм. На жаль, гэты адбітак захаваўся ў вельмі пашкоджаным выглядзе – ён быў згорнуты ў трубачку і пасля рэстаўрацыі магчыма ўпэўнена вызначыць толькі знак у выглядзе дзвюх люстрана размешчаных літар “В”.

Раней, у 1987 – 1988 гадах, побач з тэрыторыяй даследавання 2005 года, С.В. Тарасавым была адкрыта ювелірная майстэрня XII – XIII стст. Вельмі важна, што археалагічны матэрыял, атрыманы ў 2005 годзе, пацвярджае выснову аб высокім сацыяльным статусе жыхароў цэнтральнай часткі Вялікага пасада і той факт, што на паўночна-ўсходняй ускраіне сучаснай плошчы Свабоды традыцыйна сяліліся майстры-злотнікі як у XII – XIII стст., так і ў XVII стст.

Са шматгадовых археалагічных раскопак Полацка паходзіць шырокі спектр рэчаў ювелірнай вытворчасці, сярод якіх у XVI – XVIII стст., як і раней, ёсць рэчы хрысціянскага культу.

Абразок-складзень XVII ст. знойдзены падчас раскопак Г.М. Сагановіча каля былой брацкай школы. Абразок адліты з бронзы і ўяўляе сабой помнік дробнай пластыкі вельмі тонкага выканання (Сагановіч, спр. 975. Мал. 19 – 20). На абодвух яго баках змешчаны рэльефныя выявы: на пярэднім – Божая маці трымае на руках маленькага Ісуса, унізе ў правым і левым куце – выявы святых. Божая маці з дзіцём заключаны ў прамавугольную рамку, усё поле ў якой пакрыта блакітнай эмаллю, на ўсёй астатняй плошчы па-за рамкай эмаль мела зялёны ці шэраваты колер (гл. мал. 68: 32). Аналогіі гэтаму абразку пакуль не выяўлены.

Да прадметаў хрысціянскага культу належыць нацельны крыжык XVIII ст. Знойдзены выраб у двары былога езуіцкага калегіума і, верагодна, належыў прадстаўніку ордэна езуітаў. Падобна на тое, што крыжык мае іншаземнае паходжанне і зроблены пры дапамозе штампоўкі (мал. 70: 14). Ён утрымлівае на аверсе выяву ўскрыжавання і лацінскую абрэвіятуру на адваротным баку: “S*F*S*I*N” і “S*D*M* NOBIS”.



Малюнак 70 – Вырабы з каляровых металаў:
крыжы (1, 10, 14 – 16); кніжная накладка (2); засцежка (3); гузікі (4, 7 – 9, 18);
кольца (5); паясавая накладка (6); напарсткі (11 – 13); устаўка ў пярсцёнак (17);
1 – 9, 11 – 13 – раскопкі С.В. Тарасава; 15 – А.Р. Мітрафанава; 10, 14, 18 – Д.У. Дука;
16 – з прыватнай калекцыі С.Л. Міхейкі

Лацінскія нагрудныя крыжы (гл. мал. 70: 1, 10) знойдзены ў напластаваннях XVII – XVIII стст., першы знойдзены на тэрыторыі былога базыліянскага кляштара (раскопкі С.В. Тарасава, 1993 г.), другі – каля будынка езуіцкага калегіума (раскопкі аўтара, 2002 г.). Абодва крыжы зроблены з бронзы ў тэхніцы ліцця – спачатку асобна адліваліся крыж і фігурка Ісуса, пасля дзве палавінкі злучаліся разам.

Паверхня абодвух крыжоў багата дэкаравана: у верхняй частцы вертыкальнай бэлькі на таблічцы месціцца надпіс “INRI”. Тыпалагічна па-

добныя крыжы знойдзены ў Віцебску (царква Благавешчання) і Сандаміры (Collegium Gostomianum), яны датуюцца XVII ст. (Археалогія Беларусі, 2001. С. 245; Rostkowska, 1996. S. 409). Традыцыйна гэтая група прадметаў трактуецца як дэвацыянарыі, якія маглі трапіць у Полацк у выніку пілігрымак, але не выключана іх мясцовая вытворчасць (Rostkowska, 1996. S. 414).

Найпапулярнейшымі ў канцы XIV – XVI стст. былі крыжы-цельнікі гэтак званага "старыцкага" тыпу. Гэтая геаграфічная назва вельмі ўмоўная, паколькі каменныя формы для адліўкі падобных крыжоў знойдзены ў Ноўгарадзе (Беленькая, 1999. С. 15) і некаторых іншых гарадах. У крыжах "старыцкага" тыпу на аверсе адсутнічаюць выявы Ісуса, замест яго прапанаваны толькі сяміканцовы крыж з абрэвіятурай "ИС"–"ХС", праслаўленню подзвіга Хрыста служаць надпісы "ЦР СЛ" (Цар Славы), а пад выявай Галгофы – надпіс "НИКА" (Островский, 1993. С. 131). Вянок, дзіда і дрэўка перададзены кропкамі – яны сімвалізуюць пакуты Хрыста. Унікальны бронзавы крыж гэтага тыпу захоўваецца ў прыватнай калекцыі С.Л. Міхейкі, ён мае памеры 5 × 2,9 см і адліты ў двухбаковай форме (гл. мал. 70: 16). Крыж быў знойдзены на беразе Дзвіны, і акрамя традыцыйнага сюжэту на аверсе, ён утрымлівае выяву ўскрыжавання на рэверсе. Выява перададзена невысокім рэльефам, зроблена даволі архаічна і акрамя фігуры Хрыста ўтрымлівае надпіс "НИКА". Надпіс зроблены схематычна, ён разбіты на дзве часткі: "НИ" знаходзіцца над галавой Збавіцеля, "КА" перададзена ўмоўна ў ніжняй частцы крыжа.

Да прадметаў культавага прызначэння адносіцца таксама бронзавы звон-маскарон, знойдзены падчас раскопак 2002 года ў двары езуіцкага калегіума (мал. 71: 12). Звон мае дзве скразныя адтуліны для падвешвання на вяроўку і выяву маскарона ў выглядзе галавы ільва. Стратыграфічна выраб датуецца XVII – XVIII стст.

Бронзавая засцежка ад кнігі захоўваецца ў фондах НПГКМЗ (Фонды НПГКМЗ. Кп-2-1327). Выраб стратыграфічна не датаваны – засцежка была знойдзена ў Полацку мясцовымі жыхарамі. Засцежка ўтрымлівае стылізаваную выяву Сусветнага дрэва і міфалагічных істот – яго вартаўнікоў – ільва і адзінарога (гл. мал. 68: 31). Вобраз перададзены невысокім рэльефам, выкананым у тэхніцы адліўкі ў форме, пры гэтым цэнтр пласціны па вертыкальнай восі крыху ўвагнуты. Аналіз стылістычных асаблівасцяў малюнка дазваляе разгледзець яго ў шырокім культуралагічным кантэксце і тыпалагічна датаваць канцом XVI – пачаткам XVII ст.

Супрацьстаянне ільва і адзінарога – гэта распаўсюджаны матыў заходне-і цэнтральнаеўрапейскай геральдыцы, які на тэрыторыі Маскоўскай Русі з'яўляецца ў канцы XV – сярэдзіне XVI ст. і з гэтага часу становіцца надзвычай папулярным у дэкаратыўным мастацтве (Силаев, 2002. С. 120 – 121, 126). Семантыка зоаморфнага сімвала адзінарога каранямі

ўходзіць у індаеўрапейскую ведычную традыцыю (Силаев, 2002. С. 125). На тэрыторыі Украіны звычай змяшчаць на рэчах (пячатках, чарніліцах) выявы ільва і адзінарога таксама характэрна для XVI ст., што звязана з актывізацыяй заходнееўрапейскага гандлю (Климовський, 1975. С. 112; Супруненко, 2000. С. 86). Такім чынам, полацкая кніжная засцежка тыпалагічна датуецца XVI ст., а стылістычныя асаблівасці выявы дазваляюць разглядаць яе ў рамках маньерыстычнай традыцыі.



Малюнак 71 – Вырабы з металаў XVI – XVIII стст.:
накладка (1); нарыхтоўкі з медзі (3, 4, 13, 15); палоска з высокаякаснай сталі (6); бронзавыя спражкі (8 – 9, 17); медны пярсцёнак (10); бронзавае (2) і меднае кольцы (11); бронзавая завеса замочнай адтуліны (5); бронзавая створка (16); бронзавы звон-маскарон (12); аправа меднага гузіка (14); і медны выраб невядомага прызначэння (7); раскопкі Д.У. Дука

Маньерыстычная культура насельніцтва ВКЛ характарызуецца засваеннем шэрагу выразна ўсходніх элементаў. Натуральна, што гэтыя тэндэнцыі не абмінулі і Полацк. Панаванне ў Рэчы Паспалітай у канцы XVI – пачатку XVII ст. моды на ўсё ўсходняе (турэцкае, іранскае, угорскае, малдаўскае, харвацкае, славацкае) прадыктавала з'яўленне і такіх высокамастацкіх вырабаў, як гравіраваная бронзавая пласціна з пагруднай выявай чалавека ва ўсходнім адзенні (гл. мал. 68: 30). Пласціна з аднастаронняй выявай, перададзеная глыбокай чаканкай, верагодна была часткай накладкі на кнігу (дыяруша ці дарожнай справаздачы), у якой распавядалася пра паломніцтвы і вандраванні. Вядома, напрыклад, што знакамітая аповесць Мікалая Крыштафа Радзівіла Сіроткі "Пэрэгрынацыя, або Паломніцтва Ясна Асветленага Князя Ягамосці Мікалая Крыштафа Радзівіла ў Святую Зямлю" (падарожжа ў Іерусалім мела месца ў 1582 – 1584 гг.) перавыдавалася на працягу XVII – XVIII стст. дзесяць разоў (Лазука, 2001. С. 85). Беларускае (а магчыма, і полацкае) паходжанне накладкі на кнігу вельмі верагоднае, калі прыняць да ўвагі рэалістычна перададзеныя рысы твару чалавека – тыповыя ў партрэтных выявах дробнай мастацкай пластыкі ВКЛ таго часу (Археалогія Беларусі, 2001. Мал. 267: 16, 18; Мяцельскі, 2003. Мал. 78: 10).

Акрамя высокамастацкіх вырабаў, гараджане карысталіся ў побыце вялікай колькасцю больш танных ювелірных рэчаў: кнігі аздабляліся адметнымі накладкамі і засцежкамі (гл. мал. 70: 2 – 3); шырока ўжываліся розныя дэталі адзення: гузікі, паясавыя накладкі, спражкі індывідуальных формаў і колцы для нашэння розных рэчаў – кашалькоў, нажоў і інш. (гл. мал. 70 – 71); з медзі і бронзы рабілі простыя ўпрыгожванні і прылады працы (пярсцёнкі, устаўкі, напарсткі) (гл. мал. 70: 11 – 13, 17; 71: 10, 16).

Такім чынам, прадметы ювелірнай вытворчасці адлюстроўваюць усе ўзроўні сацыяльнай прыналежнасці іх уладальнікаў. Да высокамастацкіх належаць артэфакты, звязаныя з хрысціянскім культам і кніжнай справай, нешматлікасць рарытэтаў свецкага характару тлумачыцца тым, што ў неспрыяльныя часы ювелірныя ўпрыгожванні першыя ішлі на ваенныя трафеі ці проста пераплаўляліся з-за высокага кошту сыравіны.

5.2. Шкларобства

Росквіт асобных галінаў рамяства ў эпоху ранняга Новага часу адлюстраваны ў рэзкім павелічэнні асартыменту прадукцыі і найперш гэта тычыцца шкларобства.

Аконнае шкло ў пабудовах мяшчан з'яўляецца ў XVI ст., што характэрна як для насельніцтва ВКЛ, так і Польшчы (Яніцкая, 1977. С. 6; Wyrobisz, 1968. S. 122). Для шклення вокнаў да канца XVIII ст. ужываліся

шыбкі невялікіх фарматаў, зробленых тэхнікай выдзімання. Спачатку выдзімаўся цыліндр, які пасля раскатвалі разагрэтым жалезам, размягчалі і разразалі на малыя часткі. У Польшчы драўляныя пабудовы мяшчан у пачатку XVI ст. мелі шкляныя вокны, зробленыя з акруглых ці фігурных шыбак (Ciepiela, 1971. S. 182; Wyrobisz, 1987. S. 59). Прамавугольныя і трохвугольныя шыбкі-“kąciki” і больш дробныя – “tafeki” – запаўнялі прастору паміж шыбкамі-гамулкамі (“gomólki”), якія былі часцей за ўсё акруглай формы (Wyrobisz, 1968. S. 125). Шыбкі апраўляліся ў алавяныя ці свінцовыя аправы і злучаліся пры дапамозе таго ж волава ці свінца ў большыя шкляныя лісты. Шкляныя вокны на Беларусі вырабляліся рамеснікамі-блажанамі (Молчанова, 1981. С. 26).

У пабудове першай паловы XVI ст. знойдзены 2 фрагменты празрыстага аконнага шкла з зеленаватым адценнем таўшчынёй 3 мм, якое мела акруглы край (мал. 72: 7). У якасці ізалятара паміж шкельцам і шыбкай выкарыстоўваўся свінец, з якога былі зроблены некалькі фрагментаў аправак. Гэтыя знаходкі з’яўляюцца адзіным наяўным прыкладам ужывання шкляных вокнаў у будынках полацкіх мяшчан першай паловы XVI ст. І хоць аконнае шкло ў жыллёвых драўляных будынках палачан вядома яшчэ з XIII ст., з таго часу яго выкарыстанне спыняецца па сярэдзіну XVI ст. (Яніцкая, 1980. С. 64).

Заўважым, што сярод 33 рамесных спецыяльнасцей першай паловы XVI ст. шкляры і гутнікі ў Полацку не згадваюцца (Варонін, 2000 б. С. 38 – 40). Калі не прымаць да ўвагі фрагментарнасць захаваных пісьмовых крыніц, то гэты факт можа сведчыць пра яшчэ неразвітую шкляную вытворчасць Полацка ў XVI ст. (што пацвярджаецца і археалагічным матэрыялам). У 1654 годзе ў Полацку згадваецца толькі адзін шкляр (Игнатенко, 1963. С. 11), у 1786 годзе – чатыры (Игнатенко, 1963. С. 16). У такім разе знойдзенае шкло XVI ст. і, магчыма, пэўную частку шкляных рэчаў першай паловы XVII ст. можна разглядаць як прывазныя з Вільні, Гродна, Мінску ці нават з Польшчы, дзе з сярэдзіны XVI ст. ужо існавалі шкляныя гуты (Археалогія Беларусі, 2001. С. 349).

Шкляныя вырабы, што вывозіліся з Полацка ў Масковію, згадваюцца ў 1634, 1649 і 1675 гадах (Игнатенко, 1963. С. 16). У сярэдзіне, магчыма ўжо з другой чвэрці XVII ст., у Полацку была наладжана масавая вытворчасць шклянога посуду.

У пабудове канца XVI ст. знойдзены фрагменты аконных шкельцаў з закраінамі, па якіх можна меркаваць, што ў акне даследаванага дома былі не толькі прамавугольныя, але і трохвугольныя шыбкі (Здановіч, 1998. С. 130). Аналагічныя фрагменты шкла, адзін з іх прадстаўляе сабой край аконнага ліста, які ўстаўляўся ў шыбу (гл. мал. 72: 9), датуюцца XVI – XVII стст.



Малюнак 72 – Шкляныя вырабы XVI – XIX стст.:
ручка шклянога начыння (1); шкляніцы (3, 5 – 6, 10, 12, 23 – 24); келіх (25);
кварты (15, 22); пацерка (2); аконныя шыбкі (7 – 9); бутэлькі (17 – 21);
1 – 16, 22 – 25 – раскопкі Д.У. Дука; 17 – 21 – С.В. Тарасава

У XVII ст. аконныя шыбкі былі даволі разнастайныя па форме. Мяркуючы па слядах рэтушы (мал. 73: 1 – 7), яны мелі не толькі прамавугольную ці круглую форму, але і складаную канфігурацыю (Здановіч, спр. 1213 а. С. 35).



Малюнак 73 – Шкляныя вырабы XVI – XVIII стст.:
сценка шкляніцы (1); аконныя шыбкі (2 – 7); келіх (10)
і аптэчныя бутэлькі (8 – 9, 11 – 12); раскопкі Н.І. Здановіч

Большасць знойдзеных шкляных фрагментаў – гэта посуд, які прадстаўлены разнастайнымі вырабамі: бутэлькамі, бутлікамі, квартамі і інш. Шкляны посуд падзяляецца на тарны і сталовы. Самая распаўсюджаная катэгорыя тарнага шклянога посуду ў пластах другой паловы XVII – XVIII стст. – гэта бутэлькі.

Рыльцы бутэлек сустракаюцца паўсюдна ў пластах XVII – XVIII стст. і больш позніх. Для аналізу адабрана 25 бутэлек. Бутэлькі служылі для

захоўвання він, напояў, гарэлкі, піва, а таксама мінеральных водаў і лекаў (Ciepiela, 1987. S. 95). Звычайнай формай былі цыліндрычныя бутэлькі з рознымі варыянтамі афармлення рыльца (гл. мал. 72: 17 – 21), пры гэтым усе бутэлькі мелі пукатае дно, якое прызначалася для асядання асадку на спод.

У XVII ст. выраблялі пераважна прысадзістыя слоікападобныя бутэлькі (бутлікі); у XVIII ст. выцягнутыя ў плане цыліндрычныя бутэлькі значна пераважаюць, назіраецца тэндэнцыя да павелічэння вышыні вырабаў. У першай палове XVIII ст. пад краямі венцаў бутэлек змяшчаліся шкляныя валікі няправільнай формы, якія прызначаліся для мацавання корка (Ciepiela, 1977. S. 97). З другой паловы XVIII ст. бутэлькі маюць шыйку з шырокім рыльцам (гл. мал. 72: 17 – 21).

Разнастайныя бутлікі – другая па колькасці распаўсюджвання катэгорыя тарнага шклянога посуду. Для аналізу адабрана 18 адзінак (Здановіч, спр. 1213 а. С. 35). Рыльцы бутлікаў аформлены як у бутэлек, у канцы XVII ст. звычайным становіцца шматрадавы жгут па краю рыльца (мал. 74: 8).



Малюнак 74 – Шкляны посуд XVI – XVIII стст.:
бутлікі (4 – 5, 8); кварты (1 – 2); аптэчны посуд (6 – 7, 9 – 10); збан (3);
раскопкі Н.І. Здановіч

Кварты – род бутэлек з чатырохвугольнай формай тулава (гл. мал. 72: 15, 22; мал. 74: 1, 2) – сталі шырока вядомы з канца XVII ст., а з другой паловы XVIII ст. яны набываюць больш правільныя квадратныя формы і выкарыстоўваюцца як аптэкарскі посуд (Ciepiela, 1977. S. 95). Так, з пласта XVII ст. паходзіць кварта поўнага профілю шырынёй 6 см пры вышыні каля 10 см; шыйка кварты аздоблена рыфленнем (гл. мал. 72: 15), што з'яўляецца характэрнай рысай аптэчнага посуду Старой Варшавы (Ciepiela, 1977. S. 111). Па матэрыялах фондавай калекцыі НПГКМЗ да квартаў належаць 117 фрагментаў посуду.

Форма бутляў развіваецца па двум напрамкам: першы – гэта шлях захавання традыцыйнай формы бутэлькі нестандартна вялікіх памераў, другі – паступовая трансфармацыя бутлікаў у мініяцюрнае аптэчнае начынне. Памеры венцаў апошніх вагаюцца ад 2,3 да 4 см, вышыня не перавышае 10 – 12 см.

Пашырэнне ў XVIII ст. асартыменту аптэчнага посуду звязана з развіццём лекарства. Аптэкарская справа актыўна развівалася ў Полацку пры царкоўных шпіталях (дамах прытулку) яшчэ з першай паловы XVI ст. (Варонін, 2000 а. С. 67; Грицкевич, 1964. С. 79).

У сярэдзіне XVI ст. у Полацку існавала тры шпіталі. Адзін з іх знаходзіўся "пад валам", другі – каля манастыра Ўваскрэсення Хрыстова (на Верхнім замку), трэці – паблізу царквы Ўзнясення Хрыстова (на Вялікім пасадзе) (Варонін, 2003. С. 35). Шпіталь "пад валам" знаходзіўся, верагодна, насупраць умацаванняў Верхняга замка на левым беразе Чорнага ручая (тэрыторыя Вялікага пасада).

З сярэдзіны XVII ст. існавала аптэка на езуіцкім двары (Варонін, 2000 б. С. 67; Грицкевич, 1964. С. 79). У XVII – XVIII стст. шпіталі ў Полацку трымала полацкае брацтва пры Богаяўленскім саборы і базыліяне (Грицкевич, 1964. С. 79). Хірургі-цырульнікі карысталіся розным інструментам, у тым ліку выкарыстоўвалі шкляныя слоікі для захоўвання лекаў.

Тыповай формай аптэчнага слоіка ў XVIII ст. становіцца начынне з тонкімі сценкамі і адагнутымі вонкі венцам аднолькавай са сценкамі таўшчыні (гл. мал. 73: 12). Для лекарскіх, аптэкарскіх і алхімічных мэтаў выраблялі малыя цыліндрычныя бутэлькі з краямі, прыстасаванымі для закрывання слоікаў мяккімі завязкамі (Ciepiela, 1987. S. 77).

Шкляніцы – род сталовага посуду для спажывання напояў – падзяляюцца на два віды: гладкія і аздобленыя. Гладкія былі найбольш папулярныя ў XVIII ст., што адпавядае цэнтральнаеўрапейскім тэндэнцыям (Ciepiela, 1977. S. 51). Шкляніцы маюць вышыню ў сярэднім 8 – 9 см і зроблены з бясколернага шкла ці шкла з зеленаватым адценнем (гл. мал. 72: 23 – 24; 75: 5 – 6, 15). Другая група шкляніц аздоблена рэльефнымі паскамі, размешчанымі гарызантальна ці наўскос (гл. мал. 75: 2 – 3, 8, 15). Большасць

шкляніц мелі цыліндрычную форму з нязначным звужэннем да донца і вырабляліся шляхам адвольнага выдзімання, аб чым сведчыць след ад понціі. Вышыня адной шкляніцы поўнага профілю 9,5 см пры дыяметры венца 7,5 см (гл. мал. 72: 12).



Малюнак 75 – Шкляны посуд XVI – XVIII стст.:
шкляніцы (2 – 6, 8, 14 – 15); келіх (18); чарка (9);
аптэчныя бутлікі (1, 7, 10 – 13, 16 – 17); раскопкі Н.І. Здановіч

Бліжэйшы аналаг шкляніцы поўнага профілю знойдзены ў Віцебску ў пабудове XVII ст. (Бубенько, 1988. Мал. 1, 7). У адрозненні ад віцебскіх шкляніц, полацкія вырабы мелі больш тонкія сценкі (2,5 – 3 мм), дыяметр донцаў – ад 5 да 6 см. Форма амаль плоскага донца полацкай шкляніцы (гл. мал. 72: 11) паўтарае форму некаторых шклянак і шкляніц XVII – XVIII стст., вядомых у іншых гарадах Беларусі (Собаль, Яніцкая, 1984. Мал. 3 а; Яніцкая, Сташкевіч, 1995. Мал. 4). Шкляніцы рабіліся ў форме, у гэтую ж форму выдзімалі "баначку" – паўторна набраную кроплю шкламасы, у выніку чаго стваралася адзінае начынне (Собаль, Яніцкая, 1984. С. 85).

Некаторыя шкляніцы канца XVI ст. (гл. мал. 73: 1) маюць дэкор у выглядзе жгутоў каля донца (зрэдку – каля венца) і з'яўляюцца самай ранняй катэгорыяй полацкага шклянога посуду (Здановіч, 1998. С. 130). Такія шкляніцы маюць паўпразрыстае ("дымленае") шкло, звычайна зялёнага колеру і пакрыты тоўстым слоем паціны, дыяметр донцаў гэтых шкляніц вагаецца ад 4 да 6,5 см (гл. мал. 72: 14, 16). Шкляніцы з накладнымі фігурнымі паскамі атрымалі самае шырокае распаўсюджванне ў XVII ст., у фондавай калекцыі НПГКМЗ яны прадстаўлены 14 адзінкамі. Да рэдкіх формаў шкляніц канца XVI ст. належыць тонкасценны выраб на цылíндрычным паддоне дыяметрам 8 см (Здановіч, 1998. С. 130).

Келіхі мелі выцягнутыя прапорцыі з шырокай ножкай-стапой і прызначаліся для ўжывання дарагіх напояў (гл. мал. 73: 10). Храналагічны дыяпазон бытавання полацкіх келіхаў бярэ пачатак з XVI ст., але найбольшага распаўсюджвання гэты від шкляных вырабаў атрымаў у канцы XVII – XVIII ст. Самы ранні стратыграфічна зафіксаваны выраб паходзіць з пабудовы першай паловы XVI ст. (мал. 76: 10). Захавалася ножка дыяметрам 6 см з цёмна-зялёнага паўпразрыстага шкла, пакрытая шчыльным слоем паціны.

Першай паловай XVIII ст. датуюцца келіхі з фігурна аздобленай ножкай (гл. мал. 76: 1 – 2, 5). Келіхі з гладкай слупаватай ножкай больш познія і ўжываліся ў другой палове XVIII ст. (гл. мал. 76: 4). Рэдкай знаходкай з'яўляецца стапа, альбо ножка, ад кілішка з белага непразрыстага шкла (гл. мал. 72: 10). Для ўжывання хмяльных напояў у XVII – XVIII стст. разам з келіхамі выкарыстоўваліся рознага роду шкляныя чаркі (гл. мал. 76: 9).

Стапа ці паддон ад звонападобнай шкляніцы з празрыстага шкла бэзавага адцення (гл. мал. 72: 10) знойдзена ў пласце XVII ст. Такія вырабы былі найбольш папулярнымі на польскіх землях, дзе яны мелі назву пухаркі (ад слова "pucharek") (Prusika – Kołcon, 2000. S. 237). Пухаркі былі таннымі і стандартнымі па форме, мелі нешырокую стапу (звычайна да 5 см) і выгнутае вонкі "звонападобнае" венца. На Беларусі звонападобныя шкляніцы знойдзены ў Віцебску ў пабудове XVII ст. (Бубенько, 1988. Рис. 1: 10), у Полацку гэты від посуду вядомы з канца XVI ст. (Здановіч, 1998. Мал. 11: 3), аднак ён не атрымаў шырокага распаўсюджвання.



Малюнак 76 – Шкляны посуд XVI – XVIII стст.:
келіхі (1 – 5, 10); шкляніцы (6 – 8); чарка (9);
1 – 9 – раскопкі Н.І. Здановіч; 10 – Д.У. Дука

Да вельмі рэдкіх знаходак можна аднесці фрагмент бутля-“gasiora” (гл. мал. 72: 13). Гэтае начынне ў выглядзе колбы з зяленаватага празрыстага шкла прызначалася для падачы напояў на стол (Ciepiela, 1977. S. 89). Індывідуальнай формы венца, магчыма, ад кілішка з зялёнага шкла, якое мела ляпную ручку ў выглядзе расамахі (гл. мал. 72: 1). Венца ў форме збана, дыяметрам 7 см, стратыграфічна датуецца канцом XVII – першай паловай XVIII ст. (гл. мал. 74: 3).

У пласце XVII ст. разам з манетай 1663 года знойдзена пацерка з сіняга непразрыстага шкла, якое было састаўной часткай жаночага ўпрыгож-

вання (гл. мал. 72: 2). Да ліку унікальных вырабаў адносіцца пячатка са светла-ружовага шкла з раскопу Н.І. Здановіч 1990 года (Здановіч, спр. 1450. Ф. 58).

З раскопу 1990 года Н.І. Здановіч паходзіць некалькі фрагментаў размаляваных шкляніц з раслінным, геаметрычным і геральдычным арнаментам, на адной з якіх чытаецца літара “В”. Дробныя кавалкі размаляванага шкла знойдзены намі на тэрыторыі Вялікага пасада. Полацкія размаляваныя шкляніцы вырабляліся дзеля задавальнення густу вышэйшых асоб, напрыклад, вядомы полацкія шкляніцы, падораныя цару Аляксею Міхайлавічу, што сведчыць аб высокім майстэрстве полацкіх шкларобаў (Яніцкая, 1977. С. 11).

Відавочна, што шкляная прадукцыя да канца XVIII ст. пачынае паступова выціскаць з побыту тарныя керамічныя вырабы і асобныя віды сталовага посуду. У XVII ст. большая частка шкляных вырабаў была мясцовай вытворчасці, што пацвярджаецца данымі фізіка-хімічнага даследавання полацкай кафлі са шкляным пакрыццем (палівай) (Здановіч, спр. 1376. С. 33), і пісьмовымі крыніцамі (Яніцкая, 1977. С. 11). Пра ўзрастанне попыту на шкляныя вырабы ў XVIII ст. сведчыць той факт, што першыя мануфактуры на тэрыторыі Беларусі былі менавіта шкловытворчымі (Налібоцкая мануфактура 20-х гадоў XVIII ст. і Урэчская мануфактура канца 30-х гадоў XVIII ст.) (Романовский, 1966. С. 40, 46). Вытворчасць шкляной прадукцыі арыентавалася на патрэбы розных сацыяльных пластоў гарадскога насельніцтва. Больш дарагое размаляванае шкло знойдзена на месцы пасялення заможных гараджан, яно цанілася вельмі высока. У напластаваннях XVII – XVIII стст. размаляванае шкло прадстаўлена адзінкавымі артэфактамі, што сведчыць пра яго адносна рэдкае выкарыстанне, затое рознага роду бутэлькі, шкляніцы, келіхі і іншыя вырабы са шкла становяцца атрыбутам сталовага посуду ў доме кожнага мешчаніна.

5.3. Гарбарныя вырабы

Гарбарства здаўна займала важнае месца ў іерархіі рамесных прафесій Полацка. Згодна з данымі пісьмовых крыніц, у першай палове XVI ст. у Полацку працавалі седлары, рымары, сырамятнікі, кажамякі, хамутнікі, рукавічнікі (Варонін, 2000 б. С. 38 – 39). У 1601 годзе краўцы, кушняры, шапачнікі, сапожнікі і гарбары былі аб’ядняны ў адзін цэх (Полоцк: Ист. очерк, 1987. С. 49), у 1619 годзе кушняры і шапачнікі ўтварылі самастойны цэх (Игнатенко, 1963. С. 32). На пачатку XVIII ст. (1726) цэх кушняроў, шапачнікаў і гарбароў зноў падзяліўся, і з яго складу выйшлі гарбары і ўтварылі новы цэх (Игнатенко, 1963. С. 32). Напрыканцы XVIII ст.

у Полацку нараджаецца мануфактурная вытворчасць (гарбарня Марка Лукашэвіча), у 1786 годзе дзейнічае 12 майстэрняў мануфактурнага тыпу па вытворчасці скур (Лютый, 1987. С. 134; Полоцк: Ист. очерк , 1987. С. 63, 81).

Скураныя вырабы ў культурным пласце Полацка XVI – XVIII стст. сустракаюцца рэдка, што тлумачыцца фізічнай характарыстыкай гэтага пласта: ён сухі, крохкі, месцамі невыразны, дрэнна захоўвае арганіку. Выключэннем з'яўляецца культурны пласт у паўночна-ўсходняй частцы былога Вялікага пасада (за будынкамі гарадскога Дома культуры паміж вуліцамі Ф. Скарыны і Камуністычнай).

Самая прадстаўнічая калекцыя скураных вырабаў XVI – XVIII стст. сабрана на Вялікім пасадзе (раскопкі С.В. Тарасава 1987 – 1988 гадоў на плошчы Свабоды). Тут знойдзены дэталі абутку, фрагменты адзення і іншыя рэчы.

Дэталі абутку прадстаўлены падэшвамі, абцасамі, заднікамі, халявамі і галоўкамі ботаў. У разглядаемы перыяд адбываюцца карэнныя змены ў вытворчасці абутку – умацаванне падэшвы і вынаходніцтва абцаса. У Полацку абутак з абцасам з'яўляецца не раней другой паловы XVI ст., але найбольшае распаўсюджванне ён атрымаў у канцы XVI – XVII стст. (Тарасов, 1989. С. 171).

Увесь абутак падзяляецца на два тыпы: мяккі і цвёрды. Мяккі існуе да сярэдзіны XVI ст. і па тэхналогіі вытворчасці бывае суцэльнакроены і састаўны.

Цвёрдыя падэшвы з канца XVI ст. становяцца паўсюдна ўжыванымі, яны знойдзены разам з абутковымі падкоўкамі, якія выкарыстоўваліся выключна ў наборных скураных мужчынскіх абцасах (Тарасов, 1989. С. 171). Наборны абцас умацоўваўся цвікамі, драўлянымі штыркамі, але часцей за ўсё – металічнымі падкоўкамі (Археалогія Беларусі, 2001. С. 363). Апошнія з'яўляюцца масавымі знаходкамі ў пластах XVI – XVII стст.

Падэшвы XVI – XVIII стст. маюць выразныя выемкі ў галенастопе (мал. 77), яны рабіліся са скуры таўшчынёй 0,3 – 0,4 см. Па форме абцаса падэшвы сустракаюцца круглага, прамавугольнага і грушападобнага выгляду (Бубенько, 1993. С. 134 – 135).

Жаночыя чаравічкі і боты маюць больш далікатны драўляны абцас вышынёй 2,5 – 4 см. Знойдзены жаночыя падэшвы з завужанай пятой (мал. 77: 8; 78: 2). Пераважная большасць чаравічкаў (мал. 77: 1 – 4, 5) мела акруглы носік, што было тыпова для XVI – XVIII стст. (Левко, 1984. Рис. 31: 3).

Мужчынскія туфлі (чаравікі) звычайна рабіліся з 4 – 5 дэталяў (Археалогія Беларусі, 2001. С. 360–361). У іх была шматслойная падэшва, якая паступова замяняецца абцасам. Павелічэнне дэталяў прывяло да з'яўлення

сцілак, паўсцілак. Сцілкі і прасцілкі з бяросты зрэдку сустракаюцца пры археалагічных раскопках у Полацку.



Малюнак 77 – Абутковыя падэшвы; раскопкі С.В. Тарасава

Заднікі ботаў цвёрдага тыпу мелі трапецыяпадобную форму (мал. 78: 9 – 12) і выкладаліся бяростай (Археалогія Беларусі, 2001. С. 363). Халявы сустракаюцца даволі рэдка, што можа тлумачыцца высокім коштам скуры. Пасля завяршэння тэрміну эксплуатацыі ніжняй часткі ботаў халявы ішлі на заплаты, з іх рабілі поршні, чаравікі і інш. Халявы мелі вышыню ад 19,5 да 24 см (мал. 79: 1 – 4). Перады ботаў і чаравікоў з плаўна закруглёнай насавой часткай мелі язычок або мысік на ўнутраным контуры (гл. мал. 78: 13 – 21), усе яны вырабляліся з грубай скуры таўшчынёй да 0,4 см.

Акрамя абутку, у культурным пласце Полацка знойдзены іншыя вырабы са скуры. Гэта цэльнакроеныя ножны, футаралы, шытыя з двух-трох частак скуры, кашалькі (гл. мал. 79: 5 – 16). Прадстаўнічай з’яўляецца калекцыя фрагментаў скураных рамянёў (гл. мал. 79: 17 – 25), частка з якіх – паясовыя, адзін выраб, па ўсёй верагоднасці, з’яўляецца бізуном (гл. мал. 79: 17).

На працягу разглядаемага перыяду скураная вытворчасць займала вядучае становішча па колькасці рамесных спецыяльнасцей (Игнатенко,

1963. С. 11, 16; Лютый, 1987. С. 124). Гэта тлумачыцца патрэбай у абутку як сярод прадстаўнікоў вышэйшых станаў, так і сярод простых гараджан. Пераважная большасць абутку са скуры мае сляды працяглага выкарыстання, што звязана з высокім коштам скураных вырабаў, якія пасля носкі неаднаразова рамантаваліся, і на пашыў ішлі нават дробныя кавалкі. Гэты факт можа тлумачыць адносна нешматлікую колькасць знойдзеных падчас археалагічных раскопак скураных вырабаў.



Малюнак 78 – Абутковыя падэшвы (1 – 4); заднікі чаравікоў і ботаў (5 – 12); перада чаравікоў і ботаў (13 – 16); перада чаравікоў (17 – 20); раскопкі С.В. Тарасава



Малюнак 79 – Халявы ботаў (1 – 4);
скураныя ножны, футаралы і кашалькі (15 – 16); рамяні (17 – 25);
раскопкі С.В. Тарасава

5.4. Апрацоўка дрэва і косці

Апрацоўка дрэва на працягу XVI – XVIII стст. займала па-ранейшаму вялікую ролю ў жыцці насельніцтва Полацка і, у параўнанні з іншымі тэхналогіямі рамеснай вытворчасці, з'яўлялася самай кансерватыўнай. Масавая гарадская забудова была самай трывалай і ўстойлівай да зменаў формаў і характару домабудаўніцтва. На працягу стагоддзяў ад XIX ст. да пачатку ранняга Новага часу ў развіцці будаўнічай тэхніцы не назіралася якіх-небудзь істотных зменаў. Не мяняліся нават такія паказчыкі, як вулічная

планіроўка і плошчы асобных сядзіб. Пасля разбурэння аднаго гаспадарчага комплексу на яго месцы ўзводзілі новы, пры гэтым канструкцыя новага будынка не толькі не мянялася, але часта максімальна поўна адпавядала абрысам папярэдняга (Митрофанов, спр. 203. С. 33).

Па пісьмовых крыніцах у першай палове XVI ст. у Полацку вядомы спецыяльнасці сталяроў (скрыннікаў), якія займаліся вытворчасцю драўляных рэчаў (Полоцкие грамоты XIII – начала XVI в., 1980. С. 57). Згодна з інвентарнымі апісаннямі, у жылым грамадзянскім будынку была ў наяўнасці драўляная мэбля, у прыватнасці: калясценная лава, ложак, шафа, заслон і стол (Молчанова, 1981. С. 31). У XVIII ст. з'яўляюцца яшчэ ложак і крэслы. Рамесныя спецыяльнасці XVII ст., звязаныя з дрэваапрацоўкай, налічваюць прафесіі бондараў, вядзернікаў, карзіншчыкаў, каўшоўнікаў, токараў, скрыннікаў, сталешнікаў і інш. (Копысский, 1966. С. 54). У Полацку існавалі вельмі рэдкія прафесіі, звязаныя з абслугоўваннем караблёў (бочары і пільнікі) (Полоцк: Ист. очерк, 1987. С. 49). Бондары і скрыннікі выраблялі драўляны посуд, якім карысталіся ў побыце прадстаўнікі ўсіх гарадскіх саслоўяў (Молчанова, 1981. С. 54).

Наяўны археалагічны матэрыял прадстаўлены адзінкавымі знаходкамі па прычыне дрэннай захаванасці арганікі ў пластах XVI – XVIII стст.

Ніжэй узроўня падлогі даследаванай пабудовы першай паловы XVI ст. была ўкапана драўляная бочка дыяметрам 50 см і глыбінёй 45 см, пры гэтым не былі знойдзены крапежныя матэрыялы – толькі рэшткі драўляных сценак і донца (Дук, спр. 1921. С. 9). Апошняе дае падставы меркаваць, што бочка была даўблёная і ўкапана дзеля нейкіх гаспадарчых патрэб. У гэтай жа пабудове былі знойдзены драўляныя вырабы, якія сведчаць аб развітых традыцыях дрэваапрацоўкі. Апрацаваная з цэльнага кавалка сасны накрыўка вусця дрэнажу знойдзена ў склепе, тут жа знаходзілася тачонае донца берасцянкі дыметрам 17 см і таўшчынёй 0,6 см.

Касцярэзная вытворчасць на Беларусі традыцыйна была даволі развіта, сведчаннем гэтага з'яўляецца адкрыццё сярэднявечных касцярэзных майстэрняў у Віцебску і Мсціслаўлі (Археалогія Беларусі, 2001. С. 372). У культурных пластах XVI – XVIII стст. Полацка трапляюцца нарыхтоўкі з ласінага рога і адыходы касцярэзнай вытворчасці (мал. 80: 17) (Дук, спр. 1921. С. 26).

Тэхніка апрацоўкі косці была падобна на тэхніку апрацоўкі дрэва. Касцяныя вырабы маюць сляды рубкі сякерай, рэзкі нажом, пілой, тачэння на такарным станку, свідравання, глянцавання. У XVI – XVIII стст. з косці працягвалі вырабляць рэчы утылітарнага прызначэння (накладкі, дэталі вопраткі, прылады працы) і прадметы для гульні.



Малюнак 80 – Вырабы з каменю і косці XVI – XVIII стст.:
асялкі (1 – 14); ружэйны крэмень (15); форма для адліўкі гузікаў (16);
нарыхтоўка з рогу (17); касцяныя гузікі (19, 23); лашчыла (?) (21);
пярсцёнак (18); касцяныя тронкі і муфты (20, 22, 24); зубная шчотка (25);
1 – 14, 16, 19 – 25 – раскопкі Д.У. Дука; 15, 17 – Н.І. Здановіч; 18 – С.В. Тарасава

Праколкі мелі, бадай, самую ўстойлівую форму касцяных прылад працы. Дзве касцяныя праколкі знойдзены ў пабудове першай паловы XVI ст. Па знешняму выгляду яны нічым не адрозніваліся ад падобных ім касцяных праколак жалезнага веку і Сярэднявечча. Праколкі выкарыстоўваліся ў гарбарнай справе для праколвання скуры, з іх дапамогай выраблялі рэчы

з лыка і лазы: вярэнькі, кашы (Археалогія Беларусі, 2001. С. 373). Да побытавых рэчаў адносяцца таксама гузікі круглай формы дыяметрам 1,2 і 1,5 см, з трыма і чатырма скразнымі адтулінамі (гл. мал. 80: 19, 23).

Касцяныя тронкі на нажах XVI – XVIII стст. амаль пазбаўлены арнаментацыі, яны састаўныя, паўкруглай формы альбо блізкія да яе, некаторыя гранёныя і амаль плоскія (гл. мал. 53: 17 – 19; 80: 24). На большасці з іх арнаментацыя адсутнічае ці прадстаўлена рыскамі крыж-накрыж (гл. мал. 53: 18). Касцяныя тронкі мацаваліся да дзяржання нажа з дапамогай медных заклёпак, у XVII ст., як масавая з'ява, выкарыстоўваюцца ўжо жалезныя заклёпкі.

Па свайму прызначэнню вельмі блізкія да тронкаў нажоў розныя касцяныя накладкі і муфты, прыкладам апошніх можа служыць фрагмент касцяной муфты ў форме цыліндрыка, аздобленай лінейным арнаментам (гл. мал. 80: 20). З косці рабілі розныя бытавыя прылады – лашчылы, зубачысткі і іншыя вырабы (гл. мал. 80: 21 – 22, 24 – 25).

Сярод унікальных касцяных знаходак вылучаюцца сыгнет, косць для гульні, пярсцёнак і тачоныя з рога шахматныя фігуры канца XVI – XVII стст.

Косць для гульні – кубік з рабром даўжынёй 1,2 см, з нанесенымі па кожнай грані цыркульным арнаментам вочкамі ад аднаго да шасці – знойдзена падчас раскопак аўтара на Вялікім пасадзе (мал. 81: 5). Стратыграфічнае датаванне выраба – XVII ст.



Малюнак 81 – Касцяны пярсцёнак (1); касцяная ўстаўка пярсцёнка (5); косць для гульні (6); шахматныя фігуры з рогу (2 – 4); 1 – 3 – раскопкі С.В. Тарасава; 4 – 6 – Д.У. Дука; 5 – з фондаў НПГКМЗ

Усе шахматныя фігуры акрэсленага перыяду з Полацка знойдзены на Вялікім пасадзе: дзве – падчас раскопак С.В. Тарасава ў 1987 – 1988 гадах (стратыграфічна датуюцца канцом XVI – XVII стст.); адна – падчас раскопак аўтара (стратыграфічна датуецца XV – XVI стст.). Усе шахматныя фігуркі зроблены на такарным станку (гл. мал. 81: 2 – 4), адна дадаткова аздоблена інкрустацыяй у выглядзе цыркульнага арнаменту (Тарасаў, 1988. С. 19; Тарасов, Романенкова, 1987. С. 63). Па вуснаму вызначэнню В.М. Мядзведзевай, дзве фігуры з'яўляюцца шахматнымі каралямі (раскопкі С.В. Тарасава), адна – ферзем (раскопкі аўтара).

Пярсцёнак з косці мае таўшчыню сценак да 0,4 см пры дыяметры 2,3 см, на вонкавай паверхні фіксуюцца сляды зацёртасці ў выглядзе неглыбокай папярэчнай бароздкі ад працяглага нашэння. Выраб аздоблены лінейным (у чатыры палоскі) арнаментам (гл. мал. 80: 18). Гледзячы па невялікаму дыяметру адтуліны (1,4 см), пярсцёнак прызначаўся для маладой жанчыны. Стратыграфічнае датаванне выраба – XVI ст. Аналагічным чынам датуецца круглы, крыху сплошчаны ў разрэзе пярсцёнак (гл. мал. 81: 1).

Касцяны сыгнет (2,2 × 1,8 см) быў знойдзены мясцовымі жыхарамі на тэрыторыі г.п. Ветрына ў полацкай акрузе. Зроблена пячатка з маржовай косці (вызначэнне А.А. Разлуцкай). На пячатцы ў авальнай тарчы змешчана выява герба "Радван", шляхецкая карона і намёт у выглядзе парасткаў (гл. мал. 81: 6). Не выключана прыналежнасць пярсцёнка прадстаўніку роду Шчытоў. Па ўсіх прыкметах пячатка датуецца XVIII ст. і з'яўляецца ўзорам высокамастацкай апрацоўкі косці.

Відавочна, што косць у XVI – XVIII стст. не страціла папулярнасці як сыравіна для вытворчасці побытавых рэчаў і прылад працы. Да XVII ст. з косці вырабляліся традыцыйныя простыя рэчы (лашчылы, праколкі, тронкі нажэй), у XVII ст. вырабам часта надаецца высокамастацкія якасці (шахматныя фігуркі, пячаткі). З'яўляюцца новыя, не вядомыя раней формы рабочых і бытавых інструментаў, пры аздабленні якіх шырока ўжывалася косць.

5.5. Вырабы з каменю

Вырабы з каменю падзяляюцца на тры групы: прылады утылітарнага прызначэння, зброя і мастацкая пластыка.

У культурных напластаваннях XVI – XVIII стст., роўна як і больш ранніх часоў, частай знаходкай з'яўляюцца каменныя брускі-асялкі (па аднаму на 4 – 8 кв. м аднаго стратыграфічнага гарызонта). У залежнасці ад памераў і формы брускі-асялкі выкарыстоўваліся для заточкі жалезных вырабаў. Так, падчас раскопу 2001 года знойдзена калекцыя маленькіх шмат-

гранных брусочкаў, даўжынёй 2,5 – 4,5 см пры максімальнай шырыні 0,5 см (гл. мал. 80: 10 – 12). Такія асялкі прызначаліся для заточкі дробных вырабаў альбо для даводкі вастрыя буйных металічных рэчаў (Археалогія Беларусі, 2001. С. 376).

Асялкі з дробназярністага пясчаніку са слядамі спрацаванасці знойдзены ў форме трапецыі, трохвугольніка, прамавугольнага бруска ці авалу (гл. мал. 80: 1 – 8, 13 – 14). Некаторыя з іх маюць вялікія памеры – да 19 см у даўжыню і 4,5 см у шырыню (гл. мал. 80: 9).

Апрацаваны крэмень, які знойдзены ў розных частках горада, сведчыць аб шырокім выкарыстанні крамянёвых ружжаў з фіцільным замком. Па форме ўсе ружэйныя крэмні трапецыяпадобныя (Здановіч, спр. 1374. Іл. 12: 12), памерамі ад 2 да 3 см і таўшчынёй ад 0,5 да 1 см (гл. мал. 80: 15).

Да ліку рэдкіх знаходак належыць выяўленая Г.В. Штыхавым каменная плітка XV – XVI стст. з мяккага дробназярністага вапняку мясцовага паходжання, якая ўтрымлівае кірылічны надпіс і з’яўляецца своеасаблівай запісной кніжкай (Рыбаков, 1963. С. 248). Не менш каштоўнай знаходкай, якая дае ўяўленне аб узроўні развіцця мастацкай апрацоўкі каменю, з’яўляецца двухбаковая плітка (пячатка?) XVII ст. з геральдычнымі выявамі (Мілюцін, Тарасаў, 1994. С. 235).

У ювелірнай вытворчасці ў XVI – XVII стст. працягвалі выкарыстоўваць каменныя формы для адліўкі ўпрыгожванняў. Сведчаннем гэтаму з’яўляецца раздымная форма для адліўкі гузікаў. Знаходка паходзіць са стратыграфічнага гарызонта XVI ст.

Зроблена форма з мяккай пароды белага каменю, падобныя формы з Полацка выразаліся на далатамізаваных мікразярністых вапняках мясцовага паходжання (Штыхов, 1975. С. 63). Форма зроблена ў выглядзе прамавугольнага брусочка памерамі 5,3 × 3 × 1,6 см. У верхняй частцы формы выразаны літнік, які падзяляецца на тры канальцы, кожны з іх завяршаецца паўсферай дыяметрам 1 см. У двух дыяметральна супрацьлеглых баках формачкі былі прасвідраваны круглыя гнёзды дыяметрам 0,7 см, куды ўстаўлены алавяныя штыфты (гл. мал. 80: 16). Відавочна, што тэхналогія адліўкі ювелірных вырабаў у XVI – XVIII стст. істотна не адрознівалася ад традыцыі XII – XIII стст. (Археалогія Беларусі, 2000. С. 426).

З каменю выраблялі гарматныя ядры розных памераў і формаў. У Полацку знойдзена некалькі дзесяткаў каменных ядраў дыяметрам ад 6 да 35 см і вагой да 66 кг (гл. табл. 5). Адно ядро авальнай формы мае аналогіі з матэрыяламі Лідскага замку (Археалогія Беларусі, 2001. С. 376). Выраблены ядры з буйназярністага біятытавага граніту, пераважная іх

большасць знойдзена на Верхнім замку, што тлумачыцца важным стратэгічным значэннем замкавых умацаванняў у XIV – XVI стст.

Існуе меркаванне, што каменныя ядры вялікіх памераў выкарыстоўваліся для камнекідальных машын (Краўцэвіч, 1991. С. 141). Па вызначэнню Ю.М. Бохана, з чым можна цалкам пагадзіцца, круглыя ядры вялікіх памераў вырабляліся выключна для гарматнай артылерыі. Так, ядры “больш за чалавечую галаву” выкарыстоўваліся ў асаднай артылерыі (бамбарды і марціры), для лёгкіх гармат тыпу гуфніц выраблялі ядры калібрам да 230 мм (Бохан, 2002. С. 183).

Такім чынам, наяўны археалагічны матэрыял сведчыць, што розныя віды металургічнай, гарбарнай і шкляной вытворчасці разам з апрацоўкай дрэва, каменю і косці ў XVI – XVIII стст. плённа развіваліся ў Полацку на мясцовай глебе. Асобныя галіны рамяства дасягнулі ў гэты час росквіту, найперш гэта тычыцца шкларобства. Шклянымі вокнамі аздабляліся жылыя драўляныя пабудовы палачан ужо ў першай палове XVI ст., што з’яўляецца самым раннім наяўным прыкладам шклення вокнаў у пабудовах гарадскога жыхарства ўсходняга рэгіёну ВКЛ. Побыт гараджан узбагачаўся не вядомымі раней вырабамі са шкла, па-іншаму сталі выглядаць інтэр’еры жылых будынкаў са шклянымі вокнамі, што стала звычайнай з’явай у XVII ст.

6. ЖЫЦЦЁВАЯ ПРАСТОРА НАСЕЛЬНІЦТВА ПОЛАЦКА XVI – XVIII СТАГОДДЗЯЎ

6.1. Арганізацыя жыццёвай прасторы заможных гараджан

Сацыяльная структура насельніцтва Полацка ў XVI – XVIII стст. была даволі стракатай. Як і ў іншых беларускіх гарадах, самае высокае становішча ў Полацку ў XVI – пачатку XVII ст. займалі князі і паны-магнаты. У XVI ст. дробная шляхта часта называлася па-старому – баяры-шляхта. Прамежкавы стан паміж дробнай шляхтай і магнатамі займала сярэдняя шляхта, якая валодала невялікімі маёнткамі (Улащик, 1986. С. 133). У Полацку вышэйшымі саслоўямі ў XVI – XVIII стст. былі, як і раней, шляхта і мяшчане. У іх лік уваходзілі баяры (з XVII ст. – шляхта), мяшчане – землеўласнікі і купцы, сярод якіх вылучаліся вельмі заможныя гараджане (Полоцк: Ист. очерк, 1987. С. 48). Тэрмін “мяшчане” ў інтытуляцыі гарадскіх зваротаў сустракаецца з 1459 года (Полоцкие грамоты, 1982. С. 150). Сярод заможных мяшчан былі “славетныя” мяшчане-радцы, “паспалітыя людзі месцкія” ці “паспольства” – гэтая частка насельніцтва складала гарадскі патрыцыят (бюргерскі стан) (Александрович, 1998. С. 160; Варонін, 2000 б. С. 62; Полоцк: Ист. очерк, 1987. С. 48). У першай палове XVI ст. полацкі патрыцыят займаўся пераважна гандлем, сярэдні слой – рамяством і гандлем (Варонін, 2000 б. С. 65 – 66). Гэтая тэндэнцыя, верагодна, захавалася і ў XVII ст. Паводле В.А Вароніна, існаванне адносна адзінага стана мяшчан у Полацку можна весці з 1498 года (Прывілей Полацку на магдэбургскае права) (Варонін, 2000 б. С. 62).

Найбольшае ўяўленне пра арганізацыю жыццёвай прасторы палачан даюць вынікі даследаванняў гарадской забудовы. Сядзіба прадстаўнікоў вышэйшых саслоўяў у XVI ст. называлася “двор”, “дворище”, “оселость”, “маетность”. У пачатку XVII ст. з’яўляецца тэрмін “пакой” у сувязі з заменай старых валовых акон на шкляныя (Молчанова, 1981. С. 30). Святліца, пакой (“упокоец”) – гэта абагрэтыя памяшканні, у якіх жылі гаспадары, прыслуга сялілася ў “светлицах служных”. З усіх частак пабудоў у пазначаны час абаграваліся толькі кухні і святліцы (Topolska, 2002. S. 225). У дамах заможных гараджан дзверы былі з дошак (цясаныя), сталярнай работы, нярэдка “футраваныя” (абабітыя дошкамі ў розных напрамках для дэкаратыўнага аздаблення) (Молчанова, 1981. С. 31). Такія дзверы абавязкова мацаваліся жалезнымі завесамі с зашчапкамі, кручкамі і асначаліся вісячымі і ўнутранымі замкамі.

Дамы палачан у XVI – XVIII стст. маглі мець да дваццаці вокнаў (Молчанова, 1981. С. 31). У інвентарах падрабязна апісваюцца ўсе дэталі

акон: “абалоны паперные” (Археографический сборник документов..., 1867. С. 222), “абалоны шкляныя”, “завесы” (Акты, издаваемые Виленскою археографическою коммисіею, 1878. С. 4), “краты жалезныя” (Археографический сборник документов..., 1867. С. 145), што сведчыць аб іх маёмаснай каштоўнасці. На працягу другой паловы XVII ст. у маёнтках беларускай шляхты і зможных мяшчан алавяныя і свінцовыя рамы паступова замяняюцца драўлянымі (Молчанова, 1981. С. 28). Згодна з археалагічным матэрыялам, у XVI – XVII стст. аконнае шкло мела зяленаватае адценне, якое прыглушала дзённае святло і ўносіла ў інтэр’ер атмасферу спакою. Рассоўныя аканіцы звычайна вешалі на жалезных завесах, і яны мелі розныя жалезныя кручкі, зашчапкі і набойкі.

Дзвярны набор таксама вылучаўся разнастайнасцю. У пісьмовых крыніцах падрабязна пазначаюцца ўсе наяўныя жалезныя дэталі дзвярэй: “завесы з прабоямі”, “зашчапкі”, “клямкі”, “замкі нутраныя, сляпыя”, “запоры” (Археографический сборник документов..., 1867. С. 145; ИЮМ, 1875. С. 278). Некаторыя дамы заможных гараджан маглі мець двое-трое дзвярэй.

Інвентар двара Ваяводы на Верхнім замку за 1552 год з’яўляецца самым раннім прыкладам комплекснага апісання ўсіх пабудоў, размешчаных у межах аднаго двара. “На первей домъ на подклете, светлица великая зъ сенми и зъ кганъкомъ, другий домъ в стена замковой на городнях, светлочка, комора и сень зъ кганком, третий дом на подклете, комора и сенье, четверты дом на подклете, светлочка а сень, пятый домок на подклете, светлочка, комора а сень згнила, шостый дом новый на подклете, светлицы две, комора а сень; еще печей и коменков нет, пивница а на ней сховане, кухъня, пекарня зъ сенями, стайня рубаленая а за двором лазня, у воротъ замъковых к Великому посаду клет королевская, в которой жыто спижа бывала; тая клет ничемна згнила” (Полоцкая ревизия 1552 г., 1905. С. 14 – 15).

Двор ваяводы ўключаў у сабе шэсць жылых будынкаў, півніцу (склеп) са складскім памяшканнем пад ёй, кухню і пекарню, злучаную сеньмі, стайню, лазню, каралеўскую клець каля замкавых варот. Дамы на падклетах прадстаўлялі сабой двух-трох-камерныя пабудовы. Шосты дом знаходзіўся ў сцяне замкавай на гародне і, верагодна, з’яўляўся вартаўнічым памяшканнем, адкуль ваявода мог назіраць за перамяшчэннем войска (Якимович, 1991. С 267).

Уяўленне пра інтэр’ер жылля заможнага палачаніна канца XVI – пачатку XVII ст. даюць інвентарныя апісанні пабудоў архіепіскапскага двара, размешчанага “въ замку Вышнем Полоцком”, за 1588, 1601 і 1618 гады. Яны даюць выдатную магчымасць прасачыць дынаміку змен забудовы Верхняга замка каля саборнай царквы св. Сафіі за адносна непрацяглы час.

“Въ немъ (*двор Уладыкі – Дз. Дук*) будованья: светлицы две на подклетах напротивко себе, одна съ коморою, межы ними сень, сьветлица поземная, изба напротивко, межы ними сень, светлица на подъизбицы, напротивко клеть на подклете, межы ними сень, спижарня на пивницы, стайня, броваръ старый, лазня, клеточка старая” (Археографический сборник документов…, 1867. С. 167 – 171).

Інвентар за 1601 год паведамляе пра “дворъ архіепископскій въ замку вышнемъ Полоцкомъ, въ немъ будованье: ворота уезные покрытые, противъ церкви Светое Софіи; подле тыхъ воротъ по левой руце келья, где пономарь мешкаетъ; подле кельи светлица съ коморою и зъ сенкою; подле нее пивница; подле пивницы пекарня; противъ пекарни светлица служна; подле светлицы ворота въ куте; подле воротъ спижарня; подле спижарни кухня; тамъ же светличка пры кухне; броваръ и лазня. Далей, вколо идучы, домъ великій зъ кганкомъ; светлица столовая; напротивъ светлицы другая светлица покоевая съ коморою; на горе светлица; коло ней кружкганокъ. За тымъ домомъ поветъ, где возы ставляютъ; подле повета свиренъ, где шоръ ховаютъ; подле клети стайня; подле стайни ворота великіе въезные; одъ воротъ идучы свиренъ зъ кружкганками, зъ двоимъ схованьемъ” (Археографический сборник документов..., 1867. С. 221).

У інвентары за 1618 год згадваецца “светлица столовая поземная, старая, в ней окон четыре, оконницы на завесахъ с замкомъ нутренымъ; печь старая побеленая; на противкутое светлице светелка въпокоевая, оболоны шкляные, на завесах, оконницы, двери двое на завесахъ с замками нутреными, печь новая поливаная; въ тыле той светлицы другая светелка упокоевая, оболоны шкляные, двери и окна на завесах, печь поливаная; за тымъ упокойцомъ – двое схованье для сена и шопа для возов; подле той шопи стайня; подле стайни ворота уездные до двора; а подле ворот свирен на подклете, за темъ свирном знову ворота великие уездные, и фортка; подле тых воротъ звоночакъ малый што до столу звонять; подле тых ворот светелка за коморою, окна и двери на завесах, оболоны шкляные, печь простая старая; за тою светлицою пекарня; на противку пекарни светлица служная, двери и оконницы на завесах, оболонь две шклянных; одъ тое светлицы спижаренка простая, то есть лазня; на противку светёлка кухмистровская, въ сенехъ кухня, въ боку броваръ, подле светёлки пивница” (Акты, издаваемые Виленскою археографическою коммисіею..., 1878. С. 4).

Двор архіепіскапа 1601 года меў пакрытыя гонтам (?) уязныя вароты, келью панамара, святліцу з каморай і сенямі, піўніцу, пекарню, святліцу для служак, спіжарню, кухню са святлічкай, бровар і лазню. Сам архіепіскап жыў у вялікім доме з ганкам, у якім была сталовая, жылая святліца

з камораю, на другім паверсе святліца з балконам. Акрамя таго, двор уключаў у сябе вазоўню (“паветъ”), два свірна, стайню.

Дом архіепіскапа 1618 года ўключаў у сабе сені, сталовую і два жылыя пакоі з “новымі” паліванымі камернымі печамі. Акрамя дома, на дварэ было тры жылых флігеля: адзін са святліцай і каморай, другі з чалядней і пекарней праз сені, трэці – сталовая святліца повара, кухня і лазня. У двор архіепіскапа ўваходзілі таксама стайня, вазоўня, свіран на падклеце, півніца і інш. Двор меў агароджу і ўяздныя форткі (вароты).

У інвентары 1618 года пазначаны некалькі тыпаў пакояў: “светлица столовая поземная”, “светелка” са старой печчу і “светелка въпокоевая” ці “упокоец” (выкарастаны ў сінанімічным значэнні). Апошняе памяшканне мела шкляныя вокны і паліваную камерную печ. Відавочна, што ў пачатку XVII ст. будынкі са шклянымі вокнамі яшчэ паўсюдна не змянілі старыя валовыя. “Новыя паліваныя” печы проціпастаўляюцца “старым”, якія знаходзілася ў “святліцы сталовай” ці “святліцы служнай” і прызначалася для гатавання ежы. Старыя печы былі з праматочнай сістэмай ацяплення, да таго ж зробленыя з гаршковай ці міскавай кафлі. У апісанні маёмасці Полацкай архіепіскапіі ў фальварку Цётчы (26.04.1601) сказана: “Въ тыхъ всихъ светлицах печи зъ черепиц белых уробленыи” (Археографический сборник документов..., 1867. С. 222). Можна меркаваць, што ў прыведзеным паведамленні згадваецца камерная печ са сценавай кафлі, для аздаблення якой выкарыстоўвалася вапнавая пабелка. Археалагічныя матэрыялы пацвярджаюць факт выкарыстання гаршковай кафлі для аздаблення печаў у пачатку XVII ст., таксама як і наяўнасць вапнавай пабелкі на вонкавай паверхні сценавай кафлі “новых” камерных печаў (Здановіч, спр. 1376. С. 33). Печы, зробленыя з гаршковай кафлі, былі з праматочнай сістэмай ацяплення і мелі назву “простых”.

За сцяной жаночага манастыра св. Сафіі на Верхнім замку ў 1637 годзе знаходзіліся: “дом, пара ізбаў белых з пакоямі і сеньмі; з ганкам, на кроквах, драніцамі абабітых; недалёка ад яго рэтэктарж і пры ім белая ізба з пакоем; кухня і пекарня, там жа і півніца і некалькі свірнаў для захавання збожжа; там жа непадалёку дом, гэта значыць белая ізба з пякарняй насупраць; там жа свіран і стаенка. Пад тым усім будаваннем агарод для гародніны і для саду; на тым агародзе бровар і лазня, абора для быдла, стайня і некалькі адрын для захавання сена і саломы” (ИЮМ, 1901. С. 19). Манастыр быў абнесены драўлянай сцяной з форткай і варотамі, якія “да таго манастыра вядуць у два ваза”. Цікава, што хаця манастыр знаходзіўся ў добра ўмацаванай частцы горада – Верхнім замку, тым не менш ён меў уласную фартыфікацыйную сістэму.

Інвентар жаночага манастыра св. Сафіі за 1637 год сведчыць пра наяўнасць вялікага шматкамернага дома, які ўключаў у сабе дзве белыя ізбы з пакоямі, злучанымі паміж сабой сеньмі. Ён размяшчаўся побач з дваром архіепіскапа. Таксама як і на двары ваяводы, у манастырскі комплекс уваходзілі клець, лазня, пякарня, свіран і стаенка.

Такім чынам, паводле "Рэвізіі" і інвентароў XVI – XVII стст., драўляныя дамы палачан мелі ганкі ("кганки, кганьки") і размяшчаліся на "падрубе" (свайго роду драўляны падмурак), альбо "пры зямли", значыць, без падмурка. Асобныя дамы мелі на другім паверсе святліцы, акружаныя балконам ("кружкганокъ"). Сені з'яўляліся зрубным памяшканнем, якія злучалі іншыя памяшканні з надворным выхадам (Якимович, 1991. С. 362). У сенях палачане захоўвалі кадкі з вадой (Археографический сборник документов..., 1867. С. 324). У актавай кнізе полацкага магістрата за 1643 год захаваўся запіс судовай справы аб вялікім пажары ў Полацку, які знішчыў Верхні і Ніжні замкі, калегіум, касцёлы, цэрквы, ратушу, вежы, паркан і ўсе аздобы "месца Полацкага" (Археографический сборник документов..., 1867. С. 353). Пажар пачаўся з падсенняў[7] дома пана Павука, дзе знаходзілася салома і сена (Дук, 2006 а. С. 15).

На думку З.Ю. Капыскага, рэлігійная сітуацыя ў Полацку ў першай палове XVI ст. характарызуецца пашырэннем лютэранства, каталіцтва і складваннем новай веравызначальнай структуры ў гарадскім асяроддзі (Капыскі, 1989. С. 87). Следствам гэтага стала будаўніцтва ў Полацку бернардзінскага кляштара і кальвінскага збора. Апошні існаваў да сярэдзіны XVII ст. (спалены ў 1660 г.). Паводле А.Ю. Бараноўскага, кальвінскі збор размяшчаўся каля рынку ці нават на самім рынку, што і абумовіла далейшую "лацінізацыю" рынкавай плошчы і стварэнне новай урбаністычнай структуры Полацка, надалей актыўна развітай езуітамі (Baranowski, 1994. S. 28, 32). Збор размяшчаўся на супрацьлеглым баку рынка ад езуіцкага калегіума. Паводле апісання збора 1636 года ён меў вялікія вароты, новы дом з двума пакоямі (адзін з іх сталовая), сені, камору, гаспадарчыя пабудовы. У пакоях былі лаўкі, пастаўленыя па кругу, дзве белыя печы, пакрытыя зялёнай кафляй і адна чорная, для выпякання хлеба (Иванова, 1992. С. 26).

У 1667 годзе, пасля вайны Расіі з Рэччу Паспалітай (1654 – 1667 гг.), езуіты вяртаюцца ў Полацк. На месцы калегіума яны пабачылі дамы мяшчан, пабудаваныя за час панавання маскоўскіх войскаў. Езуіты пачалі адбудоўваць на месцы колішняга касцёла "сціплы калегіум" і фарны касцёл, а насупраць, праз рынак, на месцы былога кальвінскага збора, другі

[7] Адкрытая слупавая галерэя на галоўным фасадзе дома (Якимович, 1991. С. 361)

касцёл Францыска Ксаверыя. Апошні, па сведчанню пісьмовых крыніц, знаходзіўся на рынку і згарэў падчас пажара ў 1754 годзе (Baranowski, 1994. S. 30, 32).

Нерухомасць з'яўлялася найвялікшай каштоўнасцю, аб чым яскрава сведчаць пісьмовыя крыніцы. У гэтых адносінах паказальна скарга намесніка полацкага Богаяўленскага манастыра Гедэона Дроніча на полацкага ратмана Станіслава Цыгановіча на зварот і звоз нерухомай маёмасці, пабудаванай коштам манастыра. Сядзіба, агароджаная парканам, знаходзілася на вул. Вялікай (сучасная вул. Леніна). Скарга Дроніча датуецца 9 вераснем 1667 года, паводле ёй з "пляца" пана Беланова Станіслаў Цыгановіч "праз чэлядзь сваю з таго пляца звозіў і ўжо звёз гумно, дзве асеці і ўвесь паркан" (ИЮМ, 1995. С. 174). Звоз маёмасці, відаць, актыўна практыкаваўся і ў першай палове XVI ст., калі полацкі ваявода Станіслаў Давойна загадваў разбіраць і выносіць з Верхняга замка мяшчанскія дамы (Варонін, 2000 б. С. 87).

Адным з індыкатараў эканамічнага росквіту гарадоў з'яўляецца ступень развіцця радавой грамадзянскай забудовы. У некаторых беларускіх гарадах (Магілёве, Мінску) у XVII ст. адзначаецца будаўніцтва мураваных камяніц – жылля гарадскога патрыцыята (Марзалюк, 1998. С. 36). Фахверкавая[8] забудова пераважала ў заходнім рэгіёне (Гродна, Брэст, Нясвіж, Клецк, Навагрудак, Слонім) (Лакотка, 1999. С. 240, 264 – 266). Паводле археалагічных матэрыялаў, у Полацку будаўніцтва камяніц пачынаецца ў другой палове XVII ст. Н.І. Здановіч на месцы будучай карціннай галерэі мастацкай школы (каля 100 м на ўсход ад плошчы Свабоды) у 1990 годзе былі даследаваны рэшткі двух розначасовых цагляных дамоў. Першы быў пабудаваны не пазней сярэдзіны XVII ст. і меў падлогу з керамічных плітак, багата аздобленую кафляную печ і сцены, складзеныя з цэглы-пальчаткі. Пазней на яго месцы быў пабудаваны другі дом, які паўтараў абрысы першага. Плошча абодвух дамоў была не менш 48 кв. м. Не выключана, што дамы былі двухпавярховымі, а раскапаны першы ярус з'яўляўся крамай. Дом XVIII ст. на магутным цагляным падмурку з мноствам сутарэнняў выяўлены аўтарам падчас нагляду за будаўнічымі работамі па вул. Леніна, 7 (падножжа ўсходняй частцы Верхняга замка). У 1692 годзе быў узведзены так званы дом Пятра І. Апошні размешчаны на былой вул. Вялікай, на значнай адлегласці ад вуліцы, што сведчыць пра яго сядзібны характар (Слюнченко, 1988. С. 26). Адзінкавасць археалагічных адкрыццяў і скупыя звесткі пісьмовых крыніц не дазваляюць адзна-

[8] Фахверкавая забудова – дамы двух'яруснага тыпу на падклеццях, дзе ніжні ярус зроблены з брусоў на каменным падмурку, а верхні – каркас з брусоў, між якімі было запаўненне з цэглы і каменю.

чыць масавы характар прыватнаўласніцкага мураванага дойлідства ў XVII ст. Гэтая сітуацыя не змянілася, а нават пагоршылася да канца XVIII ст., паколькі паводле пісьмовых крыніц у 1780 годзе у Полацку было 360 драўляных дамоў і ні аднаго каменнага[9] (Шайкоў, 1996. С. 148). Аднак ужо ў сярэдзіне 1780-х гадоў у Полацку налічвалася каля 750 дамоў, у тым ліку 16 вялікіх цагляных будынкаў. Шпаркія тэмпы будаўніцтва тлумачацца статусам горада як цэнтра намесніцтва (1778 – 1796) (Полоцк: Ист. очерк, 1987. С. 77 – 78).

З асобных дакументаў вынікае існаванне на пасадскай тэрыторыі двухпавярховых будынкаў, якія належалі мяшчанам. Напрыклад, Уладзіслаў IV 27.03.1636 г. дазволіў полацкаму купцу Крыштафу Старыне “пад домам сваім ..., які стаіць чалом да рынака насупраць крамаў гарадскіх ... крамы мець, іх адчыняць і тавары розныя прадаваць...” (Доўнар, 2004. С. 46 – 47). Жылым у доме з’яўляўся другі паверх, а першы прызначаўся пад краму.

Такім чынам, у дакументах XVI – XVIII стст. пры пералічэнні полацкіх жылых будынкаў выкарыстоўваюцца тэрміны “ізба”, “дом”. Адзначым і выкарыстанне тэрміна “святліца” як назвы асобнай пабудовы, а не толькі пакоя (згаданы вышэй інвентар двара архіепіскапа за 1601 год згадвае святліцу з камораю і сянямі, і святліцу для прыслугі). У апісанні двара ваяводы на Верхнім замку (“у Мошонъце”), мяшчанскага двара ў “месце Полацкім” і маёнтка Мосар Полацкага павета ўжываецца тэрмін “хоромы” (Справы полацкага гродзскага суда, 1929. С. 131, 168, 275). З-за абмежаванасці пісьмовых і археалагічных крыніц даволі цяжка вызначыць розніцу ў канструкцыі ізбы і дома. Найверагодней, што гэтыя тэрміны сінанімічныя, прынамсі, у асобных дакументах яны атаясамляюцца: “там жа непадалёк дом, гэта значыць ізба белая з пекарней насупраць” (ИЮМ, 1901. С. 19). Пазначаныя тыпы канструкцый маглі быць шматкамернымі, у двух ярусах, з каморамі, сеньмі, да таго ж зробленыя на падклецях. Падклець выконвала функцыю склепа і адначасова вылучала пабудову ўладальніка з ліку радавых і паказвала на яго высокае сацыяльнае становішча. Што тычыцца харомаў, то па аналогіі з Віцебскам сярэдзіны XVII ст. можна ахарактарызаваць іх як прыгожыя і разнастайныя дамы, якія маюць надворныя хадавыя галерэі, розныя вежы і вежачкі, а таксама шатровыя дахі з цыбулінамі на іх (Красьнянскі, 1928. С. 54).

Асобныя дамы мяшчан маглі быць вялікіх памераў, пра што сведчыць запіс у актавай кнізе полацкага магістрата ад 30 чэрвеня 1621 года. Паводле запісу, полацкі ваявода Міхаіл Друцкі-Сакалінскі з панятымі

[9] Трэба падкрэсліць, што гаворка ідзе толькі пра прыватнаўласніцкае мяшчанскае і дваранскае жыллё.

прыбыў на вул. Вялікую (сучасная вул. Леніна) у дом мешчаніна Ігнація Вішні для аб'яўлення мяшчанскім старшынам пісьмовага загада аб забароне несанкцыянаваных сходак у сувязі з супрацівам распаўсюджвання уніі. Ваявода знайшоў у доме Вішні "большое сборище мещанъ обоего пола, въ числе нескольких сотъ человекъ" (падкрэслена аўтарам) (Витебская старина, 1888. Ч. 1. С. 121). Такія дамы маглі быць двухзрубнымі, дзе адзін зруб меў значна большую даўжыню за другі, прыстаўлены да яго перпендыкулярна. Гэтыя будынкі мелі ганак, кафельныя печы з комінам, асветленыя памяшканні, вокны большых памераў і прыбудоўкі каля задняй сцяны. Менавіта такія будынкі характарызуюцца вялікай жылой плошчай (Красьнянскі, 1928. С. 54).

Дарэчы, вул. Вялікая з'яўлялася месцам пражывання пераважна заможнай часткі насельніцтва (мяшчан і шляхты), пра што яскрава сведчаць археалагічныя матэрыялы і даныя пісьмовых крыніц. Не выпадкова на гэтай жа вуліцы шляхціч Іван Стаброўскі аддае свой брацкі дом на ўладкаванне ў ім часовай праваслаўнай царквы: "въ месте Полоцкимъ, надъ рекою Двиною, належонцы до маетности Пола, за ужытемъ ихъ милости пановъ (прія)теловъ воеводства Полоцкого, пановъ братии моихъ мещанъ некоторыхъ (мес)та Полоцкого реліи старожытней Кірецкей до часу слушнекго п... лилемъ спокойне одправовать набоженство, яко въ дому шляхецкимъ" (запіс ад 10 чэрвеня 1621 г.) (Витебская старина, 1888. Ч. 1. С. 122).

Аналагічная тэрміналогія жылых пабудоў і памяшканняў характэрна і для іншых беларускіх гарадоў XVI – XVIII стст., у прыватнасці Магілёва (Марзалюк, 1998. С. 35). Выкарыстанне ў пісьмовых крыніцах другой паловы XVI – пачатку XVII ст. тэрмінаў "светелка въпокоевая", "упокоец", "ізба белая" ў дачыненні да дамоў полацкага набілітэту адлюстроўвае працэс перахода да новага тыпу жылых памяшканняў з камернай печчу і шклянымі вокнамі (Акты, издаваемые Виленскою археографическою коммисіею..., 1878. С. 4).

Жылым пабудовам супрацьстаўляецца "клеть" – пабудова гаспадарчага прызначэння, якая выконвала функцыю ляцёна (летняга жылля) і азначала тое ж, што і "камора". Тэрмін "падклець", ці "падклет", азначаў кладоўку ці хлеў для свойскай жывёлы, у асобных выпадках – ніжні ярус харомаў. З іншых гаспадарчых пабудоў у Полацку згадваюцца "схованье для сена", "шопа для возов", "стайня", "свирен на подклете", "пекарня", "спижаренка простая, то есть лазня", "бровар", "пивница".

Аб канструкцыі лазняў мы можам меркаваць зыходзячы толькі з ускосных даных. Вядома, што ў Полацку, як і ў многіх беларускіх гарадах,

існавала “лазня посполитая”: Паводле прывілею Полацку на магдэбургскае права, палачане “мають убудувати ку вжытку местскому лазню посполитую, где местце оберуть подобное” (Полоцкие грамоты, 1978. С. 156). Яе падрабязнага рэестра не захавалася, аднак па аналогіі з магілёўскай гарадской лазняй можна вызначыць, што яна была драўлянай, двухкамернай, складалася са святліцы (мыечнай) і каморкі (парылкі). У кожным памяшканні знаходзілася па печцы, пры гэтым печ у парылцы была зроблена з каменю, цэглы і жалеза, зверху ляжалі камні, а сама печ устаноўлена на драўляных апечках (Марзалюк, 1998. С. 40). Верагодна, лазня мела шкляныя вокны, комін, атынкаваны вапнай, у мыечнай знаходзіліся бочкі з халоднай вадой, вялікі кацёл для кіпеня, шайкі, венікі і мыла. У лазні можна было выпіць піва і пагаліцца.

Апрача “паспалітай лазні”, на некаторых сядзібах палачан таксама будаваліся прыватныя лазні, якія прадстаўлялі для горада пэўную пажарную небяспеку. Так, ваявода Станіслаў Давойна загадаў браць штраф з мяшчан і рабаваць іх за тое, што яны маюць бровары і лазні ў сваіх дварах. Ён жа загадаў разбіраць і выносіць з замка мяшчанскія дамы (Варонін, 2000 б. С. 86 – 87). Такія жорсткія меры тлумачыліся тым, што пажары былі сапраўдным бедствам для палачан і часта прыносілі большую шкоду, чым непрыяцельскія войскі. Вядома, напрыклад, што падчас пажару 1643 года выгарэў увесь Полацк (Дук, 2006 а. С. 15), а падчас пажару 1683 года загінула шмат жыхароў горада (Сапунов, 1888. С. 257).

Палачане валодалі ўласнымі складамі для захоўвання розных тавараў, прынамсі, адзін з іх, згаданы ў 1650 годзе. Склад (spichlerz) полацкага райцы Яна Сергеевіча, размяшчаўся на Вялікім пасадзе “ў самім паркане”, насупраць гаспадарскага дома. У 1650 годзе полацкаму мешчаніну Міхалу Гапонавічу дазвалялася мець калодзеж і бровар за гарадскімі ўмацаваннямі, над Дзвіною, там, дзе размяшчалася яго асець (Актавая кніга полацкага магістрата 1650 года, 2006. С. 199, 212).

Яшчэ адна катэгорыя нерухомасці згадваецца ў пісьмовых крыніцах XIV – XVII стст. – гэта полацкія млыны. Як мінімум два млыны знаходзіліся на Палаце, адзін – насупраць заходняй выспы Верхняга замка (г. зв. Машны) (Тарасаў, 1988. С. 72). Насыпы на яго месцы візуальна фіксуюцца нават сёння. Млын згадваецца ў прывілеі Жыгімонта I 1510 года (1509?) (Справы полацкага гродскага суда, 1929. С. 196). Яшчэ адзін млын належыў Барысаглебскаму манастыру і размяшчаўся на рацэ Бельчыца (падложная грамата Яраслава Ізяславіча 1396 г.), гэты ж млын на рацэ Бельчыца згадваецца ва ўводным лісту 16 ліпеня 1623 года (Витебская старина, 1888.

Ч. 1. С. 10; ИЮМ, 1892. С. 358 – 361). Археалагічныя даныя аб іх канструкцыі адсутнічаюць.

Паводле Прывілею 1510 года (1509?) Жыгімонт I дазволіў палачанам пабудаваць чатыры гасціныя дамы. Дагэтуль купцы з іншых земляў мусілі жыць у прыватных дамах. Колькасць пабудаваных гасціных дамоў не вядома, паколькі Рэвізія 1552 года згадвае толькі адзін гасціны двор (Варонін, 2000 б. С. 44). У грамаце Аляксея Міхайлавіча полацкім мяшчанам 1657 года пазначаецца, што "гостинъ де дворъ въ Полотеске тесенъ, пріезжимъ торговымъ людемъ изместиться негде" (Витебская старина, 1885. Ч. 2. С. 78), для пабудовы гасцінага двара было аддадзена "пустое ратушное место по малую улицу". На сённяшні дзень гасціныя двары археалагічна не выяўлены.

Да пабудоў грамадскага прызначэння XVI ст. адносіліся таксама свіраны ў Машне і Багародзіцкі, а таксама "важница" і "капница для воска", згаданыя ў прывілеі Полацку на магдэбургскае права 1498 года (Тарасаў, 1998. С. 71). Месца іх размяшчэння дакладна не вядома, можна цалкам пагадзіцца з меркаваннем С.В. Тарасава, што "важница" і "капница" размяшчаліся ў непасрэднай блізкасці да полацкага рынка на Вялікім пасадзе.

Па аналогіі з іншымі беларускімі гарадамі, дахі полацкіх драўляных будынкаў крылі гонтам і дранкай. Паводле Паўля Одэборна, дахі драўляных цэркваў на Полаччыне ў 1580-я гады крыліся гонтам (Сагановіч, 2005. С. 169). Мураваныя пабудовы ў XVIII ст. мелі дахі, зробленыя з дахоўкі. З вялікай доляй верагоднасці можна сцвярджаць, што асобныя драўляныя будынкі, напрыклад карпусы езуіцкага калегіума XVII ст., былі крытыя керамічнай дахоўкай. Драўляны комплекс калегіума ў XVII ст. неаднаразова цярпеў ад пажараў (Габрусь, 2001. С. 163), у выніку чаго ў культурны пласт маглі трапляць фрагменты дахоўкі.

Форма дахаў большасці будынкаў была двусхільнай, аб чым сведчаць іканаграфічныя матэрыялы. Самыя раннія з іх – гэта планы С. Пахалавіцкага 1579 года. На малюнку "Аблога Полацка каралём Стэфанам Баторем" паказаны Верхні і Ніжні замак (Тарасаў, 1998. С. 10 – 14). Акрамя абарончых вежаў і гародняў, на плане даволі дэталёва намаляваны дамы гараджан і культавыя пабудовы. Разумеючы, што цалкам давяраць рэалістычнасці выяў С. Пахалавіцкага нельга, вылучым агульныя рысы знешняга выгляду будынкаў, якія на малюнках С. Пахалавіцкага безумоўна прысутнічаюць. На думку С.В. Тарасава, большасць будынкаў на плане двухпавярховыя (Тарасаў, 1998. С. 14). Гэта маглі быць двух'ярусныя святліцы на падклецях. Дамы маюць двусхільныя дахі, а абарончыя вежы – шатровую форму стрэх, і толькі асобныя – двусхільную (мал. 82).

Малюнак 82 – Прамалёўка часткі плана “Узяцце Полацка Стэфанам Баторыем у 1579 годзе” (друкуецца паводле С.В. Тарасава) (Тарасаў, 1998. Мал. 2)

Паводле малюнка С. Пахалавіцкага, тэрыторыя Верхняга замка была шчыльна забудавана, што, дарэчы, пацвярджаецца археалагічным матэрыялам – нават у непасрэднай блізкасці да Сафіі даследаваны рэшткі пабудоў XVI ст. Аднак наўрад ці большасць дамоў на Вялікім пасадзе ў XVI – XVIII стст. былі двухпавярховымі, гэта дапушчальна толькі для Верхняга замка – традыцыйнага месца пражывання гарадскога набілітэту.

У Полацку XVI – XVIII стст. сярод пераважна драўлянай грамадзянскай і культавай забудовы велічна ўзвышаліся асобныя мураваныя будынкі цэркваў і касцёлаў. І калі да Інфлянцкай вайны (1558 – 1582) пераважала старажытная храмавая архітэктура полацкай школы дойлідства, то ў другой палове XVII – XVIII стст. Полацк паступова набывае цэнтральна-еўрапейскае аблічча (культавае дойлідства, забудова і планаванне цэнтральнай часткі) (Baranowski, 1994. S. 30). У 1581 годзе езуіты пачынаюць узводзіць драўляны касцёл "выдатнай архітэктуры" там, дзе пазней пабудаваны цагляны калегіум (Тарасаў, 1998. С. 9). У 1597 годзе будаўніцтва драўлянага калегіума і "вялікіх памераў і не брыдкага" касцёла было скончана (Baranowski, 1994. S. 29). На Верхнім замку пасля вайны захвалася толькі адна царква, верагодна, кафедральная св. Сафіі, і пачаў будавацца каталіцкі касцёл (Тарасаў, 1998. С. 9). Паводле Паўля Одэборна, у Полацку 1581 года існавалі тры царквы, пабудаваныя з цэглы. Одэборн адзначае, што "трэці храм, аздоблены на італьянскі манер, нават цяпер звяртае на сябе ўвагу. Астатнія разбурыў вялікі князь маскавітаў Іван Васільевіч, калі васемнаццаць гадоў таму, захапіўшы Полацк, атрымаў яго ў сваё ўладанне" (Сагановіч, 2005. С. 182). Мураваны храм, аздоблены на італьянскі манер, гэта, верагодна, царква св. Сафіі. Яе веліч здзіўляла многіх іншаземцаў, напрыклад, Р. Гейдэнштэйн заўважыў, што "храм у замку агромністы, на прыгожай мясцовасці і цудоўна пабудаваны з каменю". Рамонт Сафіі, калі, магчыма, і было зроблена рэнесанснае аздабленне, прыпадае на першую палову XVI ст., калі па прывілею Аляксандра ад 19 сакавіка 1501 года палачанам прадпісвалася "церковъ Божъю крити и цвинътаръ городити" (Справы полацкага гродзскага суда..., 1928. С. 159). Што тычыцца астатніх двух храмаў, то гэта маглі быць цэрквы, размешчаныя ў самім горадзе, паколькі ў гэты час дакладна вядома аб існаванні, акрамя царквы св. Сафіі, Пятніцкай і Барысаглебскай цэркваў ў Бельчыцкім манастыры, Спаса-Праабражэнскай царквы ў Спаса-Ефрасіннеўскім манастыры (усе разам – ужо чатыры храмы). Таму, верагодна, што Одэборн меў на ўвазе цэрквы, размешчаныя непасрэдна ў горадзе, але якія? Вышэй ужо згадвалася існаванне царквы Ражаства Хрыстова, якая, верагодна, па-ранейшаму была мураванай. На Верхнім замку ў гэты час захаваўся толькі адзін мураваны храм. Значыць, трэцяя мураваная царква знаходзілася альбо на Вялікім, альбо на Запалоцкім пасадзе. Дакладна вызначыць гэтую царкву зараз цяжка.

Звычайна на тэрыторыі манастыроў ці кляштараў існавалі могілкі. На тэрыторыі былога дамініканскага кляштара ў раёне сучаснай плошчы Свабоды С.В. Тарасавым у 1987 годзе былі зафіксаваны дзесяць даўлёных

трун-калод. Яны былі зроблены з цэльнага кавалка дрэва і складаліся з накрыўкі і ніжняй часткі. Калоды былі звужаны ў нагах і мелі даўблёную выемку ў нагах нябожчыка. Сярэднія памеры калод 1,9 × 0,4 м. Ва ўсіх трунах знойдзены касцякі, пры гэтым якіх-небудзь прадметаў не выяўлена, за выключэннем дэталяў адзення. Ад адзення засталіся толькі фрагменты скуранога абутку – поршняў ці мяккіх туфляў. Яшчэ тры пахаванні былі змешчаны ў трунах прамавугольнай формы, зробленых з масіўных дошак (Тарасаў, спр. 1014. С. 5). Час пахавання вызначаецца ў межах XVIII ст.

Паводле прывілея Уладзіслава IV праваслаўнаму Богаяўленскаму манастыру ад 6 чэрвеня 1633 года манастыр дазвалялася пабудаваць на “Большой улице, граничащей съ одной стороны Большою улицею, съ другой стороны отъ Двины, полплацемъ земли Екатерины Прилуцкой, по мужу Островской, съ третьей стороны полпляцемъ мещанки Ходыки, а съ четвертой стороны четвертью плаца Павла Невзора, где стоялъ его дворъ отдалъ на вечныя времена въ пользу монастыря греческого исповеданья неуниатовъ” (ИЮМ, 1875. С. 352). Для манастырскіх патрэб таксама дазвалялася выкупаць іншыя пляцы “на кладбище” (*падкрэслена аўтарам*) для пахавання памерлых (ИЮМ, 1875. С. 353). Паводле даравальнай граматы Аляксея Міхайлавіча Богаяўленскаму праваслаўнаму манастыру ад 23 верасня 1656 года “три дворныя места пустыя жидовския, Якоба да Герца, да Римлянина Каспара Пневского, владеть, и те места очистить для пространства подъ колокольню, и для погребения телесъ умершихъ православныхъ християнскихъ” (Витебская старина, 1885. Ч. 2. С. 63).

Верагодна, рэшткі манастырскіх могілак былі ўскрыты падчас археалагічнага нагляду за пракладкай будаўнічай траншэі ў 2005 годзе. Цела нябожчыка было пакладзена ў труну-калоду і заглыблена ў мацярык на 0,3 м. Пахаванне – мужчынскае, безінвентарнае. Нябожчык быў арыентаваны галавой на поўнач. Узрост памерлага – 40 – 50 гадоў[10]. Паводле стратыграфічных даных, пахаванне было здзейснена не пазней за XV – першую палову XVI ст. Такім чынам, археалагічныя даныя пацвярджаюць звесткі пісьмовых крыніц, што манастырскія могілкі існавалі ў раёне Богаяўленскага манастыра раней за XVII ст. У 2003 годзе безінвентарныя пахаванні ў трунах-калодах былі адкрыты ў двары былога езуіцкага калегіума, датуюцца XVII ст. Арыентацыя касцякоў галавой на ўсход (два выпадкі), адзін – на поўнач.

Падчас археалагічных даследаванняў горада былі пацверджаны даныя пісьмовых крыніц пра наяўнасць шчыльнай грамадзянскай забудовы

[10] Антрапалагічная экспертыза астэалагічнага матэрыялу з будаўнічай траншэі праведзена В.А. Емяльянчык, за што прыношу ёй шчырую падзяку.

ў XVI – XVII стст. на Вялікім і Запалоцкім пасадах, на Верхнім замку – нават непасрэдна каля Сафійскага сабора. Будынкі гарадскога патрыцыяту, у тым ліку ваяводы, у паўночнай частцы Верхняга замка таксама былі драўлянымі. Пра драўляныя будынкі каталіцкіх святароў у XVII ст. сведчаць вынікі археалагічных раскопак у паўднёвым дворыку езуіцкага калегіума.

Каталіцкае драўлянае дойлідства апошняй чвэрці XVII ст. вызначалася рэгулярнай планіроўкай цэнтральнай рыначнай часткі горада (сучасная плошча Свабоды) (Baranowski, 1994. S. 30). Можна выказаць меркаванне, што драўляныя будынкі простых палачан маглі таксама ўзводзіцца па адзінаму плану. Сведчаннем гэтага з'яўляецца ўпарадкаванасць размяшчэння асобных дамоў і вуліц. Паводле нашых назіранняў, уся цэнтральная частка горада (сучасная плошча Свабоды, вул. Замкавая) у разглядаемы перыяд мела разгалінаваную драўляную дрэнажную сістэму – абавязковы элемент гарадскога добраўпарадкавання ў эпоху барока.

Вадаадводы вядомы ў Полацку з XII – XIII стст., яны размяшчаліся ўздоўж пляцовак гарадскіх сядзіб каля маставой. На тэрыторыі Вялікага пасада былі адкрыты рэшткі вадазборніка з дрэнажом і вадаадводам (калектарам). Вадазборнік быў зроблены ў заглыбленай частцы пабудовы першай паловы XVI ст., да яго прымыкаў дрэнаж, які, верагодна, злучаў вадазаборнік з "магістральным" ваддаадводам (Дук, 2003 а). Яшчэ адзін вадаадвод (калектар) злучаў будынкі езуіцкага калегіума з вул. Замкавай і быў пабудаваны каля 1835 года (Русаў, 1998. С. 261). Дрэнажны латок быў выяўлены С.В. Тарасавым у 1988 годзе на плошчы Свабоды, ён захаваўся на дліну 22 м, пры сярэдняй шырыні 0,3 м. Зроблены з масіўных дошак таўшчынёй 0,03 м, дліной 2 м (Тарасов, спр. 1084. С. 11). Канструкцыя вадаадводаў уяўляла сабой латок з дошак ці суцэльнага драўлянага бруса, зверху перакрытага накрыўкай.

Галоўнай часткай інтэр'ера жылля заможнага палачаніна ў XVI – XVIII стст. была вялікая камерная печ, якая акрамя утылітарнага прызначэння несла эстэтычную нагрузку. Багацце дэкору пячной кафлі напрамую залежала ад заможнасці гаспадара. Не выпадкова пераважная большасць полацкай гатычнай і рэнесанснай кафлі XV – XVI стст. была знойдзена на тэрыторыі Верхняга замка – месцы пражывання гарадскога патрыцыяту.

Прадстаўнікі вышэйшых саслоўяў нярэдка заказвалі кафлю з пэўнымі сюжэтамі. Паказальны прыклад выкарыстання ў адным пячным наборы рэнесанснай кафлі з выявай русалкі і мадонны (гл. мал. 10: 5, 8). Печ стаяла ў доме заможнага чалавека, верагодна, полацкага ўрадніка. Гаспадар яго карыстаўся паслугамі рамесніка, які быў добра знаёмы з заходнееўрапейскім рамяством. Майстар сумясціў на адной кафліне выяву марской дзевы і русалкі. Гаспадар дома, відаць, лічыў натуральным размя-

шчэнне ў адным пячным наборы язычніцкай выявы русалкі і іконаграфічнага вобраза мадоны.

Вусце камернай печы выходзіла ў суседняе памяшканне – гаспадарчую прыбудову – і выкарыстоўвалася для распальвання і падтрымання агню. Праём вусця закладалі жалезнай засланкай. Печ звычайна размяшчалася каля дзвярэй ці акна: у дадзеным выпадку жыхары больш кіраваліся практычнымі патрэбамі, а не агульнакампазіцыйным планам (Dąbrowska, 1970. S. 12). Працэсам абслугоўвання печы займалася прыслуга.

З XVI ст. прастора вакол печы высцілалася керамічнымі пліткамі падлогі, некаторыя з іх у XVII – XVIII стст. пакрываліся каляровай паліваю (знойдзены пліткі зялёнага і жоўтага колеру). Магчыма, што каляровыя пліткі выкладаліся як мазаіка ці чаргаваліся з тэракотавымі.

Мэбля ў будынках як заможных, так і простых гараджан была драўляная і даволі сціплая (Topolska, 2002. S. 225). Уздоўж сцен ("вколо") ставіліся лавы, якія нярэдка абіваліся тканінай чырвонага колеру (Молчанова, 1981. С. 31). У пакоях знаходзіліся стол з "заслонай" – шырокай пераноснай лавай і лавы (Археографический сборник документов..., 1867. С. 145). У XVIII ст. у дамах з'яўляецца драўляны ложак (Молчанова, 1981. С. 31). Ад пачатку XVIII ст., акрамя традыцыйных сталоў, лаў, скрынь, у будынках мяшчан паўсюдна з'яўляюцца крэслы (Topolska, 2002. S. 371). Гэта ў першую чаргу звязана з мадэрнізацыяй умоў паўсядзённага жыцця на заходні манер.

Мемуарная літаратура другой паловы XVIII ст. утрымлівае шэраг апісанняў інтэр'ераў заможных шляхецкіх дамоў. Паводле ўспамінаў С. Шантыра, сцены дома ў маёнтку Горсплі (Полацкі павет, цяпер – Расонскі раён) былі абабіты чырвоным палатном, размаляваны алейнымі фарбамі: першыя тры пакоі – ў стылі арабеска, наступныя – віньетамі на казачныя сюжэты. Падлога элегантна выраблена і адпаліравана. Усюды стаялі крэслы – разныя, маляваныя, пратраўленыя або "абабітыя пунсовымі адамашкамі". Сцены ўпрыгожвалі тры невялікія люстэркі для адбіцця святла свечак і тры гадзіннікі – з курантавым боем і зязюлямі (Мальдзіс, 2001. С. 309).

Пакоі мяшчан і шляхты з XVII ст. асвятляліся свечкамі з лою ці воску, якія ўстаўляліся ў керамічныя падсвечнікі (гл. мал. 37: 10; 48: 2). Свечкі ў XVIII ст. сталі прадавацца ў аптэках (Мальдзіс, 2001. С. 314). Прааналізаваўшы археалагічныя матэрыялы з Полацка, можна прыйсці да высновы, што керамічныя каганцы – бакалы, запоўненыя топленым тлушчам, з кнотам альбо анучкай пасярэдзіне, – выкарыстоўваліся пераважна як касцельныя свяцільнікі (гл. мал. 36: 8; 37: 5).

У XVIII ст. у заможнай шляхты і мяшчан пачалі з'яўляцца хрустальныя люстры і падсвечнікі. Падвешаныя да столі падсвечнікі называліся павукамі або каронамі, яны нярэдка мацаваліся на аленевых рагах (Мальдзіс, 2001. С. 314).

Абавязковым атрыбутам інтэр'ера былі спецыяльныя прысценныя паліцы, на якія выстаўляўся размаляваны керамічны посуд і посуд з каляровых металаў, у тым ліку і вельмі дарагі – срэбраны і пазалочаны, аздоблены каштоўнымі камянямі. Апошні сустракаецца пры археалагічных раскопках выключна рэдка, затое звестак аб ім багата ў інвентарных апісаннях. Напрыклад, у доме заможнага полацкага мешчаніна, лаўніка Якава Фёдаравіча Хадыкі, паводле вопісу маёмасці 1626 года мелася "срэбра дамовага" посуду і адзення: "чара одна великая, кубков белых пятнадцать, злотистый один, ложок злотистых тузин, ложек белых осьм, кгузиков злотистых тузины два, кгузиков з шмальцом шесть, сребра долядовых штук двадцать пять" (усяго згадваецца срэбранага посуду 69 прадметаў, цынавага – 96 прадметаў, меднага – 28) (Акты, издаваемые Виленскою археографическою коммисіею..., 1878. С. 468; Полоцк: Ист. очерк, 1987. С. 48). Пані Паланэі Иванаўне Наплошанцэ належыла "въ золоте, сребре, перлах, начыню злоцыстым и сребърънным белим, так же в охендоставе богословском, чамарах кунних, лиссих и в летниках розных, яко теж в цыне, меди, в быдлахъ, чого всего шацуючы на колко тысечей копъ" (Актавая кніга полацкага магістрата 1650 г., 2006. С. 96). Войт мястэчка Касарова Сямён Паўлавіч патрабаваў вярнуць незаконна затрыманыя полацкім мешчанінам Сямёнам Паўлавічам рэчы: "котълы мосендзовые тры за копъ пять и грошей дванадъцать, штофъки две ценовых за золотых шесть, лихтаровъ два, купленные за золотых шест, зкрыня з белыми хустами копъ двадцать, трыноги два за копъ две талеровъ за грошей трыдцать шест, а розных речей за коп десет, а мяновите челядниковых, которое пры нем зостало зъ заслужоным, чого всего рахуючы огулом на золотых двесте" (Актавая кніга полацкага магістрата 1650 г., 2006. С. 174). Мяшчане Васіль Марцюшонак, Сяргей Дзмітравіч і Дзмітра Калбека арыштавалі кацёл мешчаніна Сямёна Войтавіча за доўг у 11 коп гр. літ. (Актавая кніга полацкага магістрата 1650 г., 2006. С. 204). Лаўнік Васка Міхайлаў меў срэбраны з пазалотай гадзіннік, а ўдава Матронка Есіпава патрабавала вярнуць адабраныя ваяводай Мікітам Вельямінавым "девять блюд цыновыхъ, да стопу цыновую жъ, да лихтаръ медной тройной, а цена блюдамъ, стопе и лихтарю 5 руб." (запісы датуюцца 1664 г.) (Витебская старина, 1885. Ч. 2. С. 218 – 219, 221). Зямянка Дамінітра Варатынцава ў 1670 годзе завяшчала базыліянскаму манастыру пры кафедральнай царкве св. Сафіі срэбраны пояс і срэбраную чарку на ножке (ИЮМ, Вып. 25. С. 231).

Каштоўныя рэчы з каляровых металаў палачане ашчадна зберагалі, а ў часы ліхалецця нярэдка хавалі ў патаенных месцах. У полацкага мешчаніна Цітка Іванова было “поклажишко въ земли схоронено отъ пожарного времени на своемъ дворе 30 р. и пол-восма рубли розныхъ литовскихъ грошей да 2 стокана серебряныхъ (*падкрэслена аўтарам*), цена стоканамъ 6 р.”. Полацкі бурмістар Андрэй Касабуцкі скардзіўся на мешчаніна Івана Сысу, што той з памочнікамі ў красавіку 1678 года знайшлі каля свайго жылля, на зямле Касабуцкага, “вялікі старажытны скарб залатой і срэбранай манеты, пятакоў, полпятакоў і дробязі, коштам на некалькі дзесяткаў тысяч злотых” (ИЮМ, 1874. С. 333). Скарб быў знойдзены на Задзвінскіх пасадах.

У штодзённым побыце прадстаўнікі ўсіх саслоўяў у XVI – XVII стст. карысталіся драўляным і керамічным посудам (Topolska, 2002. S. 225). Паводле звестак Л.А. Малчанавай, інфармацыі пра ганчарны посуд у інвентарах маёнткаў значна менш, чым пра драўляны (Молчанова, 1981. С. 54). Даныя археалогіі пацвярджаюць выснову, што керамічны посуд пераважна прызначаўся для гатавання ежы ці выкарыстоўваўся як тарны. Штодзенна для сервіроўкі стала палачане выкарыстоўвалі драўляны посуд. У Полацку, як і ў іншых беларускіх гарадах, доля сталовага керамічнага посуду ў параўнанні з кухонным і тарным вельмі малая. Напрыклад, у даследаванай аўтарам пабудове першай паловы XVI ст. на долю керамічнага сталовага посуду прыпадаў толькі 1 фрагмент міскі з 444 фрагментаў керамічнага посуду, у пабудове канца XVI ст. (раскопкі Н.І. Здановіч) – 2,2 % ад агульнай колькасці *непаліванай* керамікі (Здановіч, 1998. С. 128).

У доме заможнага мешчаніна ці шляхціца існавала месца для захоўвання розных каштоўных рэчаў, у першую чаргу біжутэрыі і дарагога адзення. У Полацку знойдзена серыя маленькіх бронзавых ключыкаў ад куфэркаў, даўжыня якіх не перавышала 3 см. Ключыкі былі багата арнаментаваны і ўсе з’яўляліся функцыянальнымі рэчамі (Дук, 2003 б. С. 114; Дук, 2006 б. С. 45). Ключыкі прызначаліся для адмыкання рознага роду куфэркаў ці скрынак, у якіх звычайна захоўваліся каштоўныя рэчы і якія часта з’яўляліся аб’ектам крадзяжу.

Так, полацкі мешчанін Некраш скардзіўся ў магістраце на цыганак, якія купілі ў яго мёд і далей “безъ моей (Некраша – *Дз. Дук*) бытности, будучи мне на торгу, у в овторокъ … в дому моемъ пили и в тотъ часъ въ дворе моемъ пивъши (мёд – *Дз. Дук*) скакали и иншие дивные речи строили. А за тымъ у мене згинуло съ **скрынъки** двадцат копъ грошей и сыгнеты два, и иншие речи. Тое всее шкоды стало ми ся на трыдцат копъ грошей” (запіс у гродскай кнізе ад 26 лістапада 1533 года). Падчас судовага разбора было высветлена, што “тые пенези были въ коморе его (Некраша – *Дз. Дук*),

въ **малой скрынъце**, отъ которое жъ в него самого ключъ былъ. А тая дей, скрыночка была въ другой **скрыни великой**, отъ которое ключи были вътой же коморе на гвозде. А комора, дей, такожъ замком замкнута…" (Справы полацкага гродзскага суда, 1929. С. 221 – 222). Земянін Міхал Каменскі скардзіўся ў 1550 годзе на пакражу "осмънадъцать червоныхъ зъ шкатулы и ложъку сребную зъ дому моего на Крывъцовомъ посаде за рекою Двиною" (Актавая кніга полацкага магістрата 1650 г., 2006. С. 100). Вучань краўца Сямён Кудзенка "дорвалсе до шъкатулы пани свое, прыбравши ключ, немалую шкоду в забраню грошей учынил и з оным утеклъ на Заполоте…" (Актавая кніга полацкага магістрата 1650 г., 2006. С. 142).

У вялікіх скрынях захоўвалі рознае адзенне, футра і нават кнігі. Так, у Сафійскай саборнай царкве знаходзіліся "пять сундуковъ съ книгами съ печатными и съ писмеными и со всякими Литовскими письмами" (Витебская старина, 1885. Ч. 2. С. 278).

Са справы па абвінавачванню ў крадзяжы Аляксея Грышковіча ад 16 снежня 1644 года вынікае, што аб'ектам крадзяжу з'яўлялася скрынка, якая стаяла ў ізбе мяшчанкі Філкавічовай па вуліцы Вялікай, адкуль Грышковіч узяў "рэчаў не мала". Сярод іх: "каптурык аксамітны з накладкамі залатымі хвосцікамі куніцы абложаны, які каштаваў коп дзве, шапачку адамаскавую паношаную, 1 капа, фартух набіўны зялёны, 1,5 капы, каралі чырвоныя з жамчужынамі, 2 капы, золата да шыцця чвэрці тры а срэбра чвэрць, за абедзве 6 злотых польскіх, бляшкі залатой чвэрць адна за злотых 2, пярсцёнка 2 срэбраных каштавалі злоты польскі, шоўку чырвонага лотаў чатыры, за то злотых 2, перцу паўфунта, 0,5 злотых, усяго 11 коп і 6 грошаў літоўскіх" (Археографический сборник документов..., 1867. С. 361). У папа Іва...? саборнай царквы Сафіі Прамудрасці Слова Божыя скралі "поясъ серебреной позолочоный женской да карали женские жемчужные, а другие красные" (запіс 1664 г.) (Витебская старина, 1885. Ч. 2. С. 222).

Варта адзначыць, што адзенне як катэгорыя нерухомых артэфактаў абсалютна не прадстаўлена ў археалагічных калекцыях, за выключэннем выяў на асобных рэчах. У пісьмовых крыніцах згадваюцца "шуба кунья", "шубъка одомашъковая" (запісы 1533 і 1538 гг. адпаведна), "лисьи шубы и тонкого суконного платья", "шуба рысья подъ сукномъ краснымъ съ нашивкою золотою, и ожерелье было у той шубы рысье жъ, а цена... той шубы 70 рублев" (запісы за 1652 і 1664 гг. адпаведна) (ИЮМ, 1873. С. 400; Витебская старина, 1885. Ч. 2. С. 221), лісі кажух (запіс за 11 чэрвеня 1533 г.) (Справы полацкага гродзскага суда..., 1928. С. 163), жаночыя кашулі, намёткі, боты, чаравічкі (запіс за 1616 г.) (ИЮМ, Вып. 25. С. 241),

катанкі[11], летнікі[12] (Археографический сборник..., 1867. С. 320), сермяга[13], рукавіцы, вілчура[14] (Актавая кніга полацкага магістрата 1650 г., 2006. С. 104, 142). У актавай кнізе полацкага магістрата пад 1650 год згадваецца пра пакражу ў краўца Даніэля Лапцевіча чэляддзю "сукон пару новую фалендышовую[15] масти кгранатовой, с потребами коштовали копъ осмънадцат; шънурка къренцоного[16] едвабног(о)[17] локтей осмънадцат, кожны локот куповано по грошей шести полских; уберы новые фалендышовые, коштовали злотых дванадцат; шапъку фалендышовую лисию лазыровую, коштовала злотых шесть; боты новые чорные козловые, даны грошей сорок литовских" (Актавая кніга полацкага магістрата 1650 г., 2006. С. 91). У гэтай жа крыніцы прыгадваецца пра "чамару, баранми подшытую, люндышовую, лазуровую, насовен[18] люндышовый[19] туркусовый[20] и саян[21] китайчатый старый, ошанцовавъшы все огулом за копъ шеснадцать...", "колпакъ соболий чырвоны фалендышовый до спреданя, который кошътовал золотых осмъ полскихъ", "коц"[22], "поес сребърный в копах пети и грошей двадъцати" (Актавая кніга полацкага магістрата 1650 г., 2006. С. 60, 140, 144).

Адзенне мела дастаткова вялікі кошт, часам вышэйшы за кошт іншай маёмасці. Гэты тэзіс асабліва яскрава ілюструе згаданая вышэй справа Лакачэўскага. У прыватнасці, са справы можна даведацца, якая зброя і адзенне шляхціца сярэдзіны XVII ст. сталі аб'ектам рабавання. Самуіл Лакачэўскі страціў шаблю, якая каштавала дзесяць злотых, а таксама зялёны тонкага сукна кунтуш, коштам пяцьдзесят злотых, і зялёную аксамітавую шапку з собалем, коштам дваццаць пяць злотых (ИЮМ, 1874. С. 278). Полацкі каморнік Іванко Валынец скрадзіўся на рабаўнікоў, што тыя "сняли з мене сукно, сагайдакъ, шаблю и взяли две седле, епанъчу" (запіс ад 13 чэрвеня 1533 г.) (Справы полацкага гродзскага суда..., 1928. С. 167 – 168).

---

[11] Верхняя цёплая кароткая вопратка, куртка.
[12] Лёгкая сукенка; увогуле летняя вопратка.
[13] Верхняе адзенне з грубага нафарбаванага даматканага сукна, штодзённая вопратка.
[14] Адзенне з воўчай шкуры, вывернутай поўсцю вонкі.
[15] Гатунак тоўстага, пругкага галандскага ці французскага сукна.
[16] Кручаны, зроблены шляхам скручвання.
[17] Шаўковага.
[18] Халат.
[19] Зроблены з англійскага сукна.
[20] Бірузовы, блакітны.
[21] Жаночы плашч.
[22] Кілім, коўдра, плашч з авечай поўсці.

У аналагічную сітуацыю трапіў полацкі мешчанін і купец Сава Ермаловіч, на якога напаў атрад узброенай чэлядзі на пад'ездзе да Запалоцця. Паводле скаргі Ермаловіча, падчас бойкі "взяли зъ него и злупили сермягу, за копъ две грошей купеную, поесъ зъ мошъною крайки фалендышовое и зъ ножемъ взяли, а въ мошне взяли левъковых таляровъ дванадцать, до того взяли и пограбили коня, шерстю рыжог(о), купленог(о) за копъ пятнадцать грошей литовских, сани, купленые за за грошей шеснадцат, хомутъ зъ дугою ременный, справленый за золотыхъ пят, лейца – грошы два, бичык – грошъ полский, рукавицы з ысподками московские, купленые за полкопы грошей, до того взяли топор челяди п(а)на Шикуцкого на возе" (Актавая кніга полацкага магістрата 1650 г., 2006. С. 133).

Паўль Одэборн, аўтар апісання побыту насельніцтва Полаччыны 1580-х гадоў адзначае, што заможныя мужчыны і жанчыны апраналіся амаль аднолькава. Яны насілі доўгія рознакаляровыя кашулі з брытанскай тканіны. Для акантоўкі вопраткі яны нашывалі шаўковыя стужкі ды пазалочаныя шарыкі. І мужчыны, і жанчыны хадзілі ў ботах. Жанчыны насілі на галаве стужкі і высокія галаўныя ўборы, мужчыны – скураное нагалоўе ці лямцавыя капелюшы рознай афарбоўкі (Сагановіч, 2005. С. 181). Гэтае апісанне, відаць, датычыцца менавіта гарадскога насельніцтва, паколькі адзенне сялян адзначаецца асобна: "дочкі сялян носяць на шыі каралі са змяіных галоў. Просты ж народ вырабляе кашулі са скуры дзікіх звяроў і абутак з кары дрэў. Тут колькі сялян – столькі і шаўцоў" (Сагановіч, 2005. С. 181).

Наколькі адпавядае прыведзены матэрыял рэчаіснасці? Свядома не кранаючы апісанне адзення сялян, заўважым, што археалагічны матэрыял з большага пацвярджае прыведзеныя звесткі, прынамсі, той факт, што палачане напрыканцы XVI ст. насілі скураны абутак на цвёрдым абцасе, за выключэннем, хіба што, маргінальнай часткі (археалогія, на жаль, тут не прадстаўляе ніякай інфармацыі). "Пазалочаныя шарыкі" – гэта, верагодна, разнавіднасць гузікаў ці бразготак, прадстаўленых, хаця і абмежавана, у археалагічных калекцыях.

Адзенне, тканіна і дарагая біжутэрыя з'яўляліся прыярытэтным прадметам кантрабанды ў XVIII ст. Праз Полацкае ваяводства ў Себеж і Невель у 1765 годзе вывозіліся каралы, жэмчуг, нюрнбергская галантарэя, дарагая тканіна, тканая золатам і срэбрам парча, сукно, аксаміт, цяжкі шоўк, атлас, французская, англійская, шатландская, швабская, галандская і кітайская тканіна (Белоруссия в эпоху феодализма, 1960. С. 350). Па аб'ёму імпарту ўвоз тканіны традыцыйна, прынамсі, з першай паловы XVI ст. (магчыма, і раней), знаходзіўся на вышэйшых пазіцыях (Варонін, 2000 б. С. 48).

Відавочна, што археалагічны матэрыял разам з пісьмовымі крыніцамі дае каштоўную інфармацыю для характарыстыкі маёмаснага стану

асобных сацыяльных груп. У вывучэнні побыту полацкіх заможных мяшчан XVI – XVIII стст. прыярытэтнымі з'яўляюцца пісьмовыя крыніцы. Нерухомыя артэфакты гэтага часу захаваліся фрагментарна. Рэдкае знаходжанне ювелірных вырабаў падчас археалагічных раскопак тлумачыцца высокім коштам сыравіны (золата, серабра, бронзы). Ювелірныя вырабы часта ішлі на пераплаўку. У гэтай сувязі вельмі цікавым уяўляецца факт адкрыцця ювелірнай майстэрні XVII ст. на Вялікім пасадзе. Майстэрства полацкіх злотнікаў дазваляла ствараць функцыянальныя рэчы і ўпрыгожванні з бронзы, якія былі вельмі падобныя на залатыя і, верагодна, карысталіся вялікім попытам. Пісьмовыя крыніцы дэталізуюць маёмасныя прыярытэты насельніцтва і даюць уяўленне пра ступень заможнасці пэўнай часткі гараджан.

6.2. Арганізацыя жыццёвай прасторы прадстаўнікоў сярэдняга сацыяльнага стану і гарадскіх нізоў

У XVI ст. асноўнае гарадское насельніцтва складалася з мяшчан. Згодна "Попісу войска ВКЛ" у 1528 годзе ў Полацку жыло 384 сям'і мяшчан-баяр, у інвентарным апісанні полацкай рэвізіі (1552) мяшчанскія двары налічвалі 1494 адзінкі (Варонін, 2000 б. С. 69). Сярэдні слой гараджан ("паспалітыя людзі месцкія") прадстаўлялі майстры, падмайстры, вучні з ліку паўнапраўных гараджан, гандляры, уласнікі крам на рынках (Варонін, 2000 б. С. 66). Сярэдні слой у буйных гарадах у XVI – першай палове XVII ст. складаў да паловы ўсіх жыхароў (Полоцк: Ист. очерк, 1987. С. 71). Мяшчане адыгрывалі вядучую ролю ў сацыяльна-эканамічным развіцці горада на працягу ўсяго разглядаемага перыяду (Полоцк: Ист. очерк, 1987. С. 61).

Мяшчане адказвалі за падтрыманне ў парадку гарадской інфраструктуры (абрончыя ўмацаванні, дарогі, будынкі грамадзянскага прызначэння, масты). Апошняя катэгорыя нерухомых артэфактаў археалагічна не вывучана, па прычыне складанасці арганізацыі падводных археалагічных даследаванняў. Гэты накірунак у будучым можа стаць вельмі перспектыўным, паколькі Дзвіна ў межах гарадской тэрыторыі вельмі статычная, у рэчышчы ракі трапляюцца шматлікія артэфакты, якія па колькасці далёка пераўзыходзяць магчымасці традыцыйнай "наземнай" археалогіі. Акрамя таго, вада выдатна кансервуе металы і дрэва, што дазваляе спадзявацца на адкрыццё рэштак падводных драўляных канструкцый прычалаў, мастоў і нават сродкаў перамяшчэння. Прынамсі, звесткі пра масты праз Палату і Дзвіну неаднаразова згадваюцца ў пісьмовых крыніцах XVI – XVII стст. "Полоцкие мещане… они де мосты мостили, и струги и канаты на живой мост давали, и паромы строили и всякия поделки делали. И въ прошломъ

де 165 году, они же мещане, сделали у города рва сто шестесят саженъ мерныхъ” (запіс 1664 г.) (Витебская старина, 1885. Ч. 2. С. 270). Праз Палату рабілі стацыянарныя на палях масты (Без-Корнилович, 1855. С. 83), тады як праз Дзвіну масты рабіліся, як сведчаць “Запіскі аб Маскоўскай вайне” Гейдэнштэйна, “пабудаваныя па вядомай сістэме на пантонах” (Витебская старина, 1885. С. 206). У якасці пантонаў выкарыстоўваліся стругі, а месцы дзе працавалі паромы называліся перавозы.

Дарэчы, пра існаванне маста праз Дзвіну (стацыянарнага альбо пантоннага) сведчыць жалаваная грамата Стэфана Баторыя на заснаванне ў Полацку езуіцкага калегіума: “для сообщенія острова с городом, …мы даем той коллегіи полное право взимать с переправляющихся по мосту, на возстановленіе его, известную плату, по нашему указу” (Витебская старина, 1888. С. 1, л. 75). Гэты мост, верагодна, размяшчаўся насупраць Вялікага пасада ў раёне перакрыжавання сучасных вул. Леніна и Замкавага завулку, дзе праходзіла дарога на Вільню, як гэта пазначана на плане Полацка 1707 года і плане-рэканструкцыі Полацка XVI – XVII стст. А.К. Марэля (Иезуиты в Полоцке, 2005. С. 8; Чантурия, 2005. Рис. 187).

Са сродкаў перамяшчэння па Дзвіне ў пісьмовых крыніцах названыя стругі[23] і чоўны. Чоўны маглі мець парус і актыўна выкарыстоўваліся палачанамі для перавозу людзей цераз Дзвіну (Актавая кніга полацкага магістрата 1650 г., 2006. С. 195). Напрыклад, у заяве полацкага архіепіскапа Антонія Селявы ад 12 кастрычніка 1633 года прыводзяцца наступныя звесткі: “12 октебра, о године, може быть, предъ полуднемъ осмой, ехалъ зъ замку Полоцкого зъ двора моего архіепископского рекою Двиною въ чолноку къ монастыру Борисоглебскому, также нетъ ведома, хто съ Кривцова посаду зъ громады стоячого поспольства мещанъ Полоцкихъ зъ мушкету два разы окрутне выстрелилъ” (Витебская старина, 1888. Ч. 2. С. 141).

Дабрабыт палачан шмат у чым залежыў ад арганізацыі і рэгламентацыі гандлю і, адпаведна, уладкавання гарадскога рынку. Паводле прывілею Полацку на пацвярджэнне сваіх правоў і вольнасцей ад 11 сакавіка 1633 года, Полацк заставаўся асноўным гандлёвым цэнтрам рэгіёну, паколькі займацца гандлем можна было толькі ў самім “горадзе вялікім Полацкім”, а ў прадмесцях “рынкаў, таргоў, крамаў, рэзніц, мер ваг як публічных, так і прыватных ніхто мець не мае” (Доўнар, 2004. С. 46 – 47). У прывілеях 1580, 1591, 1633 гадоў гаворыцца пра двухтыднёвыя кірмашы, пачынаючы

[23] Карабель для перавозкі грузаў на далёкія адлегласці, асноўны сродак перавозкі тавараў з Полацка ў Рыгу, Віцебск і іншыя гарады, які змяшчаў ад 6 да 12 тыс. пудоў грузаў; меншыя караблі называліся плавуты, шкуты, паўшкуты (Полоцк: Ист. очерк, 1987. С. 46).

ад каталіцкіх свят Трох каралёў і дня апосталаў Пятра і Паўла (Доўнар, 2004. С. 47).

Пастановай магістрата ад 8 жніўня 1635 года вызначалася поўная рэгламентацыя працэса арганізацыі гандлю ў Полацку. Гандаль ажыццяўляўся ў крамах на рынку, пры гэтым месцы пад крамы вымяраліся на рынку камісіяй, якая складалася з прадстаўнікоў магістрата і з выбарных дэпутатаў ад мяшчан, а звесткі пра пляцы пад крамы запісваліся ў полацкія магістрацкія кнігі. Полацкі магістрат у дадзеным выпадку клапаціўся аб "аздобе" горада і гарадскога рынку. Паказальна, што дзеля гарадскога добраўпарадкавання выдатковаліся вялікія грошы з гарадской скарбніцы (Доўнар, 2004. С. 47).

Месца размяшчэння крамаў агароджвалася і мела браму. Самі крамы мелі строгі парадак размяшчэння, асобна прадугледжвалася існаванне спецыялізацыі ў гандлі з крам, гэтак сама як і размяшчэнне гарадскіх і прыватных крам у іншым месцы горада. Палачанам забаранялася мець прыкаморкі каля крам ці каля вялікіх крамных варот, не дазвалялася выпрошваць у магістрата "форткі крамныя", а магістрат не павінен быў даваць такіх дазволаў. Месца для крамаў даваў магістрат. Калі месца ў крамным радзе не хапала, то магістрат павінен быў даць жадаючаму іншае месца, але толькі на тэрыторыі рынка, хоць бывалі і выключэнні (Доўнар, 2004. С. 47).

Паводле Прывілею 1498 года кірмашы праводзіліся тры разы на год, кожны па два тыдні. Крамы працавалі, відаць, штодня (Варонін, 2000 б. С. 43). Падчас правядзення буйных кірмашоў для палачан рабіліся рознага роду відовішчы з выступленнем вандроўных тэатраў скамарохаў, а таксама публічныя мерапрыемствы гарадской улады, у тым ліку вынясенне прысуду і пакаранне карбачамі пьяніц і іншых злачынцаў. Пакаранне адбывалася на ганебным "камне". Для прывядзення прысуду (біццё карбачамі) ў XVII ст. існавалі палачы-"цэкляры", для біцця палкамі – "палачнікі" (Археографический сборник документов..., 1867. С. 389; Витебская старина, 1888. Ч. 1. С. 200). Так, за абразу полацкага бурмістра Каспара Лукі Глаўбіча мясніку Каспару Какорку быў вынесены прысуд: праз гарадавых палачнікаў пакараць сарака моцнымі ўдарамі палкамі, пасадзіць у турму ("въ темную") да ўплаты штрафу і забараніць год займацца рамяством. Аднак пасля заявы Какоркі аб перахрышчэнні сябе, жонкі і дзяцей ва уніяцкую веру яму дазволена было займацца рамяством (Витебская старина, 1888. Ч. 1. С. 200).

Як і ў іншых буйных гарадах, гандаль у Полацку быў арганізаваны па радах, магчыма, кожны рад меў свайго старасту (Варонін, 2003. С. 35). Паводле пісьмовых крыніц, на рынку размяшчаліся не толькі рады крамаў і лавак, але і жылыя дамы (Гардзееў, 2004. С. 51; ИЮМ, 1892. С. 357). Пры

гэтым на рынку сяліліся найбольш уплывовыя гараджане, як, напрыклад, полацкі бурмістр Крыштаф Старымовіч, дом якога стаяў у самім рынку на рагу вуліцы Бацечковай (запіс 1667 г.) (ИЮМ, 1895. С. 196). Магчыма, дамы былі двухпавярховыя, а першы паверх прызначаўся пад краму. У тэстаменце полацкага бурмістра Давыда Панкова 1559 года згадваецца пра прыналежнасць яму лавак па абодвум бакам у "местніцкім раду" на ўласнай зямлі: "А которие лавки мои новопостановъленые по обема сторонамъ у местницъкомъ ряду на моеи властнои земли кромъ тыхъ лавокъ, которие на Великии Торгъ стоять..." (Варонін, 2003. С. 39).

Лаўка (крама) прадстаўляла сабой тып гандлёвага збудавання, прамавугольнага ў плане, з навесам перад уваходам. Звычайна ў адным комплексе з лаўкай знаходзіліся жылыя, складскія і гандлёвыя памяшканні (Якимович, 1991. С. 359).

Важнай крыніцай вывучэння побыту і ўмоў штодзённага жыцця большай часткі гарадскога насельніцтва з'яўляецца грамадзянская забудова. Падчас раскопу А.Р. Мітрафанава на полацкім Верхнім замку была выяўлена вялікая колькасць пабудоў XVI – XVII стст. у чатырох будаўнічых гарызонтах.

Першы будаўнічы гарызонт (не раней за другую палову XVII ст.) захаваўся дрэнна. У другім (сярэдзіна XVII ст.) былі выяўлены рэшткі шасці будынкаў, тры з якіх з'яўляліся жылымі дамамі, а тры астатнія мелі гаспадарчае прызначэнне. Першую групу ўтваралі жылыя будынкі сярэдзіны XVII ст., рубленыя "в обло". Іх плошча ў сярэднім складала 25 кв м. Большасць з іх мела падлогу з тоўстых (да 10 см) дошак. Дошкі клаліся на падоўжныя і папярэчныя лагі, вакол якіх знойдзена зерне жыта, камень ад жорнава, салома. У двух будынках выяўлены развалы печаў, адна знаходзілася ва ўсходнім куце (Митрофанов, спр. 203).

Зрубныя гаспадарчыя прыбудовы з драўлянымі падлогамі дасягалі памераў 2,6 × 3,4 м, яны выкарыстоўваліся як жытніцы ці стойлы для жывёл. Двары гаспадарчых прыбудоў таксама мелі драўляны насціл, які клалі на падоўжных лагах.

Асноўнай будаўнічай прыладай па-ранейшаму заставалася сякера. Слядоў выкарыстання пілы ў будаўніцтве не выяўлена (Митрофанов, спр. 203. С. 34).

У трэцім будаўнічым гарызонце (першая палова XVII ст.) былі раскапаны два жылыя дамы, чатыры гаспадарчыя пабудовы, двор, мошчаны дрэвам, і калодзеж. Яны належалі не менш як двум сядзібам (Митрофанов, спр. 203. С. 10 – 13). Плошча аднаго з дамоў была 35 кв. м. Падлога ў два насцілы, пры гэтым дошкі былі пакладзены ў розных напрамках. Даўжыня будынка – 5,8 м, у паўднёва-заходнім куце выяўлены рэшткі печы.

Дом злучаўся з гаспадарчай пабудовай драўляным насцілам з тоўстых дошак. Цікавая канструкцыя насціла – дошкі забраны ў пазы падоўжных лаг, пакладзеных на адлегласці 3,4 м паралельна адна адной. На падвор'і знойдзена венца клодзежа (0,8 × 1,2 м), рубленага "в обло".

Памеры другога жылога будынка не вызначаны, зафіксавана наяўнасць глінабітнай печы ў паўднёвай частцы. Ад паўднёвай сцяны гэтага будынка пачынаўся частакол са шчыльна прыціснутых адзін да аднаго вертыкальных слупоў.

Асобныя гаспадарчыя пабудовы мелі памеры 4,6 × 4,6 м і 4,4 × 5,2 м, адна (2,9 × 2,9 м) прымыкала да жылога будынка. Як і ў жылых дамах, падлога з дошак мацавалася да драўляных лаг, паміж якімі знойдзена шмат зярнят культурных раслін.

Чацвёрты гарызонт, магчыма, належаў да XVI ст., ён захаваў характэрную папярэднім гарызонтам сістэму планіроўкі (Митрофанов, спр. 203. С. 6 – 38). Мацаванне сцен пры дапамозе слупоў-шул адзначаны толькі ў адным гаспадарчым будынку. У некаторых гаспадарчых прыбудовах сцены былі зроблены не з бярвёнаў, а з тоўстых дошак, якія мацаваліся ў прадольных пазах вертыкальных слупоў. Выкарыстоўваліся яны як сені альбо як крытыя двары з драўляным насцілам. Як і ў другім-трэцім гарызонтах, пэўная плошча сядзібнага комплексу заставалася вольная ад забудовы і была выкладзена тоўстымі дошкамі.

Збудаванні ўсіх чатырох гарызонтаў загінулі ў агні – пабудовы і вымашчаны двор адлюстроўваюць сляды вялікага пажару.

Падчас раскопак С.В. Тарасава на плошчы Свабоды ў 1987 годзе першы будаўнічы гарызонт на тэрыторыі Вялікага пасада аднесены да XVII – XVIII стст. (Тарасов, спр. 1014. С. 5) Драўляная маставая вуліцы, шырынёй 2 – 2,5 м, закладзена ў XVII ст., хоць пачатак яе існавання адносіцца да XII – XIII стст. Вуліца захавала на працягу стагоддзяў не толькі сваі памеры і напрамак, але і асноўныя канструкцыйныя асаблівасці (!).

Другая вуліца датуецца канцом XVI – XVII стст. Існавала яна нядоўга – перакрыццё яе складалася толькі з аднаго насцілу. Вуліца мела шырыню 5,0 м і арыентавана па накірунку поўнач – поўдзень. Папяпрэчныя бярвёны-плахі дыяметрам 10 – 15 см укладаліся на прадольныя лагі таго ж дыяметра. Даўжыня прадольных лаг складала 3,8 – 4,0 м. Лагі мацаваліся да зямлі пры дапамозе вертыкальных калкоў. Тарцы папярочных лаг, якія выступалі на 0,5 – 0,8 м за прадольныя лагі, падтрымліваліся слупкамі дыяметрам 0,2 – 0,3 м. Месцамі вуліца пад прамым вуглом злучалася з мошчанымі дошкамі падвор'ямі ці пабудовамі. Гэтая вуліца была адной з асноўных на тэрыторыі пасада (Тарасов, спр. 1014 . С. 7, 13.).

У цэнтральнай частцы раскопа выяўлены падмуркі пабудоў канца XVII – XVIII стст. Яны абапіраліся на драўляныя лагі даўжынёй 10 – 11 м.

Цалкам даследавана адна зрубная пабудова, памерам 3,8 × 3 м. Каля зруба ў чатыры вянцы захаваўся рад укапаных слупоў дыяметрам да 0,3 м. З усходняга боку знаходзіліся невялікія дзверы і лесвіца шырынёй 1,5 м. Слядоў драўлянай падлогі не выяўлена, што разам з сістэмай слупоў дазваляе вызначыць пабудову як гаспадарчую падклець.

Пабудовы канца XVIII ст. па вул. Сака і Ванцэці, выяўленыя падчас археалагічнага нагляду П.А. Русава за будаўнічымі работамі, змешчаны на каменным падмурку. Каля асновы падмурка пакладзены драўляныя брусы сячэннем 15 × 20 см. Удалося высветліць толькі памеры асобных сцен дамоў: ад 4 да 8 м. Пабудовы мелі драўляную падлогу на лагах з тоўстых бярвён. У запаўненні некаторых пабудоў трапляліся рэшткі скуранога абутку, што можа сведчыць пра існаванне на гэтым месцы рамесных майстэрняў (Русаў, спр. № 103. С. 4).

Рэшткі драўлянага дома канца XVIII ст. на каменным падмурку былі выяўлены і часткова даследаваны на месцы склепа дома № 15 па вул. Талстога падчас рамонтных работ. Падмурак дома канца XVIII ст. быў часткова заглыблены ў пласт першай паловы XVIII ст. і быў зроблены з каменю на вапнавым растворы, шырыня падмурка – 0,4 м. У доме знаходзілася печ, падмурак якой быў складзены з камянёў на глінянай рошчыне. Каля печы былі знойдзены рэшткі сценавай кафлі з белай і зялёнай эмаллю. Унутраныя сцены дома таксама ўзведзены на каменным падмурку. Дом праіснаваў да другой чвэрці XIX ст. (Салаўёў, 2004. С. 67).

Дагэтуль, у першай палове XVIII ст. на тэрыторыі паўночнай часткі Вялікага пасада, у раёне вул. Талстога, пераважала драўляная забудова. Зрубы былі ўладкаваны на зямлі на гэтак званых драўляных чурбанах. Магчыма, тут жылі заможныя рамеснікі (злотнікі?), якія працавалі з каляровымі металамі. Гледзячы па археалагічнаму матэрыялу, дамы мелі печы з размаляванай сценавай і паліванай кафляй, шкляныя вокны (Салаўёў, 2004. С. 68).

Сярод рэшткаў адной з пабудоў XVIII ст. (раскопкі Н.І. Здановіч па вул. Леніна, 35) знойдзены 8 фрагментаў свісцёлак з ангобным роспісам (гл. мал. 51: 13 – 20). Развалы двух печаў указваюць на два этапы існавання будынкаў. Першая печ існавала ў першай палове XVIII ст. і была зроблена са сценавай кафлі са змешчанай рамкай, паясковай паліхромнай кафлі, балясін з белай эмаллю і каронак (Здановіч, спр. 1450. С. 4). Другая печ пабудавана ў сярэдзіне XVIII ст. (знойдзена кафля і пячная дуга з адбіткам дзяньгі 1743 г.) (Здановіч, спр. 1450. С. 4).

Пра побыт сярэдняга сацыяльнага слою мяшчан у XVI – пачатку XVII ст. дае ўяўленне даследаванне двух археалагічных комплексаў, якія размяшчаліся на Вялікім пасадзе – асноўным месцы жыхарства полацкіх мяшчан.

Драўляны будынак першай паловы XVI ст. быў змешанай канструкцыі памерам 3,45 × 3,3 м. Частка пабудовы была зрубнай: паўночна-заходняя частка – на вышыню да 0,8 м (чатыры венцы); паўночна-ўсходняя – на вышыню 0,65 м (тры венцы). У аснову былі пакладзены абчэсаныя з двух бакоў тоўстыя сасновыя і яловы плахі – такі быў ніжні ярус пабудовы. З верхняга яруса захаваліся толькі дзве дошкі на вышыню 0,3 м. У доме знаходзілася печ, зробленая з міскавай і гаршковай кафлі (знойдзены шматлікія фрагменты). Пабудова мела керамічныя пліткі падлогі, склеп пад драўлянай (але, не выключана, керамічнай) падлогай, дрэнаж (Дук, 2003 а). Паходжанне незвычайнай канструкцыі звязана з цэнтральнаеўрапейскім уплывам (Паўночная Швейцарыя, Паўночная Германія, Польшча) (Piekalski, 1995. S. 122; Piekalski, 1996. S. 81). Істотнай рысай будынкаў каркаснага тыпа з’яўляецца наяўнасць наземных плах, па краях якіх змяшчаліся апорныя слуповыя элементы драўлянага каркаса. Пры гэтым некаторыя будынкі мелі склепы глыбінёй 1,4 – 1,8 м ці заглыбленую на 50 см ніжнюю частку (Piekalski, 1995. S. 110 – 111). Такія пабудовы з’яўляліся месцам жыхарства мяшчан (Piekalski, 1995. S. 114, 118 – 119).

Вокны дома былі зроблены з паўпразрыстага шкла зеленаватага адцення, якое ўстаўлялася ў свінцовую аправу. У раскопе былі знойдзены нажы, жалезны лучнік з трыма зажымамі, жалезная сякерка, замок, дэталі аконнага і дзвярнога набору (гл. мал. 55; 57: 6 – 7). Жыхары пабудовы карысталіся адметным белагліняным посудам. З прадметаў гігіены знойдзены керамічны рукамый, які падвешваўся на вяроўцы і ў залежнасці ад патрэбы мог нахіляцца ў два бакі. У пабудове знаходзіліся дэкараваныя керамічныя флягі, якія зручна было браць з сабой у дарогу, бакалец, донца шкляніцы і інш. У адным з кутоў склепа была ўкапана драўляная бочка накшталт калоды з накрыўкай. У бочцы маглі захоўвацца розныя харчовыя запасы (напрыклад, салёныя грыбы, агуркі, квашаная капуста і інш.). Па пісьмовых крыніцах вядома, што ў склепах палачане захоўвалі таксама і пітную ваду (ИЮМ, 1874. С. 291). На падлогу склепа была пакладзена драўляная засаўка вусця дрэнажу і драўлянае донца ад берасцянкі. Прааналізаваўшы рэчавы інвентар, можна прыйсці да высновы, што пабудова належала мяшчаніну ці шляхціцу сярэдняй рукі (Дук, 2003 а).

Будынак канца XVI ст. (раскопкі Н.І. Здановіч) прадстаўляў сабой зрубную драўляную канструкцыю (4,6 × 3,8 м) з драўлянай падлогай на глінянай аснове і кафлянай печчу. Пабудова была заглыблена ў мацярык на 0,5 – 1,2 м (Здановіч, спр. 1450. С. 3, 5). Вокны месціліся ў паўднёвай

сцяне дома, якая выходзіла да Дзвіны. Уваход у будынак зроблены з усходу. Печ знаходзілася пасярэдзіне пабудовы на адлегласці 0,5 м ад заходняй сцяны (Здановіч, 1998. С. 130). З рэчавага інвентару знойдзены шкляны посуд (14 фрагментаў начынняў і 7 кавалкаў ваконных шыбак) (Здановіч, 1998. С. 130). Гэты дом быў часткай сядзібы шляхціца, які, верагодна, знаходзіўся на службе ў полацкага ваяводы Мікалая Дарагастайскага. На думку Н.І. Здановіч, у сядзібе было не менш за тры будынкі (мал. 83) (Здановіч, 2003. С. 135). Два з іх – гэта жылыя будынкі гаспадароў, а адзін, размешчаны ў глыбіні падвор'я пад гарой, мог прызначацца для прыслугі ("чорных людзей").

Пабудовы, дзе знайшлі геральдычную кафлю, размяшчаліся на пэўнай адлегласці ад вуліцы (сучасная вул. Леніна). Прастора паміж домам і вуліцай прызначалася для агародчыка (кветніка, палісадніка), агароджанага, як і ўся сядзіба, плотам з варотамі. Калі абодва гаспадарчыя будынкі адносіліся да аднаго сядзібнага комплексу, то яго плошча была не менш 300 кв. м. Двор меў форму чатырохкутніка, дамы будаваліся па ўсяму "пляцу", але са строгай арыентацыяй па баках свету (Здановіч, 2003. С. 135).



Малюнак 83 – План-схема размяшчэння розначасовых будынкаў на даследаванай пляцоўцы каля дома па вул. Леніна, 35 (паводле Н.І. Здановіч) (Здановіч, 2002. Мал. 2): № 1 – 3 – дамы XVI ст.; № 4 – 5 – дамы XVIII ст.; № 6 – дом канца XVIII – XIX ст.

Абодва комплексы аб'ядноўваюць наступныя прыкметы: 1) адносна невялікая плошча пабудоў (да 17,5 кв. м) і заглыбленая ў мацярык ніжняя частка; 2) наяўнасць у будынках шкляных акон: у абедзвюх пабудовах выяўлены прамавугольныя і трохвугольныя шыбкі; 3) пабудовы мелі драўляную падлогу, прастора каля печы была выкладзена керамічнымі плітамі; 4) сталовы і тарны посуд, мяркуючы па адсутнасці ці малой колькасці адпаведных вырабаў з гліны, быў драўляны.

Не выключана, што раскапаныя ніжнія часткі абедвюх пабудоў з'яўляліся падклецямі.

У XVI – першай палове XVII ст. нярэдкімі сталі драўляныя будынкі, падлога якіх зроблена з тэракотавых плітак ці была глінабітная (Здановіч, спр. 1450. С. 5; Здановіч, спр. 1447. С. 7). Падмурак аднаго з даследаваных дамоў XVI ст. утваралі камяні, на якія клалі ніжнія бярвёны (Здановіч, спр. 1450. С. 4 – 5). У XVIII ст. масавай з'явай сталі будынкі з бутавымі падмуркамі (Здановіч, спр. 1447. С. 7).

Адзінкай землеўладання ў Полацку, як і ў іншых беларускіх гарадах, з'яўляўся "пляц". Звычайная сядзіба палачаніна – гэта комплекс жылых і гаспадарчых пабудоў, куды ўваходзіць, таксама, двор, плот, калодзеж і, як правіла, агарод. Двары часцей за ўсё былы машчоныя дрэвам. Асноўныя рысы, якія характарызуюць масавую грамадзянскую забудову Полацка XVI – XVIII стст., наступныя: 1) пераважаў драўляны характар будаўніцтва; 2) адносна невялікай была плошча жылых пабудоў (ад 17,5 да 35 кв. м) і ўсяго прысядзібнага комплексу (сярэдняя плошча ад 100 – 160 да 300 кв. м); 3) непрацяглы час існавання будынкаў (ад некалькіх гадоў да двух-трох дзесяцігоддзяў).

Плошча сядзібнага комплексу магла вагацца ў залежнасці ад яго месцазнаходжання – на Вялікім пасадзе ці на Верхнім замку. Надзейнае вызначэнне плошчаў сядзіб XVI – XVII стст. магчыма толькі па матэрыялах археалагічных раскопак на Верхнім замку. Відавочна, што тут іх плошча магла быць меншай. На Вялікім пасадзе даных для такога вызначэння пакуль што недастаткова, але дапушчальна, што на пасадах плошча асобных сядзіб была болей за 300 кв. м. У прыватнасці, гэта тычыцца сядзібы, раскапанай па вул. Леніна, 35.

Тэхналогія масавай грамадзянскай забудовы ў XVI – XVIII стст. заставалася даволі кансерватыўнай: на месцы старых будынкаў узводзіліся новыя, якія нярэдка паўтаралі абрысы папярэдніх пабудоў. На працягу XVI – першай паловы XVIII ст. памеры і размяшчэнне будынкаў, планаванне вуліц істотна не мяняліся. Толькі ў другой палове XVIII ст. назіраецца павелічэнне плошчы будынка і распаўсюджванне падмуркаў на каменнай аснове.

Большасць людзей ў XVI – XVII стст. па-ранейшаму сялілася ў невялікіх драўляных будынках. Гэта можа тлумачыцца высокай шчыльнасцю забудовы Вялікага пасада. Згодна з падлікамі В.А. Вароніна, у 1552 годзе на Вялікім пасадзе месціліся 769 двароў (Варонін, 2000 б. С. 29). Разам з дварамі шляхты, духавенства, яўрэйскай абшчыны і гарадской беднаты, якія не ўлічваліся рэвізорамі, колькасць двароў магла быць значна большай (па звесткам Лебедзеўскага летапісу на Вялікім пасадзе ў 1563 годзе згарэлі 3 тыс. двароў) (Варонін, 2000 б. С. 29). Пры гэтым частка пасада была занята нежылымі пабудовамі (крамамі, лазнямі, важніцамі і г.д.).

Па аналогіі з Віцебскам можна адзначыць, што гарадская бедната мела дамы ў выглядзе прымітыўнага тыпа адназрубнай клеці з невялікімі вокнамі, пакрытай двухсподнай страхой. Яны звычайна стаялі на зямлі і нічым не адрозніваліся ад беднай вясковай хаты. Як вынікае з выявы “Чарцяжа” г. Віцебска 1664 года, гэтыя дамы былі курныя, некаторыя мелі ў жылой палове прыруб у выглядзе маленькай нізкай клеці пад асобнай страхой, якая была халодная і мела службовае прызначэнне. У Віцебску да ліку такіх пабудоў належала значная частка дамоў у пасадах і крам на рынку (Красьнянскі, 1928. С. 46). Відаць, такая ж карціна назіралася і ў Полацку. Па аналогіі з курнымі сялянскімі дамамі XVIII ст. можна заўважыць, што сцены дамоў бедных гараджан некалькі разоў на год (да каляд і Вялікадня) маглі бяліцца вапнай, але ад густога дыму яны хутка зноў чарнелі (Мальдзіс, 2001. С. 302). Пра звычай бялення ўнутраных сценаў бедных дамоў ускосна сведчыць прысутнасць лінзаў і прапластачак вапны ў культурных напластаваннях XVI – XVIII стст.

Сядзібы людзей сярэдняй заможнасці, па аналогіі з тым жа Віцебскам, утваралі будынкі, якія складаліся з двух аднолькавых зрубаў, злучаных сенямі і пакрытых адной агульнай двухсподнай страхой. Некаторыя будынкі пастаўлены на падклець. Сядзіба была агароджана плотам, дамы мелі комін (Красьнянскі, 1928. С. 46).

У асобных дамах маглі сумесна пражываць некалькі сем’яў. Паводле пастановы магістрата 1656 года, дзве сястры павінны былі “спокойно мешкати” у доме іх швагра разам з шаўцом Пятром Андрэевічам “ажъ до прыезду его самог(о)” (Гардзееў, 2004. С. 55). Было вырашана, што “им, Петровнам, (*займаць плошчу – Дз. Дук*) у светлицы под окномъ, што противъ печы ку подворю, и на куте под другим окном, а Петру шевъцу под окном запечним. А до варенья стравы волная им маеть быт печь у в ызбе, где ковал мешкаетъ, в том же дому” (Гардзееў, 2004. С. 55). Атаясамленне тэрмінаў “ізба” і “святліца” як асобных пакояў у дадзеным выпадку вельмі цікавае. Гэта, відаць, было натуральным, калі ўлічыць простую канструкцыю глінабітнай печы. Будынак меў тры акны, адно акно

знаходзілася насупраць печы і выходзіла на падвор'е, другое – знаходзілася бліжэй да кута, верагодна, смежнай сценкі, і трэцяе акно было запечным. Паколькі дакумент рэгламентуе размяшчэнне спальных месцаў, то вынікае наяўнасць у доме трох лаваў. Гэтыя лавы былі драўляныя і размяшчаліся ўздоўж сцен каля акон. У ізбе была таксама печ для гатавання стравы, паводле сведчання Паўля Одэборна, у XVI ст. прэсны хлеб выпякалі ў кожным доме (Сагановіч, 2005. С. 171).

Графічная рэканструкцыя інтэр'ера звычайнага палачаніна другой паловы XVI – XVII стст. прадстаўлена на малюнку 84.



Малюнак 84 – Графічная рэканструкцыя інтэр'ера жылля палачаніна сярэдзіны XVI – XVII стст.

У XVII ст. у беларускіх гарадах рэзка павялічваецца прыток уважных тавараў асабістага ўжытку, у прыватнасці віна і піва (Котлярчук, 2001. С. 50, 215). У XVI ст. віно было дастаткова рэдкім таварам, вядома нават, што ў 1580-я гады пры яго адсутнасці ў цэрквах выкарыстоўвалі гатаваны мёд (Сагановіч, 2005. С. 171). Ужыванне дарагога ўвазнога віна ў асяроддзі беларускай шляхты і мяшчан садзейнічала пашырэнню вытворчасці шкляного посуду як абавязковага атрыбута застолляў з выпіўкай. Пасля такіх застолляў нярэдка адбываліся бойкі і нават пагромы. Так, гайдукі полацкага замка скардзіліся на пагром карчмы і дамоў, дзе жылі іх сем'і, які ўчынілі ў 1652 годзе "преподобные отцы" Градзіцкі і Іосіф з памочнікамі і

прыслугай: “преподобные же отцы въехавъ въ ворота, начали бить и тиранить сихъ стражниковъ; …собрали тамъ всю прислугу, бывшую налицо, и приказали ей вооружиться” (ИЮМ, 1874. С. 261). Падчас далейшага пагрому былі збіты жонкі і дзеці гайдукоў, выбіты рамы са шкельцамі, пасечаны лаўкі, адбіты прабоі[24] ў кладоўках і сенцах (ИЮМ, 1874. С. 261 – 264).

Распаўсюджванне ў XVII ст. моды на імпартныя хмяльныя напоі не выцесніла традыцыйнай мясцовай вытворчасці гарэлкі і мёду. З пісьмовых крыніц першай паловы XVI ст. вынікае, што папулярным хмяльным напіткам у полацкіх мяшчан было піва і мёд: “будучы у пиве у в одного человека господаръского и человека его збилъ” (запіс у гродскай кнізе ад 16 сакавіка 1533 г.), “будучи у пиве у человека мещанского Андрея Чеха и мене безъвинъне збилъ” (запіс ад 29 красавіка 1533 г.) (Справы полацкага гродзскага суда, 1929. С. 119, 127), “за напитием меду пограбил у мене мушъкет и ручницу” (Актавая кніга полацкага магістрата 1650 г., 2006. С. 134). Асобныя застоллі, відаць, суправаджаліся граннем на музычных інструментах, у прыватнасці цымбалах, што неаднарозова ўзгадваецца ў актавай кнізе полацкага магістрата 1650 года.

З XVI ст. захаваліся звесткі, што асобныя полацкія мяшчане да смерці п’юць гарэлку і мёд, гуляюць у карты. 14 мая 1535 года двое мяшчан Васко Міцьковіч і Максім Радзьковіч на падпітку селі гуляць у карты, гулялі ўсю ноч з панядзелка да аўторка, у выніку Максім Радзьковіч распрануў свайго сябра да кашулі. Назаўтра Васко Міцьковіч узяў “с полътину грошей” і адыграў “платья и ковшовъ серебныхъ” разам з “жупицай” Максіма, аднак калі ўжо збіраўся сыходзіць, то гаспадар з прыяцелямі заступіў яму дзверы і збіў, забраўшы ўсе рэчы (Справы полацкага гродзскага суда, 1928. С. 260 – 261).

За часам адсутнасці дома мужа (сюжэт, як бачым, стары) здаралася нямала кур’ёзных сітуацый. Так, мешчанін Аўгустын Ляўданскі, будучы “на весяле” на Востраве, граў на цымбалах. У гэты час яго жонка Кацярына Пашкевічоўна забрала з дому мужа рэчы “ад мала да вяліка”: хусткі, пасцельную бялізну, асабістыя рэчы мужа, а таксама пенязі і ўцякла (Актавая кніга полацкага магістрата 1650 г., 2006. С. 168 – 169). Магчымым матывам дзеянняў жанчыны з’явілася прага мужа да спажывання алкаголя.

Як і зараз, злоўжыванне хмяльнымі напоямі нярэдка правакавала цяжкія злачынствы. Так, мешчанін Марк Сыса, “выпивши полгарнца пива и за одинъ грошъ водки” насмерць збіў сваю цяжарную жонку, за што і

[24] прабой – металічная дужка, убітая ў дзверы, якая выкарыстоўваецца для навешвання замка.

быў пакараны адсячэннем галавы на рыначнай плошчы (запіс у гродскай кнізе ад 8 лютага 1683 г.) (ИЮМ, 1874. С. 275).

Супраць злоўжывання хмельнымі напіткамі прымаліся адэкватныя меры: па справе краўца Фёдара Біндаса ад 4 чэрвеня 1649 года гродскі суд вынес прысуд, па якому "его вольно до турмы взяти… и бить на камне на рынке публично карбачами" (Археографический сборник документов..., 1867. С. 361). Гарадская турма ў XVI ст. размяшчалася на Верхнім замку каля двара епіскапа: "везенья до замку на врадъ гродскій Полоцкій" (Витебская старина, 1888. Ч. 1. С. 142), а ў другой палове XVII ст. – у будынку ратушы (ИЮМ, 1874. С. 285).

Паводле прывілею Полацку на Магдэбургскае права 1498 года, права мець корчмы належала ўсім жыхарам горада. У 1503 годзе сярод уладальнікаў корчмаў згадваюцца: уладыка, баяры, мяшчане і валасныя людзі, аднак у гэтым жа годзе права валодання корчмамі было перададзена Аляксандрам асобным уладальнікам: Скеп'еўскаму, Гарапчаніну і Пушкаровым (Полоцкие грамоты, 1978. С. 204), у 1509 годзе такое ж права было выдадзена Жыгімонтам I смаленскаму старасце А.Я. Рэбічковічу (Полоцкие грамоты, 1980. С. 42). Менавіта ім дазвалялася "мёд и пиво почати варити" і двойчы на год выплочваць падаткі ў каралеўскую казну (Полоцкие грамоты, 1978. С. 204).

У 1633 годзе Уладзіслаў дазволіў палачанам, прыкладам горада Вільні, мець не часовае бяспошліннае рассычэнне мёду, а на працягу ўсяго года рассычаць мёд "у доме брацкім... пры ратушы на то збудаваным". У брацкім доме дазвалялася "віно малмазію і іншае прывазное" прадаваць без капшчызны і іншых падаткаў. Палачанам дазвалялася ў сваіх дамах трымаць для ўласнай патрэбы розныя напоі, без усялякага даходу і падаткаў гораду і дзяржаве, за выключэннем выпадкаў гандлем імі. Гандляваць напоямі дазвалялася любому мешчаніну (мець у сваім доме "корчмы" і "шынкі") пры ўмове ўплаты адпаведных падаткаў, за выключэннем бурмістраў (Доўнар, 2004. С. 48).

Па сведчанню Паўля Одэборна, напрыканцы XVI ст. аднымі з пастаянных наведвальнікаў корчмаў былі "русінскія" святары, што адлюстроўвае адну з праяў крызісу праваслаўнай царквы другой паловы XVI ст. Одэборн адзначае, што "ў грамадскіх корчмах яны па ўсіх днях п'юць цёмнае віно. І калі потым ужо не служаць ні розум, ні ногі, яны часта валяюцца проста сярод плошчы, быццам мёртвыя, і засынаюць. ...Калі ж на наступную раніцу яны вяртаюцца ў храм для таго, каб правіць набажэнства, то нічым не менш шануюцца і паважаюцца людам" (Сагановіч, 2005. С. 173).

Палачане ў XVII стст. маглі варыць піва і вырабляць гарэлку для ўласных патрэб. Напрыклад, у пералічэнні маёмасці лаўніка Я.Ф. Хадыкі згад-

ваецца “медь: котелъ пивный одинъ, домовый, котелъ горелочный безъ трубъ” (Акты, издаваемые Виленскою археографическою коммисіею, 1878. С. 468).

Вольны час жыхары горада бавілі ў інтэлектуальных і азартных гульнях (шахматы, косці, карты). Па сведчанню Паўля Одэборна, у XVI ст. пад час гулянак “русіны”[25] гулялі ў карты і косці. Але з найбольшым спрытам яны гулялі ў шахматы, “калі два варожыя каралі – белы і чорны – змагаюцца паміж сабой за славу з войскам двух колераў. У гэтай гульні яны (“русіны” – *Дз. Дук*), насамрэч, такія дасканалыя, што я не ведаю, ці мог бы параўнацца з імі які-небудзь народ” (Сагановіч, 2005. С. 180). Вялікая колькасць танных керамічных шарыкаў (па матэрыялах раскопак аўтара на Вялікім пасадзе ў сярэднім на 12 – 16 кв. м стратыграфічных пластоў XVII – XVIII стст. прыходзіцца па 1 мурмельшпілю) сведчыць аб папулярнасці гульні ў шарыкі сярод шырокага кола гарадскога насельніцтва.

З пачатку XVII ст. пачынае распаўсюджвацца звычай ужывання тытуню. Забарона полацкім мяшчанам тытунёвай арэнды датуецца 17 снежнем 1638 года (Археографический сборник..., 1867. С. 309). У XVIII ст. паленне становіцца з’явай масавай. Адлюстраваннем гэтага працэсу з’яўляецца частае знаходжанне керамічных люлек і муштукоў у культурных пластах канца XVII – XVIII стст.

У XVI – XVII стст. горад прыцягваў вялікую колькасць збяднелых сялян (“чорных людзей”) (Варонін, 2000 б. С. 66). Асабіста вольнае збяднелае сялянства – “лёзныя” і “гульцяі” – з’яўлялася гарадскімі жыхарамі (мяшчанамі), аднак паўнапраўнымі гараджанамі лічыліся тыя, хто меў нерухомую маёмасць (“оселость”). “Лёзныя” і “гульцяі” арандавалі жылое памяшканне ў гараджан. У крыніцах яны фігуруюць як “каморнікі” (Копысский, 1966. С. 58 – 60). Частка “чорных людзей” працавала па найму (“найміты”, “парабкі”, “слугі”) ці займалася купляй-продажам тавараў (“перакупнікі”). У Полацку “лёзных” наймалі на гандлёвыя караблі для аховы купецкіх абозаў (“молодцы”) (Копысский, 1966. С. 61). Маргінальныя групы гарадской беднаты (“лёзныя”, “жабракі”) складалі да 10 % насельніцтва (Котлярчук, 2001. С. 43).

Жылыя пабудовы гарадской беднаты падзяляліся на белыя і чорныя. У белай знаходзілася печ з адкрытым вусцем, якое нярэдка выходзіла ў стайню ці куратнік. Насупраць вусця размяшчалася гліняная лава (Topolska, 2002. S. 371). У XVII ст. працягвалі вырабляць гаршковую кафлю, печы з гаршковай кафлі мелі утылітарнае значэнне і клаліся ў дамах бедных гараджан (Дук, 2001 б. С. 44).

[25] Маюцца на ўвазе жыхары Паўночнай Беларусі, беларусы.

З вопісу маёмасці полацкага мешчаніна Марка Сысы за 6 лютага 1683 года вынікае, што самымі каштоўнымі рэчамі з пераліку больш чым 50 прадметаў з'яўляліся: "жупан голубого цвета, выделанных овчин 5, медный котелок, гарусный пояс, лисья шапка, замок без ключа, утюг, железная кочерга, серп и топор, …бердыш, …оловянная фляжка в полкварту, сундук, ушат с крышкою, …железный шворень[26]…нож в ножнах, безмен и железный бурав…" (ИЮМ, 1875. С. 287 – 288). У пераліку не пазначаны драўляны і керамічны посуд (за выключэннем карыта і квашні), што сведчыць, па-першае, пра адсутнасць больш дарагога паліванага начыння, па-другое, пра нізкі кошт звычайнага драўлянага і керамічнага посуду (гаршчкоў, місак, збаноў і інш.). Пры гэтым дом мешчаніна меў шкляное акно, якое ўзімку для захавання цяпла закладвалася снегам (ИЮМ, 1875. С. 278).

Звычай закрываць на ноч вокны для захавання цяпла і для абароны ад чужога вока шырока практыкаваўся, сведчаннем чаго з'яўляецца абвінавачванне полацкай шляхцянкі Гаўрылавы. Пад'ячы Іван Матфееў, дзяншчык Юрка Плотнікаў і мешчанін Рамашка Бабчак абвінавачвалі яе ў тым, што яна нібыта зачыняе абразам вокны. Па загаду ваяводы і стольніка Мікіты Вельямінава шляхцянку двойчы саджалі на цэп, аднак высветлілася, што абраз быў пакладзены ў ізбе на акно наўмысна, каб сфабрыкаваць абвінавачванне і авалодаць маёмасцю шляхцянкі (запіс 1664 г.) (Витебская старина, 1885. Ч. 2. С. 221).

Акрамя прыватнай, існавала таксама і катэгорыя дзяржаўнай маёмасці. Для яе характарыстыкі варта прывесці інвентар Верхняга замка за 1664 год, дзе згадваецца шырокі спектр вырабаў як прывезеных з Масковіі, так і бытаваўшых у Полацку да вайны 1654 – 1667 гадоў[27]. "Да въ оруженныхъ анбарехъ у целовальниковъ, у Полоцкихъ стрельцовъ… да съ Москвы присланы… 10 заступовъ целыхъ, 8 заступовъ ломанныхъ, 176 кирокъ, 38 кирокъ ломанныхъ, 15 топоровъ целыхъ, 12 топоровъ порчаныхъ, 4 топора ломанныхъ, 7 трубъ ломанныхъ, 25 фурмъ медныхъ и железныхъ, …13 котловъ болшихъ и середнихъ, сковорода медная большая, 4 трубы винныхъ техъ же котловъ, 2 сковороды железныхъ, кумганъ медной болшой, 4 меха кузнецкихъ старыхъ, палатка ветчаная, 11 ломовъ железныхъ, 8 пешенъ, коромыселъ весовой, векша железная, 2 ведерка железныхъ, 2 кожи красныхъ бараньихъ, 2 кожи яловичныхъ деланы, 1950 арш. холсту, 6 топорковъ

[26] Шворень – шворан – жалезны стрыжань, які з'яўляўся вертыкальнай воссю перадка павозкі.

[27] У пераліку маёмасці намі адмыслова не пазначаецца ўзбраенне, якое займае асноўную колькасць інвентарных вопісаў.

путныхъ худыхъ, 4 подсвечника оловянных, 4 колокольчика малыхъ медныхъ, …3 ножика, что режетъ дернъ, вертлугъ пушечного станка, 2 пилы, что режутъ торчицы, 6 крюковъ, что известь мешаютъ, 12 лопатокъ железныхъ, что делаютъ кирпичное дело, цепь железная, что сделана въ соборную церковь къ паникадилу, 27 штукъ рудницкого запасу, молотъ большой, …6 клиновъ железныхъ, половникъ железной дирявой, ведерко медное съ накрышкою, …15 копъ струговыхъ скобъ, 10 смычковыхъ скобъ ломанныхъ, пудъ дроби железной, 3 кожи возовыхъ Могилевскихъ мещанъ, четырнадцать пудъ 24 гривенки пакули, 4 меха кожаныхъ пороховыхъ, четвертой новой, 11 боробановъ худыхъ пробитыхъ, 3 крюка барабанныхъ, 3 ремня барабанныхъ худые, …гвоздильня да тиски, три паруса целыхъ, четвертой поржень, половинка шатровая драная, верху безъ полъ, 140 крицы железа" (Витебская старина, 1885. Ч. 2. С. 203). Асобна пазначаюцца рэчы, што былі набыты "для пожарного времени", а менавіта "19 трубъ медныхъ, 10 трубъ деревянныхъ" (Витебская старина, 1885. Ч. 2. С. 204).

Вельмі важна падкрэсліць той факт, што пералічаныя рэчы практычна не прадстаўлена ў археалагічных калекцыях. Скура, тканіна і дрэва не захаваліся па зразумелых прычынах. Што тычыцца большай часткі жалезных вырабаў, то адсутнасць у археалагічных калекцыях з'яўляецца сведчаннем іх адноснай нешматлікасці, высокага кошту і адметных фізічных характарыстык (вялікія рэчы згубіць цяжка).

Колькасць гарадскога насельніцтва расла за кошт перасялення часткі сялян пасля эпідэмій і войнаў: горад даваў шырокія магчымасці для сацыяльнай мабільнасці асобных гараджан, гандлёвых ці рамесных карпарацый (Котлярчук, 2001. С. 46). Знойдзены ў Полацку сельскагаспадарчы інвентар (косы, акоўкі ад рыдлёвак, матыкі) сведчыць аб цесных кантактах горада з акругай у XVI – XVIII стст. Пры гэтым ў першай палове XVI ст. вядомы выпадкі, калі самі сяляне набывалі збожжа ў Полацку (Варонін, 2000 б. С. 50).

Для жыхароў беларускага горада сельскагаспадарчая вытворчасць з'яўлялася значным дапаможным промыслам нават у XVIII ст. (Мяцельскі, 2003. С. 83). Дакументы ўказваюць, што палачане займаліся сельскай гаспадаркай і мелі вялікія зямельныя плошчы не толькі ў аддаленых мясцінах за Палатою і ўздоўж яе (Тарасаў, 1998. С. 6), але і непасрэдна каля гарадскіх умацаванняў. Напрыклад, у грамаце, якая датуецца 1501 годам, згадваецца "огород подле замка" (Тарасаў, 1998. С. 6). У прыведзеным паведамленні гаворка ідзе пра агарод за межамі Верхняга замка. Але і на самім замку таксама існаваў агарод манастыра пры царкве св. Сафіі (ИЮМ, 1901. С. 18). У крыніцах сярэдзіны XVII ст. ёсць звесткі пра агарод Грыгорыя Рылковіча, што змяшчаўся "на улицы названой Невелской за парканом меским

полоцъким лежачый, з одное стороны подъле огорода Ярмошы каваля а зъ другое стороны подъле огорода Гавърылы Рослого зятя” (Актавая кніга полацкага магістрата 1650 г., 2006. С. 119) ці “дом… за рекою Двиною стоячый, з огородом и с пашънею на полпляца лежачый подле церъкви Светог(о) Миколы” (Гардзееў, 2004. С. 52). Актавая кніга полацкага магістрата 1650 года ўтрымлівае шэраг спраў пра продаж палачанамі агародаў, у тым ліку размешчаных у Запалоцці, відаць, на месцы закінутай да таго часу пасадскай забудовы: “ку венцу межы огородовъ, то естъ з обудвух сторон подле огородовъ пана Матыяша Кгедройца а с третее стороны подле огорода Подсвинковое а зъ четъвертое стороны подле огорода моего ж, мене, Петра Исаковича...” (Актавая кніга полацкага магістрата 1650 г., 2006. С. 175). Такім чынам, за межамі гарадскіх умацаванняў Вялікага і Запалоцкага пасадаў, а таксама Верхняга замка, існавалі сельскагаспадарчыя ўгоддзі палачан, падзеленыя на асобныя ўчасткі-агароды. Агароды былі абнесены плотамі з жэрдак, і гэтыя жэрдкі самі па сабе часам з’яўляліся аб’ектам крадзяжу (Актавая кніга полацкага магістрата 1650 г., 2006. С. 193).

Існуюць шматлікія прамыя звесткі пісьмовых крыніц XVII ст. пра наяўнасць прысядзібных агародаў і садоў у межах умацаванай гарадской тэрыторыі, пры гэтым як на Верхнім замку (“погнался за женщинами *по огородамъ* при семъ доме” (ИЮМ, 1874. С. 270), так і на полацкіх пасадах (“стала стучать въ заднее окно, *съ огорода*” (ИЮМ, 1874. С. 278), “з одъное стороны подле огорода пана Спирыда Куръбатовича, а зъ другое стороны заулочокъ малый на рогу противо огорода пана Матъфея Гавъръыловича, на улицы назъваной Великой”, “ижъ огород свои власный… за парканом меским полоцким на улицы названой Батечковой на чверти пляца лежачый, з одное стороны подъле огорода ихъ же, Ганских, а зъ другое стороны подъле огорода пани Евъдокии Мелешъковны Дорофеевое Ахрамеевичовое, бурмистровое полоцъкое, а в тыле подле саду славетного пана Ивана Михновича, бурмистра полоцког(о) …” (Актавая кніга полацкага магістрата 1650 г., 2006. С. 89, 127). У другой палове XVIII ст. палачанам належыла крыху больш за 1 тыс. дзесяцін зямлі (Полоцк: Ист. очерк, 1987. С. 64).

У пісьмовых крыніцах пад 1667 год згадваецца нават гарадскі сад, размешчаны пад самым горадам за Палатой (ИЮМ, 1895. С. 166 – 167). За горадам, уздоўж Палаты, размяшчаліся таксама і фальваркі. На плане 1707 года выразна бачна гарадскі сад (гл. мал. 2) на поўнач ад Верхняга і насупраць Ніжняга замка, на правым беразе Палаты. Сёння тут размешчаны мікрараён горада “Аэрадром” і вул. Ф. Міронавай. Вельмі верагодна, у прыведзеных гістарычных крыніцах гаворка ідзе пра адзін і той жа

полацкі сад XVII – XVIII стст. Крыху вышэй, на поўнач ад яго, на правым беразе Палаты размяшчаліся фальваркі.

Паводле пастановы рэляцыйнага суда, бельчыцкія жыхары з Крыўцовага пасада, названага Кабак, “людзі простыя” і “агароднікі”, “якія купецтвам і шынкам не бавяцца, рамяством ніякім не займаюцца і ніякіх вольнасцей і таргоў гарадскіх не ўжываюць, адно землю аруць ... не павінны выконваць гарадскія павіннасці, апроч самой абароны, якая ўсім аднолькава належыць” (Доўнар, 2004. С. 46). У пастанове вялікакняжацкага суда прама ўказваецца на агародніцтва як на занятак непаўнапраўных гараджан. Пастанова цікавая яшчэ і тым, што ў ёй пазначана патройная назва аднаго тапаграфічнага аб’екта: Бельчыцы, Крыўцоў пасад, Кабак. Акрамя таго, відавочна, што значную колькасць насельніцтва Крыўцовага пасада складалі земляробы.

Пачынаючы з XVI ст., у побыце прадстаўнікоў сярэдняга і вышэйшага сацыяльнага стану адбываецца уніфікацыя ўмоў жыцця на заходнееўрапейскі манер. Гэта адпавядала працэсам, характэрным для большасці беларускіх земляў у XVI – XVII стст. (Калядзінскі, 1997. С. 137 – 138). Адметнасцю Полацка можна лічыць той факт, што інтэнсіфікацыя заходнееўрапейскага ўплыву адбываецца ў першай палове XVII ст., калі масавай з’явай становіцца будаўніцтва ў Полацку драўляных будынкаў з камернай печчу і шклянымі вокнамі (раней – драўляныя будынкі з валовымі вокнамі і глінабітнай печчу). Арганізацыя жыццёвай прасторы прадугледжвала выкарыстанне ў побыце рамесных вырабаў мясцовай і замежнай вытворчасці, якія неслі не толькі утылітарную, але і эстэтычную нагрузку. Найбольш кансерватыўным заставаўся побыт бяднейшай часткі гарадскога насельніцтва, які мала чым адрозніваўся ад вясковага. Археалагічны матэрыял разам з пісьмовымі крыніцамі дастаткова поўна ілюструе побыт і ўмовы жыцця шырокіх колаў гарадскога насельніцтва.

ЗАКЛЮЧЭННЕ

Развіццё тапаграфічнай структуры Полацка ў XVI – XVIII стст. можна падзяліць на даінфлянцкі і пасляінфлянцкі перыяды, скарыстаўшы за аснову падзеі Інфлянскай вайны (1558 – 1582) і захоп Полацка маскоўскім войскам у 1563 – 1579 гадах. Пасля надання Полацку ў 1498 годзе магдэбургскага права і пабудовы ратушы (з 1510 г.) адміністрацыйны цэнтр горада перамясціўся з Верхняга замка на Вялікі пасад – да рынкавай плошчы (сучасная плошча Свабоды). Плошча Вялікага пасада ў разглядаемы перыяд была не менш 50 га. Тапаграфічныя межы Вялікага і Запалоцкага пасадаў з большага заставаліся стабільнымі на працягу ўсяго разглядаемага перыяду. Пры гэтым істотныя ваганні межаў у першай палове XVI ст. зазнаў менавіта Запалоцкі пасад. У гэты перыяд плошча Запалоцкага пасада скарацілася ў выніку шматлікіх войн з Маскоўскім княствам, аднак наўрад яго плошча ў самыя неспрыяльныя гады была меней за 17 га. На левым беразе Дзвіны ў першай палове XVI ст. размяшчаўся Крыўцоў пасад са слабодамі, абумоўленымі іх юрыдычным статусам. Экіманскі пасад, згаданы ў Полацкай рэвізіі 1552 года, пасля Інфлянцкай вайны набывае статус юрыдыкі езуіцкага калегіума і ў XVII – XVIII стст. з'яўляўся найбуйнейшай полацкай гандлёва-рамеснай факторыяй, прадмесцем ці слабадой з развітай тапаграфічнай структурай (наяўнасць уласнай сістэмы вуліц, рынкавай плошчы, прадмесцяў).

Ніжні замак быў узведзены ў 1563 годзе і пасля вяртання Полацка ў склад ВКЛ (1579) так і не ўвайшоў у зону рассялення найбольш заможнай часткі насельніцтва. Фартыфікацыйныя функцыі Ніжняга замка да канца XVII ст. былі страчаны.

У першай трэці XVII ст. на левым беразе Дзвіны існаваў адзін пасад, які меў назву Крыўцоў. На гэтым пасадзе размяшчалась "мястэчка" (у сэнсе "мясцовасць") Бельчыцы-Кабак – дзесці паблізу Барысаглебскага манастыра, але не побач з яго сценамі. Крыўцоў пасад у 1622 – 1623 гадах быў перададзены пад юрысдыкцыю полацкага магістрата, і, адпаведна, мяшчане Крыўцовага пасада сталі паўнапраўнымі гараджанамі. Слабодскі і Востраўскі пасады, названыя ў Полацкай рэвізіі 1552 года, у вядомых дакументах полацкага магістрата XVII – XVIII стст. ні разу не згадваюцца. Замест апошняга ў 1650 годзе выкарыстоўваецца назва мясцовасці – "Востраў". Верагодна, назвы Слабодскага пасада XVI ст., згаданага ў Полацкай рэвізіі 1552 года, і мясцовасці Бельчыцы-Кабак, названай у шэрагу дакументаў першай паловы XVII ст., азначаюць адно і тое ж. Назва "Слабодскі пасад" паходзіць ад тапоніма "Бельчыцкая слабада", гэта значыць тэрыторыя, падначаленая Бельчыцкаму Барысаглебскаму манастыру. Гэтая тэрыторыя бы-

ла перададзена полацкаму магістрату 16 чэрвеня 1623 года пад назвай Бельчыцы-Кабак. Аднак і пасля перадачы “кабачане” прыпісваліся да земляў “царкоўных паселеных”.

Плошча задзвінскіх пасадаў у XVI – XVIII стст. не была вялікай. Яны працягнуліся ўздоўж Дзвіны дастаткова кампактна дзесці па мяжы сучаснай вул. Дзяржынскага (дакладнае вызначэнне плошчы можа быць зроблена толькі пасля правядзення археалагічных раскопак). Акрамя таго, палачане валодалі фальваркамі, размешчанымі ўздоўж Палаты па накірунку да Спаса-Ефрасіннеўскага манастыра. Агульная плошча горада ў XVI – трэцяй чвэрці XVIII ст. была каля 200 га.

Полацк другой паловы XVIII ст. падзяляўся на пяць асноўных частак: Прыдзвінне (былы Вялікі пасад); Запалоцце (былы Запалоцкі пасад); Верхні і Ніжні замкі; Задзвінне (былы Крыўцоў пасад). Экімань і Востраў з’яўляліся юрыдыкай езуітаў і да ўласна гарадской тэрыторыі ў гэты час не належалі.

Для маркіроўкі лакальнай прыналежнасці насельніцтва Полацка ў сярэдзіне XVII ст. карысталіся азначэннямі: “заполочане” (жыхары Запалоцкага пасада); “заречане” (жыхары левабярэжнай часткі Полацка ўвогуле); “кабачане” (жыхары мясцовасці Кабак). Кабачане па-ранейшаму вылучаліся асобна з агульнай колькасці задзвінскага насельніцтва. Сярод іх было шмат людзей, асноўным заняткам якіх было хлебаробства.

Гарадская інфраструктура акрамя дамоў, будынкаў грамадскага прызначэння (ратуша, лазня, гасцініыя двары і інш.), вытворчых збудаванняў (млыны, цагельні, асеці і інш.) і сакральных аб’ектаў (цэркваў, касцёлаў, збораў) складалася з дарог, мастоў праз Палату і Дзвіну, абарончых збудаванняў. Для перамяшчэння па Дзвіне ў асноўным выкарыстоўваліся стругі і чоўны.

Вялікую ролю ў жыцці горада меў рынак і гандлёвая плошча. У XVI ст. яна мела назву Вялікі Торг. На ёй ладзіліся кірмашы, арганізоўваліся розныя грамадскія відовішчы.

Паводле археалагічных даных, комплекс матэрыяльнай культуры Полацка XVI – XVIII стст. складаецца з асноўных груп рухомых артэфактаў, прадстаўленых архітэктурна-дэкаратыўнай керамікай, керамічным посудам, вырабамі з металаў, шкла, скуры, косці, дрэва і каменю. Гэтыя катэгорыі рэчаў найлепш захаваліся ў культурным пласце і з’яўляюцца паўнавартаснай гістарычнай крыніцай.

Матэрыяльная культура насельніцтва Полацка XVI – XVIII стст. развівалася ў межах некалькіх асноўных этапаў. У рэнесанснай культуры насельніцтва Полацка выразна вылучаецца заходнееўрапейская дамінанта, што адлюстравана на прыкладзе матываў і тэхналагічных прыёмаў выканання полацкай кафлі, з’яўлення ў побыце паліванага посуду, шкла і металічных вырабаў на манер заходнееўрапейскіх. Распаўсюджванне і засваенне маньерызму ў асобных галінах полацкага рамяства (кафлярства, вытворчасць

дэкаратыўнага посуду, златарства і інш.) звязана з апошняй чвэрцю XVI ст. – пачаткам XVII ст. Вялікі асартымент керамічнага і шклянога посуду, жанравая разнастайнасць кафлі і тэхнікі дэкаравання керамікі, папулярнасць геральдычных выяў, а таксама з'яўленне новых вырабаў з металу і скуры сведчаць аб росквіце матэрыяльнай культуры сталага барока (другая чвэрць XVII ст.). Ракайльныя (апошняя чвэрць XVII – першая палова XVIII ст.) і класіцыстычныя тэндэнцыі (другая палова XVIII ст.) адлюстраваны ў прыёмах аздаблення полацкай кафлі.

Полацкая кафля – самы прадстаўнічы від архітэктурна-дэкаратыўнай керамікі – дае дакладнае ўяўленне аб часе і этапах распаўсюджвання мастацкіх стыляў рэнесанса, маньерызму, барока і класіцызму. Надыход эпохі Рэнесанса адлюстраваны ў серыі іканаграфічных і сюжэтных выяў, якія прадстаўляюць розныя аспекты жыццядзейнасці гарадскога насельніцтва і яго духоўнага быцця ў першай палове XVI ст. Пры гэтым у межах першай паловы XVI ст. яскрава прасочваецца пераемнасць гатычнай і рэнесанснай традыцыі полацкага кафлярства. У пачатку XVII ст. з'яўляецца ўстойлівы набор арнаментальных матываў, да гэтага часу належыць і большасць геральдычных выяў. Пазначаныя асаблівасці даюць падставы для вылучэння прыкмет стылю маньерызму ў аздабленні полацкай кафлі канца XVI – першай трэці XVII ст. Росквіт вытворчасці кафлі ў Полацку прыпадае на 40 – 50-я гады XVII ст. – гэта адлюстравана ў жанравай разнастайнасці барочнага арнаменту і павелічэнні колькасці вырабляемай прадукцыі. Кафлі другой паловы XVII ст. знойдзена адносна няшмат, і прадстаўлена яна ў асноўным карнізамі і навершшамі. На прыкладзе полацкай кафлі першай паловы XVIII ст. відавочна прасочваецца пераход да ракайльнай традыцыі ў дэкаратыўным мастацтве, з'яўляюцца матывы размалёўкі. У другой палове XVIII ст. пераважаюць гладкія пласціны ў межах развіцця класіцызму.

Полацкае ганчарства, у прыватнасці вытворчасць самай масавай катэгорыі – сталовага, тарнага і гігіенічнага посуду, на працягу разглядаемага перыяду развівалася ў межах некалькіх этапаў:

1) у XVI ст. дамінуюць сярэднявечныя традыцыі ўсходняга рэгіёну ВКЛ (Беларускае Падзвінне і Падняпроўе) і суседняй Пскоўшчыны. Абсалютная большасць керамічнага посуду была выраблена на ручным ганчарным крузе, паступовае засваенне новых тэхналогій і формаў ганчарнай вытворчасці пачынаецца з сярэдзіны XVI ст., інтэнсіфікацыя гэтага працэсу адбываецца з апошняй чвэрці XVI ст. у выніку цесных кантактаў з заходнееўрапейскім светам. Канчатковы пераход да нажнога ганчарнага круга ў полацкім ганчарстве адбыўся не раней 30-х гадоў XVII ст., што звязана з агульным росквітам гарадской матэрыяльнай культуры;

2) у другой чвэрці XVII ст. у ганчарстве паўсюдна выкарыстоўваецца нажны ганчарны круг, шырока прадстаўлены паліваныя вырабы, узрастае асартымент прадукцыі, укараняюцца новыя тэхналогіі дэкаравання посуду;

3) з 70-х гадоў XVII ст. па канец XVIII ст. адбываецца стандартызацыя і спрашчэнне прыёмаў аздаблення і формаў асобных катэгорый полацкага посуду (гаршчкоў, патэльняў, латак і інш.).

Развіццё полацкага кавальства, гарбарства, апрацоўкі каменю і косці ў XVI – XVIII стст. адпавядае працэсам, якія адбываліся ў суседніх рэгіёнах Цэнтральнай Еўропы. З эпохі Рэнесанса распаўсюджваюцца і засвойваюцца формы металічных вырабаў, уласцівыя заходне- і цэнтральнаеўрапейскай традыцыі, апошняе з большага характарызуе асобныя катэгорыі рэчаў (зброя, рыштунак вершніка і каня, дробная мастацкая пластыка). Апрацоўка скуры, каменю, косці ў XVI – XVIII стст. дасягае стадыі росквіту. Шкляныя вырабы ў XVII ст. становяцца паўсядзённай катэгорыяй ў побыце мяшчан і шляхты, і да канца XVIII ст. яны паступова выціскаюць з шырокага ўжытку некаторыя керамічныя (тарны і асобныя віды сталовага посуду). У XVIII ст. значна пашыраецца разнастайнасць відаў шкляной прадукцыі, што звязана, па-першае, з удасканаленнем культуры харчавання, па-другое, з актыўным развіццём мануфактурнай вытворчасці ў ВКЛ.

Пачынаючы з XVI ст. у побыце гарадскога набілітэту пачынае адбывацца уніфікацыя ўмоў жыцця на заходнееўрапейскі манер. Гэта адпавядала працэсам, характэрным для большасці беларускіх земляў у XVI – XVII стст. Адметнасцю Полацка можна лічыць той факт, што інтэнсіфікацыя гэтага працэсу адбываецца ў першай палове XVII ст., калі масавай з’явай становіцца будаўніцтва ў Полацку драўляных будынкаў з камернай кафляной печчу і шклянымі вокнамі. Арганізацыя жыццёвай прасторы полацкай шляхты і мяшчан прадугледжвала выкарыстанне ў побыце рамесных вырабаў, якія неслі не столькі утылітарную, колькі пераважна эстэтычную нагрузку (кафля, керамічны і шкляны посуд і інш.). Заможнае насельніцтва ў большай ступені арыентавалася на засваенне здабыткаў заходнееўрапейскай цывілізацыі. Назіралася цікавае спалучэнне тэхналогій традыцыйнага ўсходнеславянскага рамяства і заходнееўрапейскіх навацыяў. Найбольш кансерватыўным застаецца побыт бяднейшай часткі гарадскога насельніцтва.

Рамесніцтва ранняга Новага часу ўзбагацілася новымі, невядомымі раней формамі арганізацыі масавай вытворчасці. Напрыклад, ганчарства з вузкаспецыялізаванай галіны рамяства пераўтварылася ў вытворчасць высокамастацкіх твораў, у якіх непарыўна перапляліся мастацкія і утылітарныя якасці. Пазначаныя тэндэнцыі цалкам характарызуюць асобныя катэгорыі матэрыяльнай культуры. Паўсядзённыя рэчы масавай і індывідуальнай вытворчасці (архітэктурна-дэкаратыўная кераміка, дэкаратыўны посуд і дроб-

ная мастацкая пластыка) адлюстроўваюць варункі развіцця рамесніцтва Полацка, розныя аспекты жыццядзейнасці і ментальнасці палачан.

З канца XVI ст., у параўнанні з папярэдняй эпохай, рэзка ўзрастае асартымент рамесных вырабаў. Па колькасці асноўных рэчавых катэгорый у першай палове XVII ст. палачане далёка пераўзышлі сярэднявечную культуру. Гэта адлюстравана ў рэзкім павелічэнні колькасці вырабляемай прадукцыі, з'яўленні новых рамесных спецыяльнасцей, пашырэнні цэхавай вытворчасці. Як паказалі вынікі археалагічнага вывучэння, шматлікія войны і пажары не заўсёды былі істотнай перашкодай для плённага развіцця рамесніцтва Полацка. Больш таго, за ўвесь разглядаемы перыяд менавіта ў першай палове XVII ст. гарадская матэрыяльная культура зведала стадыю найвышэйшага росквіту. Гэтаму не ў малой ступені спрыялі наступствы Інфлянцкай вайны (пашырэнне сацыяльна-эканамічных і культурных сувязяў з Заходняй Еўропай, пранікненне новых тэхналогій рамеснай вытворчасці і інш.).

Яркая і самабытная матэрыяльная культура палачан першай паловы XVII ст. давала падставы для вяртання Полацку ганаровага статуса ў дзяржаве, нягледзячы на згубныя наступствы войнаў, пажараў і зменаў напрамкаў сацыяльна-эканамічнага развіцця ВКЛ. Гэты працэс, аднак, быў перапынены ў другой палове XVII ст.

У асноўных рысах матэрыяльная культура XVI – XVIII стст. працягвала развівацца на ўсходнеславянскай аснове, пра што яскрава сведчыць масавае грамадзянскае дойлідства. У дакументах XVI – XVIII стст. пры пералічэнні полацкіх жылых будынкаў выкарыстоўваюцца тэрміны: "ізба", "дом", зрэдку "харомы". Адзначым выпадакі выкарыстання тэрмінаў "святліца" як назвы асобнай пабудовы, а не толькі пакоя, а таксама "ізба" як назвы пакоя.

У асобных дамах маглі сумесна пражываць некалькі сем'яў. Некаторыя дамы мяшчан маглі быць вялікіх памераў і ўмяшчаць некалькі сот чалавек, пры гэтым сядзібы полацкага патрыцыята размяшчаліся пераважна на Верхнім замку і вул. Вялікай на Вялікім пасадзе (сучасная вул. Леніна).

Галоўнай часткай інтэр'ера жылля заможнага палачаніна ў XVI – XVIII стст. была вялікая камерная печ, якая акрамя утылітарнага прызначэння несла эстэтычную нагрузку. Багацце дэкору пячной кафлі напрамую залежыла ад заможнасці гаспадара. Мэбля ў будынках як заможных, так і простых гараджан была драўляная і даволі сціплая. Уздоўж сцен ("вколо") ставіліся лавы. У пакоях знаходзіліся стол з "заслонай" – шырокай пераноснай лавай і лавы. У XVIII ст. у дамах з'яўляецца драўляны ложак. Ад пачатку XVIII ст. акрамя традыцыйных сталоў, лаў, скрынь у будынках мяшчан паўсюдна з'яўляюцца крэслы. Гэта ў першую чаргу звязана з мадэрнізацыяй умоў паўсядзённага жыцця на заходні манер. Абавязковым

атрыбутам інтэр'ера былі спецыяльныя прысценныя паліцы, на якія выстаўляўся размаляваны керамічны посуд і посуд з каляровых металаў, у тым ліку і вельмі дарагі – срэбраны і пазалочаны, аздоблены каштоўнымі камянямі. Апошні сустракаецца пры археалагічных раскопках выключна рэдка, затое звестак аб ім багата ў інвентарных апісаннях.

Жылыя пабудовы гарадской беднаты падзяляліся на белыя і чорныя. У белай знаходзілася печ з адкрытым вусцем. У XVII ст. працягвалі вырабляць гаршковую кафлю, печы з гаршковай кафлі мелі утылітарнае значэнне і клаліся ў дамах бедных гараджан.

Пакоі мяшчан і шляхты з XVII ст. асвятляліся свечкамі з лою ці воску, якія ўстаўляліся ў керамічныя падсвечнікі. У XVIII ст. у заможнай шляхты і мяшчан пачалі з'яўляцца хрустальныя люстры і падсвечнікі. Каштоўныя рэчы з каляровых металаў палачане ашчадна зберагалі, а ў часы ліхалецця нярэдка хавалі ў патаенных месцах.

У штодзённым побыце прадстаўнікі ўсіх саслоўяў у XVI – XVII стст. карысталіся драўляным і керамічным посудам. У доме заможнага мешчаніна ці шляхціца існавала месца для захоўвання розных каштоўных рэчаў, у першую чаргу біжутэрыі і дарагога адзення. Рэчы хранілі ў ларцах ці скрынях. У вялікіх скрынях захоўвалі рознае адзенне, футра і нават кнігі.

Полацкая драўляная забудова XVI – XVIII стст. археалагічна вывучана даволі слаба, што абумоўлена фізічнымі ўласцівасцямі культурнага пласта. Рэшткі грамадзянскай забудовы найбольш поўна захаваліся на Верхнім замку і фрагментарна на Вялікім пасадзе – месцы асноўных раскопаў. Звычайная гарадская сядзіба радавого палачаніна ("двор", "дворище", "оселость", "маетность") – гэта комплекс жылых і гаспадарчых пабудоў, куды ўваходзіць двор, плот, калодзеж і, як правіла, агарод ці невялікі сад. Асобныя падвор'і масціліся дрэвам. Гарадскі сад размяшчаўся за горадам уздоўж Палаты; за межамі гарадскіх умацаванняў існавалі сельскагаспадарчыя ўгоддзі палачан, падзеленыя на асобныя ўчасткі-агароды, абнесеныя плотам з жордак.

Паводле археалагічных крыніц, асноўнымі рысамі, якія характарызуюць масавую грамадзянскую забудову Полацка XVI – першай паловы XVIII стст., з'яўляюцца наступныя:

1) пераважна драўляны характар будаўніцтва;

2) адносна невялікая плошча жылых пабудоў (ад 17 да 35 кв. м, у сярэднім каля 27 – 28 кв. м) і ўсяго прысядзібнага комплексу (у сярэднім 100 – 160 кв. м);

3) непрацяглы час існавання драўляных будынкаў (ад некалькіх гадоў да двух-трох дзесяткаў).

Пачатак мураванага грамадзянскага дойлідства па археалагічных матэрыялах адзначаецца з сярэдзіны XVII ст., хаця цагляны будынак ратушы, па звестках пісьмовых крыніц, узведзены ў пачатку XVI ст. Раней, з XV ст., цаглянае будаўніцтва адзначаецца толькі ў будаўніцтве печаў у дамах заможнай часткі палачан. У другой палове XVIII ст. нярэдкай з'явай сталі драўляныя грамадзянскія будынкі, размешчаныя на каменным падмурку (раней – без падмурка ці на драўляных апорах – чурбанах).

Пасля актыўнага мураванага будаўніцтва, росквіту полацкай школы дойлідства XI – XII стст., відавочны перапынак назіраецца і ў будаўніцтве культавых пабудоў. Большая частка мураваных полацкіх цэркваў XII ст., паводле археалагічных даных, была зруйнавана падчас захопу Полацка ў 1563 – 1579 гадах (падзеі Інфлянцкай вайны). Аднаўленне мураванага культавага дойлідства XVIII ст. звязана ўжо з плынямі еўрапейскага барока і было ў абсалютнай большасці выпадкаў каталіцкай скіраванасці. У выніку цэнтральная рынкавая плошча Полацка напрыканцы XVIII ст. набыла сапраўднае еўрапейскае аблічча.

Падсумоўваючы адзначым, што ў XVI – XVIII стст. полацкія рамеснікі (злотнікі, кушняры, кавалі, ганчары і інш.) стварылі асновы для станаўлення новых традыцый вытворчасці. Майстры-выканаўцы ўдала спалучалі ўласны досвед і традыцыйныя здабыткі з запатрабаваннямі заходнееўрапейскай моды і самі, такім чынам, станавіліся праваднікамі самастойных напрацовак. Гэтая выснова пацвярджаецца большасцю вырабаў з катэгорыі архітэктурна-дэкаратыўнай керамікі, посуду, зброі і дробнай мастацкай пластыкі. Аўтарамі пэўных сюжэтаў выступалі як самі рамеснікі, так і прадстаўнікі вышэйшых сацыяльных груп (шляхта і заможныя мяшчане). Найбольш кансерватыўным застаецца побыт бяднейшай часткі мяшчан ("чорных людзей", "лёзных", "гульцяёў").

КРЫНІЦЫ

1. Актавая кніга полацкага магістрата 1650 г.: зб. дакл. / НАН Беларусі, Ін-т гісторыі; склаў і падрыхт. да друку М.Ю. Гардзееў. – Мінск: Беларуская навука, 2006. – 270 с.: іл.
2. Акты, издаваемые Виленскою археографическою коммисіею. – Вильна: Тип. А.Г. Сыркина, 1878. – Т. 9. – 591 с.
3. Археографический сборник документов, относящихся к истории Северо-Западной Руси, издаваемый при управлении Виленского учебного округа. – Вильна, 1867. – Т. 1. – 409 с.
4. Археологические раскопки в Полоцке в 1958 и 1959 гг. // Архіў ІГ НАНБ. – Воп. 1. – Спр. 376 (фотоальбом).
5. Белоруссия в эпоху феодализма: в 5 т. – Минск: Изд-во АН СССР, 1950. – Т. 2: С середины XVII до конца XVIII в. до воссоединения с Россией. – 560 с.
6. Булкин, В.А. Отчёт об археологических исследованиях Софийского собора и прилегающих к нему территорий в 1978 г. / В.А. Булкин // Архіў ІГ НАНБ. – Воп. 1. – Спр. 594.
7. Витебская старина / сост. А. Сапунов; типо-литография Г.А. Малкина, 1885. – Т. IV: Витебск. – 394 + XII с.
8. Витебская старина / сост. А. Сапунов, 1888. – Т. V: Витебск. – 670 с. + 40 л. ил.
9. Дук, Д.У. Справаздача аб палявых археалагічных даследаваннях у горадзе Полацку ў 2003 годзе: у 2-х ч. / Д.У. Дук // Архіў ІГ НАНБ. - Спр. 2079 а. – Ч. 1: Тэкст і ілюстрацыі.
10. Дук, Д.У. Справаздача аб археалагічных раскопках у горадзе Полацку ў 2002 годзе: у 2-х ч. / Д.У. Дук // Архіў ІГ НАНБ. – Воп. 1. – Спр. 2046. – Ч. І: Тэкст і ілюстрацыі.
11. Дук, Д.У. Справаздача аб палявых археалагічных даследаваннях у Полацку ў 2001 годзе / Д.У. Дук // Архіў ІГ НАНБ. – Воп. 1. – Спр. 1921.
12. Дук Д.У. Справаздача аб палявых археалагічных даследаваннях у Полацку ў 2000 г. / Д.У. Дук, С.В. Тарасаў // Архіў ІГ НАНБ. – Воп. 1. – Спр. 1880.
13. Здановіч, Н.І Справаздача аб правядзенні археалагічных раскопак у ліпені 1989 г. / Н.І. Здановіч // Архіў ІГ НАНБ. – Воп. 1. – Спр. 1148 б.
14. Здановіч, Н.І. Справаздача пра археалагічныя даследаванні летам 1991 г. / Н.І. Здановіч // Архіў ІГ НАНБ. – Воп. 1. – Спр. 1374.

15. Здановіч, Н.І. Справаздача аб правядзенні архітэктурна-археалагічных даследаванняў у маі і кастрычніку 1990 г. / Н.І. Здановіч // Архіў ІГ НАНБ. – Воп. 1. – Спр. 1213 в.
16. Здановіч, Н.І. Справаздача пра археалагічныя даследаванні па вул. Леніна, 35 у г. Полацку ўлетку 1992 г. Кн. 1 / Н.І. Здановіч // Архіў ІГ НАНБ. – Воп. 1. – Спр. 1450.
17. Здановіч, Н.І. Справаздача пра археалагічныя даследаванні рэштак агароджы ў жніўні 1992 г. / Н.І. Здановіч // Архіў ІГ НАНБ. – Воп. 1. – Спр. 1447.
18. Здановіч, Н.І. Справаздача пра археалагічныя доследы па вул. К. Маркса, 1 у г. Полацку ў ліпені – жніўні 1990 г. Кн. 1 / Н.І. Здановіч // Архіў ІГ НАНБ. – Воп. 1. – Спр. 1213 а.
19. Здановіч, Н.І. Справаздача пра архітэктурна-археалагічныя раскопкі летам 1991 г. / Н.І. Здановіч // Архіў ІГ НАНБ. – Воп. 1. – Спр. 1373.
20. Здановіч, Н.І. Справаздача пра архітэктурна-археалагічныя даследаванні ў жніўні 1991 г. (дом па вул. Фрунзе, 1 у г. Полацку) / Н.І. Здановіч // Архіў ІГ НАНБ. – Воп. 1. – Спр. 1376.
21. ИЮМ. – Витебск: тип. Губ. правл., 1873. – Вып. 4. – 432 с.
22. ИЮМ. – Витебск: тип. Губ. правл., 1874. – Вып. 5. – 416 с.
23. ИЮМ. – Витебск: тип. Губ. правл., 1875. – Вып. 6. – 411 с.
24. ИЮМ. – Витебск: Типо-Литография Г.А. Малкина, 1892. – Вып. 23. – 512 [6], XXX с.
25. ИЮМ. – Б.м., б.в., б.г – Вып. 25. – 505, XLI с.
26. ИЮМ. – Витебск: Вит. Губ. Типо-Литография, 1895. – Вып. 26. – 516 + XXIV с.
27. ИЮМ. – Витебск: Вит. Губ. Типо-Литография, 1901. – Вып. 29. – 472 с.
28. Митрофанов, А.Р. Отчёт о раскопках Полоцкой археологической экспедиции Ин-та истории АН БССР в 1959 г. / А.Р. Митрофанов // Архіў ІГ НАНБ. – Воп. 1. – Спр. 203.
29. Митрофанов, А.Р. Археологические раскопки в г. Полоцке в 1958 и 1959 гг. (фотоальбом) / А.Р. Митрофанов // Архіў ІГ НАНБ. – Воп. 1. – Спр. 376.
30. Полоцкая ревизия 1552 г. / к изд. подготовил И.И. Лаппо. – М., 1905. – 236 с.
31. Полоцкие грамоты XIII – начала XVI в.: в 6 вып. / Акад. наук СССР. Ин-т истории СССР. – М., 1977 – 1989. – Вып. 3 / сост. А.Л. Хорошкевич. – 1980. – 214 с.

32. Полоцкие грамоты XIII – начала XVI в.: в 6 вып. / Акад. наук СССР. Ин-т истории СССР. – М., 1977 – 1989. – Вып. 2 / сост. А.Л. Хорошкевич. – 1978 – 220 с.
33. Полоцкие грамоты XIII – начала XVI в.: в 6 вып. / Акад. наук СССР. Ин-т истории СССР. – М., 1977–1989. – Вып. 4 / сост. А.Л. Хорошкевич. – 1982 – 217 с.
34. Раппопорт, П.А. Отчёт о раскопках в Полоцке в 1975 г. / П.А. Раппопорт // Архіў ІГ НАНБ. – Воп. 1. – Спр. 511.
35. Раппопорт, П.А. Отчёт об археологических раскопках в 1976 г. / П.А. Раппопорт // Архіў ІГ НАНБ. – Воп. 1. – Спр. 527.
36. Русаў, П.А. Справаздача аб археалагічным наглядзе за землянымі работамі па вул. Сака і Ванцэці ў г. Полацку ў чэрвені – жніўні 1996 г. / П.А. Русаў // Архіў НТДП "Белінформрэстаўрацыя". – Спр. № 103.
37. Русаў, П.А. Справаздача пра археалагічныя доследы на помніку архітэктуры XVIII ст. – доме генерал-губернатара ў г. Полацку / П.А. Русаў // Архіў ІГ НАНБ. – Воп. 1. – Спр. 1692.
38. Сагановіч, Г.М. Справаздача аб правядзенні археалагічных даследаванняў у г. Полацку ў жніўні 1986 г. / Г.М. Сагановіч // Архіў ІГ НАНБ. Вопіс 1, спр. 975.
39. Справы полацкага гродзскага суда 1533 – 1539 гг. // Беларускі архіў. – Мінск, 1928. – Т. 2. – 344 с.
40. Тарасаў, С.В. Справаздача аб археалагічных досьледах у Полацку і Полацкай акрузе ў 1993 г. / С.В. Тарасаў // Архіў ІГ НАНБ. – Воп. 1. – Спр. 1496.
41. Тарасов, С.В. Отчёт о раскопках в г. Полоцке в 1988 г. / С.В. Тарасов // Архіў ІГ НАНБ. – Воп. 1. – Спр. 1084.
42. Тарасов, С.В. Отчёт о раскопках в Полоцке и Полоцкой округе в 1987 г. / С.В. Тарасов // Архіў ІГ НАНБ. – Воп. 1. – Спр. 1014.
43. Тарасов, С.В. Отчёт о раскопках в г. Полоцке в 1986 г. / С.В. Тарасов // Архіў ІГ НАНБ. – Воп. 1. – Спр. 953.
44. Трусаў, А.А. Археалагічная справаздача аб раскопках Вялікага сабора Бельчыцкага манастыра XII ст. у Полацку ў ліпені 1990 г. Кн. 1 / А.А. Трусаў // Архіў ІГ НАНБ. – Воп. 1. – Спр. 1251 а, б.
45. Фонды Нацыянальнага музея Рэспублікі Беларусь.
46. Фонды Нацыянальнага Полацкага гісторыка-культурнага музея-запаведніка.
47. Штыхов, Г.В. Отчёт об археологических исследованиях в Северной Белоруссии в 1967 г. / Г.В. Штыхов // Архіў ІГ НАНБ. – Воп. 1. – Спр. 349.

ДАСЛЕДАВАННІ

1. Акунова, Л.Ф. Технология производства и декорирования художественных изделий / Л.Ф. Акунова, В.А. Крапивин. – М.: Высшая школа, 1984. – 207 с.
2. Александрович, С. Особенности развития городов Великого княжества Литовского в XVI – XVII вв. / С. Александрович // ГАЗ. – 1998. – № 13. – С. 157 – 161.
3. Алексеев, Л.В. Западные земли домонгольской Руси: очерки истории, археологии, культуры: в 2 кн. / Л.В. Алексеев; Ин-т археологии РАН. – М.: Наука, 2006. – Кн. 1. – 289 с.
4. Амброз, А.К. О символике русской крестьянской вышивки архаического типа / А.К. Амброз // СА. – 1966. – № 1 – С. 61 – 76.
5. Археалогія Беларусі: у 4 т. / Я.Г. Звяруга [і інш.]; навук. рэд. П.Ф. Лысенка. – Мінск: Беларуская навука, 2000. – Т. 3: Сярэдневяковы перыяд (IX – XIII ст.). – 554 с.
6. Археалогія Беларусі: у 4 т. / В.М. Ляўко [і інш.]; пад. рэд. В.М. Ляўко і інш. – Мінск: Беларуская навука, 2001. – Т. 4: Помнікі XIV – XVIII ст. – 597 с.
7. Без-Корнилович, М.О. Историческія сведенія о примечательнейших местах в Белорусіи с присовокупленіем и других сведеній к ней же относящихся / М.О. Без-Корнилович. – СПб.: В типографіи III Отд. Собст. Е. И. В. Канцеляріи, 1855. – 357 с.
8. Бектинеев, Ш.И. Средневековые Горы / Ш.И. Бектинеев // Сярэдневяковыя старажытнасці Беларусі: Новыя матэрыялы і даследаванні / Ш.И. Бектинеев, О.Н. Левко; пад рэд. В.М. Ляўко. – Мінск: Навука і тэхніка, 1993. – С. 8 – 19.
9. Собаль, В.Е. Беларуская кафля / Складальнік В.Е. Собаль [і інш.]. – Мінск: Беларусь, 1989. – 160 с.
10. Беленькая, Д.А. Медная пластика городов Московской Руси (XIII – XV вв.) / Д.А. Беленькая // КСИА. – 1999. – Вып. 208. – С. 11 – 19.
11. Белецкий, С.В. О рейнской керамике в Пскове / С.В. Белецкий // СА. – 1978. – № 2. – С. 292 – 293.
12. Бехайм, В. Энциклопедия оружия / В. Бехайм; пер. с нем.; предисл. А.Н. Кирпичникова. – СПб.: АО “Санкт-Петербург оркестр”, 1995. – 576 с.
13. Бобринский, А.А. Гончарство Восточной Европы. Источники и методы изучения / А.А. Бобринский. – М., 1978. – 272 с.

14. Бойцов, И.А. Красноглиняная керамика XV – XVI вв. из Большого Гнездниковского переулка (Москва) / И.А. Бойцов // РА. – 1999. – № 1. – С. 152 – 163.
15. Бохан, Ю.М. Меч з Верхнядзвінскага раёна Віцебскай вобласці / Ю.М. Бохан // БГЧ. – 2003. – № 2. – С. 28 – 31.
16. Бохан, Ю.М. Узбраенне войска ВКЛ другой паловы XIV – канца XVI ст. / Ю.М. Бохан. – Мінск: Экаперспектыва, 2002. – 336 с. з іл.
17. Бубенька, Т.С. Кафля з гербамі Агінскіх з Віцебска / Т.С. Бубенька, Л.У. Хмяльніцкая // ГАЗ. – 1994. – № 3. – С. 115 – 121.
18. Бубенько, Т. Изразцы Витебского замка / Т. Бубенька // Час, помнікі, людзі. Памяці рэпрэсаваных археолагаў: тэз. дакл. міжнарод. канф., Мінск, 27 – 30 кастрычніка 1993 г. / уклад. В. Вяргей, Г. Штыхаў. – Мінск, 1993. – С. 11 – 27.
19. Бубенько, Т. Нижний замок – экономический центр Витебска XIV – XVIII вв. / Т. Бубенько // Castrum, urbis et bellum: зб. навук. прац. – Баранавічы: Баранав. узбуйн. друк., 2002. – С. 90 – 117.
20. Бубенько, Т.С. Кожаная обувь средневекового Витебска XII – XVIII вв. (по материалам исследования Нижнего замка) / Т.С. Бубенько // Сярэдневяковыя старажытнасці Беларусі: Новыя матэрыялы і даследаванні; пад рэд. В.М. Ляўко. – Мінск: Навука і тэхніка, 1993. – С. 127 – 137.
21. Бубенько, Т.С. Стеклянная посуда из Витебска / Т.С. Бубенько // Древности Литвы и Белоруссии / ред. Л.Д. Поболь, А.З. Таутавичюс. – Вильнюс: Москласс, 1988. – С. 125 – 129.
22. Булгаковский, Д.Г. Пинчуки / Д.Г. Булгаковский // Записки Императорского Русского Географического общества по отделению этнографии. Т. XIII. – СПб.: Типография Майкова, 1890. – Вып. 3. – 200 с.
23. Бэрк, П. Народная культура Эўропы ранняга Новага часу / П. Бэрк. – Мінск: Тэхналогія, 1999. – 380 с.
24. Варонін, В. Новая літаратура: агляды і рэцэнзіі: “Тарасаў, Сяргей В. Полацк IX – XVII ст.: Гісторыя і тапаграфія / В. Варонін. – Мінск: Беларуская навука, 1998. – 183. іл.” // БГА. Т. 7. Сш. 1 (12). 2000 а. – С. 246 – 254.
25. Варонін, В. Тэстамент полацкага бурмістра Давыда Панкова 1559 г. / В. Варонін // Гісторыя і археалогія Полацка і Полацкай зямлі. – Полацк, 2003. – С. 32 – 40.
26. Варонін, В.А. Сацыяльна-эканамічнае і палітычнае развіццё Полацкага ваяводства ў першай палове XVI стагоддзя: дыс. … канд. гіст. навук: 07.00.02 / В.А. Варонін. – Мінск, 2000 б. – 109 с.

27. Векслер, А.Г. Обувные подковки XV – XVIII вв. (по материалам раскопок в Москве) / А.Г. Векслер, Ю.А. Лихтер, Д.О. Осипов // РА. – 1997. – № 3. – С. 114 – 119.
28. Виногродська, Л.І. До історії керамічного та скляного виробництва на Україні ў XIV – XVIII ст. / Л.І. Виногродська // Археологія. – 1997. – № 2. – С. 129 – 140.
29. Виногродська, Л.І. Кахлі середього подніпров'я XIV – середини XVIII ст.: автореф. дис. … канд. іст. наук: 07.00.06 / Л.І. Виногродська; Ін-т археологіі АН Україні. – Київ, 1993. – 20 с.
30. Высоцкая, Н.Ф. Темперная живопись Белоруссии конца XV – XVIII вв. / Н.Ф. Высоцкая. – Минск: Беларусь, 1986. – 208 с.
31. Габрусь, Т.В. Мураваныя харалы: Сакральная архітэктура беларускага барока / Т.В. Габрусь. – Мінск: Ураджай, 2001. – 287 с.: іл.
32. Ганецкая, І. Тэхналогія дэкаратыўнай апрацоўкі маёлікавых вырабаў на Беларусі ў XVI – XVIII ст. / І. Ганецкая // З глыбі вякоў. Наш край: гісторыка-культуралагічны зб. – Мінск: МП "Крок уперад", 1992. – С. 165 – 179.
33. Ганецкая, І. Дэкаратыўная кераміка / І. Ганецкая, Н. Здановіч // Час, помнікі, людзі. Памяці рэпрэсаваных археолагаў: тэз. дакл. міжнар. канф., Мінск, 27 – 30 кастр. 1993 г. / уклад. В. Вяргей, Г. Штыхаў. – Мінск, 1993. – С. 27 – 30.
34. Ганецкая, І. Раскопкі старажытнага Слоніма / І. Ганецкая, Н. Здановіч // ГАЗ. – 1996. – № 10. – С. 112 – 127.
35. Ганецкая, І.У. Культурныя ўплывы ў люстэрку мастацкай керамікі XVI – XVIII ст. / І.У. Ганецкая // Заслаўскія чытанні, 1995 г.: матэрыялы міжнар. канф. / рэд. Т.С. Скрыпчанка. – Заслаўе: Гісторыка-культурны запаведнік "Заслаўе", 1997. – С. 76 – 77.
36. Ганецкая, І.У. Маёліка на Беларусі ў XI – XVIII ст / І.У. Ганецкая. – Мінск, 1995. – 120 с.
37. Гардзееў, М. Акты па аперацыях з нерухомасцю ў полацкіх магістрацкіх кнігах другой паловы XVII ст. / М. Гардзееў // Commentarii Polocenses Historici. – 2004. – Т. 1. – С. 50 – 58.
38. Гардзееў, М. Дакументы па гісторыі рамяства ў актавай кнізе полацкага магістрата за 1656 – 1657 г. / М. Гардзееў // БГА. – Т. 10. Сшытак 1 – 2 (18 – 19). Снежань 2003. – С. 175 – 187.
39. Гаттерер, У.Х. Начертание гербоведения / У.Х. Гаттерер. – М.: Императорская типография, 1805. – 343 с.

40. Глiннiк, В.В. Невядомая познегатычная выява полацкай трагедыi 1563 г. / Глiннiк В.В. // Матэрыялы навук.-практ. канф. (па вынiках навукова-даследчай работы ў 2004 г.). – Полацк: НПГКМЗ, 2004. – С. 143 – 159.
41. Глiннiк, В. Полацкiя саборныя цэрквы (X – XX стст.) / Глiннiк В.В. // Беларускi горад у часе i прасторы: 500 гадоў Полацкай магдэбургii: зб. навук. прац. – Наваполацк: ПДУ, 2001. – С. 198 – 205.
42. Голан, А. Миф и символ / А. Голан. – 2 изд. – М.: Руслит, 1994. – 375 с.
43. Грицкевич, В.П. Медицинское дело в феодальном Полоцке / В.П. Грицкевич // Здравоохранение Белоруссии. – 1964. – № 2. – С. 77 – 80.
44. Гурын, М.Ф. Жалезныя вырабы XIV – XVII ст. з Вiцебска / М.Ф. Гурын // Весцi АН БССР. Сер. грамадскiх навук. – 1981. – № 5. – С. 97 – 104.
45. Дзярновiч, А. Шляхi пранiкнення кафлi на Беларусь: да пытання беларуска-нямецкiх кантактаў / А. Дзярновiч // З глыбi вякоў. Наш край. – Мiнск, 1996. – Вып. I. – С. 245 – 250.
46. Доўнар, А. Пацвярджальны прывiлей Полацку 1633 г. (нарыс з гiсторыi Полацка 30-х гадоў XVII ст.) / А. Доўнар // Commentarii Polocenses Historici. – 2004. – Т. 1. – С. 43 – 49.
47. Дук, Д. Большой пожар за две копейки / Д. Дук // Родина. – 2006 а. – № 4. – С. 14 – 15.
48. Дук, Д. Камни из саги о Тидрике Бернском / Д. Дук // Родина. – 2006 б. – № 10. – С. 44 – 46.
49. Дук, Д.У. Гiсторыя Полацка: па матэрыялах археалагiчных даследаванняў: вучэб.-метад. комплекс для студ. спец. 1-21 03 01-01 01 “Гiсторыя Беларусi”, 1-02 01 02-04 “Гiсторыя. Англiйская мова” / Д.У. Дук. – Наваполацк: УА “ПДУ”, 2006 в. – 112 с.
50. Дук, Д.У. Лакалiзацыя асобных тапаграфiчных аб’ектаў Полацка XVI – XVIII стст. / Д.У. Дук // БГЧ. – 2006 г. – № 6. – С. 37 – 43.
51. Дук, Д.У. Матэрыялы да геральдычнай карты месцазнаходжання двароў полацкай шляхты XVI – XVII стст. / Д.У. Дук // Герольд Litherland. – 2002 а. – № 3 – 4 (7 – 8). – С. 84 – 89.
52. Дук, Д.У. Полацкая каробчатая кафля XV – сярэдзiны XVI ст. / Д.У. Дук // V Республ. науч. конф. студ., аспирантов и магистрантов Респ. Беларусь (НИРС-2000): материалы конф.: в 5 ч. – Гродно: ГрГУ, 2000. – Ч. 1. – С. 124 – 128.
53. Дук, Д.У. Полацкая кафля XIV – сярэдзiны XVI ст. / Д.У. Дук // ГАЗ. – 2001 ж. – № 16 – С. 167 – 173.
54. Дук, Д.У. Полацкая керамiчная вытворчасць XIV – XVI ст.: усходнiя i заходнiя ўплывы / Д.У. Дук // Актуальныя праблемы гiсторыi Беларусi: стан, здабыткi i супярэчнасцi, перспектывы развiцця: матэрыялы

рэсп. навук. канф.: у 4 ч. / пад. рэд. І.П. Крэня, У.І. Навіцкага, І.А. Змітровіча. – Гродна: ГрДУ, 2003 в. – Ч. 1. – С. 217 – 224.
55. Дук, Д.У. Полацкі дэкаратыўны посуд XVI – XVIII стст. / Д.У. Дук // Вестн. Полоц. гос. ун-та. – 2002 в. – Т. 1. – № 4. – С. 34 – 40.
56. Дук, Д. Полацкая кафля і вера палачанаў / Д. Дук // Спадчына. – 2001 а. – № 1 – 2. – С. 163 – 169.
57. Дук, Д. Цеплыня ад цеплыні: дэкор полацкай кафлі XVII ст. / Д. Дук // Мастацтва. – 2001 б. – № 5. – С. 42 – 46.
58. Дук, Д.У. Аб адным "паралельным" сюжэце полацкай і магілёўскай кафлі з выявамі рыцараў / Д.У. Дук // Мінулая і сучасная гісторыя Магілёва: зб. навук. прац. / уклад. І.А. Пушкін. – Магілёў: УПКП "Магілёўская ўзбуйнённая друкарня", 2001 в. – С. 47 – 51.
59. Дук, Д.У. Аб прыналежнасці некаторых груп полацкай кафлі з геральдычнымі матывамі / Д.У. Дук // Каштоўнасці мінуўшчыны-4: Помнікі археалогіі: праблемы аховы і вывучэння: матэрыялы канф., Мінск, 23 лістапада 2000 г. / пад рэд С. Марцэлева. – Мінск: Лекцыя, 2001 г. – С. 108 – 119.
60. Дук, Д.У. Археалагічны комплекс "Пабудова першай паловы XVI ст." (па выніках раскопак 2001 – 2002 гг. на Вялікім пасадзе г. Полацка) / Д.У. Дук // Гісторыя і археалогія Полацка і Полацкай зямлі: матэрыялы IV міжнар. навук. канф. – Полацк: НПГКМЗ, 2003 а. – С. 88 – 106.
61. Дук, Д.У. Вывучэнне і ахова культурнага пласта гістарычнага цэнтра Полацка / Д.У. Дук // Каштоўнасці мінуўшчыны-6: Гістарычныя цэнтры гарадоў Беларусі: праблемы і шляхі іх вырашэння: матэрыялылы канф., Мінск, 28 лістапада 2002 г. / пад агул. рэд. С. Марцэлева. – Мінск: Знамение, 2003 б. – С. 111 – 124.
62. Дук, Д.У. Культурныя сувязі палачан (па выніках вывучэння пячной кафлі XIV – XVII ст.) / Д.У. Дук // Матэрыялы міжнар. навук. гісторыка-краязн. канф. (да 75-годдзя Полацкага краязнаўчага музея, Полацк, 18 – 19 мая 2001 г.). / уклад. В.Д. Краско. – Полацк, 2001 д. – С. 33 – 37.
63. Дук, Д.У. Археалагічная разведка на Запалоцкім пасадзе Полацка ў 2003 годзе / Д.У. Дук // Древности Беларуси в системе межкультурных связей: Материалы по археологии Беларуси. – Минск: Ин-т истории НАН Беларуси, 2006 д. – Вып. 11. – С. 104 – 113.
64. Дук, Д.У. Матэрыяльная культура гарадоў Беларусі ранняга Новага часу: адметнасці станаўлення і развіцця / Д.У. Дук // Традиции и обычаи народов России и Беларуси: междунар. конф. 23 – 25 мая 2001 г.,

Минск, Респ. Беларусь: докл. и сообщ.: в 2 т. / науч. ред. и сост. Н.А. Лобанов. – Минск: Изд-во МИУ, 2001 е. – Т. 2. – С. 45 – 50.
65. Дук, Д.У. Семантыка некаторых выяў полацкай кафлі з анімалістычнымі матывамі / Д.У. Дук, П.І. Мішын // ГАЗ. – 2002 б. – № 17 – С. 236 – 240.
66. Дук, Д.У. Шляхі пранікнення і распаўсюджвання культурна-стылістычных накірункаў у матэрыяльнай культуры насельніцтва Полацка ад пачатку XVI да канца XVII ст. / Д.У. Дук // Сімяон Полацкі: светапогляд, грамадска-палітычная і літаратурная дзейнасць: матэрыялы II міжнар. навук. канф., Полацк, 18 – 19 лістапада 2004 г. – Полацк: НПГКМЗ, 2005. – С. 45 – 57.
67. Дэрмус, В.Я. Болезни и врачевание в древней Прибалтике / В.Я. Дэрмус. – Рига: Зинатне, 1970. – 200 с.
68. Зайцава, В.Я. Кафля XVI – XVIII ст. з Друі / В.Я. Зайцава // Весці АН БССР. Сер. грамадскіх навук. – 1990. – № 1. – С. 80 – 81.
69. Зайцева, О.Е. Поливная посуда второй половины XVI – XVII в. из Друи / В.Я. Зайцава // ГАЗ. – 1996. – № 10. – С. 133 – 143.
70. Зайцева, О.Е. Поливная посуда: некоторые методологические аспекты проблемы / В.Я. Зайцава // ГАЗ. – 1996. – № 10. – С. 129 – 132.
71. Закурина, Т.Ю. Замки и ключи из раскопок Пскова / Т.Ю. Закурина // Археологи рассказывают о древнем Пскове / ред. В.В. Седов. – Псков, 1991. – С. 107 – 118.
72. Заяц, Ю.А. Заславль в эпоху феодализма / Ю.А. Заяц. – Минск: Наука и техника, 1995. – 208 с.
73. Заяц, Ю.А. Заслаўская кафля / Ю.А. Заяц. – Мінск: Навука і тэхніка, 1990. – 62 с.
74. Заяц, Ю.А. Классификация керамической посуды Заславля / Ю.А. Заяц // Сярэдневяковыя старажытнасці Беларусі: Новыя матэрыялы і даследаванні / рэд. В.М. Ляўко. – Мінск: Навука і тэхніка, 1993. – С. 108 – 118.
75. Заяц, Ю.А. О постройке с изразцовыми печами возле княжеского терема в Полоцке / Ю.А. Заяц // ГАЗ. – 1997. – № 12. – С. 92 – 102.
76. Заяц Ю.А., Кудрашоў В.Я., Расадзін С.Я. Нож // Археалогія і нумізматыка Беларусі: энцыкл. / Беларус. энцыкл.; Рэдкал.: В.В. Гетаў і інш. – Мінск: БелЭн, 1993. – С. 467.
77. Звяруга, Я.Г. Гарадок / Я.Г. Звяруга, Г.М. Сагановіч // Археалогія і нумізматыка Беларусі: энцыкл. / Беларус. энцыкл.; рэдкал.: В.В. Гетаў і інш. – Мінск: БелЭн, 1993. – С. 162.

78. Зданович, Н.И. О некоторых видах неполивной посуды окислительного обжига Лидского замка / Н.И. Зданович // Древнерусское государство и славяне / редкол. Л.Д. Поболь и др. – Минск: Наука и техника, 1983. – С. 98 – 99.
79. Здановіч, Н. Гратэскавае люстэрка кафлярства / Н. Здановіч // Мастацтва. – 2001. – № 2. – С. 47 – 50.
80. Здановіч, Н. Пячная засланка, што датуецца расійскай манетай / Н. Здановіч, Я. Сінчук // Полацк; Кліўленд. – 1993. – № 1 (21). – С. 4 – 5.
81. Здановіч, Н.І. Ангобны роспіс на бытавой кераміцы Полацка XVII – XIX стст. / Н. Здановіч // Гісторыя і археалогія Полацка і Полацкай зямлі: матэрыялы навук. канф., прысв. 1130-годдзю Полацка. – Полацк, 1992. – С. 24 – 25.
82. Здановіч, Н.І. Да пытання рэканструкцыі старажытнай забудовы Полацка / Н. Здановіч // Гісторыя і археалогія Полацка і Полацкай зямлі: матэрыялы IV Міжнар. навук. канф., Полацк, 2003. – С. 131 – 137.
83. Здановіч, Н.І. Комплекс рэчаў з пабудовы XVI ст. з Полацка / Н.І. Здановіч // Гісторыя і археалогія Полацка і Полацкай зямлі: матэрыялы III міжнар. навук. канф. – Полацк: Полацкі гісторыка-культурны музей-запаведнік; ПГУ, 1998. – С. 125 – 140.
84. Здановіч, Н.І. Полацкая кафля канца XVI – XVII ст. / Н. Здановіч // ГАЗ. – 1997. – № 12. – С. 103 – 125.
85. Здановіч, Н.І. Матэрыяльная культура Міра і Мірскага замка / Н.І. Здановіч, А.К. Краўцэвіч, А.А. Трусаў. – Мінск: Навука і тэхніка, 1994. – 152 с.
86. Здановіч, Н.І. Беларуская паліваная кераміка XI – XVIII стст. / Н. І. Здановіч, А.А. Трусаў. – Мінск: Навука і тэхніка, 1993. – 183 с.
87. Здановіч, Н.І. Мсціслаўскі посуд XV – XIX стст. / Н.І. Здановіч, А.А. Трусаў // Помнікі культуры: новыя адкрыцці / рэд. С.В. Марцэлеў. – Мінск: Навука і тэхніка, 1985. – С. 195 – 200.
88. Иванова, Г.Н. Рейнская керамика из раскопок во Пскове / Г.Н. Иванова // СА. – 1975. – № 4. – С. 274 – 276.
89. Иванова, Л.С. Из истории реформационной церкви в Полоцке (вторая половина XVI – первая половина XVII в.) / Л.С. Иванова // Гісторыя і археалогія Полацка і Полацкай зямлі. – Полацк, 1992. – С. 25 – 27.
90. Игнатенко, А.П. Ремесленное производство в городах Белоруссии в XVII – XVIII вв. / А.П. Игнатенко. – Минск: Изд-во Мин-ва высш., средн. спец. и проф. образов. БССР, 1963. – 88 с.

91. Иезуиты в Полоцке: 1580 – 1820 гг.: в 2 ч. Ч. 1 / сост., примеч. и вступ. ст. Л.Ф. Данько, А.И. Судник. – Полоцк: А.И. Судник, 2005. – 40 с.: ил. – (Наследие Полоцкой земли. Вып. 2).
92. Івакін, Г.Ю. Дослідження південної частини Подолу в 1984 – 1985 рр. / Г.Ю. Івакін, Г.А. Козубовский // Стародавній Київ. Археологічні дослідження 1984 – 1989: Зб. наук. праць. – Київ: Наукова думка, 1993. – С. 104 – 133.
93. Калядзінскі, Л. Замак Віцебскі / Л. Калядзінскі // Zamek i dwór w średniowieczu od XI do XV wieku: Materiały XIX Seminarium Mediewistycznego / red. J. Wiesiołowski. – Poznań: Wyd. Poznańskiego towarzystwa przyjaciół nauk, 2001. – С. 92 – 97.
94. Калядзінскі Л.У. Матэрыяльная культура гарадоў Беларусі ў X – XVII стст. (генезіс і станаўленне) / Л. Калядзінскі // Труды VI Междунар. конгр. славянской археологии / отв. ред. В.В. Седов. – М.: НПБО “Фонд археологии”, 1997. – Т. 2: Славянский средневековый город. – С. 133 – 139.
95. Калядзінскі, Л.У. Мурмельшпіль / Л.У. Калядзінскі // Археалогія і нумізматыка Беларусі: энцыкл. / Беларус. энцыкл.; рэдкал.: В.В. Гетаў і інш. – Мінск: БелЭн, 1993. – С. 447.
96. Капыскі, З.Ю. Полацк у эпоху ранняга Адраджэння / З.Ю. Капыскі // Спадчына Скарыны: Зб. матэрыялаў першых Скарынаўскіх чытанняў (1986) / укл. А.І. Мальдзіс. – Мінск: Навука і тэхніка, 1989. – С. 30 – 38.
97. Касцюкевіч, С.У. Беларуская цацка: гісторыя і сучаснасць / С.У. Касцюкевіч // V Республ. науч. конф. студ., аспирантов и магистрантов Республики Беларусь (НИРС-2000): Материалы конф.: в 5 ч. – Гродно: ГрГУ, 2000. – Ч. 1. – С. 10 – 13.
98. Каталинас, К. Вильнюсские пластинчатые изразцы XVI – XVII вв. с “кованым” орнаментом / К. Каталинас // Древности Литвы и Белоруссии / ред. Л.Д. Поболь, А.З. Таутавичюс. – Вильнюс: Москласс, 1988. – С. 135 – 140.
99. Кильдюшевский, В.И. Горшковидные изразцы в средневековом Пскове / В.И. Кильдюшевский // Памятники средневековой культуры. Открытия и версии / отв. ред. А.Н. Кирпичников, О.В. Овсянников. – СПб.: ART-CONTACT, 1994. – С. 89 – 96.
100. Кильдюшевский, В.И. Об одном из типов керамики XIV – XVI вв. крепости Орешек / В.И. Кильдюшевский // КСИА. – 1981. – № 164. – С. 111 – 116.

101. Климовський, С.І. Пам’ятка англійской торгівлі XVI ст. з Киева / С.І. Климовський // Археологія. – 1975. – Вып. 16. – С. 112 – 116.
102. Колчин, Б.А. Хронология новгородских древностей // Новгородский сборник. 50 лет раскопок Новгорода / Б.А. Колчин; Ред. Б.А. Колчин, В.Л. Янин. – М.: Наука, 1982. – С. 156 – 177.
103. Конецкий, В.Я. Исследования позднесредневекового селища у деревни Княжье село Любытинского района Новгородской области / В.Я. Конецкий, С.Г. Сивохин // Новгород и Новгородская земля. История и археология. – 1995. – Вып. 9. – С. 20 – 30.
104. Копысский, З.Ю. Экономическое развитие городов Белоруссии в XVI – первой половине XVII в. / З.Ю. Копысский. – Минск: Наука и техника, 1966. – 227 с.
105. Королёва, Э.В. К вопросу о дворах в средневековом Пскове (по материалам Васильевского раскопа) / Э.В. Королёва, Б.Н. Харлашов // Археологическое изучение Пскова. – 1994. – Вып. 2. – С. 77 – 96.
106. Котлярчук, А.С. Праздничная культура в городах России и Белоруссии XVII в.: официальные церемонии и крестьянская обрядность / А.С. Котлярчук. – СПб.: Петербургское Востоковедение, 2001. – 240 с.
107. Кошовий, О.П. Будівельна кераміка України / О.П. Кошовий. – Київ: Наукова думка, 1989. – 136 с.
108. Красьнянскі, В. “Чарцёж” места Віцебску 1664 году як документальны помнік да гісторыі беларускага драўлянага будаўніцтва / В. Красьнянскі. – Мінск, 1928. – 55 с. [1].
109. Краўцэвіч, А.К. Археалагічныя даследаванні ў Ашмянах // Сярэдневяковыя старажытнасці Беларусі: Новыя матэрыялы і даследаванні / А.К. Краўцэвіч; пад рэд. В.М. Ляўко. – Мінск: Навука і тэхніка, 1993. – С. 40 – 46.
110. Краўцэвіч, А.К. Гарады і замкі Беларускага Панямоння XIV – XVIII стст.: Планіроўка, культурны слой / А.К. Краўцэвіч. – Мінск: Навука і тэхніка, 1991. – 171 с.
111. Кушнярэвіч, А. “Партрэтная” кафля XVI ст. / А. Кушнярэвіч, А. Трусаў // Спадчына. – 2000. – № 2. – С. 136 – 138.
112. Лазука, Б.А. Беларускае барока: Гіст.-тэарэт. прабл. стылю / Б.А. Лазука. – Мінск: Беларусь, 2001. – 144 с.
113. Лакотка, І.А. Нацыянальныя рысы беларускай архітэктуры / І.А. Лакотка. – Мінск: Ураджай, 1999. – 366 с.
114. Левко, О.Н. Витебск XIV – XVIII вв.: (Стратиграфия, хронология, социал.-ист. топография и технология пр-в) / О.Н. Левко. – Минск: Наука и техника, 1984. – 120 с.

115. Левко, О.Н. Витебские изразцы XIV – XVIII вв. / О.Н. Левко. – Минск: Наука и техника, 1981. – 46 с.
116. Левко, О.Н. Средневековое гончарство северо-восточной Белорусии / О.Н. Левко. – Минск: Наука и техника, 1992. – 127 с.
117. Лобанов, Н.А. Освещение в древнем городе // Археологи рассказывают о древнем Пскове / Н.А. Лобанов; ред. В.В. Седов. – Псков, 1991. – С. 118 – 124.
118. Лугіна, Н.Г. Кафля сярэдзіны XVI – пачатку XVII ст. з раскопак Н.І. Здановіч / Н.Г. Лугіна // Матэрыялы навук.-практ. канф. (па выніках навукова-даследчай работы ў 2001 г.) / уклад. Т.А. Джумантаева. – Полацк, 2002. – С. 21 – 52.
119. Лугіна, Н.Г. Калекцыя кафлі з фондаў ПГКЗ (аб'ём і структура каталога) / Н.Г. Лугіна // Матэрыялы навук.-практ. канф. (па выніках навукова-даследчай работы ў 1996 г.) / уклад. Т.А. Джумантаева. – Полацк, 1997. – С. 29 – 33.
120. Лугіна, Н.Г. Кафля XIV – канца XX ст. з раскопак С.В. Тарасава / Н.Г. Лугіна // Матэрыялы навук.-практ. канф. (па выніках навукова-даследчай работы ў 2000 г.) / уклад. Т.А. Джумантаева. – Полацк, 2001. – С. 50 – 56.
121. Лугіна, Н.Г. Кафля другой паловы XIV – пачатку XX ст. з раскопак В.А. Булкіна / Н.Г. Лугіна // Матэрыялы навук.-практ. канф. (па выніках навукова-даследчай работы ў 1998 г.) / уклад. Т.А. Джумантаева. – Полацк, 1999. – С. 30 – 57.
122. Лугіна, Н.Г. Кафля з раскопак княскага церама XII ст. / Н.Г. Лугіна // Матэрыялы навук.-практ. канф. (па выніках навукова-даследчай работы ў 1997 г.) / уклад. Т.А. Джумантаева. – Полацк, 1998. – С. 49 – 53.
123. Лугіна, Н.Г. Кафля канца XVI – XVIII ст. з раскопак Русава П.А. / Н.Г. Лугіна // Матэрыялы навук.-практ. канф. (па выніках навукова-даследчай работы ў 1999 г.) / уклад.Т.А. Джумантаева. – Полацк, 2000. – С. 28 – 31.
124. Любавский, М.К. Областное деление и местное самоуправление Литовско-русского государства / М.К. Любавский. – М.: Университетская типография, 1892. – 884 с.
125. Лютый, А.М. Социально-экономическое развитие городов Белоруссии в конце XVIII – первой половине XIX века / А.М. Лютый; под. ред. В.В. Чепко. – Минск: Наука и техника, 1987. – 181 с.

126. Максимова, Э.О. Ювелирное искусство Полоцка XVI – XVIII вв. / Э.О. Максимова // История и археология Полоцка и Полоцкой земли: Материалы науч. конф., посв. 1125-летию Полоцка / сост. Т.А. Джумантаева. – Полоцк, 1987. – С. 33 – 34.
127. Максімава, Э.С. Мастацкія якасці шатаў абразоў XVI – першай паловы XVII ст. / Э.С. Максімава // Помнікі мастацкай культуры Беларусі эпохі Адраджэння / рэд. С.В. Марцэлеў. – Мінск: Навука і тэхніка, 1994. – С. 143 – 150.
128. Макушнікаў, А.А. Бытавая кераміка з Чачэрска (па матэрыялах раскопак 1981 – 1982 гг.) / А.А. Макушнікаў, Н.І. Здановіч // Весці АН БССР. Сер. грамадск. навук. – 1985. – № 1. – С. 67 – 73.
129. Мальдзіс, А. Як жылі нашыя продкі ў XVIII стагоддзі / А. Мальдзіс. – Мінск: Лімарыус, 2001. – 384 с.
130. Марзалюк, І. Хатняе асвятленне магілёўцаў / І. Марзалюк, З. Яцкевіч // Ратуша. – Магілёў. – 1992. – 7 крас. – С. 6.
131. Марзалюк, І.А. Магілёў у XII – XVIII ст. Людзі і рэчы / І.А. Марзалюк. – Магілёў; Мінск: Веды, 1998. – 260 с.
132. Милюченков, С.А. Белорусское народное гончарство / С.А. Милюченков. – Минск: Наука и техника, 1984. – 183 с.
133. Мілюцін, У.М. Старажытная пячатка з Полацка / У.М. Мілюцін, С.В. Тарасаў // Помнікі мастацкай культуры Беларусі эпохі Адраджэння; рэд. С.В. Марцэлеў. – Мінск: Навука і тэхніка, 1994. – С. 233 – 240.
134. Молчанова, Л.А. Очерки материальной культуры белорусов XVI – XVIII вв. / Л.А. Молчанов. – Минск: Наука и техника, 1981. – 112 с., ил.
135. Мяцельскі, А.А. Старадаўні Крычаў: Гіст.-археал. нарыс горада ад старажытн. часоў да канца XVIII ст. / А.А. Мяцельскі; навук. рэд. П.Ф. Лысенка. – Мінск: Беларуская навука, 2003. – 167 с.: іл.
136. Насевіч, В. Полацкае ваяводства / В. Насевіч // Энцыкл. гісторыі Беларусі: у 6 т. / Беларус. энцыкл.; Г.П. Пашкоў (галоўны рэд.) і інш. – Мінск: БелЭн, 1999. – Т. 5. М – Пуд. – С. 524 – 525.
137. Никитин, А.В. Русское кузнечное ремесло XVI – XVII вв. / А.В. Никитин // САИ. – 1971. – Вып. Е1 – 34. – 84 с.
138. Островский, А.Б. Православные нагрудные кресты: символика и пластика / А.Б. Островский // Традиционные верования в современной культуре этносов / ред. В.В. Горбачёва. – СПб.: Рос. этногр. музей (РЭМ), 1993. – С. 123 – 139.

139. Памяць: Гіст.-дакум. хроніка Полацка / рэд. кал. Г.П. Пашкоў (гал. рэд.) і інш. – Мінск: БелЭн, 2002. – 912 с.
140. Паничева, Л.Г. Белорусские изразцы XIV – XVII вв. как исторический источник: автореф. дис…канд. ист. наук: 07.00.06 / Л.Г. Паничева; Ин-т археологии АН СССР. – Л., 1980 а. – 16 с.
141. Паничева, Л.Г. Изразцы и изразцовые печи позднесредневекового Полоцка / Л.Г. Паничева // СА. – 1981. – № 3. – С. 274 – 280.
142. Паничева Л.Г. Полоцкая архитектурно-декоративная керамика XIV – XVII вв. / Л.Г. Паничева // КСИА. – 1980 б. – Вып. 160. – С. 53 – 59.
143. Пилецкий, И.В. География Витебской области / И.В. Пилецкий. – Витебск: Изд-во ВГУ, 1999. – Ч. 1. – 163 с.
144. Полоцк: Ист. очерк / АН БССР. Ин-т истории; ред. П.Т. Петриков. – Минск: Наука и техника, 1987. – 320 с.
145. Путеводитель по городу Полоцку 1910 года: К торжеству перенесения мощей преподобной Евфросинии, княжны Полоцкой, из г. Киева в г. Полоцк / сост., примеч. и вступит. ст. Л.Ф. Данько, А.И. Судник. – Полоцк: А.И. Судник, 2006. – 48 с.: ил. – (Наследие Полоцкой земли; Вып. 4).
146. Пуцко, В. Серебряная чарка с гербом Полацка / В. Пуцко // ГАЗ. – 2000. – № 15. – С. 164 – 165.
147. Пуцко, В.Г. Мнимый крест Параскевы Полоцкой / В.Г. Пуцко // Беларускія старажытнасці: матэрыялы канф. па археалогіі БССР. – Мінск, 1972. – С. 210 – 219.
148. Рабинович, М.Г. Московская керамика / М.Г. Рабинович // МИА. – 1949. – № 12. – Т. II. – С. 57 – 105.
149. Раппопорт, П.А. Кирпич Древней Руси / П.А. Раппопорт // Памятники науки и техники. 1987 – 1988. / ред. Н.К. Гаврюшина. – М.: Наука, 1989. – С. 133 – 164.
150. Раппопорт, П.А. Полоцкое зодчество XII века / П.А. Раппопорт // СА. – 1980. – № 3. – С. 142 – 161.
151. Раппопорт, П.А. Полоцкое зодчество XII века / П.А. Раппопорт // СА. – 1980. – № 3. – С. 142 – 161.
152. Розенфельдт, Р.Л. Белорусские изразцы / Р.Л. Розенфельдт // МИА. – 1969. – № 169. – С. 178 – 184.
153. Розенфельдт, Р.Л. Московское керамическое производство XII – XVIII вв. / Р.Л. Розенфельдт // САИ. – 1968. – Е 1 – 39. – 124 с.

154. Романовский, Н.Т. Развитие мануфактурной промышленности в Белоруссии (вторая половина XVIII – первая половина XIX в.) / Н.Т. Романовский – Минск: Изд-во БГУ, 1966. – 428 с.
155. Русаў, П. Даследаванне вадаадвода Іезуіцкага калегіума Полацка (па матэрыялах археалагічных раскопак 1997 г.) / П. Русаў // Гісторыя і археалогія Полацка і Полацкай зямлі: мат. III міжнар. навук. канф. – Полацк: Полацкі гісторыка-культурны музей-запаведнік; ПГУ, 1998. – С. 259 – 263.
156. Русецкий, А.В. Художественная культура Витебска с древности до 1917 года / А.В. Русецкий, Ю.А. Русецкий. – Минск: БелЭн, 2001. – 288 с.
157. Рыбаков, Б.А. Русалии и бог Симаргл – Переплут / Б.А. Рыбаков // СА. – 1967 – № 2. – С. 91 – 116.
158. Рыбаков, Б.А. Татарская кириллическая надпись из Полоцка / Б.А. Рыбаков // СА. – 1963.– № 4. – С. 248 – 249.
159. Саганович, Г.М. Кузнечное ремесло Белоруссии XIV – XVIII вв.: дис. … канд. ист. наук: 07.00.06. / Г.М. Саганович. – Минск, 1988. – 299 с.
160. Сагановіч, Г.М. Кавальска-слясарныя вырабы з раскопак Крэўскага замка / Г.М. Сагановіч // Сярэдневяковыя старажытнасці Беларусі: Новыя матэрыялы і даследаванні / пад рэд. В.М. Ляўко. – Мінск: Навука і тэхніка, 1993. – С. 92 – 98.
161. Сагановіч, Г.М. Кавальскія вырабы сярэдневяковага Мсціслава / Г.М. Сагановіч // Помнікі мастацкай культуры Беларусі: новыя даследаванні.: зб. арт. / рэд. С.В. Марцэлеў. – Мінск: Навука і тэхніка, 1989. – С. 183 – 189.
162. Сагановіч, Г.М. Паўночная Беларусь у апісанні Паўля Одэборна / Г.М. Сагановіч // БГА. – 2005. – Том. 12, Сш. 1 – 2 (22 – 23). – С. 162 – 189.
163. Сайко, Э.В. Техника и технология керамического производства Средней Азии в историческом развитии / Э.В. Сайко. – М.: Наука, 1982. – 212 с.
164. Салаўёў, А. Полацкая цацка XVII – XVIII стагоддзяў / А. Салаўёў // Мастацтва. – 2002. – № 5 – 6. – С. 50 – 52.
165. Сапунов, А.П. Пребывание императрицы Екатерины II в Полоцке / А.П. Сапунов. – Б.м., б.г. – 29 с.
166. Седов, В.В. Культурный слой Пскова – памятник истории и культуры человечества / В.В. Седов, С.В. Белецкий // Археологи рассказывают о древнем Пскове / ред. В.В. Седов. – Псков, 1992. – С. 8 – 20.

167. Сергина, Т.В. Опыт планиграфического исследования позднесредневекой городской керамики (по материалам раскопа УС – XI Смоленска) / Т.В. Сергина // Археология и история Пскова и Псковской земли / ред. В.В. Седов. – Псков, 1994. – С. 64 – 67.
168. Сергина, Т.В. Поливная посуда из Смоленска / Т.В. Сергина // СА. – 1981. – № 2. – С. 233 – 244.
169. Силаев, А.Г. Истоки русской геральдики / А.Г. Силаев. – М.: ФАИР-ПРЕСС, 2002. – 240 с.
170. Синчук, И.И. Заслонки и печная дуга XVII в. из Дисны / И.И. Синчук, О.Е. Зайцева // Памятники старины. Концепции. Открытия. Версии: в 2-х т. – СПб. – Псков, 1997. – Т. 2. – С. 244 – 251.
171. Сінчук, І. Магілёўская цэгла XVIII ст. (аналіз метралагічных паказчыкаў) / І. Сінчук // З глыбі вякоў. Наш край: Гісторыка-культуралагічны зб. – Мінск: МП “Крок уперад”, 1992. – С. 190 – 200.
172. Слюнченко, В.Г. Архитектурные памятники Полоцка. Историко-архитектурный очерк / В.Г. Слюнченко. – Мінск: Полымя, 1988. – 48 с.
173. Смирнов, Г.Д. Производство красноглиняных печных изразцов и опыт реконструкции печей по материалам Старого Орхея / Г.Д. Смирнов // Известия Молдавского филиала Академии наук СССР. – 1956. – № 4. – С. 75 – 89.
174. Собаль, В.Я. Шкляны посуд Мінска XII – XIX стст. / В.Я. Собаль, М.М. Яніцкая // Помнікі старажытнабеларускай культуры: новыя адкрыцці / рэд. С.В. Марцэлеў. – Мінск: Навука і тэхніка, 1984. – С. 83 – 91.
175. Соболь, В.Е. Минск XIV – XVIII вв. (по материалам археологического изучения): дис. … канд. ист. наук: 07.00.06 / В.Е. Соболь. – Минск, 1988. – 295 с.
176. Соколова, Т.М. Орнамент – почерк эпохи / Т.М. Соколова. – Л.: Аврора, 1972. – 176 с.
177. Соловьёв, А.А. Археологическое исследование дома № 15 по ул. Толстого в г. Полоцке при проведении ремонтных работ / А.А. Соловьёв // Матэрыялы навук.-практ. канф. (па выніках навукова-даследчай работы ў 2004 г.). – Полацк: НПГКМЗ, 2004. – С. 64 – 78.
178. Спегальский, Ю.П. О некоторых приёмах устройства отопительных печей XVII в. (по находкам в Пскове) / Ю.П. Спегальский // КСИА. – 1968. – Вып. 113. – С. 74 – 77.
179. Страчаная спадчына / Т.В. Габрусь [і інш.]; уклад. Т.В. Габрусь. – Мінск: Полымя, 1998. – 351 с.

180. Супруненко, О.Б. Археологія в діяльності першого приватного музею Україні (Лубеньский музей К.М Скаржиньскої): Монографія / О.Б. Супруненко. – Київ – Полтава: Археологія, 2000. – 392 с.
181. Тарасаў, С.В. Вялікі пасад у Полацку / С.В. Тарасаў // ПГКБ. – 1988. – № 4. – С. 18 – 21.
182. Тарасаў, С.В. Дэмаграфічная структура Полацка XI – XVII стст. па гісторыка-археалагічным крыніцам / С.В. Тарасаў // Гісторыя і археалогія Полацка і Полацкай зямлі. – Полацк, 1992. – С. 59 – 61.
183. Тарасаў, С.В. Полацк IX – XVII стст.: Гісторыя і тапаграфія / С.В. Тарасаў. – Мінск: Беларуская навука, 1998. – 183 с.
184. Тарасаў, С.В. Полацкі Верхні замак / С.В. Тарасаў // Археалогія і нумізматыка Беларусі: энцыкл. / Беларус. энцыкл.; рэдкал.: В.В. Гетаў і інш. – Мінск: БелЭн, 1993. – С. 508.
185. Тарасаў, С.В. Полацкі Вялікі пасад / С.В. Тарасаў // Археалогія і нумізматыка Беларусі: энцыкл. / Беларус. энцыкл.; рэдкал.: В.В. Гетаў і інш. – Мінск: БелЭн, 1993. – С. 508.
186. Тарасаў, С.В. Полацкі Запалоцкі пасад / С.В. Тарасаў // Археалогія і нумізматыка Беларусі: энцыкл. / Беларус. энцыкл.; рэдкал.: В.В. Гетаў і інш. – Мінск: БелЭн, 1993. – С. 509.
187. Тарасов, С.В. Технология и инструменты кожевенно-сапожного ремесла Полоцка и Минска (XI – XVIII вв.) / С.В. Тарасов // Памятники науки и техники, 1987 – 1988. – М.: Наука, 1989. – С. 164 – 175.
188. Тарасов, С.В. Раскопки на Великом посаде в г. Полоцке / С.В. Тарасов, Г.Н. Романенкова // История и археология Полоцка и Полоцкой земли: мат. науч. конф., посв. 1125-летию Полоцка / сост. Т.А. Джумантаева. – Полоцк, 1987. – С. 62 – 63.
189. Тревер, К.В. Собака-птица: Сэнмурв и Паскудж / К.В. Тревер // Из истории докапиталистических формаций: сб. ст. к 45-летию Н.Я. Марра. – М; Л.: Соцэкгиз, 1933. – С. 293 – 328.
190. Трусаў, А. Антрапаморфныя выявы на беларускай кафлі XV – XVII стст. / А. Трусаў // З глыбі вякоў. Наш край: Гісторыка-культуралагічны зб. – Мінск: МП “Крок уперад”, 1992. – С. 97 – 104.
191. Трусаў, А.А. Керамічныя пліткі падлогі ў інтэр’ерах дойлідства беларускага сярэдневякоўя / А.А. Трусаў // Помнікі культуры: новыя адкрыцці / рэд. С.В. Марцэлеў. – Мінск, 1985. – С. 190 – 195.
192. Трусаў, А.А. Новае пра старажытны Мазыр (па матэрыялах археалагічных даследаванняў 1981 – 1984 гг.) / А.А. Трусаў, Н.І. Здановіч // Сярэдневяковыя старажытнасці Беларусі: Новыя матэрыялы і даследаванні / пад рэд. В.М. Ляўко. – Мінск: Навука і тэхніка, 1993. – С. 20 – 32.

193. Трусаў, А.А. Гродзенская кафля эпохі Адраджэння (другая палова XVI – пачатку XVII ст.) / А.А. Трусаў, А.К. Краўцэвіч // Помнікі мастацкай культуры Беларусі эпохі Адраджэння / рэд. С.В. Марцэлеў – Мінск: Навука і тэхніка, 1994. – С. 228 – 233.
194. Трусаў, А.А. Стары замак у Гродне XI – XVIII стст.: гіст.-археал. нарыс / А.А. Трусаў, В.Е. Собаль, Н.І. Здановіч. – Мінск: Навука і тэхніка, 1993. – 152 с.
195. Трусов, О.А. Белорусская черепица XIV – XVII вв. / О.А. Трусов // СА. – 1986. – № 3. – С. 186 – 191.
196. Трусов, О.А. Большемерный кирпич XIII – XVII вв. на территории Белоруссии / О.А. Трусов // КСИА. – 1991. – № 205. – С. 111 – 117.
197. Трусов, О.А. Мстиславские изразцы / О.А. Трусов // Памятники культуры: Новые открытия: Ежегодник. 1989 / Сост. Т.Б. Князевская. – М.: Наука, 1990. – С. 334 – 340.
198. Трусов, О.А. Памятники монументального зодчества Белоруссии XI – XVII вв. Архитектурно-археологический анализ / О.А. Трусов. – Минск: Наука и техника, 1988. – 160 с.
199. Угрыновіч, У. Дрэва жыцця / У. Угрыновіч // Мастацтва Беларусі. – 1988. – № 12. – С. 12 – 13.
200. Улащик, Н.Н. Одежда белорусов XVI – XVIII вв. / Н.Н. Улащик // Древняя одежда народов Восточной Европы (Материалы к историко-этнограф. атласу). – М.: Наука, 1986. – С. 133 – 145.
201. Цітоў, А. Пячаткі старажытнай Беларусі: Нарысы сфрагістыкі / А. Цітоў. – Мінск: Полымя, 1993. – 239 с.
202. Цітоў, А.К. Герб Льва Сапегі / А.К. Цітоў // Друцк старажытны: да 1000-годдзя ўзнікнення горада / рэд. кал.: Г.П. Пашкоў (гал. рэд.) і інш. – Мінск: БелЭн, 2000. – С. 66 – 67.
203. Чантурия, Ю.В. Градостроительное искусство Беларуси второй половины XVI – первой половины XIX в.: Средневековое наследие, Ренессанс, барокко, классицизм / Ю.В. Чантурия. – Минск: Белорусская наука, 2005. – 375 с.
204. Шайкоў, В. Аб некаторых сацыяльна-дэмаграфічных аспектах гісторыі Полацка XVI – першай чвэрці XIX ст. у святле айчыннай гістарыяграфіі / В. Шайкоў // Полацк: карані нашага радаводу / Полац. дзярж. ун-т; рэд. А. Мальдзіс і інш. – Полацк, 1996. – С. 144 – 150.
205. Шаланда, А. Перыядызацыя гісторыі геральдыкі Беларусі / А. Шаланда // Герольд Litherland. – 2001. – № 1. – С. 3 – 7.

206. Шалькевіч, В. Полацкі езуіцкі калегіўм / В. Шалькевіч // Энцыкл. гісторыі Беларусі: у 6 т. – Пуд / Беларус. энцыкл.; рэдкал.: Г.П. Пашкоў і інш. – Мінск: БелЭн, 1999. – Т. 5. М. – С. 535.
207. Шматаў, В.Ф. Станаўленне барока ў мастацтве ўсходнеславянскіх народаў / В.Ф. Шматаў // Барока ў беларускай культуры і мастацтве / навук. рэд. В.Ф. Шматаў. – Мінск: Беларуская навука, 2001. – С. 7 – 45.
208. Шовкопляс, Г.М. Середньовічні художні кахлі з Киева / Г.М. Шовкопляс // Археологія. – 1975. – Вып. 16. – С. 104 – 114.
209. Штыхов, Г.В. Древний Полоцк (IX – XIII вв.) / Г.В. Штыхов. – Минск: Наука и техника, 1975. – 136 с.
210. Якимович, Ю.А. Зодчество Белоруссии XVI – XVIII вв. / Ю.А. Якимович. – Минск: Наука и техника, 1991. – 368 с.
211. Яніцкая, М.М. Беларускае мастацкае шкло (XVI – XVIII стст.) / М.М. Яніцкая; рэд. С.М. Цямерын. – Мінск: Навука і тэхніка, 1977. – 120 с.
212. Яніцкая, М.М. Мсціслаўскае шкло XVI – XIX стст. // Помнікі культуры: новыя адкрыцці / М.М. Яніцкая, А.Б. Сташкевіч; рэд. С.В. Марцэлеў. – Мінск: Навука і тэхніка, 1995. – С. 83 – 93.
213. Яніцкая, М.М. Вытокі шкларобства Беларусі / М.М. Яніцкая; рэд. Г.В. Штыхаў. – Мінск: Навука і тэхніка, 1980. – 160 с.
214. Ярашэвіч, А. Полацкі кляштар бернардзінцаў / А. Ярашэвіч // Энцыкл.: гісторыі Беларусі: у 6 т. – Мінск, 1999. – Т. 5. – С. 536.
215. Baranowski, A. Urbanistyka Połocka w okresie baroku / A. Baranowski // Kwartalnik architektury i urbanistyki. T. XXXIX, zeszyt 1. – 1994. – S. 25 – 34.
216. Boniecki, A. Herbarz Polski. Cz. 1. Wiadomości historyczno-genealogiczne o rodach szhlacheckich / A. Boniecki. – Warszawa: Druk. tow. S. Orgelbrands Synow, 1907. – T. X. – 391 s.
217. Boniecki, A. Poczet rodów w Wielkiém Ksienstwie Litewskiém w XV i XVI wieku / A. Boniecki. – Warszawa: Druk. tow. S. Orgelbrands Synow, 1883. – 425 s. [XLIX].
218. Buśko, C. Średniowieczne piece typu hypocaustum na Śląsku / C. Buśko // Archaeologia Historica Polona. – 1995. – T. 1. – S. 149 – 182.
219. Ciepiela, S. Szklo osiemnastowieczne starej Warszawy / S. Ciepiela. – Warszawa: Państwowe wyd. naukowe, 1977. – 144 s.
220. Ciepiela, S. Wyroby szklane od połowy XIII do połowy XVII w. / S. Ciepiela // Polskie szkło do połowy XIX w. – Wrocław; Warszawa; Kraków; Gdańsk; Łódź, 1987. – S. 70 – 79.

221. Ciepiela, S. Zabytki szklane z Solca nad Wisłą od końca XV do XVIII/XIX w. / S. Ciepiela // SMHKM. – 1971. – T. XLV. – S. 173 – 214.
222. Dąbrowska, M. Kafle i piece kaflowe w Polsce do końca XVIII w. M. Dąbrowska // SMHKM. – 1987. – T. LVIII. – 270 s.
223. Dąbrowska, M. Piec z początku XVII wieku. Opracowanie i proekt rekonstrukcji dla zamku królewskiego w Warszawie / M. Dąbrowska // Kronikie zamkowe. – 1994. – № 1/29, 2/30. – S. 15 – 29.
224. Dąbrowska, M. Problematyka i stan badań nad ogrzewnictwem na ziemiach polskich od XIV do połowy XVII w. / M. Dąbrowska // Studia z dziejów rzemiosła i przemysłu. – 1970. – T. 10. – S. 7 – 19.
225. Dąbrowska, M. Późnośredniowieczne i nowożytne naczynia gliniane oraz kafle. Komentarz do analizy / M.Dąbrowska, M. Gajewska, J. Kruppé // Sandomierz: bądania 1969 – 1973. T. 1 / Polskie badania archeologiczne. – 1993. – T. 31. – S. 240 – 261.
226. Dymnek, K. Średniowieczne i renesansowe kafle śląskie / K. Dymnek. – Wrocław: Uniwersytet wrocławski, 1995. – 292 s.
227. Federowski, M. Lud Białoruski na Rusi Litevskej / M. Federowski. – Kraków: Wyd. Komisyi Antropologicznej, 1897. – T. 1. – 509 s.
228. Gajewska, M. Garncarstwo nowożytne w Polsce. Stan i potrzeby badań / M. Gajewska // PMMAEL. – 1990. – № 36. – S. 159 – 169.
229. Genys, J. Klaipėdos kokliai ir jų gamiba XVI – XVII amžiuje / J. Genys // Architektūros paminklai. – 1984. – T. 9. – P. 43 – 53.
230. Glosek, M. Późnośredniowieczna broń obuchowa w zbiorach polskich / M. Glosek. – Warszawa; Łódź: SCIENTA – Naukowa Oficyna Wydawnicza, 1996. – 143 s.
231. Historia sztuki Polskiej w zarysie. W III t. – Kraków: Wyd. Literackie, 1962. – T. II: Sztuka nowożytna. – 1962. – 490 [2] s.
232. Hołubowicz, W. Garncarstwo wiejskie zachodnich terenów Białorusi / W. Hołubowicz. – Toruń: Wyd. Towarzystwa naukowego w Toruniu, 1950. – 283 s.
233. Jabłonowski, J. Heraldika to jest Osada kleynotów rycerskich i wiadomość znaków herbownych dotąd w Polszcze nie obiáśniona / J. Jabłonowski. – 1748.
234. Jasinski, J. Technika i organizacja produkcji złotniczej w Poznaniu w XVI i I połowie XVII w. / J. Jasinski // SMHKM. – 1971. – T. XLV. – S. 71 – 171.
235. Kajzer, J. Wstęp do archeologii historycznej w Polsce / J. Kajzer. – Lódz: Wyd. Uniwersitetu Lódzkiego, 1996. – 267 s.

236. Kojałowicz, W.W. Herbarz rycerstwa W. X. Litewskiego t. zw. Compendium / W.W. Kojałowicz. – Kraków:Wyd. “Herolda Polskiego”, 1897. – 527 s.
237. Kowalski, K.M. Artefakty jako żródła poznania / K.M. Kowalski // Studium z teorii nauki historycznej. – Gdańsk: Wyd. Uniwersitetu Gdańskiego, 1993. – 170 s.
238. Kruppé, J. Garnczarstwo późnośredniowieczne w Polsce / J. Kruppé // SMHKM. – 1981 a. – T. LIII. – Cz. 1. Tekst. – 116 s.
239. Kruppé, J. Garnczarstwo późnośredniowieczne w Polsce / J. Kruppé // SMHKM. – 1981 в. – T. LIII. – Cz. 2. Karty katalogowe. – 78 s.
240. Kruppé, J. Garnczarstwo warszawskie w wiekach XIV i XV / J. Kruppé. – Wrocław; Warszawa; Kraków: Wyd. Polskiej Akademii nauk, 1967. – 285 s.
241. Lithuanian archaeology: investigations and findings // Editors: A. Kuncevičius, E. Jovaiša, V. Šimenas. – Vilnius: Institute of cultural heritage, 1998. – 32 p.
242. Mikołajczyk, A. Naczynia datowane skarbami monet XIV – XVIII w. na ziemiach polskich / A. Mikołajczyk // Biblioteka archeologiczna. – 1977. – T. 24. – 183 s.
243. Niesiecki, K. Herbarz Polski / K. Niesiecki // Powiékszony dodatkami z póznejszych autórow rękopismów, dowodów urzędowych: w X t. – Lipsk: Nakladem i drukem Breitkopfa i Haertela, 1845. – T. X. – 308 s.
244. Niesiecki, K. Herbarz Polski / K. Niesiecki // Powiékszony dodatkami z póznejszych autórow rękopismów, dowodów urzędowych: w X t. – Lipsk: Nakladem i drukem Breitkopfa i Haertela, 1839. – T. I. – 582 s.
245. Niesiecki, K. Herbarz Polski / K. Niesiecki // Powiékszony dodatkami z póznejszych autórow rękopismów, dowodów urzędowych: w X t. – Lipsk: Nakladem i drukem Breitkopfa i Haertela, 1841. – T. VIII. – 652 s.
246. Okoński, E. Z badań nad typologią i zmiennością dekoracji kafli w Polsce / E. Okoński. – Warszawa: Wyd. PKZ, 1988. – 103 s.
247. Panasiewicz, W. Staroruskie miniaturowe toporki z Gródka, pow. Hrubieszów / W. Panasiewicz, M. Wołoszyn // Archeologia Polski. – 2002. – T. XLVII. – Z. 1 – 2. – S. 245 – 286.
248. Piątkiewicz-Dereniowa, M. Materiał kaflowy / M. Piątkiewicz-Dereniowa // Początki i rozwój starego miasta w Poznaniu w świetle badań archeologicznych i urbanistyczno–architektonicznych. – Warszawa; Poznań, 1977. – S. 193 – 205.
249. Piątkiewicz-Dereniowa, U. Rekonstrukcja dawnych Wawelskich piecow kaflowych / U. Piątkiewicz-Dereniowa // Biuletyn historii sztuki. – 1960. – R. XXII. – S. 331 – 332.

250. Piekalski, J. Budownictwo z drewna w późnośredniowiecznym Wrocławiu / J. Piekalski // Archaeologia Historica Polona. T. 1. – Toruń: Wyd. Uniwersitetu M. Kopernika, 1995. – S. 107 – 125.
251. Piekalski, J. Początki budynków o konstrukcji szkieletowej na terenie Środkowej Europy / J. Piekalski // Archaeologia Historica Polona. T. 3. – Toruń: Wyd. Uniwersitetu M. Kopernika, 1996. – S. 73 – 86.
252. Pietkiewicz, C. Kultura duchowa połesia rzeczyckego / C. Pietkiewicz. – Warszawa, 1938. – 459 s.
253. Podręczna encyklopedya kościelna. Opracowana J. i R. Archutowskich. T. XXXVII – XXXVIII. – Warszawa, Skład główny w księgarni Gebethnera i Wolffa. – Kraków: O. Gebethner i s-ka, 1913. – 410 [2] s.
254. Prusika-Kołcon, E. Sklane pucharki dzwonowate z Zamościa od Końca XVI wieku do końca XVII wieku / E. Prusika-Kołcon // Archeologia Polski Środkowowschodniej. – 2000. – T. V. – S. 230 – 239.
255. Rębkowski, M. Średniowieczna ceramika miasta lokacyjnego w Kołobrzegu / M. Rębkowski. – Kołobrzeg: Feniks, 1995. – 134 s., 42 ryc., tabl. LXXII.
256. Rostkowska, B. Dewocjonalia: medaliki i krzyżyki. Tkaniny ozdobne / B. Rostkowska // Sandomierz: bądania 1969 – 1973. T. 2 / Polskie badania archeologiczne. – 1996. – T. 32. – S. 405 – 422.
257. Samek, J. O renesansowym rzemiosle artystycznym w Polsce / J. Samek // Renesans. Sztuka i ideologia. – Warszawa: Państwowe wyd. naukowe, 1976. – 640 s.
258. Tautavičius, A. Vilniaus pilies kokliai (XVI – XVII a.) / A. Tautavičius // Acta historica lituanica. – 1969. – T. IV. – 48 p.
259. Topolska, M. Społeczestwo i kułtura w Wielkim Księstwie Litewskim od XV do XVIII wieku / M. Topolska. – Poznań; Zielona Góra: Bogucki wydawnictwo naukowe, 2002. – 448 s., il.
260. Urbaniak, W. Zbior nowożytnej ceramiki naczyniowej z podwórza przy ul. Jezuickiej 5 w Lublinie / W. Urbaniak // Archeologia Polski Środkowowschodniej. – 2000. – T. V. – S. 215 – 229.
261. Urzędnicy centralni i dygnitarze Wielkiego Księstwa Litewskiego XIV – XVIII wieku / Spisy. Opracowali Henryk Lulewicz i Andrzej Rachuba // Urzędnicy dawnej Rzeczypospolitej XII – XVIII wieku. Spisy / Pod red. A. Gąsiorowskiego. T. XI. – Kórnik: Biblioteka Kórnicka, 1994. – 255 s.
262. Uzbrojenie w Polsce średniowiecznej 1350 – 1450 / Red. A. Nadolski. – Łódź: Wyd. Instytutu Histjrii Kultury Materialnej PAN, 1990. – 530 [2] s.
263. Vilniaus žemutinės pilies rūmai (1988 metų tyrimai) / Red. A. Klimavičiene. – Vilnius, 1989. – 128 p.

264. Wielądko, W.W. Heraldyka czyli opisanie herbów, w jakim który jest kształcie, oraz Familie rodowitej Slachty Polskiej, i W. X. Litewskiego, z ich herbami. T. 1. Cz. 1 / W.W. Wielądko. – Warszawa: Druk. P. Zawadskiego, 1792. – 344 s.
265. Wisner, H. Wojsko Litewskie I polowy XVII w. / H. Wisner // Studia i materiały do historii wojskowości. – 1978 – T. XXI. – S. 45 – 148.
266. Wolff, J. Kniaziowie litewsko–ruscy od końca czternastego wieku / J. Wolff. – Warszawa: Skład główny w księgarni Gebethera i Wolffa, 1895. – 698 s.
267. Wolff, J. Senatorowie i dygnitarze Wielkiego Księstwa Litewskiego 1386 – 1795 / J. Wolff; przez J. Wolffa. – Kraków: Drukarnia W.L. Anczyca i Spółki, 1885. – 351 s.
268. Wyrobisz, A. Szkło w Polsce od XIV do XVII w. / A. Wyrobisz. – Wrocław; Warszawa; Kraków: Wyd. PAN, 1968. – 223 s.
269. Wyrobisz, A. Warunki rozwoju przemysłu w Polsce w XVI i pierwszej połowie XVII w. / A. Wyrobisz // SMHKM. – 1976. – T. LI. – S. 197 – 244.
270. Wyrobisz, A. Wytwórczość szklarska od połowy XIII do połowy XVII w. / A. Wyrobisz // Polskie szkło do połowy XIX w. – Wrocław; Warszawa; Kraków; Gdańsk; Łódź, 1987. – S. 48 – 62.
271. Żemigala, M. Belaruskaia kaflia / M. Żemigala // Kwartalnik architektury i urbanistyki. – 1991. – T. XXXVI. – Z. 3. – S. 263 – 271.
272. Żemigala, M. Nowożytne kafle pieczowe z Kalisza na podstawie znalezisk z terenu zamkowego / M. Żemigala // PMMAEL. – 1998. – № 40. – S. 97 – 204.
273. Zubrzycki, J. Kaflarstwo polskie / J. Zubrzycki. – Lublin: Wyd. Museum lubelskiego, 1915. – № 2. – 15 s., XXII tabl.
274. Żygulski, Z. Broń w dawnej Polsce na tle uzbrojenia Europy i Bliskiego wschodu / Z. Żygulski. – Warszawa: Państwowe wydawnictwo naukowe, 1982. – 336 s., album [377 il.].

Навуковае выданне

ДУК Дзяніс Уладзіміравіч

ПОЛАЦК XVI – XVIII СТАГОДДЗЯЎ: НАРЫСЫ ТАПАГРАФІІ, ГІСТОРЫІ МАТЭРЫЯЛЬНАЙ КУЛЬТУРЫ І АРГАНІЗАЦЫІ ЖЫЦЦЁВАЙ ПРАСТОРЫ НАСЕЛЬНІЦТВА БЕЛАРУСКАГА ГОРАДА

Рэдактар *Р. Н. Аўласенак*
Тэхнічны рэдактар *Р. Н. Аўласенак*
Дызайн вокладкі *І. С. Васільевай*

Падпісана да друку 20.04.07. Формат 60 × 84 1/16. Бумага афсетная.
Гарнітура Таймс. Друк трафарэтны.
Умоўн. друк. арк. 15,55. Ул.-выд. арк. 15,32. Тыраж 100 экз. Заказ № 714.

Выдавецтва і паліграфічнае выкананне:
Установа адукацыі
“Полацкі дзяржаўны універсітэт”

ЛВ № 02330/0133020 от 30.04.04
ЛП № 02330/0133128 от 27.05.04

211440 г. Наваполацк, вул. Блахіна, 29